НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

**У. В. Гніламёдаў**

# Янка Купала

*жыццё і творчасць*

Мінск
«Беларуская навука»
2002

УДК 821.161.3.09+929 Купала
ББК 84(4Беи)
Г 56

Навуковы рэдактар доктар філалагічных навук В. П. Жураўлёў
Рэцэнзенты: доктар філалагічных навук В. А. Максімовіч,
кандыдат філалагічных навук Я. А. Гарадніцкі

ISBN 985-08-0521-8

© Гніламёдаў У. В., 2002

# УСТУП

У кожнай нацыянальнай літаратуры ёсць постаці асабліва значныя і славутыя, якія найбольш поўна ўвабралі ў сябе вопыт перажытага, здабыткі папярэднікаў, сталі прызнанымі песнярамі свайго народа, яго гістарычнага лёсу. У славян гэта Пушкін, Шаўчэнка, Міцкевіч, Прэшэрн, Негаш, Гвездаслаў... Сярод іх знаходзіцца і Янка Купала. Ён стварыў такія мастацка-філасофскія, ідэйныя каштоўнасці, якія не маюць аналагаў у іншых народаў. Праз яго творы беларускі народ расказаў свету пра сваё жыццё, звычаі, гісторыю, прыроднае ўлонне, раскрыў свой светапогляд і норавы, прад'явіў, інакш кажучы, неабвержнае мастацка-паэтычнае сведчанне аб сваім існаванні на зямлі. Гістарычная своеасаблівасць Купалы заключалася ў тым, што з самага пачатку, з «жалейкавага» перыяду, паэт выступаў як прарок нацыянальнага Адраджэння. Менавіта ў гэтым, думаецца, сэнс славутага яго верша «Я не паэта», пра змест якога мы і сёння працягваем спрачацца, прыпісваючы нашаму песняру нейкую правінцыяльную сціпласць і незразумелую сарамяжлівасць. А між тым калі ўсур'ёз падумаць над тым, якое азначэнне ў дачыненні да Янкі Купалы ставіць на першае месца: прарок ці паэт, — дык, безумоўна, ён перш за ўсё прарок, дакладней — прарокпаэт, для якога нацыянальныя інтарэсы свайго народа былі і вышэй, і важней за ўсё:

Я не паэта, о крый мяне Божа!
Не рвуся я к славе гэткай німала,
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі — Янка Купала.

*(«Я не паэта»)*

Рухаючай сілай Купалавай творчасці была любоў да людзей, у чалавечай асобе ён бачыў стымул і самамэту грамадскага развіцця. Ён добра ведаў, што ёсць правы чалавека, на якія ніхто не павінен пасягаць.

Творчасць Купалы ўжо на самых першых этапах была трывала звязана з нацыянальнымі традыцыямі. Ён бачыў і радаваўся абуджэнню і разгортванню духоўных сіл свайго народа. Апора на нацыянальнае дазволіла яму дасягнуць шырокіх агульначалавечых далягядаў. Адначасова Я. Купала садзейнічаў узбагачэнню беларускай літаратуры за кошт мастацкага вопыту літаратуры сусветнай, а найперш рускай, польскай, украінскай. Ён прызнаваўся, што з рускіх паэтаў асабліва блізкія яму былі А. Пушкін, М. Лермантаў, А. Кальцоў, М. Някрасаў, з польскіх — А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, М. Канапніцкая,

С. Выспянскі і некаторыя іншыя, з украінскіх — Т. Шаўчэнка. Купала зачытваўся іх творамі, якія прывівалі ідэі свабоды, нянавісці да сацыяльнага і духоўнага прыгнёту.

Актыўныя сувязі з братнімі літаратурамі дазволілі Купалу вырасці ў вялікага і арыгінальнага нацыянальнага паэта, які паказаў дарогу, што вяла беларускую літаратуру да вяршынь сусветных мастацкіх дасягненняў. Чым вышэй ён узнімаўся да іх, тым больш дзейсна ўплываў на родную літаратуру. Купалаўскі ўплыў быў своеасаблівы і непаўторны, ён адпавядаў ідэйна-эстэтычным параметрам яго творчасці.

Сёння ў нас і за мяжою знаходзяцца, на жаль, «разумнікі», якія пра Купалу кажуць прыкладна так: «Быў ён таленавітым, але свой талент мог выкарыстаць для чыстай паэзіі, а не ідэі». Такія развагі не маюць, мякка кажучы, аніякіх падстаў, таму што, па-першае, нейкай чыстай, «дыстыляванай», паэзіі не існуе ў прыродзе. Сапраўдная паэзія не можа ні нарадзіцца, ні існаваць па-за ідэяй (паняцце ідэі, як вядома, належыць не каму-небудзь, а старажытнаму мудрацу Платону). Па-другое, тым больш нельга адасабляць «ідэйнае» і «мастацкае», калі гаворка ідзе пра паэзію Янкі Купалы — паэта-адраджэнца і прарока, які валодаў абсалютным чуццём хараства, што адбілася ў многіх і многіх яго творах. І гэта натуральна, таму што праваявая, так бы мовіць, ідэя беларускага нацыянальнага адраджэння заўсёды была ў сваёй генетычнай аснове ідэяй эстэтычнай. Такой яна прадстае і ў Купалы, які выдатна разумеў, што пры адсутнасці ў беларусаў дзяржаўнасці і нацыянальнай незалежнасці, развітых формаў уласнага палітычнага і эканамічнага жыцця, культура, літаратура, паэзія, нарэшце, выступаюць як важнейшы аб'яднальны фактар, які садзейнічае захаванню этнічнай самасвядомасці, духоўнаму абуджэнню і кансалідацыі.

Успомнім, напрыклад, цудоўны верш «Жняя», у якім намаляваны надзвычай прывабны — зямны і адначасова ўзнёсла-адухоўлены — партрэт маладой сялянкі, якая ідзе «ў вяночку паміж спелых гоняў»:

Каласкі хінуцца
Перад ёй паклонна,
Дзівіцца ігруша
На мяжы зялёнай.

А яна — царыца —
Весела, шчаслiва
Каранує песняй
Залатое жніва.

Смела йдзе у сонца
Ўся сама — як сонца,
Гэта жнейка наша
У нашаей старонцы.

Купалаўская жняя — эстэтычнае ўвасабленне нацыянальнага адраджэння, а Купала — яго сімвал, ён як ніхто іншы з беларускіх паэтаў паслядоўна і пераканана развіваў і бараніў ідэю Адраджэння, якая разумелася ім надзвычай шырока і была тоесная самому жыццю з усім яго багаццем і шматстайнасцю. Прыгажосць стала, можна сказаць, ключавым момантам Купалавай творчасці, не ўступаючы, аднак, у супярэчнасць з этычным пачаткам.

Федэрыка Гарсія Лорка даў песнярам (сваім іспанскім калегам) такое вызначэнне. «Песняры, — сказаў ён, — гэта папросту медыумы, лірычныя ачагі нашага народа». Але ж падобнае выказванне ў немалой ступені стасуецца і да індывідуальнасці беларуса Янкі Купалы, які, адораны незвычайнай паэтычнай чуласцю, таксама з'яўляўся «лірычным ачагом» свайго народа, прарокам яго долі. Бо хто іншы, як не прарок, мог скласці такі, напрыклад, верш, як купалаўскі «Вялікдзень»:

Два сьвяты на сьвеце — ад нівы да нівы:
Хрыстос уваскрос! наступае весна!
Глянь сьмела, глянь вольна, шчасьліў, нешчасьлівы
І далей к жыцьцю с паніжэньня і сна!

Гэй, гэй, на спатканьне вялікіх двух сьвятаў!
Сьпяшыце супольна, хто ў путах ня згніў!
Хай льюцца-зыльюцца ад хаты да хаты
Ў вадно ўсе грамады, ўсе людзі ўсіх ніў!

Вялікдзень! Вялікдзень! ад нівы да нівы.
Забыў не адзін з нас недаўные дні,
А ўспомні-прыпомні шчасьліў, несчасьлівы,
Аб тых, што ў сьвітаньні на век адыйшлі, —

Ўсе костачкі тые на гонях папарных, —
Жывых, што ў бязпуцьці зьвіняць...
Прыпомні, дай слова ня счэзнуці марна,
Пачатую справу шырыць, расшыраць!

Вялікдзень! Вялікдзень! ад нівы да нівы

Заводзе бацькоў сваіх песеньку сын.
Зірні-ж, азірніся, шчасьліў, нешчасьлівы
І заўтра на поле да сох, як адзін!

Дагэтуль мы плачэм, дагэтуль мы стогнем,
Адвечных не можэм пазбыціся сьлёз...
Наперад па шчасьце! Хай злое ўсё дрогне,
Весна ўжо на сьвеце, — Хрыстос уваскрос![1]

Разам з тым хочацца яшчэ раз паўтараць, што паэзія Янкі Купалы — песняра Адраджэння — мае не толькі нацыянальнае, але і агульначалавечае значэнне. Яна прасякнута вітальнаю сілаю, яна — на баку жыцця, бароніць чалавека і яго годнае месца на зямлі.

[1] Наша ніва. 1909. 26 сак

## РЫСЫ БІЯГРАФІІ

Сапраўднае яго прозвішча — Луцэвіч Іван Дамінікавіч. Нарадзіўся ён 7 ліпеня 1882 г. (па новаму стылю) у самым цэнтры Беларусі, пад Мінскам, у фальварку Вязынка былой Радашковіцкай воласці (зараз Маладзечанскі р-н Мінскай вобл.). Здарылася гэта амаль на свята Івана Купалы, і потым, калі паэту, паводле беларускай традыцыі, спатрэбіцца псеўданім, ён выбера гэты адзіны — Янка Купала. Да нашага часу жыве ў славян легенда пра тое, што ў самую кароткую летнюю ноч, у ноч на Івана Купалу, зацвітае на імгненне кветка папараці. Хто яе знойдзе — той знойдзе шчасце. Купалле — сакральнае свята разняволенасці, блізкага судакранання чалавека і прыроды, своеасаблівая містэрыя духу.

Народнае павер'е сцвярджае, што папараць, якую яшчэ называлі певуноў агняцвет, жарцвет, качадыжнік, цвіце толькі ў ноч пад Івана Купалу, калі здзяйсняюцца самыя неверагодныя цуды. Паміж лісцямі, падобнымі на крылы арла вырастае і набухае пупышка, якая ў поўнач гучна лопаецца і разрываецца. Гэта нараджаецца на свет вогненная кветка, раздаецца выбуховы пошчак грому і скаланаецца зямля. Толькі чалавек са смелым сэрцам і чыстай душой адважыцца сарваць гэтую кветку і не збаіцца ўступіць у двубой з нячыстай сілай, але ўжо тады смельчаку будуць падуладныя ўсе таямніцы і чары. З гэтай легенды пачынаецца мастацкі свет Янкі Купалы, яе водгулле чуецца ва ўсёй яго творчасці.

На Міншчыне нарадзіліся і бацькі паэта: Дамінік Ануфрыевіч — у засценку Пяскі, каля Ігумена (Ігумен — цяперашні Чэрвень), і Бянігна Іванаўна, маці, якая паходзіла з фальварка Няшота, што непадалёк ад мястэчка Рубяжэвічы. Абое належалі да дробнай шляхты, пажаніліся ў 1879 г. (Бянігна Іванаўна нават супраць волі бацькоў, парваўшы з сям'ёй). Дамінік Ануфрыевіч вымушаны быў (дарэчы, як і яго бацька) стаць арандатарам памешчыцкіх фальваркаў.

У сваёй біяграфіі і творчасці Янка Купала як бы спалучае два стагоддзі — XIX і XX. Дзяцінства і юнацтва паэта прыпадаюць на 80-90-я гады XIX ст. — надта змрочны перыяд расійскай гісторыі — перыяд, калі Беларусь афіцыйна іменавалася «Северо-Западным краем» царскай імперыі, а народ гэтага «краю» цягнуў надзвычай гаротнае існаванне. Адмена прыгоннага права (у 1861 г.) не вырашыла на Беларусі пытання аб зямлі і мала паправіла становішча сялянства. Была ж Беларусь краем пераважна сялянскім, гарадское насельніцтва складала тут нават пазней, у 1913 г., усяго толькі 4%. Сялянства і ў парэформенны перыяд па-ранейшаму бедавала ў

галечы. Не палепшала справы і стварэнне земстваў (не ва ўсёй Беларусі, а ў некаторых месцах), якія, хаця і прынеслі пэўную карысць, не толькі не спынілі злоўжыванняў з боку чыноўнікаў, але і спарадзілі новыя.

Пачатак 80-х гадоў XIX ст., калі нарадзіўся будучы паэт, адзначаны агульным крызісам. У 1881 г. быў забіты цар Аляксандр II. Самадзяржаўе тым не менш не жадала здаваць пазіцый. Узмацняецца палітыка русіфікацыі. Яна не была навіною і прымянялася на беларускіх землях яшчэ пасля паўстанняў 1831 і 1863 гг. як пакаранне, якое накладалася на бунтаўнічы край. Цяпер русіфікацыя стала формай забароны і знішчэння нацыянальнай адметнасці, мовы, гісторыі... Таму пытанне «быць ці не быць?» ні ў якога іншага народа не стаяла так востра і драматычна, як у беларусаў. Гістарычныя рамкі сацыяльна-палітычнага ладу, якім ён усталяваўся к пачатку XX ст. у Расіі, перакрылі ім шлях да багацця і культуры, пазбавілі грамадскай справядлівасці, правоў і свабоды. Застаючыся надзвычай бядотным, мужыцкім краем, Беларусь аб'ектыўна ўтрымлівала ў сабе ідэю сацыялізму, сацыялістычнага шляху да роўнасці, але, каб выкіравацца на гэты шлях, патрэбна была інтэлігенцыя.

З канца XIX — пачатку XX ст. у гісторыі беларускага народа і народаў Расійскай імперыі пачынаецца новы этап. У Расію перамяшчаецца цэнтр рэвалюцыйнага руху. Расце ўплыў радыкальных палітычных партый — эсэраў, сацыял-дэмакратаў, бальшавікоў і інш. Палітычны ўздым вядзе за сабой ажыўленне нацыянальна-вызваленчых настрояў у асяроддзі народаў — насельнікаў Расійскай імперыі. Для дзяржаў Заходняй Еўропы нацыянальны рух, — пісаў У. І. Ленін, — «даўняе мінулае». Там «бацькаўшчына» «адыграла сваю гістарычную ролю», а вось «на ўсходзе Еўропы справа выглядае інакш. Для ўкраінцаў і беларусаў, напрыклад, толькі чалавек, які ў мроях жыве на Марсе, мог бы адмаўляць, што тут няма яшчэ завяршэння нацыянальнага руху, што абуджэнне мас да авалодання роднай мовай і яе літаратурай — (а гэта неабходная ўмова і спадарожнік поўнага развіцця капіталізму, поўнага пранікнення да апошняй сялянскай сям'і) — тут яшчэ адбываецца. «Бацькаўшчына» тут яшчэ не праспявала ўсёй сваёй гістарычнай песні»[1].

Дзяцінства і нават юнацтва Янкі Купалы прайшло ў вандраваннях па Міншчыне — ад фальварка да фальварка, ад пана да пана. Праз год пасля нараджэння першынца Яся сям'я Луцэвічаў, прагнучы большай самастойнасці, пакідае Вязынку і перабіраецца ў маёнтак

---

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 30. С. 90.

Юзафова (на Барысаўшчыну), затым у 1886 г. — у Косіна (Лагойшчына), у 1889 г. — Сенніцу (Мінскі павет). Так і вандравалі — з маёнтка ў маёнтак. Быў яшчэ Мінск, дзе нядоўга жылі Луцэвічы, фальваркі Прудзішча і Селішча Мінскай губерні, дзе яны арандавалі зямлю, і іншыя мясціны цэнтральнай Беларусі.

У Косіне Ясю споўнілася шэсць гадоў. Тут ён упершыню вучыўся пачатковай грамаце — сын аднаго з служачых маёнтка па прозвішчу Патаповіч (імя невядома) вучыў яго па-польску. Хлопчык рос добразычлівым, адкрытым, разумным і, як успаміналі сёстры, вельмі спагадным... Апынуўшыся ў Сенніцы, бацька аддае сына ў мясцовае двухкласнае народнае вучылішча, дзе ён займаецца ў Алімпіяды Васільеўны Сонцавай. Вучыўся ён і ў вандроўных настаўнікаў, і сам пры магчымасці шмат чытаў у вольны ад работы час. Сярод настаўнікаў падлетка быў Уладзімір Самойла — у будучым вядомы літаратар і філосаф, які шмат дапаможа Янку Купалу на яго паэтычнай пуцявіне. Значны ўплыў на фарміраванне светапогляду будучага паэта мела зблізэнне з Зыгмунтам Чаховічам — былым удзельнікам паўстання 1863 г. Знаёмства адбылося ў 1895 г., калі Луцэвічы арандавалі фальварак Прудзішчы. Маёнтак Чаховіча знаходзіўся побач — у Селішчы. У гаспадара была багатая бібліятэка. Таму нядзіўна, што калі юнака ў 1897 г. пасылаюць у Беларуцкае двухкласнае народнае вучылішча, дык ён заканчвае яго ў адзін год, атрымаўшы адзіны ў сваім жыцці афіцыйны атэстат аб адукацыі.

У 1902 г. здарылася няшчасце — памёр бацька Дамінік Ануфрыевіч — у чужой хаце, так і не прыдбаўшы ўласнага кавалка зямлі Ясь — старэйшы з семярых дзяцей — застаецца за гаспадара. Праз паўгода памірае ад шкарлятыны малодшы брат — Казік, а яшчэ праз тыдзень — сёстры Сабіна і Гэля. Купала перажыў за сваё жыццё шмат глыбокіх і моцных трагічных узрушэнняў, якія адбіліся на яго творчасці. Смерць бацькі, брата і сясцёр скаланула яго да глыбіні душы. Адчуванне абдзеленасці шчасцем-доляю не пакідае Купалу на працягу ўсяго жыцця...

Даводзіцца не толькі працаваць на гаспадарцы, але і шукаць работу на іншых месцах — на пасадзе хатняга настаўніка, пісара ў судовага следчага і інш. Усё гэта садзейнічае ўзбагачэнню жыццёвага вопыту, разнастайнасці ўражанняў і перажыванняў і, вядома, патрабуе нейкага выйсця. К таму часу Ясь ужо пісаў вершы. Вядома, што ў дзень імянін сястры Леакадзіі ён склаў прысвечаны ёй гумарыстычны верш. Гэта было ў Селішчы ў 1902 г. Верш, на жаль, не захаваўся, аднак сам факт сведчыць, што Купала рана адчуў вострую патрэбу ў

тым, каб раскрыць перад людзьмі сваю душу, падзяліцца вопытам перажытага, расказаць пра тое, што яго хвалявала.

Першыя творы былі напісаны па-польску. Беларуская мова на той час усё яшчэ знаходзілася пад забаронаю, і спадзявацца на публікацыю не даводзілася. Акрамя таго, малады паэт быў слаба знаёмы з беларускай літаратурнай традыцыяй. На працягу 1903-1904 гг. у польскім часопісе «Ziarno» ён надрукаваў некалькі вершаў на польскай мове, падпісаных ініцыяламі «I. L.» і псеўданімам «К-а». Польскія вершы Купалы маюць даволі неакрэслены сентыментальна-рамантычны характар і ў многім пазбаўлены той самастойнасці і арыгінальнасці, якія ўласцівы яго творчасці сталай пары. Малады паэт знаходзіўся ўсё ж такі ў беларускім моўным асяроддзі, якое падтрымлівала яго духоўнае існаванне, жывіла тыя псіхічныя параметры, якія фарміруюць асабісты свет чалавека і кіруюць яго свядомымі і падсвядомымі ўчынкамі. Штуршком — каб пісаць па-беларуску — з'явіліся кніжкі выдатных беларускіх паэтаў XIX ст. Ф. Багушэвіча («Дудка беларуская») і В. Дуніна-Марцінкевіча («Гапон»), выдадзеныя за мяжой. Здарылася гэта недзе ў 1904 г. Матчына мова, якая прамаўляла з аркуша белай паперы, зрабіла глыбокае ўражанне, дзякуючы ёй можна было душэўна паразумецца, адчуць цяпло чалавечай дабрыні і спагады. «Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! — пісаў у прадмове да «Дудкі беларускай» Мацей Бурачок. — Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай»... А праз колькі абзацаў далей Бурачок засцерагаў: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі».

Над гэтым варта было задумацца...

## ВЕРШЫ ПРА ДОЛЮ БЕЛАРУСА

Адзін з першых вершаў, напісаных на роднай мове, так «па-багушэвічаўску» і называўся — «Мая доля» (ён якраз адзіны і захаваўся з усяго напісанага ў гэты час). Датуецца 15 ліпеня 1904 г. Купала не ўключыў яго ў першы свой зборнік «Жалейка», аднак верш цікавы як адпраўны пункт працяглай ідэйна-эстэтычнай эвалюцыі паэта:

Мая доля, дык вось доля,
Каб ты лопнула была!
Каб у чыстае дзе поле
Ад мяне ты ўцякла!..

Не даеш ты мне спакою
Ані ўночы, ані ўдзень, —
Усё ходзіш ты за мною,
Як нябожчыка той цень.

Сапраўдная паэзія, як вядома, пачынаецца з біяграфіі, характару, жыццёвага вопыту паэта. «Маёй долі» ўсяго гэтага ў поўнай меры не ставала. «Мая доля» — узор міфатворчага мыслення ранняга Купалы, пераймання ім не толькі паэтычных матываў Ф. Багушэвіча, але і традыцый фальклору, у якім чалавечым паводзінам звычайна надаецца характар усеагульнасці. Гэта і вызначыла кодавую ступень формы твора. Аднак ужо гэты першы верш сведчыў, што драматызм быцця, яго пагрозлівая неўладкаванасць, адчуванне грані, да якой дайшла рэчаіснасць таго часу, з самага пачатку ўваходзяць у плоць і кроў купалаўскай паэзіі.

Такім чынам, аўтар «Маёй долі» пачынае не з прыватнага, а з агульнага, эпахальнага і ў адпаведнасці з ім стварае вобраз свайго лірычнага героя, паказвае абставіны яго жыцця. Разам з тым нельга не адзначыць, што верш «Мая доля» чымсьці блізкі і хрысціянскаму пункту гледжання (Купала быў католікам па веравызнанню), згодна з якім зло, ліхая доля заключаны не ў чалавеку, а ў больш магутных сілах, што знаходзяцца недзе па-за ім, вакол яго, у тым свеце, у якім ён жыве. Як бы там ні было, народны характар верша відавочны. Праз голас з народнага хору ён праўдзіва перадае псіхалагічна-эмацыянальнае самаадчуванне чалавека з народа, яго духоўную прыгнечанасць і зададзеную жыццёвую наканаванасць, своеасаблівы фаталізм. Па сутнасці, паэт паказаў залежнасць асобы ад асяроддзя, характару ад абставін і поўную немагчымасць якоганебудзь выбару. Абставіны жыцця такія, што цалкам падаўляюць усялякую спробу асабістай ініцыятывы.

Усё гэта, аднак, не рабіла паэзію маладога аўтара банальнай — у ёй у сэнсе чалавечага перажывання было шмат новага, свежага, прысутнічала праўда жыцця.

Развіццё літаратуры XX ст. характарызуецца не толькі пашырэннем сацыяльнай праблематыкі, узрастаннем цікавасці да псіхалагічных праблем дыялектыкі душы і паводзін чалавека, але і многімі іншымі складанымі мастацкімі працэсамі, у тым ліку і ўзмацненнем ідэалагічнага пачатку. Адбываецца палітызацыя мастацкай творчасці, яе свядомае збліжэнне з інтарэсамі пэўных класаў і сацыяльных груп. «Новы перыяд у гісторыі беларускай літаратуры, — пісаў М. Багдановіч, — мае зыходным пунктам 1905 год, які зрабіў глыбокі пераварот у псіхіцы народных мас; перад імі паўстаў, высунуўшыся з ценю на святло, цэлы шэраг новых пытанняў, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння... Стварылася гарачае імкненне разабрацца ў падзеях, рассунуць поле свайго зроку, а значыць, стварыўся аграмадны попыт на ідэалагічныя каштоўнасці»[1].

Узнікала пытанне: ці магчымы для чалавека іншыя сацыяльныя і псіхалагічныя нормы і тыпы паводзін, як толькі заставацца рабом сваёй долі? Гэта пытанне знаходзіцца ў цэнтры ўсяго пачатковага этапу творчасці Янкі Купалы. Матыў пошукаў чалавекам самога сябе, сваёй сапраўднай долі праходзіць праз усе першыя кнігі паэта.

Між тым узмежжа XIX-XX стст. — эпоха прадчування вялікіх перамен, сацыяльных зрухаў, час надзей і спадзяванняў. Імкненне маладога Купалы «пісаць па-беларуску» супала з уздымам новай хвалі рэвалюцыйных настрояў, што ў многім былі выкліканы паражэннем у руска-японскай вайне, якая паказала адсталасць Расійскай імперыі і няздатнасць самадзяржаўя кіраваць гэтай вялікай краінай. Існуе нацыянальна-вызваленчы рух і на Беларусі, узнікае палітычная партыя — Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая, дарэчы будзе сказаць, звярнулася да беларускага чалавека ў сваіх адозвах на яго роднай мове. Сярод яе арганізатараў былі вельмі вядомыя потым дзеячы: браты Луцкевічы, А. Бурбіс, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец), В. Іваноўскі, В. Ластоўскі, А. Пашкевіч (Цётка), Ф. Стацкевіч, А. Уласаў, Ф. Умястоўскі (Дзядзька Пранук), А. Смоліч і інш. На гэты актыўны і свядомы нацыянальна-дэмакратычны рух і абапіраўся Купала ў сваіх ідэйных і мастацкіх пошуках. У 1904 г. малады паэт упершыню знаёміцца з рэвалюцыйнымі пракламацыямі на беларускай мове, якія ён атрымліваў (як і нелегальную літаратуру для распаўсюджвання) ад актыўнага ўдзельніка рэвалюцыйнага руху ў

[1] Багдановіч М. Зб. тв. У 2 т. Мн., 1968. Т. 2. С. 121.

Вільні, будучага грамадскага дзеяча паслякастрычніцкай Беларусі Алеся Бурбіса. Знаёмства з ім, думаецца, не магло не паспрыяць паглыбленню народна-дэмакратычных перакананняў Купалы, які на ўздыме рэвалюцыйнай хвалі 1905-1907 гг. адчуў стоеную сілу свайго народа. Вясною 1905 г. ён і сам удзельнічае ў маёўцы рэвалюцыйна настроеных рабочых гуты «Залессе» (цяпер Вілейскі раён), а 15 мая гэтага ж года ў мінскай газеце «Северо-Западный край» публікуе славуты свой верш «Мужык», падпісаны псеўданімам «Янук Купала». Гэта было і першае выступленне ў друку. Газета выходзіла на рускай мове, але купалаўскі верш быў апублікаваны ў арыгінале — ды ён таго і заслугоўваў. Ад «Маёй долі», пра якую ішла гаворка вышэй, яго аддзяляе ўсяго толькі год, але розніца відавочная. У «Мужыку» Купала адыходзіць ад фальклорна-міфалагічнага мыслення і, гаворачы пра рэальнае становішча беларуса, звяртаецца да больш канкрэтна-індывідуалізаваных сродкаў мастацкай тыпізацыі. Гэтаму спрыяла новая канцэпцыя купалаўскага героя, які ўпершыню кідае выклік свайму лёсу.

Што я мужык, усе тут знаюць,
І, як ёсць гэты свет вялік,
З мяне смяюцца, пагарджаюць, —
Бо я мужык, дурны мужык...

Чытаць, пісаць я не умею,
Не ходзіць гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею, —
Бо я мужык, дурны мужык...

І раптам нечаканы паварот: купалаўскі мужык пачынае разважаць аб сваёй чалавечай годнасці:

Але хоць колькі жыць тут буду,
Як будзе век тут мой вялік,
Ніколі, браткі, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык.

І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык:
Што хоць мной кожны пагараджае,
Я буду жыць! — бо я мужык!

Гэта быў верш-учынак. Людзі пачулі ў ім голас беларускага селяніна, таго мужыка, працай якога карыстаўся свет, а сам ён быў загнаны і прыгнечаны. І паэт, і яго герой-мужык адчулі, што свет уступіў у новую паласу гістарычных зрухаў. Настала пара, каб вяр-

нуць мужыку яго чалавечае «я», грамадскую самасвядомасць, родавую пэўнасць і адметнасць. Сучаснікі ўбачылі ў гэтым творы вострую і мастацкі пераканальную крытыку таго спакон вечнага песімізму, якім былі ахутаны лёс і само існаванне беларускага народа. З гонарам сапраўднага дэмакрата Купала сцвярджае павагу да простага чалавека, права змагацца за сваё чалавечае званне. Менавіта такім чынам ён вяртаў беларусу сэнс жыцця, які, па сутнасці, быў для яго страчаны. Купалаўскі мужык становіцца асобай, таму што ўсведамляе не толькі сваю прыналежнасць да пэўнай сацыяльнай групы, але і сваю індывідуальнасць, чалавечыя правы.

У характары верша і ўсім яго кампазіцыйна-стылявым ладзе адчуваліся спакойная ўпэўненасць, эпічная ўгрунтаванасць, тая духоўная нерастрачанасць і моц, што ідуць ад беларускай літаратуры XIX ст. і нават ад больш старажытных эпох і сведчаць аб яго сувязі з глыбокай нацыянальнай традыцыяй.

Якой бы цяжкай ні была доля беларуса, яна дазволіла яму выпрацаваць свой асаблівы менталітэт і захаваць нацыянальную адметнасць, што ён і падкрэсліваў, называючы сябе тутэйшым. Вядома, многае радніла беларускага селяніна з суседзямі, напрыклад з рускім селянінам, над таямніцаю душы якога шмат думаў вядомы знаўца народнага характару Глеб Успенскі. «А таямніца гэта, — пісаў ён у кнізе «Улада зямлі», — сапраўды агромністая і, думаю я, заключаецца ў тым, што велізарнейшая маса рускага народа да таго часу і цярплівая і магутная ў няшчасцях, да таго часу маладая душой, мужнамоцная і па-дзіцячы лагодная — словам, народ, які трымае на сваіх плячах усіх і ўсё, народ, які мы любім, да якога ідзём за збаўленнем душэўных пакут, — да таго часу захоўвае свой магутны і пакорлівы тып, пакуль над ім гаспадарыць улада зямлі, пакуль у саміх каранях яго існавання ляжыць немагчымасць не паслухацца яе загадаў, пакуль яна ўладарыць над яго розумам, сумленнем, пакуль яны напаўняюць усё яго існаванне... Адарвіце селяніна ад зямлі, ад тых клопатаў, якія яна накладвае на яго, ад тых інтарэсаў, якімі яна хвалюе селяніна, — дамажыцеся, каб ён забыў «сялянства», — і няма гэтага народа, няма народнага светасузірання: няма цяпла, якое ідзе ад яго. Застаецца адзін пусты апарат пустога чалавечага арганізма»[1].

Усё гэта з поўным правам можна было сказаць і пра беларускага мужыка. Аднак рускі мужык і беларускі пры ўсёй супольнасці іх сацыяльнага і эканамічнага становішча мелі даволі істотныя гісторыка-тыпалагічныя адрозненні. Руская вёска жыла пераважна

---

[1] Успенский Г. Власть земли. М., 1985. С. 136.

абшчынаю. Іншая справа — беларуская. «Абшчыны як пэўнай формы землекарыстання на Беларусі, — піша А. Цвікевіч у сваёй працы «Западно-русізм», — ніколі не было; тут спрадвеку былі развіты індывідуальныя, падворныя формы сялянскага землекарыстання, так што не было жаднай прычыны распаўсюджваць на Беларусь гэтую спецыфічна велікарускую адзнаку. Не было дзеля гэтага рацыі бачыць у беларускім жыцці тыя сацыяльныя ды палітычныя элементы, якія славянфільства, а з ім і «Западно-русизм» выводзілі з «общинного порядка» Расіі так званую «ўладу зямлі», сувязь народа з уладай і тую «ўнутраную праўду» Расійскай дзяржавы, якую шукалі славянафілы. Індыкі дуальна-парламентарны лад Беларусі эпохі Літоўскага статуту з дамешкай феадальна-арыстакратычных элементаў пазнейшага беларуска-польскага перыяду рэзка адрознівалі Беларусь ад Расіі на працягу вякоў»[1].

«Абшчынная» структура рускай вёскі аб'ектыўна была скіравана супраць любога праяўлення свабоды волі. Фактычна яна ўмацоўвала «роевую свядомасць», калі чалавек страчвае здольнасці да самастойнага дзеяння, губляе сваю індывідуальную непаўторнасць, пераўтвараецца ў функцыю. У беларускай вёсцы не было сляпога падпарадкавання асобы групе, супольнасці. Купала гэта ведаў і таму стаяў не за «саборнасць» і калектывізм, а за індывідуальную адказнасць уласніка, якую падказваў яму вопыт беларускага сялянства. У перыяд першай рускай рэвалюцыі палітыкі-сацыялісты з БСГ абмяркоўвалі ідэю калектывізацыі зямлі, імкнучыся надаць ёй статус праграмнага палажэння. Купала не падзяляў гэтай думкі пра неабходнасць абагульнення зямлі і правядзення калектывізацыі сельскіх гаспадарак. Ён гранічна ясна і прадметна сфармуляваў патрабаванні бяднейшага сялянства. Палітычная эканомія пры гэтым, не страціўшы сваёй канцэптуальнасці, стала пад яго пяром эканоміяй паэтычнай.

Ад свету, ад Бога
Жадаю нямнога:

Зямелькі з валоку,
К ёй шнур неўдалёку,
З святлічкай хацінку
За жонку дзяўчынку,
Кусок салца к хлебу,
Рубля на патрэбу,
Здароўя чым болей,

[1] Спадчына. 1992. № 2. С. 44.

Крыху долі, волі —

І ўсё! больш нічога...
Ну, ці ж гэта многа?

*(«Ці ж гэта многа?!»)*

Гэта не наіўны русаізм[1], а імкненне дасягнуць гармоніі на шляхах развіцця чалавечай і грамадскай культуры. Свабода і незалежнасць, на думку паэта, з'яўляюцца асноўнымі перадумовамі шчасця чалавечай асобы, у якой ён бачыў стымул і самамэту грамадскага развіцця.

Нацыянальнае адраджэнне Беларусі на ўсіх узроўнях — асобасным, грамадска-сацыяльным, дзяржаўнапалітычным — стала рухаючым імпульсам творчасці Купалы. Ужо самымі першымі сваімі творамі ён арганічна ўваходзіў у рэчышча нацыянальнай літаратурнай традыцыі, якая існавала, нягледзячы на пастаянны іншамоўны ўціск на працягу XVII-XIX стст., што істотна замаруджвала яе развіццё. Зрэшты, геній ніколі не бывае самотным дрэвам, якое расце ў пустцы. Сярод беларускіх пісьменнікаў XIX ст. Купала меў сваіх непасрэдных папярэднікаў: быў знаёмы не толькі з кнігамі В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча, але і з творчасцю Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, К. Каліноўскага, Я. Лучыны і інш., а таксама з паэмамі невядомых аўтараў «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Ён выступіў як пераемнік іх асветніцкіх і рамантычных шуканняў, які імкнуўся прышчапіць свайму народу паняцці нацыі і свабоды.

Выразна выяўлены беларускі нацыянальны характар мела, напрыклад, творчасць У. Сыракомлі, нягледзячы на тое што ён, як і многія яго калегі, пісаў пераважна па-польску.

У творах «лірніка вясковага» яскрава паказана трагедыя беларуса — чалавека прыгнечанага, цёмнага і забітага. Гэта ад яго імені ідзе гаворка ў вершы У. Сыракомлі з красамоўнай назвай «Непісьменны» (1852):

Я не зайздрошчу, крый мяне, Божа,
Нікому ў свеце, ніякай сіле;
Адно зайздросна мне толькі, можа,
Што вас, панове, пісаць навучылі.
Пяро мне дайце і аркуш белы,
Навучыце, як мне вадзіць ім трэба, —
Пяро мятала б маё, зіхцела,
Як бліскавіца па хмарах неба!
І боль, і ўцеху, што браў аберуч,

---

[1] Тлумачэнні некаторых складаных паняццяў і іменаў змешчаны ў канцы кнігі.

Што сам адчуў я ці ўбачыў зблізку, —
Усё паклаў бы я на паперу,
За думкай думку, за рыскай рыску...
Гусачка, гуска! Пас цябе летам,
Зімой халоднай карміў сумленна,
Дай мне пяро і крыло за гэта,
От і ўзлячу — чалавек непісьменны.

*(Пераклаў М. Лужанін)*

У гэтых радках генетычна, можна сказаць, запраграміраваны Янка Купала. Можна толькі здзіўляцца, наколькі пранікліва і дакладна У. Сыракомля прадбачыў мастацка-тыпалагічныя параметры будучай зоркі, што неўзабаве павінна была ўзысці на паэтычным небасхіле беларускай літаратуры. Нездарма Купала так моцна любіў Сыракомлю, аў1912г. у сувязі з 50-годдзем з дня яго смерці наведаў хутар Барэйкаўшчыну, дзе жыў гэты выдатны паэт. Творчасць папярэднікаў уражвала сваім крытычным духам і засяроджанасцю на сацыяльнай сутнасці чалавека; Купала засвоіў гэтыя іх урокі і намагаўся пайсці далей, пераадолець залішні бытавізм беларускай літаратуры XIX ст., заглянуць за гарызонт будзённага жыцця, узвысіць духоўны пачатак у чалавечай асобе. У яго як у мастака ў параўнанні з імі больш актыўныя адносіны да рэчаіснасці, да яе эстэтычнага адлюстравання і выяўлення. Творчасць Купалы сведчыла, што на змену пакутніку і плакальшчыку ў беларускую літаратуру прыходзіць новы, адраджэнскі тып чалавека, які пачынае разумець сваю вартасць і маральную сілу. Гэты чалавек становіцца пратаганістам купалаўскай творчасці, вызначае яе ідэйны змест і мастацка-эстэтычныя рысы.

Поспех «Мужыка» ўзбадзёрыў і акрыліў паэта, ён піша вершы, паэмы, перакладае, але працуе, як цяпер бы сказалі, «у стол»: друкаваць не было дзе... Між тым жыццёвая адысея паэта працягваецца. Восенню 1905 г. ён паступае практыкантам на бровар Сёмкава Мінскага павета (16 км ад Мінска), дзе, аднак фактычна працуе чорнарабочым. Затым была праца памочніка вінакура ў Яхімаўшчыне Вілейскага павета і ў маёнтку Дольны Сноў Навагрудскага павета. Гэта былі своеасаблівыя універсітэты жыцця. Ён на ўласныя вочы бачыў, што ўсюды пераважае патагонная сістэма працы, што людзі цяжка працуюць доўгія гадзіны, харчуюцца вельмі дрэнна, умовы жыцця невыносныя.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 гг. абуджаюць у беларускім народзе нацыянальную свядомасць, прымушаюць царызм дазволіць беларускі друк. У Пецярбургу ў 1906 г. ствараецца выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца», на чале якога стаяў Брані-

слаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла — вучоны-філолаг, прафесар Пецярбургскага універсітэта, відны дзеяч беларускага Адраджэння, сябар Францішка Багушэвіча. Гэта было першае ў гісторыі беларускай культуры пасля шматвяковага перапынку — пасля Францыска Скарыны і Пятра Мсціслаўца — выдавецтва, якое легальна пачало друкаваць кнігі на беларускай мове.

У маі 1906 г. Купала шле яму вершаванае прывітанне «Беларускай выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца», а ў верасні вітае выхад беларускай газеты «Наша доля» вершам «Нашай долі». З лістапада гэтага ж года ў Вільні пачынае выдавацца штотыднёвая газета «Наша ніва», якая на працягу свайго існавання адыграла выключна вялікую ролю ў грамадскім жыцці беларускага народа і яго нацыянальным развіцці і аказала значны ўплыў на асабісты лёс Купалы і яго творчасць. У «Нашай ніве» 11 мая 1907 г. ён надрукаваў верш «Касцу», які стаў першым выступленнем паэта ў беларускім друку. У ім паэт працягвае беларускую тэму, распачатую ў папярэдніх творах «Мая доля», «Мужык» і інш. Гаворка ідзе пра тое, каб разняволіць селяніна, абудзіць у ім творчы дух і здольнасць пастаяць за свае чалавечыя інтарэсы.

Верш «Касцу» цікавы двухпланавасцю свайго зместу. Як бы між іншым аўтар напамінае свайму герою, што каса, вілы, цэп з'яўляліся не толькі спрадвечнымі працоўнымі прыладамі беларускага селяніна — нярэдка яны былі і яго зброяй:

Быў даўней народ хітрай,
Не знаў стрэльбаў, дык аей!
Коскі шаблямі былі,
Ваяваць з імі ішлі.
Гоп, гоп, гоп!
Ваяваць ішлі.

Гістарычныя абставіны лёсу беларускага народа не спрыялі развіццю лібералізму, як гэта было ў іншых краях. Ідэю духоўнага абуджэння і разняволення чалавека Купала разглядае не ў абстрактна-эвалюцыйным плане, а звязвае яе з неабходнасцю змен у яго сацыяльна-гістарычным быцці.

«Наша ніва» ўсур'ёз зацікавілася маладым паэтам, і з ліпеня па верасень таго ж 1907 г. на яе старонках, услед за вершам «Касцу», з'яўляюцца новыя творы: «Лета», «Ці ж гэта многа?!», «Непагодна», «Вучыся...», «Былі ў бацькі тры сыны...» і інш. Па часе, адказваючы на пытанне аб вытоках сваёй творчасці, Купала пісаў: «Якімі былі паэтычныя штуршкі? Усё, што акаляла: і сацыяльная, і нацыянальная крыўда, і беларуская прырода, і песні, пачутыя на полі, на вяселлі, на

вечарынцы». І сапраўды, вершы сведчаць, што паэт добра ведае патрэбы і спадзяванні селяніна, умее маляваць вясковы побыт, працоўнае жыццё земляроба. Паэзія Купалы адкрывае беларусу яго прыроднае ўлонне, гісторыю, лёс. Тое, што каму-небудзь іншаму па даўняй звычцы здавалася бедным і сціплым і не вартым нават увагі, у паэта выклікае глыбокае душэўнае ўзрушэнне:

Эх ты, лета гарачае, бурнае!
Ажыўляеш ты поле і луг,
Люба, думкі пакінуўшы хмурныя,
На свет выйсці ды глянуць вакруг.

Шум стаіць над лясістай дуброваю,
Быццам рада аб нечым ідзе;
Рэчка, у прысадзь схаваўшысь альховую,
Бурліць; рыбка плюскоча ў вадзе.

Ў збожжа ўсякае ніва прыбралася —
Хараства там якога няма! —
Як зялёны дыван, распласталася;
Шопат нейкі плыве ад жытца.

У «Леце» знаходзім відавочныя прыкметы такой з'явы, як «рамантызацыя свету» (Наваліс). Паэт увесь аддаецца пачуццю прыроднага хараства, адчуванню тых жыватворных сіл, якія свабодна пульсуюць на ўлонні прыроды і здольны адарыць сваёй энергіяй спакутаванага чалавека:

Дай жа, лета, мне веру магучую,
Што калісь сваю долю знайду,
Дай мне песні пець сілу жывучую,
Дай працівіцца крыўдзе і злу!

У паэзіі Купалы фарміруюцца эмацыянальна-вобразныя структуры, у якіх адлюстроўваўся нацыянальнапсіхалагічны архетып* судакранання чалавека і прыроды. Ён успрымае прыроду не толькі з духоўна-эстэтычнага боку, але і з пункту гледжання той ролі, якую яна адыгрывае ў жыцці селяніна. Гэта добра відаць у вершы «Хлеб» (1906):

Мы і з сошкай ішлі, і з варонкай ішлі
Заслужыцца на ласку ў цябе,
І гной везлі, траслі на пусцейшай раллі —
Сеяць шлі аж па трэцяй арбе.

І свянцілі цябе, ідучы засяваць,

Выбіралі к сяўбе лепшы дзень,
А на лета цябе ўсёй сям'ёй шлі збіраць,
Сцераглі, хмары ўбачыўшы цень.

Канкрэтнае апісанне сельскагаспадарчай працы і клопатаў вясковых людзей надзвычай дынамічнае, рухомае:

У калядны ж мароз, як шум дзікай зімы,
Слоў праклясце і нам, і жыццю,
Шлі, не гледзя на ўсё, на ток досвіткам мы,
Шлі з цапамі па плату сваю.

І ўсё шчыра табе паслугоўвалі так,
Каб на воку нас, бедных, ты меў...
А ты што нам зрабіў, адплаціўся ты як?
Ці ты нас хаця чуць пажалеў?

У гэтым вершы Купала выяўляе дысгармонію жыцця, якая, аказваецца, ахапіла не толькі сацыяльны бок чалавечага існавання, але і ўсе сферы зямнога быцця. Кола спасціжэння навакольнага свету становіцца ўсё шырэй. Паэт пераконваецца, што ўзаемадзеянне чалавека і асяроддзя, у якім ён існуе, мае складаны, востраканфліктны характар. Справа, як бачым, не толькі ў сацыяльных нягодах і бяспраўі — нават у самой прыродзе маюцца нейкія брутальныя сілы, жорсткія і бязлітасныя, якія спараджаюць зло. Зло з'яўляецца неад'емнай уласцівасцю жыцця, якое ўтрымлівае ў сабе разбуральны пачатак, скіраваны супраць чалавека, — ён адчувае хісткасць свайго існавання, няўпэўненасць і вечную для сябе пагрозу...

## РАННІЯ ПАЭМЫ

У пачатковы, «жалейкаўскі», перыяд малады Купала актыўна звяртаецца як да вершаў, так і да жанру паэмы. 1 лютага 1906 г. завершана паэма «Зімою», а праз некалькі месяцаў другая — «Нікому». У наступным, 1907 г., напісана яшчэ адна — «Адплата кахання» (увайшла ў зборнік «Жалейка»), На працягу гэтага года створана таксама паэма «Калека». З'яўляюцца яны адна за другой, без доўгага перапынку. 18 снежня 1908 г. у «Нашай ніве» надрукавана паэма «У Піліпаўку». У снежні гэтага ж года скончана праца над паэмай «За што?» Раннія паэмы, па сутнасці, абойдзены ў купалазнаўстве, а між тым усе яны па-свойму цікавыя. Па форме яны вельмі нагадваюць характэрныя для нацыянальнай фальклорна-літаратурнай традыцыі вершаваныя апавяданні, якія грунтуюцца на «праўдзівых здарэннях» з народнага жыцця. Потым і сам аўтар, перавыдаючы іх у 20-я гады, пазначыць гэтыя творы як «апавяданні вершам». Матэрыялам для іх паслужылі рэальныя здарэнні, пра якія паэт мог даведацца з судовых спраў падчас службы пісарам судовага следчага ў Радашковічах (1903), а таксама з навакольнага жыцця. У іх сюжэтах і дэталях адлюстроўваюцца канкрэтныя грані чалавечых характараў. Гэтым паэтыка ранніх паэм блізкая да паэтыкі Якуба Коласа: і там, і тут устаноўка на факт, падрабязнасць, апісанне. Але ў Купалы нават у ранніх яго рэчах угадваецца востры разлад з рэчаіснасцю, драматызм, арыентацыя на рамантычны падыход да адлюстравання рэчаіснасці.

В. Каваленка, гаворачы пра раннія паэмы Купалы, пранікліва адзначае, што «ёсць адна асаблівасць, якая аб'ядноўвае большасць з іх, — прысутнасць вобраза мясцовай дзяўчыны, маладой жанчыны, у якім угадваюцца абагульненне стану народнага ці нацыянальнага духу, уласцівага ў пэўны гістарычны перыяд шырокай масе людзей на роднай зямлі, прыкметы іх усеагульнага лёсу, іх сучасныя і будучыя магчымасці высокага чалавечага самасцвярджэння... Вобразы жанчын у паэмах Янкі Купалы не проста прывабныя, яны захапляюць не толькі тым, што цнатлівыя, шчырыя, верныя свайму пачуццю, адданыя праўдзе і справядлівасці, хоць асабісты лёс іх бывае трагічным. У іх унутраным абліччы закладзены маральна-духоўны пачатак шырокай, агульнанароднай перспектывы»[1].

Сурова, бязлітасна паставілася доля да «прастачкі» Ганны — гераіні паэмы «Зімою». Гаротныя бацькі дзеля кавалка хлеба вымушаны

[1] Каваленка В. Эпічная сіла паэтычнага слова // Янка Купала. Паэмы. Драматычныя творы. Мн., 1989. С. 484.

паслаць яе «ў двор на службу», але надта ж несалодкім выдалася жыццё семнаццацігадовай прыгажуні сярод чужых людзей, хоць на першых парах шчасце быццам бы і ўсміхнулася ёй. Ганна сустрэла такога ж, як і сама, «беднага дзецюка» Цімоха. Маладыя пабраліся, але Цімоха забралі ў салдаты, а ў Ганны нарадзілася дзіця. З дзіцем яе не сталі трымаць на службе і тут жа разлічылі. Ганна вымушана ісці дадому, хоць там яе таксама не вельмі чакаюць: «ужо з дзіцем ты лішняя ў хаце». Далей мы застаём Ганну ў дарозе, калі яна ў зімовую замець з малым на руках ідзе праз снежнае поле. Душа паэта прасякнута глыбокім жалем і спачуваннем да такіх, як Ганна:

Дайце мне лета, каб роднай зямлёю
Бура не трэсла, не біла людзей,
Дайце мне хатку, хатку прыгодную,
Вечная радасць жыла каб у ей!

Ганніна гісторыя скончылася трагічна. Разам з дзіцем на руках замярзае яна ў глыбокіх снежных сумётах пад свіст сцюдзёнага зімняга ветру.

Гэта змрочная, але зусім рэальная карціна, як ні дзіўна, набывае ў паэме прывідны вобраз агульнанароднага быцця:

Сцелецца ноч тут ценьмі магільнымі,
Гіне з няшчасця малы і стары,
Слабыя гінуць, крыўджаны сільнымі,
Стогнуць, гаруюць з зары да зары.

Другая трагічная гісторыя — паэма «Нікому» — мае падзагаловак «З часоў прыгону». Распуснік-пан пасылае сваіх служак у вёску, дзе якраз адбывалася вяселле Тамаша і Алены, каб яны прывялі маладую да яго ў панскія пакоі. Усе зразумелі, на якія «гулі» кліча пан. Узбантаваны Тамаш у беспрытомнасці вырашае: «Няхай жа не будзе ні пану, ні мне!»:

І сякерай гахнуў,
Як вокам міргнуць,
Па абух ўпілася
Ў Аленіну грудзь.

Рухнула Алена
На дол без жыцця
Крывёй цёплай, свежай
Залітая ўся.

Незадаволенасць і пратэст працоўнага люду выяўляюць сябе стыхійна. Учынак Тамаша знаходзіцца, думаецца, у межах неператасэнсаванага старажытнага архетыпу чалавечых паводзін у падобных

абставінах і сведчыць не толькі аб невысокім узроўні свядомасці народнай масы, але і аб прыхаванай у яе глыбінях здольнасці на бунт.

Галоўных герояў ранніх паэм умоўна можна раздзяліць на дзве групы: адна — гэта слабыя, пакорлівыя сіле абставін людзі і другая — характары больш моцныя, бескампрамісныя, здольныя на пратэст, на супраціўленне.

Тамаша пасля яго бунту закавалі ў кайданы і адправілі ў Сібір, пан павесіўся. Праўда, не столькі з-за пачуцця віны, колькі ад таго, што «мінуўся прыгон».

У ранніх паэмах Купалу — як гэта ўласціва рамантыкам — цікавяць пытанні чалавечага лёсу. Ён гатовы прыйсці да высновы, што светам кіруе нейкая злая воля. Героі гэтых твораў у большасці сваёй выступаюць як ахвяры «сусветнага зла». Звычайны чалавек, апынуўшыся ў арбіце «сусветнага зла», падпарадкоўваецца антыгуманным законам асяроддзя, грамадства, самой прыроды, спалучаецца з варожым для яго светам, страчвае «натуральнасць», набывае якасці, якія робяць яго часцінкай, механізмам «сусветнага зла».

Нелітасціва абыходзіцца лёс з Зосяй і Янкам (паэма «Адплата кахання»). Зося — шляхцянка, Янка — мужыцкі сын. Людзі гордыя, незалежныя, яны, аднак, хочуць самі быць гаспадарамі свайго лёсу і кідаюць яму выклік. «Зло» — у абліччы бацькі Зосі — пераступае ім дарогу. Каб не дапусціць няроўнага шлюбу, бацька Зосі, багаты шляхціц Лаўчынскі[1] забівае Янку сякерай, калі той спіць у пуні, і падпальвае яе. Гіне Янка, і, не перанёсшы яго смерці, канчае самагубствам Зося:

Нябожчыкаў неслі хаваць неяк зрана,
Пад вечар жа везлі ў вар'яцкі дом пана.

Рамантычны парыў і высакародныя мары касуюцца і разбіваюцца аб сцяну несправядлівасці. Аўтар паказвае маральную дэградацыю пануючых слаёў грамадства, праз якія і дзейнічае «сусветнае зло». Ён бачыць, «што вёска... заліта людскімі слязамі»:

Занадта сляпы люд, занадта баіцца,
Каб мог ён за крыўду сваю заступіцца.
Праз тое і вёску так хваляць паэты,
Найболей такія, што, з'еўшы катлетаў,
Віном якім смачным катлет той закусяць;
О, гэткія, пэўна, аб шчасці пець мусяць!

*(«Адплата кахання»)*

---

[1] На Лагойшчыне, адкуль паходзіць сюжэт паэмы, распаўсюджана прозвішча Аблачынскія. Лаўчынскі — ці не вытворнае ад яго? Як бачым, нават у дробязях паэт не адступае ад жыццёвай праўды.

Героі ранніх паэм адчуваюць сябе вельмі самотна, няўтульна і безабаронна. Усё адступіла ад іх — людзі, суседзі-аднавяскоўцы, бацькі, нават сама навакольная прырода. Сувязь чалавека і прыроды інтэрпрэтуецца тут у духу старажытнага антрапамарфізму. У ранніх паэмах Купалы яна выглядае таямніча і пагрозліва, як і сацыяльны свет грамадства. Усё гэта сведчыць аб тым, што паэт адчуваў падспудную сувязь чалавека з глыбінным трагізмам быцця, як, напрыклад, у паэме «Калека». Герой паэмы вяртаецца з вайны калекам — з адной рукой, але з узнагародай — крыжам на грудзях. Аднак свет застаецца раўнадушны да яго заслуг і не забяспечвае Куксу (так звалі гэтага чалавека) спакойнай старасці, на якую ён меў права. На службе ў пана ў выніку няшчаснага выпадку, ён страчвае нагу, становіцца жабраком і ўрэшце замярзае ля прыдарожнага крыжа.

Глыбокім трагізмам адзначана падзейная канва паэмы «У Пілі-паўку». Селянін накіроўваецца ў далёкую дарогу па лякарства для свайго адзінага сына, які захварэў, і замярзае ў зімовым полі пад суцяшальныя песні мяцеліцы. Удава хавае адначасова і сына, і мужа:

Сходзіўся ўдоўку пацешыць народ,
Братнім слаўцом адзываўся:
«Маеш адзін хоць расход і заход,
Крыжам адным абышлася!»

Сурова абышоўся лёс — у асобе пана — і з сям'ёй Юркі Дзягеля, сагнаўшы арандатара з апрацаванай ім зямлі і пусціўшы з жабрачымі торбамі па свеце (паэма «За што?»). Паэма «За што?», апрача ўсяго, — яшчэ і водгук сямейнай драмы паэта, якую ён праз колькі год шырока разгорне ў п'есе «Раскіданае гняздо». Выходзіць, што зло — спрадвечная ўласцівасць жыцця, якая пастаянна нагадвае аб сабе. Узнікае пытанне, ці варта ўвогуле жыць у гэтым жорсткім, адчужаным свеце. Напрамую, непасрэдна аўтар яго не ставіць, аднак яно адчуваецца ў глыбіні, у змрочным рамантычным падтэксце. Трэба сказаць, што ў ранніх паэмах выразна выявіўся рамантычны характар Купалавай творчасці. Узаемаадносіны чалавека і яго «долі», падпарадкаванне ці непадпарадкаванне ёй, усведамленне магчымасцей і межаў чалавечага «я» — усё, што якраз і займае Купалу як мастака і своеасаблівага філосафа і складае прадмет яго паэтычнага роздуму, разглядаецца ў святле рамантычнай праблематыкі. Паэт бачыць няўстойлівасць свету і трагічную алагічнасць быцця. Бяспраўнасць, адсутнасць свабоды, стан прыгнечанасці ўзмацняюць чалавечыя страсці і імкненні, робяць іх некіруемымі. Грамадскае зло выступае тут не як выключэнне ці адхіленне ад нормы, а як унутраная якасць той несправядлівай жыццебудовы, з якой маюць справу гэтыя людзі

— героі паэм. Гэта людзі працы, сацыяльныя нізы грамадства, якія яшчэ не ўсвядомілі свайго бяспраўнага становішча і знаходзяцца ў стане ідэалагічнай і арганізацыйнай бездапаможнасці.

Што ж рабіць? Ці можна адолець зло, якое мае шматаблічны, фатальны характар?

Людзі, у прыватнасці тыя, хто ўмеў чытаць, чакалі ад сваіх паэтаў (якім даводзілася адначасова быць мысліцелямі і філосафамі) адказу на пытанне, дзе і як знайсці выйсце з гэтага агульнага нярадаснага становішча. Купала імкнецца зразумець прычынна-выніковы механізм таго становішча, у якім апынуўся яго герой, пакугуе над пытаннем, як можна выблытацца з гэтага клубка супярэчнасцей, шукае сілы, здольныя перайначыць гэты несправядлівы свет. Паводле свайго светапогляду, ён, як і многія іншыя беларускія пісьменнікі таго часу, быў пераважным чынам асветнікам, які імкнуўся далучыць свой народ да культуры і цывілізацыі. Дапамагчы, на думку асветнікаў, павінна навука, якая валодае вялікімі магчымасцямі асветніцка-разумовага пазнання навакольнай рэчаіснасці:

Пакіньма напуста на лёс свой наракаць,
Скрозь слёзы скаргі сеяць па зямлі, —
Нам трэба жыць і долю папраўляць,
Каб нас патомкі з часам не клялі.

Блудныя сцежкі цёмнага жыцця
Навукі сонцам мусім рассвятліць,
Каб мы і наша ў прышласці дзіця,
Не блудзячы, маглі свой век дажыць.

*(«Пакіньма напуста на лёс свой наракаць...»)*

Вядома, прыкрым нечаканасцям і злу, стоеным у самой прыродзе і навакольным асяроддзі, сярод якіх існуе чалавек, можна супрацьпаставіць навуку, асвету, вопыт, але як быць з сацыяльным злом, з жахлівай несправядлівасцю маральна-прававой практыкі грамадства? Купала быў непрымірымы да непрасветленага ў чалавеку, да неабуджанасці ў ім чалавечых якасцей, да таго пракаветнага цярпення, якое праяўляў беларус у адносінах да свайго становішча. Паэт хацеў, каб беларус нарэшце ўсвядоміў свае беды і тое, як іх пазбыцца. У вершах «Пакіньма напуста на лёс свой наракаць...», «Вучыся...» ён выступае супраць русаісцкай ідэалізацыі дабрачыннасці так званага натуральнага чалавека, лічыць, што чалавек мае патрэбу ў асвеце і гуманізацыі:

Ўсе людзі значэнне пазналі вучэння,
Адзін толькі ты ані дбаеш!

Цямней, беларусе, ад ночкі асенняй,
І шчасце ж такое ты маеш...

*(«Вучыся...»)*

Лірыка і паэмы Купалы 1905-1907 гг. выявілі спакутаваную душу беззямельнага селяніна, яго барацьбу за сваё існаванне і бясконцую павагу паэта да людзей працы. Побач з узмацненнем сацыяльна-палітычных і асветніцкіх матываў яго паэзіі развіваецца нацыянальнадухоўная праблематыка. Адбітак духоўнай самабытнасці паэт шукае ў яго песнях («Родныя песні», 1906), у прыгажосці і неўміручасці роднай мовы («Роднае слова», 1908), у гістарычным мінулым сваёй радзімы («Над сваёй Айчыннай...», 1908). Сустракаючыся з беларускім ладам на шматстайных пуцявінах свайго лёсу, Купала ўсё больш пераконваўся, што карэнні нацыянальнага жыцця не ўсохлі, што яны жывыя, і ў яго ўзнікае запаветнае жаданне:

Дык жа знайце, чаго б я хацеў,
Аб чым думачкі толькі мае:
Каб мой люд маю песню запеў
І пазнаў, аб чым песня пяе!

*(«Чаго б я хацеў»)*

## «ЖАЛЕЙКА»

У лістападзе 1906 г. Купала падрыхтаваў да друку першы свой зборнік «Жалейка». Гісторыя літаратуры сведчыць, што вершы сапраўднага паэта нашмат выйграюць, калі іх збіраюць разам. Гэту ісціну пацвердзіла і «Жалейка», з'явіўшыся на свет у 1908 г. у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца». Кнігу прыхільна сустрэлі грамадскасць і літаратурная крытыка, на якіх яна зрабіла вялікае ўражанне.

«На вуліцы маладой Беларусі вялікае свята! — пісаў У. Самойла. — Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў акно цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа... Беларуская песня з галіны этнаграфіі пераходзіць у галіну літаратуры[1]. У. Самойла глыбока адчуў наватарскія намеры паэта і яго вялікія мастацкія магчымасці. З яго водзыву вынікала, што купалаўская «Жалейка» стала, па сутнасці, паэтычным адкрыццём Беларусі — пераважна Беларусі сялянскай. З думкай крытыка нельга было не пагадзіцца: тут усё — праца земляроба, з'явы прыроды, стыхіі, побыт чалавека і яго пачуцці — жыло сваім жыццём, і гэта надавала непаўторную свежасць лірыка-псіхалагічным вобразам кнігі:

Невясёлая старонка
   Наша Беларусь:
Людзі — Янка да Сымонка,
   Птушкі — дрозд ды гусь.

Поле — горы ды каменне,
   Потам зліта ўсё,
Сенажаць — адно карэнне,
   Сівец ды куп'ё.

*(З песень аб сваёй старонцы»)*

«Жалейка» населена беларускімі тыпамі. Гэта мужыкземляроб (у розных іпастасях), пан (ці «панічок», як называе яго паэт) — уладальнік маёнтка, шматлікія падпанкі, жнеі, рахмеснікі, «бабулька — прадаўшчыца зёлак», старцы, «Сорка, што соль прадае»...

Вось яны — жнеі:

Пагнуўшы ў крук худыя спіны,
Сярпом махаючы крывым,
Мы, жонкі, ўдовы і дзяўчыны,
Пры доўгай постаці стаім
   І дружна жнём,

[1] Наша ніва. 1908. 15 жн.

І паддаём
Адна адной
Ахвоты больш,
І песню жаласна пяём.

*(«Песня жней»)*

Янка Купала добра ведаў беларускую вёску XIX ст., добра бачыў, што з прыходам новага стагоддзя ў ёй нічога не памянялася:

Асобна кожную загонам
Нас надзяліў пан-дабрадзей,
А над усімі злы аконам
Стаіць, ганяе жаць бардзей.

*(«Песня жней»)*

Рытмічнае поўнагалоссе верша даносіць да чытача не проста дынаміку жніва, але, я б сказаў, і працоўную злосць жней, апантанасць працай, напал іх пачуццяў і іронію аўтара, які і тут непахісна стаіць на варце справядлівасці, на баку «бедных і загнаных».

У «Жалейцы» мастацка-паэтычнай увагай і прызнаннем песняра адзначаны самыя звычайныя прадметы сялянскай працы і побыту: саха, каса, тапор, лапці, хатка, дрэвы — вольха, ліпа, бяроза... Але гэта толькі ідэі рэчаў і прадметаў, ідэальныя, так сказаць, рэчы, а не рэалістычныя. Яны ўвасабляюць яго жыццёвую долю, аднак у гэтых дэталях раскрываюцца і замацоўваюцца не столькі рэальна-побытавыя падрабязнасці сялянскага жыцця ў натуральнасці іх зместу (як гэта было ў творах беларускай літаратуры да Янкі Купалы), колькі вобразныя згусткі паэтычных эмоцый аўтара:

Друг мой неадчэпны,
Саха ты крывая,
Хоць корміш свет цэлы,
Сама ж век худая.

Вяровак, жалеза,
А дрэва найболей
Пайшло, каб пажытак
З цябе быў у полі.

*(«Саха»)*

Паэт «эмацыяналізуе» дэталі, адухаўляе іх; страчваючы свой жывапісна-пластычны характар, яны набываюць павышаны пачуццёвы статус як увасабленне сувязі з лёсам лірычнага героя. «Жалейка» пацвердзіла, што прырода мастацкага метаду Купалы рамантычная, аднак дэталі і абставіны жыцця тут нярэдка яшчэ ўзвышаюцца над асобай лірычнага героя. Праўда, рэальнасць навакольнага існавання ў

«Жалейцы» яшчэ не поўнасцю падпарадкавана ідэальнаму суб'ектыўнаму свету, у якім жыве лірычны герой паэта-рамантыка. Так будзе далей, у «Гусляры», калі канкрэтыка адсунецца на задні план, а на першым плане акажацца самацэннае быццё асобы. Аднак ўжо і ў «Жалейцы» спакваля пачынае сцвярджацца прынцып двайнога ўспрымання рэчаіснасці: з аднаго боку, рэалістычна-дакладнае, прадметнае ўзнаўленне жыцця, з другога — асэнсаванне яго ў рамантычна-абагульненых вобразах-сімвалах.

Істоту паэта адольвалі ўнутраныя супярэчнасці. У аўтабіяграфіі, напісанай для акадэміка Я. Карскага, Купала засведчыць: «Моладасць мая прайшла страшэнна пагана. Чытанне кніжак без разбору, — а чытаў я іх вельмі шмат, — разбудзіла маю фантазію. І вось у душы маёй быў вечны нейкі пякельны разлад. Ніяк не мог я пагадзіць акружаючага рэальнага жыцця з жыццём думак, фантазіі, якія пачарпнуў з кнігі»[1]. У адным з вершаў «Жалейкі» знаходзім такое даверлівае прызнанне:

Я не сокал зоркавокі,
Не арол адважны,
Што так думна за аблокі
Ўзносіцца з іх кажны.

Нават я не салавейка,
Што пяе так слаўна,
А я толькі верабейка,
Ўзрошчаны пад Гайнай.

Як ён, край шаную родны,
Не ляту ў чужыя,
І з зімой б'юся халоднай,
Хоць-та сэрца ные.

*(«Я не сокал...»)*

А праз колькі старонак — другі верш, другое «я», якое сведчыць, што паэт пашырае думкі і адчуванні свайго героя ні больш ні менш як да сусветных маштабаў. Пра гармонію з існуючай рэчаіснасцю не магло быць і гаворкі. Для Купалавай рамантычнай ідэі свабоды яна не падыходзіла. Заставалася адно: мастацкім шляхам стварыць такую эстэтычную сапраўднасць, якая б адпавядала рамантычным уяўленням паэта:

Я — багач, я — магнат! —

[1] Клейнборт Л. М. Молодая Белоруссия: Очерк современной белорусской литературы 1905-1928. Мн., 1928. С. 184.

Усім рад, усім сыт!
Што мне пан, што мне кат?! —
Цэлы свет мне адкрыт!

Я усё закляну,
Усёй сілай папру, —
З гор зраблю даліну,
А з далінкі гару!

*(«З песень беларускага мужыка»)*

Тут у Купалы выступае рамантычная ідэя ўсёмагутнасці чалавечай асобы, у лірычным герої праяўляецца своеасаблівы тытанізм, імкненне да абсалюту. Жаданні паэта, як бачым, выходзяць далёка за межы прыватнай асобы — за асабістым, у магутных токах жыцця, ён адчувае агульнае. Лёс свайго лірычнага «я» Купала асэнсоўвае як лёс народны, сацыяльны. Ён прадстае як месія, які выйшаў з глыбінь народа, каб павесці яго за сабой: «Неспакойнай душой надарыў мяне Бог, і з такой у магілу напэўна зыйду («З пралётных дум»). Рамантызм Я. Купалы незвычайны ў тым сэнсе, што ў ім вельмі шмат ад «нізавога» сялянскага побыту, штодзённых клопатаў, поту, слёз. Але «нізавым» ён не вычэрпваецца. Канкрэтны вясковы свет — толькі адпраўны пункт паэзіі Купалы, далей ён выходзіць на маштабныя абагульненні нацыянальнага вопыту:

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці запеў салавей, ці загагала гусь,
Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю — Беларусь.

Хоць гарыста яна, камяністы яна,
Вераб'ю па калена, што сею, расце,
Дый люблю ж я яе, шкода хаткі, гумна:
О, такіх няма, мусіць, нідзе!

*(«Гэта крык, што жыве Беларусы)*

Пачуццё, перажыванне ў лірыцы Купалы пераважаюць над апісаннем, якое не мае самастойнага характару. Вершы пра вёску скіраваны ў шырокі свет чалавечых эмоцый. Творчасць паэта жывіцца ідэямі адраджэння чалавека, народа, чалавецтва. Сюжэтам лірычнага перажывання стала сацыяльнае быццё народа і яго сучасны стан, суадносіны паміж асобай і гісторыяй. Гэта, напэўна, той выпадак, які меў на ўвазе В. Бялінскі калі гаварыў пра генія: «Імя генія — мільён,

таму што ў грудзях сваіх носіць ён пакуты, радасці, надзеі і імкненні мільёнаў»[1]. Думка выдатнага рускага крытыка дапамагае зразумець своеасаблівасць творчай індывідуальнасці Я. Купалы. У яго паэтычным «сувоі» — амаль што поўны пералік народных бед і гаворанняў, спіс якіх паэт хоча прад'явіць на страшны суд гісторыі:

...Не! досыць, досыць! трудна далей
Цярпець, ціхія слёзы ліць!
Нічога мне, ой не, не далі,
А ўзялі ўсё, чым мог бы жыць.

Нявольнік, кланяцца век трэба
Людзям; век з потам кроў цячэ,
Няма патолі і ад неба:
То студзе, то спёкай пячэ.

Пярун у хатку б'е крывую,
Пасевы нішчыць суш і град.
Авечку воўк задраў старую,
Скрыпіць нямазан панарад.

Худзее жонка ў слёзах, працы,
Трасе дзюравым каптаном...
Гэй ты, што песцішся ў палацы,
Мей ж літасць над маім жыццём?!

*(«Спрасоння»)*

У прамове з нагоды 35-годдзя сваёй літаратурнай дзейнасці Янка Купала скажа: «Я, сын беларускай вёскі, узгадаваны яе нядоляй, бачыў крыўду і гора народа. Мне хацелася крыкнуць на ўвесь свет аб тым, як цяжка пакутуе народ пад прыгнётам цара і капіталістаў. Мне хацелася намаляваць вобраз народа, які ідзе з рукамі ў крывавых мазалях, з нагаміўлапцях і нясе на плячах сваю крыўду»[2].

Паэт гаворыць пра адзін з самых вядомых сваіх вершаў — «А хто там ідзе?», які ўпершыню быў змешчаны ў «Жалейцы» і вырас «да сілы гімна», як адзначаў польскі пісьменнік Е. Янкоўскі:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,

---

[1] Белинский В. Г. Полн. собр. соч. В 9 т. М., 1954. Т. IX. С. 527.
[2] Купала Я. Зб. тв. У 7 т. Мн, 1976. Т. 7. С. 319.

На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.

Унутраны, душэўны рытм спалучыўся ў гэтым купалаўскім вершы з рытмам народнага шэсця ў агульнае, супольнае сацыяльна-эстэтычнае адзінства. Меў рацыю Е. Янкоўскі: гады праз два ўбачыла свет асобнае выданне «А хто там ідзе?» з нотамі (музыка Л. М. Рагоўскага) і сапраўды стала, па сутнасці, беларускім народным гімнам.

«А хто там ідзе?», напісаны ў духу біблейскага старога тастаменту, дазваляе, як і многія іншыя вершы Купалы, гаварыць пра сувязь яго творчасці з Бібліяй. Дарэчы, тэма аб месцы і ролі Бібліі ў жыцці і творчасці паэта да гэтага часу застаецца амаль што зусім некранутай у купалазнаўстве. Зрэшты, гэта і зразумела: і 20-я, і 30-я гады (ды і наступныя таксама) былі перыядам такога ваяўнічага атэізму, што пра паралелі з Бібліяй заікнуцца нельга было. Між тым як паэт-прарок, вяшчун Адраджэння, ён свядома і інтуітыўна адчуваў патрэбу абапірацца не толькі на навукова-асветніцкія ідэі, але і на ўвесь вопыт чалавецтва, у тым ліку і рэлігійны. Прарочы дар Купалы якраз і выявіўся ў тым, што праблемам беларускай гісторыі ён надаваў абагульняючы характар, паказваючы іх як праблемы агульначалавечыя. Біблія давала яму магчымасць глабальнага погляду на гісторыю свайго народа. Многія творы паэта, пачынаючы са зборніка «Жалейка», сведчаць пра яго абвостраную цікавасць да Бібліі і грунтоўнае знаёмства з ёю. Паэт ясна ўсведамляў, што з часу ўсталявання на зямлі хрысціянства «Маісееў закон» стаў набыткам усяго чалавецтва. Не забудзем, што з Бібліі пачынаў некалі і Францішак Скарына — нястомны перакладчык старазапаветных тэкстаў, якія ў беларускай трансфармацыі павінны былі ўзняць духоўны ўзровень нацыянальнага этнасу, садзейнічаць ідэйна-маральнаму вызначэнню свядомасці народа, выхаванню ў ім стойкасці, моцы і трываласці. За ўзор браўся прыклад старажытна-іудзейскай гісторыі яўрэйскага народа.

Біблія стымулявала думку:

Божа! Гэткі свет тут
Моц стварыла твая!
Дзе ж мой дом, дзе мой люд?
Дзе айчызна мая?
Дзе той час, у яком
Тут кіпела жыццё?
Свой народ быў кругом
І любіў сваё ўсё,
Сваю песню ў лад свой

Не стыдаўся запець!
І сярмяжкі сівой
Не стыдаўся надзець!
*(«Над сваёй Айчызнай»)*

Біблейскі — дагістарычны — вопыт быў вельмі дарэчы, каб адказаць на гэтыя пытанні. Купалаўскі месіянізм мае, несумненна, біблейскае паходжанне. Тагачасная духоўная сітуацыя, якую Купала бачыў у навакольнай паўсядзённасці і якая адбілася ў «Жалейцы», нагадвала яму тую, у якую трапіў старажытнаяўрэйскі народ, калі апынуўся ў егіпецкім палоне, страціўшы свабоду і самастойнасць. Гэта тыпалагічная супольнасць, як я ўжо казаў, добра відаць у славутым «А хто там ідзе?», у якім аўтар выкарыстоўвае панарамную карціну біблейскага «Зыходу» дзеля разумення і падтрымкі духоўнага адраджэння свайго народа. Значнае месца ў лірыцы Купалы як дакастрычніцкага, так і паслякастрычніцкага перыяду займае біблейская тэма справядлівага суда, які чакае ўсіх і кожнага. Многія тэмы і вобразы Бібліі знайшлі ў яго творчасці глыбокі адбітак, пачынаючы з ранніх і заканчваючы вершам перыяду Айчыннай вайны «Беларускім партызанам». Разам з іншымі фактарамі Біблія дапамагла адчуць прызнанне прарока нацыянальнага адраджэння, будзіцеля народных мас. Нездарма чуйны Р. Бярозкін параўноўваў Купалу з своеасаблівым жрацом, ці, калі казаць па-іншаму, біблейскім левітам, якія, як вядома, мелі містычную ўладу над масамі і закліканы былі прывесці свой народ да лепшай долі:

Шчасце так рэдка над светам усходзе;
Ўсё ж досыць бывае меці хоць мала, —
Долю каб бачыў у родным народзе,
А быў бы шчаслівы Янка Купала,
(«Я не паэта»)

Наўрад ці правамерна было б сцвярджаць, што ў гэты пачатковы, «жалейкавы» перыяд Купала верыў ў абсалютную эстэтычную каштоўнасць паэзіі, Паэзія ў яго разуменні была падпарадкавана пошукам долі. Каб прывесці свой народ да лепшай долі, замала быць толькі паэтам. Паэзія Купалы, па сутнасці, з самага пачатку набывае месіянскі, прарочы характар. Зразумела, паэт не дамагаўся нейкай прывілеяванай выбранасці для свайго народа — месіянізм быў для яго сродкам супрацьстаяння нацыянальнай асіміляцыі і дапамагаў увасобіць у слове тытанічны змест, здольны абудзіць народ на барацьбу за сваю чалавечую годнасць.

Дар прарока дапамагае яму ўзняцца на новы, больш высокі ўзровень разумення і ацэнкі сучаснай яму рэчаіснасці. У «Жалейцы» адбілася мара паэта аб чалавекузмагару:

Я відзеў душы сільныя,
Якім віхры ўсміхаліся
І пелі песні дзіўныя,
Каб выйшлі і змагаліся;

Змагаліся з няпраўдаю,
Змагаліся з кайданамі,
З кайданамі пякельнымі,
З людскіх касцей каванымі.

*(«Я відзеў душы сільныя...»)*

Кованыя з людскіх касцей кайданы сімвалізуюць смерць, якой супрацьстаіць рамантычны герой Купалы.

У 1908 г. быў напісаны верш «Аратаму», які, аднак, не ўвайшоў у «Жалейку» і быў надрукаваны ў «Нашай ніве»:

Ты — пан, ты — багаты, ты — сіла, араты!
Ты ў крыўду не даўся б другім:
Знай, шмат каму трэба з тваёй працы хлеба,
Дый сам ты галодзен зусім...

Дык выпрамся трошку, дый жыва за сошку,
Ды ў поле — к вялікай арбе!
Бач, можа, і долю ў няўродлівым полі
Ты выараш, братка, сабе...

З цягам часу творчы дух купалаўскага героя і ягоная свабодная воля ўсё больш узрастаюць і ўмацоўваюцца, каб весці бескампрамісную барацьбу з сіламі зла і сляпой неабходнасці.

Першая кніга на сваіх старонках засведчыла шырокую жанравую разнастайнасць паэзіі Купалы: лірыка грамадзянская суседнічала з медытатыўнай, інтымныя матывы з пейзажамі, побач з элегіяй сустракаем баладу, паэму. Аўтар «Жалейкі» даказаў, што тэматычнае поле лірыкі — бязмежнае. Яго паэзія аказалася моцна звязанай з беларускім этнаграфічным светам, у разуменне яго ўваходзіць не толькі фальклор, але таксама гістарычныя і геаграфічныя асаблівасці краю, норавы, звычаі, характар народа, яго мова, яго эмацыянальнае і псіхалагічнае аблічча, эстэтычныя традыцыі.

Матывы суму, маркоты рамантычнага героя хораша выявілі сябе ў пейзажнай лірыцы. Купалу была блізкая думка М. Гарэцкага пра эстэтычную своеасаблівасць роднай прыроды. «Хараство беларускай

прыроды, — пісаў М. Гарэцкі, — ляжыць якраз у ...далікатнай колернай мяккасці і паэтычнай засмучонасці...» Менавіта такі погляд сцвярджаецца ў лірычных пейзажах Купалы:

Шумныя бярозы
Пабяліў мароз.
Хацеў бы я плакаць,
Дый не маю слёз.

Хацеў бы я Пеці
Аб сваёй бядзе,
Дый мне сэрца ные,
Песенька не йдзе.

*(«З песень нядолі»)*

Бяроза ў Купалы, як і ў беларускім фальклоры, увасабляе адзінства чалавека і прыроды, далёкае, аднак, ад душэўнай раўнавагі і заспакаення. Паэт узмацняе ўнутраны дынамізм і поліфанічнае гучанне пейзажнага верша.

Адзін з паказчыкаў культуры паэзіі, своеасаблівасці яе гуманістычнага пафасу — інтымная лірыка. Свае першыя вершы пра каханне — «Не глядзі» і «На адвітанне» — Купала напісаў у 1907 г. Прарочая доля Купалавага паэтычнага дару, здавалася б, не стымулявала індывідуальна-інтымнага самараскрыцця паэта, але гэта не так. Тэма кахання — адна з галоўных у яго творчасці, таму што пачуццё кахання заўсёды заставалася важнейшай гранню Купалавага паэтычнага характару, адзнакай паўнаты зямнога быцця:

Яшчэ раз будзь шчаслівa, дзяўчынка,
Хоць не лёгка нам шчасця спаткаць!
Я ж адзін, як над рэчкай вярбінка,
Буду жыць і цябе ўспамінаць.

І на памяць, што ў сэрцы мне ўскрэсне,
Чым я жыў так і мучыўся чым,
Злажу самую лепшую песню
Аб табе і каханні тваім.[1]

*(«На адвітанне»)*

У гэтым і іншых вершах Купалы пра каханне адлюстравалася ўласцівая паэту суровая праўда пачуццяў, праўда жыцця. Можна было б падумаць, што каханне адносіцца да той сферы жыцця, дзе

[1] Купала Я. Поўны зб. тв. У 9 т. Мн., 1995. Т. І. С. 163.

рэальнае магло б хутчэй за ўсё спалучыцца з ідэальным, але не! Яно падпарадкоўваецца агульным супярэчлівасцям сацыяльнага жыцця:

I вечна не знойдзеш спакою
Ў замужнім бязвольным жыцці;
Нядоля услед за табою,
Як здань тая, будзе ісці.

*(«Сватаная»)*

Паэтычная думка становіцца ўсё больш пластычнай, унутрана заглыбленай і драматычнай.

Асобая ўласцівасць купалаўскага рамантызму — музычнасць верша. Музычны пачатак здаўна жывіў і змест, і форму беларускай паэзіі, яе мастацка-эмацыянальную своеасаблівасць. Купала пайшоў значна далей у гэтым напрамку. Часта бачым, як у традыцыйным вершаваным памеры, у песенных інтанацыях ён знаходзіць новыя рытмічныя магчымасці, якія ўзмацняюць рамантычны дух яго творчасці.

## МЭТЫ, ІДЭАЛЫ, ШЛЯХІ

У зборніку «Жалейка», а таксама ў іншых творах гэтага перыяду, якія ў зборнік не ўвайшлі, паэт, па сутнасці, узнімаецца да ідэі нацыянальнага вызвалення Беларусі. Аднымі з першых гэта «ўчулі» цэнзары. У кастрычніку таго ж 1908 г. у Санкт-Пецярбургскім камітэце па справах друку пры Міністэрстве ўнутраных спраў разглядалася справа аб забароне «Жалейкі». Прынята пастанова налажыць арышт на зборнік і прыцягнуць да адказнасці асоб, вінаватых у надрукаванні кнігі. «Жалейка» была канфіскавана, аўтар і выдаўцы прыцягнуты да судовай адказнасці. Праз некаторы час, аднак, арышт з «Жалейкі» быў зняты, хоць гэта каштавала немалых клопатаў.

У зборнік, вядома, не маглі трапіць вершы, у якіх паэт адкрыта заклікаў да ўзброенай барацьбы. Цэнзура забараніла ўключаны аўтарам у «Жалейку» верш «Песня вольнага чалавека», прызнаўшы яго «антыдзяржаўным». Цэнзар пісаў, што ў ім «нельга не заўважыць адкрытага ўзбуджэння да дзеянняў яўна бунтаўнічых». Залішні ўхіл у рэвалюцыйную тэндэнцыйнасць, уласцівую зборніку «Жалейка», адзначаў Ядвігін Ш. — аўтар рэцэнзіі на яго ў газеце «Минское эхо»[1]. Аднак гэта было натуральна для Купалы — інакшым ён не мог быць. Паэзія Купалы з самага пачатку набыла апазіцыйны характар у адносінах да існуючага ладу. Купалаўскі герой выразна бачыць «пагрэшнасці» гісторыі, якая абдзяліла беларусаў чалавечай доляй. Паэту ўласціва ўсёпаглынаючае ўсведамленне сваёй ідэйнай місіі. Гамлетаўскае пытанне «быць ці не быць?», вырашаемае ў маштабах усёй нацыі, праходзіць праз усю творчасць Янкі Купалы. У яго вершах, паэмах, п'есах адлюстравалася імклівасць нацыянальна-гістарычнага развіцця беларускага народа пад уплывам рэвалюцыі 1905-1907 гг. Сам паэт усё больш пераконваецца ў неабходнасці рашучай барацьбы. Ён не раз меў магчымасць усвядоміць, што ў самадзяржаўі ўвасобіліся тупыя, але ўладарна-дэспатычныя сілы, якія стрымліваюць чалавечую ініцыятыву, пазбаўляюць свабоды і радасці жыцця. Адносіны да беларуса як да духоўнай адзінкі з боку царскіх улад і панства і сапраўды насілі нейкі першабытна-варварскі, злачынны характар. Воляю гістарычнага лёсу народ быў асуджаны на бяспраўнае існаванне. Пазбаўлены правоў, ён, такім чынам, быў пазбаўлены і будучыні. Купала разумеў усё гэта і выношваў у сваёй душы грандыёзны праект паляпшэння рэчаіснасці. ХХ стагоддзе пазнілася на

---

[1] Минское эхо. 1908. 9 ліп.

Беларусь, і паэт хацеў прыспешыць яго прыход, на які ён ускладаў шмат надзей.

Якія ж шляхі бачыў ён для ажыццяўлення сваіх ідэалаў? З самага пачатку аўтару «Жалейкі» было зразумела, што адной мужнасці, стаіцызму, непрацiўлення недастаткова, каб выстаяць супраць напору зла. Умовай дасягнення лепшай будучыні ён прызнаваў адмаўленне існуючага парадку рэчаў. У 1906 г. быў напісаны верш «Зашумеў лес разгуканы», які меў выразнае рэвалюцыйнае гучанне. Купалаўскі «лес разгуканы» — гэта вобраз усёй уздыбленай Расіі:

Зашумеў лес разгуканы,
Нівы задрыжалі,
Задрыжалі і тыраны,
Што бяду стваралі.

Паэт упэўнены, што прагрэс у гісторыі дасягаецца не сам сабой, праз спантанны рух стыхійных сіл, а з дапамогай людзей, якія імкнуцца да сацыяльнай справядлівасці, ідэалаў народнай свабоды, гармоніі асобы і грамадства. Купала падзяляў вядомую з часоў Вялікай французскай рэвалюцыі гераічную ідэю аб свабодзе асобы, якая адчувае сваю ўласную непаўторную сутнасць і імкнецца здзейсніць для сябе права на чалавечую роўнасць.

У вершы «Там» (1906) ён піша:

Там кроў ліецца, там за волю
Барцы на віселькі ідуць,
А вы, вы мучаны найболей,
Спіце, хоць вас даўно там ждуць.

Аўтара бянтэжыць недахоп сацыяльнай актыўнасці ў родным краі. Тут выяўляецца купалаўскі ультрарадыкалізм, нецярпенне сына пакрыўджанага і зганьбаванага народа. І, мяркуючы па ўсім, узброенае паўстанне здавалася яму адзіна магчымым для народа шляхам заваявання сацыяльнай і духоўнай свабоды:

Паўстаньце, покуль цар звыродны
Крыві ўсяёй не высcаў з вас!
Паўстаньце! Край ваш стогне родны,
Заве збаўляць, як зваў не раз.

Паэт як максіміліст лічыў, што яго ідэал павінен тут жа ўвасобіцца ў рэальнасць, і вельмі перажываў, што гэтага не адбывалася. Праблема насілля была адной з тых, якія Купала ўвесь час трымаў у сваёй свядомасці. Само па сабе насілле, як вядома, далёкае ад ідэалаў і мэтаў гуманістычнай маральнасці. Яно здольна развязаць у чалавеку самыя горшыя інстынкты. Нянавісць да зла — як сляпая, нераз-

важаючая ярасць — далёка не заўсёды можа быць сумяшчальнай з уяўленнямі аб гуманізме.

Стары тэстамент: вока за вока, зуб за зуб. Затое Евангелле сцвярджала нешта зусім супрацьлеглае, і Купала разумеў, што спробы выкаранення зла злом не павінны быць законам жыцця. У прынцыпе ён таксама быў супраць таго, каб чалавечая актыўнасць праяўлялася ў разбуральнай форме, але ці магчыма было спадзявацца толькі на эвалюцыйны працэс? Жыццё пераконвала, што насілле ў шматаблічнасці свайго праяўлення ёсць неад'емная ўласціваць вялікай сусветнай дзеі і нават як бы адной з анталагічных умоў чалавечага існавання, ад пачатку да канца пранізанага болема і стратамі. Дык як было не апраўдаць мэтазгоднасць актыўнага супраціўлення неразумным, злым сілам жыцця, неабходнасць барацьбы з імі!

А чаша народнага цярпення перапаўнялася. Злоўжыванне правам уласнасці, ігнараванне справядлівасці ў размеркаванні багаццяў вялі да накаплення сацыяльнага зла і да выбуху. Ілюзій на бесканфліктнае вырашэнне сацыяльнай сітуацыі не заставалася. Царскія ўлады, прыгнятаючы народ, адмаўляюцца нават выслухаць яго скаргі. У нясцерпных умовах двайнога прыгнёту — сацыяльнага і нацыянальнага — паўстанне апраўдана было лічыць актам вышэйшай справядлівасці ў адносінах да існуючай улады. Беларускі народ, на думку Купалы, меў права на выкарыстанне сілы ў якасці сродку дасягнення і ўстанаўлення на зямлі свабоды і справядлівасці.

Трэба было, як пісаў Ц. Гартны ў сваім знакамітым рамане «Сокі цаліны», «на гвалт адказаць гвалтам...» Заклік да ўзброенай барацьбы за вызваленне народа чырвонай ніткай праходзіць праз дакастрычніцкую творчасць Купалы.

Сёння знаходзяцца людзі, гатовыя папракнуць яго заклікам да насілля, але гэта ідэя тады проста-такі насілася ў паветры. Да бурырэвалюцыі зваў Горкі. Рэвалюцыя абяцала пераадолець адчужэнне, разрыў паміж асобай і светам, грамадствам і дзяржавай, культурай і цывілізацыяй, забяспечыць пераход з царства неабходнасці ў царства свабоды. Гімнамі «гунам», «дзецям полымнага дня» вітаў 1905 г. В. Брусаў: «Крушите жизнь — и с ней меня!» — заклікаў ён, спадзеючыся, што рэвалюцыйна-разбуральныя дзеянні здольны абнавіць трухлявы сацыяльны арганізм, які мае ў гэтым неадкладную патрэбу. Рускі паэт не спыняецца, як бачым, перад татальным адмаўленнем усіх наяўных буржуазных і чыноўніцкіх парадкаў, іх ідэалогіі і маралі. Гэты дух жыў і ў паэзіі Купалы. Меў, відаць, рацыю У. Самойла, які знаходзіў у купалаўскім рамантызме палітычны ўхіл, але ў гэтым «ухіле» беларускі паэт меў, напэўна, больш рацыі, чым В. Брусаў. Ён

не лічыў насілле сродкам дасягнення ўсеагульнага дабра, але для роднага краю іншага выйсця не бачыў. Рэвалюцыю ён разглядаў як суровую расплату з тымі, для каго свае вузка эгаістычныя інтарэсы аказаліся вышэй за народную праўду і народны лёс.

Купала, такім чынам, не выбіраў паміж хлебам і свабодай, а патрабаваў таго і другога разам, бо ведаў: калі аддасі перавагу хлебу, то не будзеш мець ні хлеба, ні свабоды. Спалучэнне сацыяльнага падыходу з нацыянальным, духоўна-прававым прадухіляла небяспечную аднабаковасць грамадскіх ідэалаў і памкненняў.

Асветніцкі, духоўны пафас творчасці Купалы выявіўся ў глыбокім раскрыцці антыдэмакратычнай дзейнасці расійскага самаўладства, імперыялістычнай палітыкі «ворагаў Беларушчыны». З самага пачатку ён змагаецца з непрызнаннем беларускага народа за нацыю, з неўключэннем яго ў кола гістарычных народаў свету. За спакойнай і ўраўнаважанай, здавалася б, знешнасцю купалаўскага лірычнага героя таіўся гарачы лірычны тэмперамент. Намаганні беларускай інтэлігенцыі адрадзіць нацыянальную культуру, абудзіць народ ад сну сустракалі значнае процідзеянне з боку польскіх і рускіх шавіністаў. Уладныя структуры, панства і чыноўніцтва рабілі ўсё, каб народ страціў сваю нацыянальную ідэнтычнасць і прымкнуў да нейкага — усходняга ці заходняга — боку.

У 1907 г. Купала стварае славутае сваё «Ворагам Беларушчыны» — водпаведзь рускім і польскім шавіністам, якія без канца нападалі, паводле выразу паэта, «на ўсё беларускае»:

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб той мове,
Якой азваўся беларус?

Гэта адзін з самых выдатных узораў ранняй купалаўскай лірыкі, у якім знайшоў адэкватнае самавыяўленне той неўтаймоўна-бурлівы стан, у якім знаходзіўся ў той час паэт, прамоўніцкім пафасам і тэмпераментам нагадваючы біблейскага Іезікііля:

Чаму вам дзіка яго мова?
Паверце, вашай ён не ўкраў,
Сваё ён толькі ўспомніў слова,
З якім радзіўся, падрастаў.
Эх, кіньце крыўдамі карміцца, —
Кожны народ сам сабе пан;
І беларус можа змясціцца
Ў сям'і нялічанай славян!

Царкоўна-кніжная мова ў духу старога тастаменту зnітавана тут з народна-бытавым, размоўным словам і інтанацыяй. Верш «Ворагам Беларушчыны» ўзнавіў і развіў патрыятычныя традыцыі палемічнай беларускай літаратуры XVI-XVII стст. — А. Філіповіча, М. Сматрыцкага, С. Зізанія і іншых пісьменнікаў, якія стаялі на варце нацыянальных інтарэсаў свайго народа і не давалі яго ў крыўду розным непрыяцелям і нядобразычліўцам.

У вершы «Ворагам Беларушчыны» Купала, па сутнасці, выступае наследнікам традыцый беларускага барока, пра што сведчыць павышаная экспрэсіўнасць твора і эмацыянальнасць, якая ўзнімаецца да патэтыкі.

У першых Купалавых творах чулася сіла народа, вера ў яго будучыню, заклік да актыўнага, паўнакроўнага жыцця. Было ясна, што ў беларускую літаратуру прыйшоў сапраўдны паэт-грамадзянін.

# ВІЛЬНЯ. «АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ»

Восенню 1908 г., пасля трохгадовай службы на броварах у маёнтку Дольны Сноў, па запрашэнню братоў Івана і Антона Луцкевічаў, знаёмых з яго вершамі, Купала прыязджае ў Вільню. Уладкоўваецца на працу бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы Б. Л. Данілевіча «Знание» і адначасова супрацоўнічае ў газеце «Наша ніва». Б. Даніловіч духоўна быў блізкі да нашаніўскага згуртавання беларускай інтэлігенцыі і аказваў паэту падтрымку.

Вільня — старажытны беларускі горад, скрыжаванне разнастайных культурных уплываў, рэлігій, моў. Тут, на яго брукаваных вуліцах, чулася яшчэ рэха крокаў вялікага гуманіста і асветніка эпохі Адраджэння Францыска Скарыны. У тыя даўнія часы працавала тут беларуская друкарня братоў Мамонічаў, дзякуючы якой убачылі свет многія беларускія кнігі. З Вільняй звязана дзейнасць Мялеція Сматрыцкага.

У 1579 г. тут была адкрыта Віленская акадэмія, якая потымператварылася ва універсітэт, у якім вучылася беларуская моладзь.

Вільня помніла палымянага рэвалюцыянера, аднаго з кіраўнікоў паўстання 186 3 г. Кастуся Каліноўскага — паэта і рэдактара першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда».

З 1884 г. у Вільні ў акруговым судзе працаваў адвакатам Францішак Багушэвіч — адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, кнігі якога мелі значны ўплыў на станаўленне і фарміраванне купалаўскага таленту.

У Беларускім музеі братоў Луцкевічаў у Вільні знаходзіліся пярсцёнак з пальца Усяслава Полацкага, Літоўскі статут, дзяржаўныя граматы Вялікага княства, пісаныя на беларускай мове, абразы, тканіны, інструменты.

У Вільню Купала прыехаў не з пустымі рукамі — сярод творчых здабыткаў была драматычная паэма «Адвечная песня», напісаная яшчэ ў жніўні 1908 г. у Бараўцах (дзе ў той час сям'я арандавала фальварак).

Выдадзеная ў 1910 г. «Адвечная песня» сведчыла пра новыя павевы ў яго творчасці. Гэта яго першы драматычны твор, напісаны вершам. У жанры паэмы праглядваліся рысы своеасаблівай сацыяльна-бытавой драмы, у якой аўтар — мастак новага часу — дасягае высокай ступені эстэтычнага абагульнення з'яў жыцця. Постаці і сітуацыі ў гэтай паэме пераносяцца з побытавага плана ў іншае — філасофска-светапогляднае — вымярэнне, набываючы пераносна-метафарычны сэнс. Герой «Адвечнай песні» — Мужык — па сваёй

жыццёвай сутнасці не столькі селянін, колькі універсальны чалавек — чалавек увогуле. За рэалістычным сюжэтным покрывам у паэме тоіцца абагульненне амаль касмічнай шырыні, якое цалкам ўвабрала ў сябе жыццёвы вопыт купалаўскага героя і паставіла пытанне аб сэнсе чалавечага быцця наогул.

І ўсё ж такі, хаця аўтар і адыходзіць ад бытавой канкрэтыкі, яго твор прысвечаны звычайнаму сялянскаму жыццю. «Адвечная песня» складаецца з дванаццаці вузлавых актаў-«праяў». У іх раскрываецца жыццё Мужыка ад нараджэння да смерці. На самым пачатку ўрачыста гучыць біблейскі матыў стварэння свету і чалавека:

Ўсясільнай рукою тварэння
Даю яму права існення,
На ўласнасць, ваду і зямлю,
Душу яму такжа даю.
Пад уладай сваёй будзе мецi
Як ёсць усё чыста на свеце;
Ён будзе ўсіх чыста дужэй,
Ён будзе ўсіх чыста мудрэй.
І рэкі, і долы, і горы
Яго будуць слухаць з пакорай;
Там высуша, там правядзе,
Там зрые, а там узнясе.

Шмат добрага паабяцана чалавеку, аднак побач з закручаным у зрэбныя пялёнкі ужо прымасцілася Доля з неадчэпнай Бядой і Голадам, якія, наадварот, нічога добрага не абяцаюць:

Мы будзем хадзіць за ім парай,
Наводзіць балесці і хмары,
Душой і хацінай трасці,
Адвечныя казкі плясці...

Англійскі эстэтык і філосаф Кодуэл (ХХ ст.) лічыў, што ў аснове мастацтва знаходзіцца канфлікт паміж «чалавекам натуральным» і «чалавекам грамадскім». Інакш кажучы, з аднаго боку, чалавек — цар прыроды, з другога — раб існуючага становішча рэчаў, якое прымушае яго падпарадкоўвацца. Працоўнае жыццё Мужыка пачынаецца ў самым дзяцінстве — як гэта і заведзена было ў беларускай вёсцы — з пастухоўства. На пытанне маці — «Як там служба, як там сілы, як з ядой?» — пастушок адказвае:

Як у служкі сходзяць леты —
Ў пастуха,
Пытай, маці, птушкі гэтай —
Канюха.

Запытайся гэтай хмары —
Гэтых слёз,
Гэтай кветкі на папары —
Гэтых лоз,
Гэтай грушы сярод поля
І балот:
Яны ўсе аб маёй долі
Вядуць шчот.

Прыкметная рыса ранняй творчасці Купалы — пастаянная суаднесенасць чалавечага жыцця і навакольнай прыроды, аднак у «Адвечнай песні» такой суаднесенасці амаль што няма: аўтар паэмы перш за ўсё бачыць сацыяльную абумоўленасць чалавечага лёсу. З гэтага пункту гледжання жыццё селяніна — жыццё пакутніка, што рана страціў надзею на лепшае. Ён не мае сіл супрацьстаяць разбуральнаму ціску абставін. Вясна імкнецца абудзіць яго: «Араць, сеяць пара!» У селяніна ж не хапае насення, даводзіцца звяртацца за дапамогай у «магазын». Доўгі час даймала паншчына, але, пазбавіўшыся яе, ён трапляе пад капіталістычны прыгнёт. Сацыяльна-эканамічную прыроду гэтых сіл селянін, вядома, не разумее — яны ўяўляюцца яму спрадвечнымі вобразамі-сімваламі: Жыццё, Доля, Холад, Вясна, Лета... Як старажытнагрэчаскія мойры, прадуць яны нітку чалавечага лёсу.

На герою «Адвечнай песні» ляжыць пячатка бяссілля і асуджанасці. Светам — паводле законаў энтрапіі — кіруюць Смерць, Час, якія абыходзяцца з Мужыком асабліва жорстка, — яго жыццёвае становішча вядзе да хуткага і поўнага вычарпання ўсіх духоўных і фізічных сіл. Вядома, у ім, трэба сказаць, пазнаецца перш за ўсё беларускі, селянін, дух якога амярцвеў, заціснуты ў самім сабе. Гэты чалавек не роўны самому сабе, таму што ён жыве пад прымусам, дзейнічае па чыімсьці намаўленні, знаходзячыся ў залежнасці ад вельмі няпэўных і зменлівых абставін. Больш таго, трапляючы пад уладу абставін і сітуацый, ён вымушаны расстацца з уласным характарам.

Словам, у параўнанні з вершам «Мужык», пра які ішла гаворка вышэй, «Адвечная песня» гучыць песімістычна. У апошняй сцэне «На могілках» над магілай узнімаецца цень Мужыка, якому хочацца даведацца, што ж адбываецца ў свеце пасля яго смерці. Але яго зноў чакае расчараванне: няма «сцежкі к прасвету», усё «чахне без сіл». І вось — апошні акорд:

Раскрыйся нанова, магіла:
Страшней цябе людзі і свет.

Гэтымі словамі галоўнага героя — Мужыка — заканчваецца «Адвечная песня». Цень Мужыка над магілай зноў і зноў вяртае да пытання: ці здольна дабро ўзяць верх над злом? Аўтар прыходзіць да вываду, што і ў новых, здавалася б, умовах XX ст. чалавек не стаў мэтай грамадскага прагрэсу, што ён як і быў, так і застаўся яго сродкам, трапіўшы пад уціск непадкантрольных і варожых яму сіл. Гэта быў крызіс гуманізму, які адчуваў і перажываў не толькі Купала, але і многія яго сучаснікі.

Навакольны аб'ектыўны свет, уключаючы і побыт беларускага сялянства, найбольш шырока і поўна адбіўся ў ранні, «жалейкавы», перыяд творчасці паэта, але памылкай было б лічыць Янку Купалу нават на ранніх этапах творчасці толькі вясковым, сялянскім паэтам — яго творчасць уключала агульначалавечую праблематыку. «Адвечная песня» малюе немэтазгоднасць зямнога жыццеўладкавання чалавека. Нават, больш таго, паэт бачыць, што рэальнае яго жыццё не проста неўладкаванае і трагічнае — яно абсурднае. Бо якім жа яшчэ можа быць існаванне чалавека, пазбаўленага правоў і асабістай годнасці, як не абсурдным па самой сваёй сутнасці. Чалавек самотны і безабаронны перад часам, хваробамі і смерцю, і ў выніку жыццё не мае сэнсу. Сялянскае ў «Адвечнай песні» Купала раскрывае як універсальнае. У жыцці і смерці селяніна яму бачыцца універсальная мадэль чалавечага лёсу.

Усё гэта сведчыць аб тым, што мастацка-вобразная структура "Адвечнай песні» ўзбагацілася за кошт тагачасных мадэрнісцкіх уздзеянняў. На фарміраванне задумы «Адвечнай песні» аказала ўплыў, як лічаць многія купалазнаўцы, п'еса Л. Андрэева «Жыццё чалавека». У купалазнаўстве гэта ўжо адзначалася. Такую ж ролю, думаецца, магла адыграць і другая п'еса Л. Андрэева — «Цар-Голад», пабудаваная на сходных драматургічных прынцыпах. Рысы тыпалагічнай супольнасці з творчасцю Л. Андрэева 1892-1906 гг. намеціліся ўжо ў ранніх паэмах Я. Купалы. У «Адвечнай песні» яны ўзраслі. Па сутнасці, ён, як і рускі пісьменнік, за паўстагоддзя да экзістэнцыялістаў паставіў пытанне аб абсурдным характары чалавечага існавання, у многім апярэдзіўшы іх мастацкія адкрыцці. Але гэта была і спрэчка з Л. Андрэевым. Тут маем справу з паэтычнымі элементамі мадэрнізму, пераасэнсаванымі, аднак, у духу рэалізму, у выніку чаго яны атрымалі новую мастацкую функцыю. Яны не закрэсліваюць усіх спадзяванняў на лепшае. Нягледзячы на тое што грамадства даводзіць чалавека да абсурду, паэт усё ж такі не траціць надзеі разарваць спрадвечны кругазварот жыцця, знайсці для яго апору. Як-ніяк, Купала не даходзіць да таго, каб вылучыць у рэчаіснасці адны толькі абсурдныя

з'явы і гэтым абмежавацца. У паэме, як бы там ні было, адчуваецца прысутнасць думкі, заключанай у старажытным народным выслоўі: паміраеш, а жыта сей! Меў рацыю віленскі крытык Рубер, які пісаў пра «Адвечную песню», што «гэта сапраўды жыццё чалавека, толькі не цалкам сімвалічнае і абстрактнае, як паэма Андрэева, а гэта рэальныя вобразы жыцця беларускага селяніна»[1].

Першым творам з паметкай «Вільня» быў верш «Ужо днее», напісаны ў лістападзе 1908 г. у сувязі з другой гадавінай з дня выхаду газеты «Наша ніва». «Ужо днее» сведчыць аб тым, што паэт не мяняе сваіх ідэйнамастацкіх накірункаў. У цэнтры верша — вобраз роднай Беларусі, якая адраджаецца да новага жыцця: «Я ўсё, колькі сілы, змагала, ўставала! Я жыва! Народ мой са мною, пры мне!»

У віленскі перыяд (1909) узніклі шырокавядомыя потым вершы «Маладая Беларусь» («Гэй ты, гэй, Беларусь, маладая старонка»), «Зваяваным», «Вёска», «Памяці Шаўчэнкі», «Песняру-беларусу», «Заклятая кветка», «Апекунам», «Курганы», «Чорны Бог», «Адцвітанне», «Паліліся мае слёзы», «Песня жнеяў» і інш. Частку з іх надрукавала «Наша ніва», большасць убачыла свет у наступных паэтычных зборніках — «Гусляр» (1910), «Шляхам жыцця» (1913), «Спадчына» (1922)...

У творчасці Купалы гэтага перыяду пэўнае месца займаюць таксама і ўпадніцкія настроі, песімізм. Пасля рэвалюцыйнага ўздыму 1905-1907 гг. наступілі гады рэакцыі. Адчуваннем гэтага народжаны верш «Чорны Бог»;

У кіраўніцах амшалых
З галавы да ног,
З дзікіх багнаў, пераналаў
Выбрыў Чорны Бог.

Купалу ўсё менш задавольвае такое адлюстраванне рэчаіснасці, якое абмяжоўваецца яе непасрэдным капіраваннем або эмацыянальным выяўленнем, — паэт імкнецца тварыць свой арыгінальны мастацкі свет, які, адпавядаючы жыццёвай сутнасці, знаходзіцца ўсё ж такі ў больш складаных і апасродкаваных адносінах са сваёй рэальнай першаасновай. Ён звяртаецца да звышпрыроднага, пазапачуццёвага, што не дадзена чалавеку ў яго рэальных адчуваннях.

У вершы «Чорны Бог» ён па-свойму інтэрпрэтуе апакаліптычны вобраз звера, які выходзіць з бездані. Чорныя богі — у беларусаў гэта Мар, Марока (іх яшчэ называлі «дзівамі») — не абяцалі людзям дабра. Старажытныя міфы паэт выкарыстоўвае для выражэння сучасных

[1] Любімы паэт беларускага народа. Мн., 1960. С. 218.

ідэй: улада звера бачыцца яму ў бязлітаснай уладзе чалавека над чалавекам...

Работа ў бібліятэцы, у асяроддзі рэдакцыі «Нашай нівы», доступ да кніжных багаццяў станоўча адбіліся на інтэлектуальным росце Янкі Купалы. Творчасць гэтага часу сведчыла, што ён па-сапраўднаму авалодаў красой і сілай роднага слова. Гэтак лічыла і крытыка. У часопісе «Пшэглёнд краёвы» (Кіеў) Е. Янкоўскі ў артыкуле «Песняры маладой Беларусі» пісаў: «Нібы паказваючы негрунтоўнасць меркаванняў пра штучнае адраджэнне беларускай культуры, вырас паэтычны талент Купалы. Арганічнасць яго з'яўлення бясспрэчная... Аснову яго паэзіі складаюць вершы з незвычайным адчуваннем прыроды краю і людзей. Купала не проста наглядае, як Колас. Апісанняў яго муза не ведае, затое ў своеасаблівай самабытнай рытміцы, у складзе верша гэтага песняра праглядваецца штосьці незвычайнае... ён... умее... мімаходзь стварыць верш майстэрскі, поўны арыгінальнага тэмпераменту, дасканалы стылёва. У ім задума спявае, размах натуральны, пераліваецца ў ім сіла, радасць існавання і захапленне сваёй сялянскай доляй»[1].

А ў наступным, 1910 г., у «Нашай ніве» быў змешчаны артыкул С. Палуяна «Беларуская літаратура ў 1909 г.», дзе адзначалася, што ў творах Купалы «відаць унутраную сур'ёзную работу і праўдзівае разуменне задач літаратуры». Выказвалася таксама ўпэўненасць, што «перад Купалам вялікая будучыня»[2].

Царская адміністрацыя, на заметку да якой трапіў Я. Купала, ужо не выпускала яго з поля нагляду. У 1909 г. па распараджэнні віленскага генерал-губернатара «Жалейка» была паўторна канфіскавана. Паэт, трапіўшы ў разрад «неблаганадзейных», трымае сябе з пачуццём уласнай годнасці. Каб не зашкодзіць афіцыйнай апініі «Нашай нівы», ён кідае працу ў рэдакцыі і ў кастрычніку—лістападзе едзе па рэкамендацыі Б. Даніловіча на працу ў маёнтак Бенін Навагрудскага павета Мінскай губерні, дзе прабыў каля двух месяцаў. Вярнуўшыся ў Вільню, апынуўся без працы.

---

[1] Przegląd krajowy. 1909. 16 вер.
[2] Наша ніва. 1910. 11 лют.

## ПЕЦЯРБУРГ. «ГУСЛЯР»

Між тым мары і намеры паэта сягалі далёка — Вільні для іх было ўжо і замала. Маніў Пецярбург, не пакідала думка аб вучобе. З людзьмі, асабліва паэтамі, здараецца, што наспявае патрэба пераадолець уладу асяроддзя, інерцыю ранейшага існавання, шырэй глянуць на свет. Янка Купала вырашыў падацца ў Пецярбург. Адбылося гэта ў снежні 1909 г.

Год назад тут убачыла свет яго «Жалейка».

У Пецярбургскі універсітэт паступаў некалі Ф. Багушэвіч.

Пра Пецярбург — сталіцу Расійскай імперыі — ён думаў даўно. Там адбываліся падзеі, якія ўплывалі на ўсю Расію. Яны натхнілі беларускага паэта на верш «Перад вісельняй» (1908), у якім узнік трагічны вобраз «акрываўленай Нявы».

З сабою Купала меў рэкамендацыйнае пісьмо У. Самойлы да Б. Эпімах-Шыпілы, які і дапамог уладкавацца на курсы А. Чарняева, дзе выкладалі вядомыя пецярбургскія вучоныя.

Прыехаўшы ў Пецярбург, ён меў пры сабе добры стос вершаў — аснову беларускага зборніка «Гусляр». Кніга пад такой назвай паявілася на свет у 1910 г. у друкарні Пянткоўскага.

У Пецярбургу Купала стаўся сваім у асяроддзі беларускай студэнцкай і рабочай моладзі. Ён наведвае навукова-літаратурны гурток, створаны па ініцыятыве Б. Эпімах-Шыпілы, знаёміцца з прадстаўнікамі сталічнай інтэлігенцыі.

Калі пецярбургскія ўлады прыцягнулі да судовай адказнасці выдавецкую суполку «Загляне сонца і ў наша аконца» за выданне кніг Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская» і «Смык беларускі», Купала на баку выдавецтва ўдзельнічае ў судовым працэсе.

Першы «пецярбургскі» верш быў напісаны толькі ў красавіку 1910 г. На працягу доўгай і суровай зімы жыхары сталіцы занудзіліся па сонцу. Верш меў назву «Песня сонцу». Сонца заўсёды было для паэта крыніцай жыцця і ўсіх яго багаццяў, ад сонца залежыць усё існаванне чалавека. Трэба сказаць, недзе на ўзмежжы XIX-XX стст. навука (пра гэта паэт мог даведацца на чарняеўскіх курсах) адкрыла энергію сонечных промняў, якая ўздзейнічае на ўсе прыродныя працэсы, што адбываюцца на зямлі, на іх стваральную долю. Але сонца ў Купалы — яшчэ і прадвеснік новага жыцця, сімвал будучыні Беларусі:

Вольным гоманам хвоек высокіх,
Туманамі санлівых нізін,
Казкай векаў блізкіх і далёкіх
Клічам, сонца, цябе, як адзін!

Распусці залацістыя косы,
Схаладзелы загон ацяплі,
Аквяці лугавыя пакосы,
Ўсходы новыя сей на зямлі.

Думкі пра родную Беларусь не пакідаюць яго і ў Пецярбургу:

Як у свята купальскае, сонца,
Свой жывы абнаўляеш паглёд,
Аднаві славу нашай старонцы,
Аднаві яе сумны народ!

Неяк разам з Б. Эпімах-Шыпілам і А. Грыневічам ён пабываў у Фінляндыі, наведаў вадаспад Іматра на рацэ Вуоксе і горад Выбарг. У выніку з'явіліся два творы: лірычны верш «Над Іматрай» і дарожны нарыс «Думкі з пабыцця ў Фінляндыі на Іматры», надрукаваныя амаль аднагчасова ў «Нашай ніве». Аснова аднаго і другога — адна і тая ж уражанні ад турыстычнай паездкі па фінскай зямлі. Верш «Над Іматрай» — узор пейзажнай лірыкі Купалы, надзвычай маляўнічы па фарбах, рамантычна прыўзняты і раскаваны. У ім услаўляецца свабода як натуральная ўмова існавання ўсяго прыгожага на зямлі. У нарысе ўсяго гэтага эстэтычнага багацця няма, але па самай агульнай думцы ён набліжаецца да верша. У ім Купала пісаў: «Як жа багацейша і пякнейша наша зямелька, калі яе параўнаць з фінскай, хоць, паміма гэтага, людзі тут лепей апрануўшыся і весялей, свабодней выглядаюць, як нашы! Дзіўна і несправядліва звініць гэта наша бесперапыннае: «край наш бедны, зямлі мала!» Мне здаецца, што не край наш бедны, а толькі мы яго абяднілі ды наша мачыха-доля, што заклеймавала нас нязмытым кляймом спрадвечнага падданства і паніжэння»[1].

Патрыятызм паэта яскрава выявіўся ў вершы «Я ад вас далёка...», у якім ізноў (услед за «Адвечнай песняй») узнікае вобраз надмагільнага ценю як паэтычнае ўвасабленне ідэі духоўнага адзінства з роднай зямлёй:

Я ад вас далёка... Божа ты мой мілы!
Неразлучны з вамі да самой магілы, —
Не пакіну думаць світам і ўпацёмку:
Як там жывіце вы, як жыве старонка?
А хоць дасць мне доля ў дамавіне месца, —
Ўстане цень з зямлі мой, на крыж абапрэцца,
І ў той бок глядзеці будзе век нязводна,

---

[1] Наша ніва. 1910. 22 ліп. Павагу да фінскага народа Купала захаваў на ўсё жыццё. Р. Барадулін, прыгадваючы свае размовы пра Янку Купалу з Петрусём Броўкам, успамінае: «Даверліва распавядаў Броўка, як падчас агрэсіі, якую пазней па-савецку сарамліва назвалі канфліктам на фінскай мяжы, Янка Купала хваліў Фінляндыю, фінскі народ, як абураўся ганебнай вайной» (Беларусь. 1995. № 1. С 32).

Дзе ляжаць загоны Беларусі роднай.

Потым гэты алегарычны вобраз ценю яшчэ не раз паўторыцца ў творчасці паэта як сімвал вернасці і адданасці Бацькаўшчыне. Беларуская справа стала для яго даражэй самога жыцця.

Знаходзячыся ў Пецярбургу, Купала выступіў супраць віленскай чарнасоценнай газеты «Белорусская жизнь», якая, як успамінаў Я. Хлябцэвіч, «натраўлівала мясцовае грамадства супраць беларускай літаратуры і друку, абвінавачваючы іх у сепаратызме»[1].

Ён стварае вядомы свой верш «Гэй, капайце, далакопы...», у якім выкрывае тых, хто хацеў бы «пад аслонай ночы» затрымаць абуджэнне і развіццё нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Самае, так бы сказаць, цікавае, што тыя, хто збіраецца хаваць Беларусь у «яміне-магіле», самі па паходжанню беларусы. Пра аднаго з такіх «далакопаў» М. Гарэцкі пісаў у фельетоне «Нашы» (1913): «Пан Лукашэвіч (хто хоча, няхай чытае Солон ці як інакш), сын свайго беларускага народа, перш быў вучыцелем, потым... валасным пісарам, далей пралез у чыновенства, зрабіўся газетным пісакам за «тыя» грошы, скрабецца і ў Г. Думу, ... працаваў і «нашым, і вашым».

Як тое кажуць: на ўсе кепствы — майстра лепшы!»[2].

З'едлівая сатыра нашых класікаў, на вялікі жаль, не страціла сваёй актуальнасці і сілы і да нашых дзён.

8 ліпеня 1910 г. «Наша ніва» паведаміла, што ў Пецярбургу, у выдавецтве А. Грыневіча, асобнай кніжкай выйшла паэма Купалы «Адвечная песня». Тагачасная літаратурная крытыка па-рознаму сустрэла гэты твор. Крытык Рубер у артыкуле «З сялянскіх грудзей. Аб сучаснай беларускай паэзіі»[3] даў станоўчую ацэнку паэме, як і ўсёй творчасці Купалы. Затое з рэзкай крытыкай выступіў польскі друк. Варшаўскія крытыкі З. Пяткевіч у артыкуле «Янка Купала. «Адвечная песня» («Prawda». 1910. № 39) і Ч. Янкоўскі ў артыкуле «Беларуская паэма» («Kurjer Warszawski. 1910. № 339), звыклыя бачыць беларускую літаратуру ў шарачковай свіціне вобразнага выяўлення і традыцыйным абсягу слова, засталіся незадаволенымі новымі, «мадэрнымі» павевамі, якія яны адчулі ў «Адвечнай песні».

13 кастрычніка гэтага ж года друкарня Пянткоўскага выдала тыраж другога зборніка — «Гусляр». Паведамленне пра гэта з'явілася ў «Нашай ніве» ад 21 кастрычніка 1910 г.

Адной з іманентных заканамернасцей літаратурнай творчасці з'яўляецца тая, што пісьменнік ва ўсіх сваіх новых здабытках у той ці

[1] Полымя. 1953. № 9. С. 144.
[2] Гарэцкі М. Творы. Мн., 1990. С. 164.
[3] Наша ніва. 1910. 8 ліп.

іншай форме працягвае і развівае сваю першую кнігу. «Гусляр» таксама ў многім працягваў лінію «Жалейкі»:

Я нясу вам дар
Братніх скіб і сяліб,
Смутных сосен і ліп,
Думак дар, сэрца жар, —
Вольных, звонкіх песень чар.
Гэй! нясу вам дар!
Гэй! гэй! гэй!

*(«Я нясу вам дар»)*

Паэт па-ранейшаму не расстаецца з нескладанай поўнагалоснай рыфмай (Купала любіў поўнагалоссе), але развівае яе магчымасці, ставячы ў канец радка, «пад рыфму», паэтычна значныя, эмацыянальна насычаныя словы: дар — жар — чар...

Многія старонкі «Гусляра» зноў і зноў сведчылі пра адчужанасць і закінутасць чалавека ў свеце сацыяльнай несправядлівасці і звярталі ўвагу на гаротнае жыццё «прыніжаных і зняважаных»:

З іх жыцця без жыцця, з іх бяднот і цямнот
Карыстае бяспуцце, як можа;
І ніхто ж не жалее, як вечных сірот,
Ні свой брат, і ні ты нават, Божа!

*(«Адгукніся, душа!..»)*

Паэт — як прарок — вядзе гаворку з небам. У гэтым, думаецца, асаблівасць «Гусляра» — кнігі, у цэнтры якой знаходзіцца, што называецца, чалавек з вялікай літары. Магутны духам, ён хоча скарыстаць сваё права на самарэалізацыю, на апраўданне свайго чалавечага прызвання. Тут Купала працуе на ўсю шырыню свайго таленту — зборнік «Гусляр» раскрывае духоўны свет чалавека ў яго імкненні да поўнага разняволення і свабоды — і не ў абыякіх маштабах, а ў маштабах усяго чалавецтва. Для гэтага патрэбны былі моцныя паэтычныя крылы, і Купала іх меў.

Адна з цэнтральных тэм зборніка — мастак і свет, мастак і народ. Яна гучыць у вершы «Сон» («Дарогай змучаны далёкай...») і ў шэрагу іншых твораў. «Сон» аўтар прысвяціў свайму настаўніку У. Самойлу:

Я лесам шоў; якаясь змора
Вяла па ім мой спячы дух,
А лес быў цёмны, як дно мора,
Як мора дно, быў нем і глух.
Я заблудзіў, і страшна стала
Мне ў гэтай пушчы аднаму;
Ды бурай неба рагатала...

І ўздумаў я: пamру вазьму!
Надзея з вераю нямелі...
Тады, як з неба ці з зямлі,
Якаясь цень падходзе ў белі,
Такая, быццам знаў калі...

Сітуацыя падобная той, якую сустракаем у пушкінскім «Прароку». У вершы Купалы таксама адбіліся напружанасць і самаахвярнасць духоўных пошукаў паэта, якія дапамагаюць яму зразумець сутнасныя сілы жыцця, пазнаць яго сэнс, далучыцца да ісціны.

Купалаўскі «цень у белі» нагадвае пушкінскага «шасцікрылага серафіма»:

І кажа мне: «Чаго, сын міра,
Упаў так сэрцам і душой?
Я — песня, а во мая ліра!
Бяры нас! Хочам быць з табой.
І страх жыцця цябе аставе,
І бор пачне шумець жыццём;
Мы след пралoжым табе к славе,
Чаго жадаў, мы ўсё дадзём».
І дзіва! блуд і страх мой зломан:
Лес прасвятлеў, загаманіў,
Мне стаў паняцен пушчы гоман...
Тут я збудзіўся, недасніў[1]

Паэт узнімаецца ў шырокія прасторы духоўнасці, а ідэалы сацыяльнага вызвалення і палітычнай свабоды ў яго свядомасці арганічна аб'ядноўваюцца з ідэяй духоўнага самаўдасканалення. У што б гэта ні стала ён хоча абудзіць у чалавеку здольнасць духоўнага росту. Адсюль — напал пачуццяў:

Гэй, гусляр, гусляр!
Ты удар, удар
    Па струнах-званах.
    Дай нам з песень-чар,
    Дум вялікіх дар,
    К сонцу зорны шлях,
    Дай, гусляр, гусляр!..
                *(«Гусляр»)*

Праграмныя вершы «Сон», «Гусляр» і некаторыя іншыя былі, думаецца, напісаны не без уплыву У. Самойлы, эстэтычныя погляды якога фарміраваліся пад уздзеяннем рускага сімвалізму. Рэцэнзуючы збор-

---

[1] Kupała J. Huślar. Pieciarburh, 1910. C. 12-13.

нік «Жалейка», ён знаходзіў у Купалы, як ужо гаварылася, празмерны «палітычны ўхіл». Цяпер, у новай кнізе паэзіі, Купала, услед за сваім настаўнікам, лічыць паэта не толькі дзіцем свайго часу і асяроддзя, але і сынам вечнасці, «сынам міру» (верш «Сон»), адзначаным пячаткай прагістарычных і касмаганічных сувязей. Купала як бы адчуў духоўную першаснову светабудовы, яе таямніцу, і ён па-новаму ставіць пытанне аб ролі чалавека ў светабудове.

Сваю самотнасць Купала ўсведамляў і перажываў як абранасць. Паэт — гусляр — сын міру — сейбіт — абраннік. І гэта фундаментальная ўласцівасць яго паэтычнага светапогляду не толькі не аддаляла песняра ад сацыяльнага накірунку творчасці, а, наадварот, узмацняла яго ролю як званара, прарока, будзіцеля народных мас.

Крах рэвалюцыі 1905-1907 гг. не перакрэсліў рэвалюцыйных спадзяванняў на будучыню:

Ты ад гумн да гумн
Запануй, гусляр!
Дай паходням жар,
Лінь жыццё ў бор-яр.
Не мінай акон;
Строй ваякаў шар,
Кроў сагрэй, як вар,
Сказам новых дзён...
Грай, будзі, гусляр!
*(«Гусляр»)*

Нацыянальная праблематыка ў «Гусляры», як мы ўжо казалі, атрымлівае больш грунтоўнае мастацкае асэнсаванне — больш глыбока і поўна раскрываецца перад паэтам сам чалавек, і не толькі як прадстаўнік народа, нацыі, але і як прадстаўнік чалавецтва. Аўтарам «Гусляра» рухала прага не больш і не менш як абнаўленне і пераўтварэння чалавецтва. У сувязі з гэтым абсягі яго светапогляду рэзка пашыраюцца: паэт імкнецца асэнсаваць чалавека ў яго сувязях з грамадствам, прыродай, космасам, гісторыяй. У «Гусляры» знаходзім глабальнае адчуванне эпохі, глыбіні і маштабу яе канфліктаў і катаклізмаў. Відаць зрух у самім спосабе ўспрымання свету. Мяняецца пункт гледжання, далягляды бачання, з'явіўся погляд «зверху», якога ў «Жалейцы» не было, адкрываецца своеасаблівая «касмічная свядомасць». У лірычным перажыванні ўсё больш адлюстроўваецца ўнутраны стан паэта, верш вызваляецца ад традыцыйнай для беларускай паэзіі сюжэтнасці і апісальнасці.

Купала высока цэніць пачуццё асабістай свабоды чалавека. У дачыненні да зборніка «Гусляр» гаворка можа ісці нават не толькі пра

сваботу, а пра свабоду як неабмежаваную волю. Асоба Купалы пратэстуе супраць усялякага прыгнёту і ўціску — гаворка ідзе не толькі пра ўціск грамадства і дзяржавы, але і аб саміх асновах светаўладкавання. Усёй істотай сваёй паэт хоча вызваліцца ад улады зямных турбот, судакрануцца з вечнай таямніцай Сусвету. Хіба не пра гэта гаворыць верш «І вецер, і сокал, і я...»?

І вецер, і сокал, і я —
Сыны адной долі-жыцця,
Наводзім маркотныя мы
І думы, і песні адны.
Як вецер, і я б так ляцеў.
Як вецер, аб тым самым пеў.
Як вецер, свабодны мой дух.
Хоць гора цягаю ланцуг.

Маланкавыя ўсполахі купалаўскіх метафар зырка асвятляюць самыя, здавалася б, патаемныя куткі чалавечых жаданняў. У памкненнях сваёй душы Купала перасягае сацыяльна-палітычныя і пабытова-эканамічныя межы і ўяўленні і яго творчасць набывае касмаганічныя рысы:

Як сокал, і я б мкнуў да зор:
Там сонца, раздолле, прастор;
Без жалю б пакінуў зямлю,
І хатку, і долю сваю.

Купалаўскі герой адчуў сваю прыналежнасць да сіл жыцця, што пульсуюць як унутры яго істоты, так і ў касмічных маштабах, выклікаючы аграмадны прыліў чалавечай энергіі, здольнай перабудаваць свет паводле прынцыпаў гуманізму і дабра. Менавіта ў такім напрамку развіваецца купалаўскі рамантызм:

Дайце разгону, прастору
Дрэмлючым песням і сілам, —
Дрогне запор наймацнейшы,
Мы ўскалыхнём і магілай.
Продка адвечную думу
Праўнук санлівы пачуе;
Што ўзяць курган нам маніўся,
На кургане адбудуем.
Шлях залаты працярэбім,
Зорна ўзнясёмся ў высоты
Вышай няпраўды, няславы,
Вашай пакутных балотаў.

*(«Песня і сіла»)*

Паэзія «Гусляра» падпарадкавана рамантычнамуператварэнню празаічнай рэчаіснасці ў рэчаіснасць незвычайную, «магічную», якая адпавядала ўнутранаму стану паэта. Гэты высокі рамантызм, абумоўлены не толькі сваім, нацыянальным, болем, але і тым, што пецярбургскія сімвалісты называлі «мировой скорбью».

У «Гусляры» часамі гучаць нават ідэі ніцшэанства, абумоўленыя тым, што лірычны герой, трактуючы сваё зямное існаванне ў касмаганічных танах, набывае прыкметы своеасаблівага тытанізму.

Вядома, у купалаўскім касмізме (і тытанізме) ёсць ірацыянальны момант, звязаны з глыбіннымі ўласцівасцямі душы лірычнага героя, які, што б там ні было, жадае сцвердзіць сваю асабістую волю і характар. Але галоўнае — у іншым. Купала прагне стварыць сваю паэтычную мадэль светабудовы, якая павінна даць чалавеку схрон і ахову ад зла і безвыходнасці, якія акружаюць яго сярод зямной юдолі

Не выключана, што яму траплялі на вочы радкі з папулярнай у тыя часы кнігі нямецкага астранома Г. Клейна «Астранамічныя вечары», выдадзенай у 1900 г. у Пецярбургу: «У кожным чалавеку, які мысліць, жыве затоенае імкненне ўзняцца над сферай зямнога і пранікнуць — хаця б толькі ў думках — у царства небных свяціл, якія сёння, як і тысячы гадоў назад, ззяючы, глядзяць уніз кожную ясную ноч. Паглядзіце на зоры, калі яны бязгучна, у нямой веліччы, праходзяць свае нябесныя шляхі, успомніце пра акіян часу і прасторы, аб якім гаворыць гэтыя бліскучыя кропкі, і вас міжвольна ахопіць пачуццё вечнасці»[1].

Космас, як цяпер даказана, прымае ўдзел у ахове прыроды і самога чалавека як яе часткі. Філосаф М Бярдзяеў сцвярджаў. «Чалавек — арганічны член сусветнай, касмічнай іерархіі, і багацце яго зместу прама прапарцыянальна яго спалучанасці з космасам»[2].

Цікавасць да касмічнага зорнага неба падагрэла ў Купале, мусіць, і камета Галея, якая ў 1910 г. прамчалася над светам, выклікаўшы сваім з'яўленнем мноства абвостраных эсхаталагічных перажыванняў.

Аднак купалаўскі касмізм істотным чынам адрозніваецца ад касмічных медытацый нямецкага навукоўца і перажыванняў эсхатолагаў. Паэт таксама набліжае чытача да новых уяўленняў пра свет, аднак касмічнае ў Купалы ўсё ж такі не адасабляецца ад зямнога:

К зорам агністым, к прыволлю нябеснаму,
Вырваўшы з ціны жыццёвай душу,
Мчыся, не дайся цярпенню балеснаму,

---

[1] Клейн Г. Астрономические вечера. СПб.. 1900. С 1
[2] Бердяев Н. Собр. соч. Смысл творчества Париж. 1985 Т. 2. С 119.

Горда пакінь земляную глушу!

Імкненне да недасягальнага, вечная незадаволенасць — родавыя прыкметы рамантычнага героя. У космасе, як вядома, пануе ледзяны холад, і паэт хоча яго пераадолець, ён імкнецца да свабоды і духоўнай незалежнасці:

З зораў, з-пад неба ўсё быцце зямельнае
Проймеш паглядам цікавым наскрозь;
Бачыці будзеш — з жыццём нераздзельныя
Крыўду, бяспуцце, нянавісць і злосць.
*(«К зорам»)*

У даным і іншых падобных выпадках маем справу з выключна смелымі, мастацкі пранікнёнымі ўсплёскамі творчага духу паэта, страснымі памкненнямі да разняволення і свабоды. Гэта своеасаблівае эмацыянальнае асэнсаванне драматызму чалавечага існавання на зямлі, пазбаўленага сувязі з космасам, бо менавіта космас, погляд на зоры (чалавеку стала не да зораў) напаўняюць жыццё разумным, «небным» сэнсам. Чалавеку — на думку паэта-летуценніка — няма іншага выйсця, як толькі ўзняцца над празаічным укладам зямнога быцця, паяднаўшыся з прыроднымі стыхіямі космасу. Касмізм Купалы — гэта яго балючае рэагаванне на трагічную алагічнасць жыцця.

За гэтым стаіць таксама, трэба думаць, і горкае расчараванне ў спадзяваннях на хуткія рэвалюцыйныя перамены, і крызіс веры ў магчымасць такіх перамен...

Словам, касмізм Купалы — важнейшая грань яго таленту, выяўленне творчай інтуіцыі і глыбіннага душэўнага вопыту. Гэта паэт-прарок варожыць па зорнаму небу. Яно для яго не проста безжыццёвая прастора, а нешта адухоўленае, не чужое, здольнае тварыць суд над чалавекам па законах дабра і справядлівасці. Космас патрэбен яму, каб выканаць сваё прызначэнне, ажыццявіць чалавечыя магчымасці, рэалізаваць якія ён можа толькі з усім навакольным светам прыроды.

У гэтым, думаецца, праявілася таксама антыбуржуазнасць паэта, які выступаў супраць неабуджаных, супраць тых, хто спіць, супраць чыноўніка і мешчаніна. У самазадаволеным абліччы абывацеля бачыўся яму чалавек, што адпаў ад вечнага ідэалу, плоскі і шэры, заклапочаны ўсяго толькі матэрыяльнымі інтарэсамі штодзённага жыцця. У паэта ж — супрацьлеглыя інтарэсы:

Мець бы мне крылі саколія,
Мець бы мне волю зарніцаў,
К нізям не рваўся б ніколі я,
З высі б глядзеў на зямліцу.
Зможаны ж гібелі сілаю,

Век рвучысь далей і далей,
Хмарка была б мне магілаю,
Зоры памінкі б спраўлялі.
Вось і па смерці з зямліцаю
Знацца не трэба ўжо будзе...
Быці, ой, гэтак! — крыніцаю
Радасць плыла бы мне ў грудзі.

*(«Шчаслівасць»)*

Паэтычная фантазія не мае межаў, але ў інтэлектуальным і эмацыянальным плане яна цалкам апраўдана. У Купалавым «Гусляры» яна раскрыла і паказала неабмежаваныя магчымасці чалавека, сусветныя маштабы яго асобы. Лірычны суб'ект уведзены тут, можна сказаць, у абсалют, што надае незвычайны размах вобразна-эмацыянальным абагульненням, пашыраючы іх да філасофскіх абсягаў.

Філасафічнасць пошукаў паэта абумоўлена імкненнем заглянуць у таямніцу часу, зразумець рух гістарычнага працэсу. У некаторых момантах ён наследуе біблейскаму Эклізіясту, які канстатаваў бяссілле чалавека перад тварам Часу. Гэта тычыцца такіх вершаў, як «Ноч за ночкай», «Адцвітанне», «Воўк», «Грабар», «Запушчаны палац», «За годам год» і інш.

Нічога вечнага на свеце
Няма для шумнага жыцця;
Здарэнні, многія сталецці
Ідуць пад века забыцця.

*(«Кругаварот»)*

Чалавек падпарадкаваны гэтаму вечнаму кругазвароту, і ніштo, здаецца, не дае яму магчымасці ўзняцца над ім — ні сіла духу, ні высакароднасць, ні дабрыня.

Аднак закрадваецца і іншая думка, што падказана ўсё той жа светабудовай, якая так блізка падпусціла паэтакасміста да разгадкі сваіх таямніц:

Плача сонца маладое
Над планетай над старою,
    Іскры сыплюцца цурком.
    Што не тымі пуцінамі
    Ходзяць леты за лятамі
    Ў вечным Эладзе з курганом.

*(«Знямога»)*

Сонца плача іскрамі — цікавы, адраджэнскі па сваёй паэтычнай энергетыцы вобраз. І вельмі хацелася верыць у прадказанні гэтага

іскрыстага сонца, якое абяцала шчаслівыя змены і ў сацыяльна-гістарычным абліччы свету.

Сейбіт — герой некаторых Купалавых вершаў — асэнсоўваецца як пасланец сонца.

Вось такія «перапады» ў амплітудзе паэтавых адчуванняў — ад расчаравання ў гістарычным прагрэсе да надзеі на магчымасць усё ж такі прывесці яго ў чалавечую норму...

Прарочая доля купалаўскага паэтычнага дару, здавалася б, не стымулявала індывідуальна-інтымнага самараскрыцця паэта як чалавечай адзінкі, але гэта не так. Тэма кахання — адна з цэнтральных у яго творчасці, значнае месца яна заняла і ў «Гусляры», таму што само пачуццё кахання заўсёды заставалася важнейшай гранню купалаўскага паэтычнага характару. Каханне для лірычнага героя «Гусляра» — шлях выйсця ад тытанізму, у пэўнай ступені ўсё ж такі індывідуалістычна абмежаванага, да людзей, да паўнаты зямнога быцця. Каханне выступае ў паэзіі Купалы як чалавечы знак, як крытэрый чалавечнасці, якая супрацьстаіць сілам зла. Каханая — прамень сонца ў змрочнай рэальнасці:

Ты адзінокай, я сіратою —
Возьмем і пойдзем разам з табою
  Колкай жыцця пуцявінкай;
  Долю, нядолю, сэрца і думы,
  Зложым скарб гэты ў скрыню адну мы,
  Будзь ты маёю, дзяўчынка!

*(«Дзяўчынцы»)*

У вершы «Дзяўчынцы» адлюстроўваўся, па сутнасці, народны ідэал кахання.

У адным выпадку гэта каханне, якое ўвабрала ў сябе звычайную зямную прыгажосць, у другім — грунтуецца на ўзнёслых, звышнатуральных пачуццях, нават з дапушчэннем пэўнай экзальтацыі. Аднак і ў адным, і ў другім выпадку ў інтымных перажываннях лірычнага героя шчыра выявіўся свет чалавечай душы, багацце і шматстайнасць высокіх пачуццяў.

У «Нашай ніве» была змешчана і рэцэнзія А. Бульбы на новую купалаўскую кнігу. У ёй гаварылася: «Пануе ў творах Янкі Купалы фантазія, адмыкае ў ім вялікае багацтва форм, напаўняе яго думы, і ліецца песня гусляра. Багацтва пастраенняў прабіваецца ў кожным яго творы. У кароткім вобразе маем колькі вобразаў, гарманічна зліваючыхся ў адзін, каторы малюе пуцяводную думку. Ці кінецца Купала ў даўкі быт, ці загляне ў даўкі курган, што віднеецца на нашай

бацькаўшчыне... — з усяго дабудзе тон роўны, дабудзе той асобны беларускі матыў. І верыць, што «моц сваю свету пакажам...»[1]

Крытык меў рацыю. «Гусляр» — кніга надзеі. Купалаўскі герой — істота касмічная ў такой жа ступені, як і зямная. Сінтэз аднаго і другога адкрываў перад ім будучыню.

Гэты зборнік паказаў таксама павышэнне культуры купалаўскага верша, яго мастацкай формы. Паэт дасягнуў высокага ўзроўню сінкрэтызму гукапісу, пластыкі, інтанацыі, якія спалучаюцца ў адзіным лірычным пафасе.

Вершы непасрэднай рэвалюцыйнай накіраванасці — такія, як «Перад вісельняй» (1908), «Зваяваным» (1909) — у зборнік «Гусляр» не ўвайшлі. Пазней паэт успамінаў, што Б. І. Эпімах-Шыпіла, «баючыся, каб гэты зборнік не прынёс яму столькі клопату, колькі «Жалейка», выкінуў усё тое, што магло не спадабацца цэнзуры, і на ўсякі выпадак надрукаваў зборнік адной лацінкай, каб лягчэй было абысці цэнзара»[2].

Летам 1910 г. упершыню з творамі Янкі Купалы пазнаёміўся Максім Горкі. Асабліва спадабаліся яму «А хто там ідзе?» і «Адвечная песня». У лісце да ўкраінскага пісьменніка М. Кацюбінскага ад 7 лістапада 1910 г. ён пісаў: «У Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлопцы! Так прымітыўна-проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым бы трошкі гэтых якасцей! О, Божа! Вось бы добра было!»[3] «Прымітыўна-проста» — гучыць у вуснах Горкага як пахвала. Справа ў тым, што ён на той час глыбока расчараваўся ў паэзіі рускіх сімвалістаў, якія, на яго думку, надта аддаліліся ад рэальных патрэб жыцця і знаходзіліся ў палоне дэкадэнцтва. Паэзія Купалы і Коласа здалася яму надзвычай значнай і істотнай паводле зместу і формы. Неўзабаве Горкі пераклаў на рускую мову верш «А хто там ідзе?» і лічыў неабходным перакласці паэму «Адвечная песня». І хаця пастаяннай духоўнай блізкасці не было, але цёплыя адносіны паміж Горкім і Купалам захаваліся на ўсё жыццё.

[1] Наша ніва. 1910. 22 кастр.
[2] Полымя. 1947. № 6. С. 72.
[3] Горький М. Собр. соч. В 30 т. М., 1955. Т. 29. С. 138-139.

## «КУРГАН». «СОН НА КУРГАНЕ». СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ КУПАЛАЎСКАГА РАМАНТЫЗМУ

Пасля «Гусляра» ўсім стала зразумела, што ў асобе Купалы беларуская літаратура набыла выдатнага паэтарамантыка. Рамантызм — заканамерная з'ява літаратурнага працэсу, і, здаецца, ніводная літаратура свету яго не абмінула. У Заходняй Еўропе ён узнік на ўзмежжы XVIII-XIX стст. на глебе адыходу ад рацыяналістычнага светапогляду. У немалой ступені ён паўплываў таксама на развіццё новай беларускай літаратуры, якая заявіла аб сабе ў пачатку XIX ст., але, у сілу вядомых прычын, як след сябе не праявіў. Давялося чакаць яшчэ сто гадоў, і ў пачатку XX ст. М. Багдановіч з поўным правам пісаў: «Наша пісьменнасць яшчэ толькі зараджаецца, рамантызм для яе — не пройдзеная ступень, як у іншых літаратурах, а рэч зусім свежая».

Свежая, дададзім мы, таму, што жывілася самой рэчаіснасцю. Гэта быў, нагадаю, пераломны час тэктанічных зрухаў у свядомасці народных мас і іх сацыяльным становішчы, у развіцці навукі, тэхнікі, мастацтва. Купалу ўжо не заўсёды задавальняў стары, багушэвічаўскі пазітывісцкі рэалізм. Больш смела, у параўнанні з папярэднікамі, заглыбляўся ён у духоўную прыроду чалавека, шукаючы ў ёй апору для сваіх мастацкіх азарэнняў. XX ст. несла шмат новага ў пісьменніцкую творчасць. Светапогляд людзей XIX ст. абапіраўся на дакладную навуку і пазітыўныя веды. Многія буйныя мастакі і інтэлектуалы заўважылі на пачатку XX ст., што далёка не ўсе дзеянні і ўчынкі асобы вызначаюцца яе свядомасцю і ўласцівай для яе логікай сацыяльна-псіхалагічнага дэтэрмінізму і што сам дэтэрмінізм не заўсёды дастатковы для вытлумачэння думак і паводзін чалавека. Унутраны свет купалаўскага героя з уласцівымі для яго магчымасцямі выбару і самавыяўлення фарміруецца не толькі рацыянальна-лагічнымі ведамі і вопытам, але і ірацыянальным пачаткам (эмацыянальна-вобразным, асацыятыўным, інтуітыўным і г. д.). Гэта давала магчымасць адысці ад паўсядзённасці, захоўваючы ў той жа час шырокія сувязі з жыццём, на чым рабіў акцэнт А. Блок у сваёй прамове, якая так і называлася: «Аб рамантызме» (1919).

А. Блок гаварыў: «Пад рамантызмам у прастамоўі прынята заўсёды разумець нешта, хоць і вельмі ўзнёслае, але адцягненае; хоць і паэтычнае, але туманнае і расплывістае; а галоўнае — далёкае ад жыцця, адарванае ад рэчаіснасці...» На самой жа справе, працягваў ён, «сапраўдны рамантызм не быў адмаўленнем ад жыцця; ён быў, наадварот, напоўнены прагным імкненнем да жыцця, якое адкрывалася яму ў святле новага і глыбокага пачуцця...» Сапраўдны

рамантызм, па перакананню паэта, ніколі не парывае з рэалізмам, «паколькі сапраўдны рэалізм, рэалізм вялікі, рэалізм вялікага стылю, складае самае сэрца рамантызму».

Купалаўскі рамантызм абуджаў і развіваў эмацыянальную прыроду паэзіі. Гэта быў, па сутнасці, новы напрамак мастацкай творчасці, так званы пострамантызм, звязаны з больш глыбокім разуменнем чалавека ў яго суадносінах з сучаснасцю, гісторыяй, космасам. Гэты напрамак у Купалы ўзнік і сфарміраваўся на глебе незадаволенасці і нязгоды з існуючым станам рэчаў, ён рваўся і клікаў у бясконцыя далі жыцця, да недасяжнага ідэалу. Паэта-адраджэнца, удзельніка нацыянальнавызваленчага руху хвалявала шчырасць і паўната чалавечых пачуццяў, новае ўспрыманне свету, гераізм асобы. Ён імкнуўся пераадолець жыццёвыя супярэчнасці, знайсці шляхі выйсця з тупіковага становішча, адкрыць патаемныя сілы чалавечага духу, невядомыя ці недаацэненыя раней, але вельмі неабходныя для аднаўлення разбуранай гармоніі.

Дух рамантычнага пратэсту ўвасабляўся ў самых разнастайных карцінах, вобразах і сюжэтах яго паэтычных твораў. Адно з вышэйшых дасягненняў купалаўскага рамантызму гэтага плану — паэма «Курган», праца над якой была завершана ў маі 1910 г. у Пецярбургу.

У цэнтры твора — гераічны вобраз безыменнага гусляра, у якім увасобіліся лепшыя рысы народнага характару і духоўны ідэал паэта. Гусляр з паэмы «Курган» у духоўным сэнсе вельмі блізкі да лірычнага героя зборніка «Гусляр», у якім Купала паказаў чалавека ў памкненні да ўсеагульнай свабоды. У адным і ў другім выпадку такім чалавекам з'яўляецца мастак. Купалу моцна хвалявала спрадвечная праблема мастака і ўлады. Яе вастрыню ён зведаў на асабістым вопыце. Цяпер мы можам сказаць, што яна неадчэпна праследавала паэта ўсё жыццё. Заклікаючы чалавека скінуць з плячэй ненавіснае ярмо прыгнёту, мастак павінен даць прыклад сваёй уласнай творчасцю.

І ў зборніку «Гусляр», і ў паэме «Курган» галіной ўзнёслага для паэта з'яўляецца стыхія магутнага чалавечага духу і яго свабоднага развіцця. І ў адным, і ў другім выпадку героі адзначаны рысамі тытанізму, што, як гаварылася, ішло ад імкнення чалавека сцвердзіць сваю годнасць і высокае прызначэнне. Тытанізм тут унёс ідэю не эгаістычнай, а свабоднай асобы. Дэмакратызм, уласцівая яму высокая сумленнасць робяць купалаўскі тытанізм высакародным і чалавечным.

Сюжэт паэмы — паядынак гусляра і князя, канфлікт паміж якімі аўтар імкнецца ўзняць на вышыню вечных катэгорый. У глыбінях нацыянальнай гісторыі ён знаходзіць матэрыял для пастаноўкі праблем, якія мелі і маюць агульначалавечую значнасць.

Каб пацешыць вяльможных гасцей, запрошаных на вяселле дачкі, князь кліча вядомага на ўсю ваколіцу музыку-гусляра і ставіць перад ім умову:

Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям —
Поўны гуслі насыплю дукатаў;
Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам —
Канапляную возьмеш заплату.

Характар народнага гусляра рамантычны па сваёй эстэтычнай прыродзе: паэт разумеў рамантызм як служэнне ідэі. Купалаўскі рамантызм быў бунтарны, узнёслы і ваяўнічы, для яго ўласціва ўзбуйненне асобы, цікавасць да магчымасцей чалавека, вера ў яго сілы. Таму «Курган» часам называюць паэмай-баладай, і ў гэтым шмат праўды, бо балада — гэта спрэчка чалавека з лёсам, сцвярджэнне высокіх духоўных каштоўнасцей, гераізму. Гусляр у «Кургане» адчувае сябе пасланцом неба. Як рамантык, віція, ён не кіруе самім сабою, не мае ўлады над тымі глыбока стоенымі ў ім унутранымі сіламі, якія стыхійна выбухаюць у яго свядомасці. Папярэджанне князя не можа яго спалохаць. У сваёй песні ён выказвае ўсю праўду пра князя, што бязлітасна крыўдзіць свой народ, трымае яго пад страшэнным уціскам, і пра цяжкую долю падданых.

Гераічнае ў паэзіі Купалы звязана з трагічным. Трагічнае ў «Кургане» нараджаецца на падставе выяўлення чалавекам сваіх гераічных якасцей, на аснове сутыкнення яго з жорсткасцю і антычалавечнасцю варожага свету. За свой смелы ўчынак гусляр паплаціўся жыццём, прыняўшы страшную смерць, — па загаду князя музыку жывым закапалі ў магілу.

Прызванне мастака, на думку Купалы, — праўда і справядлівасць. Гусляр як сапраўдны мастак застаўся верны свайму прызванню.

Зло, жорсткасць, антычалавечнасць увасоблены ў постаці князя, які зацікаўлены, каб народ не ведаў свайго імені, каб ён вечна знаходзіўся ў пакоры і духоўным ярме. Па сучасных паняццях, ён стварыў свой культ. Карацей кажучы, перад намі тыран, у вобразе якога адлюстраваліся не толькі антынародныя і антыдэмакратычныя сілы, але і сілы нацыянальнай здрады і нігілізму. Пазіцыі князя і мастака несумяшчальныя.

Пра гэта, праўда, з іншай нагоды напамінае сучасны пісьменнік Васіль Быкаў: «Відаць, творца асуджаны на сталае супрацьстаянне з Уладаю. Для сумленнага мастака гэта, мабыць, непазбежна...»[1]

---

[1] ЛіМ. 1992. 7 лют.

Вобразам гусляра Купала сцвярджае сумленнасць і непадкупнасць народнага генія, адкрывае ў ім здольнасць бачыць свет далёка і ўсеахопна:

Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая
Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.

Трагічныя ноты, якія гучаць у паэме «Курган», пакідаюць глыбокае ўражанне, аднак не даюць падставу гаварыць пра песімістычны характар светаўспрымання аўтара. У князя шмат сіл і магчымасцей, але скаваць ланцугамі вольныя думы не можа нават ён.

Гістарычны аспект у сюжэце паэмы — рэч, зразумела, даволі ўмоўная, але калі мець на ўвазе і гэта, то трэба сказаць, што твор быў скіраваны супраць матэрыялістычнага абездухоўлення гісторыі, аўтар шукаў там постаці барацьбітоў за народную долю, ідэі і ўрокі, прыдатныя для сучаснасці.

Да буйнейшых выяў купалаўскага рамантызму належыць таксама драматычная паэма «Сон на кургане». Задумаў ён гэту рэч яшчэ ў Вільні, а скончыў ў Пецярбургу ў жніўні 1910 г. Асобным выданнем твор выйшаў у 1912 г. у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» (альманах «Маладая Беларусь»). Твор напісаны ў перыяд інтэнсіўнага асэнсавання рэвалюцыйных падзей, якія толькі што мінулі, і ў ім адбіўся пакутлівы роздум паэта над складанымі шляхамі сацыяльнай і нацыянальнавызваленчай барацьбы і лёсам яе ўдзельнікаў. Ідэйны змест твора ў агульным плане акрэсліў М. Ярош, на думку якога гаворка ў «Сне на кургане» ідзе «перш за ўсё пра людзей, пра іх пакутліваe, поўнае трагізму жыццё ў буржуазна-памешчыцкім грамадстве, пра пошукі народам вялікага скарбу — свабоды»[1].

Пасля падаўлення рэвалюцыі 1905-1907 гг. пачаўся перыяд масавых арыштаў і ваенна-палявых судоў. Сталыпінскія парадкі ў краі пасля спаду рэвалюцыйнай хвалі Купала пазней называў «царствам ночы і цемры». Многія дзеячы беларускага рэвалюцыйнага руху сядзелі па турмах ці былі высланы ў Сібір, не відаць было ніякіх колькі-небудзь выразных перспектыў на паляпшэнне сацыяльных, палітычных, культурных умоў жыцця. Пануючыя класы не толькі не аслаблялі цяжар уціску, які гнуў народныя плечы, але яшчэ больш павялічвалі яго, узмацнялі рэпрэсіі супраць тых, хто выяўляў нязгоду з існуючым грамадска-палітычным ладам. Гэта быў час, калі хіба што толькі літаратура магла яшчэ падаць беларусу надзею на лепшую будучыню.

---

[1] Ярош М. Пясняр роднай зямлі. Мн., 1982. С. 109.

У «Сне на кургане» ў параўнанні з папярэднімі творамі паглыбляецца філасофскі аспект мастацкага пазнання. Адзін з даследчыкаў — І. Навуменка — знайшоў у ім «роздум Купалы аб гістарычным мінулым народа, які ў рэвалюцыі шукаў здзяйснення сваіх сацыяльных і нацыянальных спадзяванняў, аб узаемадачыненнях правадыра, рэвалюцыйнага важака, і народнай масы, аб пошуках контррэвалюцыі, якая, падавіўшы рэвалюцыю, імкнецца натравіць народ на лепшых яго сыноў — рэвалюцыйных кіраўнікоў, — вось рэальны змест паэмы, які праглядвае з-за сімвалічнай, алегарычнай бутафорыі, што акутвае хісткім полагам шматзначнасці многія вобразы і карціны твора»[1].

Ідэйна-эстэтычная прырода гэтага шэдэўра, якая выявіла сябе ў алегарычна-сімвалісцкай форме, патрабуе актыўнасці чытацкага ўспрымання. Цяжка быць упэўненым, што драматычная паэма «Сон на кургане» канкрэтна прывязана да рэвалюцыйных падзей пачатку XX ст. Не, тыя часавыя абсягі, што пакладзены ў аснову твора і яго праблематыкі, значна шырэй. Пра гэта сведчыць змест паэмы, якая складаецца з чатырох дзеяў-«абразоў».

У першай дзеі «У пушчы» паэт малюе карціну крыўды, падману і злачынстваў, якія складаюць неад'емную ўласцівасць чалавечага грамадства. Акрамя гэтага, ёсць тут і нацыянальны, уласна беларускі каларыт — тое, пра што некалі пісаў А Кіркор у кнізе «Живописная Россия»: «Белоруссия — край могил, курганов, городищ, городков, урочищ, замков, замковищ — край, где чуть не на каждом шагу вы встречаете следы минувшего в памятниках, сказаниях, песнях»[2].

Дзея адбываецца ўночы, у дзікім запушчаным лесе, які вырас на старадаўнім кургане. Сярод буралому і беспрасвецця, навокал кургана блудзіць Сам, шукаючы дарогі дадому, і, змогшыся, засынае. Русалкі навяваюць яму сон — «сон на кургане». Яму прысвечана другая дзея-«абраз» «На замчышчы». Сон Сама — «казка долі яго», якая пачынаецца ад дзядоў. Сам паўтарае долю сваіх продкаў, імкнучыся, як і яны, авалодаць скарбамі, якія некалі схаваў «хтось адзін вельмі багаты» ў лёхах замчышча. У гэтым яму перашкаджае нехта Чорны, выбіваючы з рук тапор, якім Сам хацеў адчыніць лёхі замчышча. Сон Сама — як пра яго расказана ў паэме — гэта вяртанне да радаводных каранёў, спроба самапазнання, вяртання ў памяць роду, абуджэння духоўных сіл. Гэта знайшло адлюстраванне ў песні Сама, у якой ёсць такія словы:

Ходзім, блудзім, снуем без прыстанішча,

---

[1] Навуменка І. Янка Купала: Духоўны воблік героя. Мн., 1967.
[2] Киркор А. Живописная Россия. М., 1882. С. 236.

Адпраўляем старыя малітвы
На забытым самымі курганішчы,
Дзе спяць сведкі нявыйграных бітваў.

Працэс самапазнання Сама парушаюць відмы, яўна незацікаўленыя ў абуджэнні яго самасвядомасці.

Тым часам дзея паэмы пераходзіць у рэальны план: здараецца пажар — гарыць роднае селішча, куды накіроўваўся Сам. На сцэне з'яўляюцца пагарэльцы — яўрэйская сям'я з рэшткамі маёмасці, вяселле, якое разагнаў пажар, соцкі з парожнім вядром у руках, іншыя жыхары згарэўшай вёскі, што ўратаваліся ад пажару. У падпале абвінавачваюць Сама.

Карціна пажару, мяркуючы па ўсім, мае алегарычны сэнс і пэўнае палітычнае значэнне, за якім угадваюцца падзеі рэвалюцыі 1905 г. ці, можа, якога-небудзь з папярэдніх паўстанняў. Сам, як сведчаць вяскоўцы, быццам бы бег «са смолкай і саломай» падпаліць воласць, і пры ім была сякера.

Гаворачы пра «Адвечную песню», мы ўспаміналі п'есы Л. Андрэева «Жыццё чалавека» і «Цар-Голад», тыпалагічна блізкія купалаўскай драматычнай паэме. «Сон на кургане» прымушае згадаць яшчэ адзін твор рускага пісьменніка — напісаную ў 1907 г. аповесць «Цемра».

Герой «Цемры» — эсэр-тэрарыст, г. зн. вельмі актыўны прафесійны рэвалюцыянер, якім авалодвае сумненне ў магчымасці што-небудзь змяніць у гэтым жыцці. Як і ў «Адвечнай песні», Купала і на гэты раз таксама ў нечым лічыцца, пагаджаецца, а ў нечым і спрачаецца з Андрэевым, даючы сваё разуменне постаці змагара за народную справу. Вобраз Сама шматзначны, акружаны арэолам духоўнай значнасці і маральнай прыгажосці. Гэта не толькі рэвалюцыянер — сацыяльны барацьбіт, а рэвалюцыянер-адраджэнец. Розніца, трэба сказаць, істотная.

«У барацьбе з царызмам, — пісаў пазней Я. Лёсік, — рэвалюцыянер знаходзіў сабе спачуццё збоку хоць некаторай часткі грамадзянства, а з адраджэнца насміхаліся ўсе, пачынаючы з папа і канчаючы хамам, не кажучы ўжо пра тое, што яму пагражала кара і за рэвалюцыйную дзейнасць, бо адраджэнец парушаў інтарэсы ўсяго нацыянальна-каманднага грамадзянства... Нават сацыялісты не паважалі адраджэнца, бо лічылі работу яго шкадлівай для адзінства класавай барацьбы»[1].

На прыкладзе Сама паэт раскрывае асабістую драму свайго сучасніка-аднадумцы — рэвалюцыянера-адраджэнца. Адасоблены ад

---

[1] Навіны Беларускай акадэміі. 1992. 30 кастр.

мас сцяною неразумення, пазбаўлены падтрымкі аднадумцаў і паплечнікаў, ён — фігура трагічная і, можна сказаць, асуджаная на паражэнне, нягледзячы нават на асабістыя высокія маральныя якасці. Сам адначасова звычайны чалавек і як бы кімсьці зачараваны волат, што ніяк не можа наладзіць сувязь з новым часам. Гэта — гордая, нязломная натура, але разам з тым ён і пакутнік.

У гэтай сувязі, калі гаварыць пра ўплывы, можна прыгадаць яшчэ адзін твор — паэму Ю. Славацкага «Кароль-Дух». Купала добра разумеў, што літаратуры патрэбны шырокія культурна-гістарычныя далягляды і імкнуўся да іх. Дарэчы сказаць, і ў «Сне на кургане» аўтар — асабліва ў вытлумачэнні асобы галоўнага героя — арыентуецца на постаці біблейскіх прарокаў, якія заўсёды займалі духоўна актыўную пазіцыю.

У песні Сама ёсць словы:

А калі ж наклеплеш косы
На чырвоныя на росы,
Што палеткі сушаць нашы, —
Хлеб людзям, а коням пашу?

Праўда, людзі не спяшаюцца прыслухацца да літанняў Сама, вобраз якога ў гэтым сэнсе, па свайму духоўнаму зместу і ўзаемаадносінах з людзьмі, вельмі блізкі да героя верша «Прарок» (1912). Ды і агульная сітуацыя, пра якую ідзе гаворка ў гэтых творах, шмат у чым тыпалагічна агульная. Верш «Прарок» прысвечаны, як вядома, Пецярбургскаму навукова-літаратурнаму гуртку беларускай моладзі. Гэта, па сутнасці, вольны пераклад біблейскага тэксту. Інтэрпрэтацыя біблейскай тэмы даецца ў сувязі з той сітуацыяй, якая мела месца ў тагачасным беларускім адраджэнскім руху. Рамантычны прарок ідзе да людзей з мэтай збудзіць іх ад сну:

За мной, за мной, забраны людзе!
Я добрай доляй послан к вам
І знаю, што было, што будзе,
І вас у крыўды не аддам.

Аднак прарока чакае горкае расчараванне:

А людзі, глянуўшы на сонца,
Адказ казалі грамадой: —
Па колькі ж нам дасі чырвонцаў,
Калі мы пойдзем за табой?

Для Купалы гэта разам з тым было і асэнсаванне свайго асабістага жыцця ў сувязі з жыццём грамадства, народа. Верш сведчыць пра расчараванне паэта ў сіле маральнай пропаведзі і пра страту веры ў

гуманістычныя каштоўнасці. Сам прарок стаўся ахвярай людской раўнадушнасці і эгаізму.

Трагічна складваецца і лёс Сама. За рэвалюцыйную дзейнасць ён трапляе ў турму, потым — у Сібір. Паміраe жонка. Перакідаецца ў варожы стан сын — становіцца царскім стражнікам. У вобразе Сама адлюстраваўся цяжкі і пакутлівы лёс беларускага народа ў пошуках шляхоў сацыяльнага і духоўнага адраджэння. Як паэт-рамантык Купала патрабаваў ад сябе і ад іншых няспыннага гарэння ў імя вызвалення народа. Адзін з герояў «Сну на кургане» Старац як прадстаўнік народа, умудраны вопытам спрадвечнага цярпення, гаворыць:

З грудзей вырві сваё сэрца, —
Зіму, лета сушы ў печы;
А як высахне, смалою
Злі жывою сэрца тое, —
Падпалі тады лучынкай,
Каб гарэла безупынку,
Як пажар гарэў сягоння, —
І ідзі ў свет, як з паходняй:
Праўды йдзі так з ім шукаці...
Ты не знойдзеш...

Старац са «Сну на кургане» па часе паўней раскрываецца ў аднайменным персанажы драмы «Раскіданае гняздо»...

Носьбіт злых, змрочных памкненняў — Чорны, які таксама сведчыць, што ў «Сне на кургане» паэт імкнецца да надзвычай значных абагульненняў. Матэрыяльная, канкрэтна-пачуццёвая аснова вобразу Чорнага раствараецца ў яго абстрактна-адцягненым, іншасказальным значэнні. Гэта тычыцца таксама такіх персанажаў, як відмы, якія сімвалізуюць пэўныя грамадска-палітычныя і эканамічныя структуры. М. Арочка за кожным з сямі відмаў і іх «таварышаў» імкнецца ўбачыць не жыццёваграмадскія «прататыпы», прыходзячы да вываду, што гэта «самадзяржаўны закон, суд, варта, капітал, карчма, гандлярства, царква»[1].

Чалавек адчувае адчужэнне перад тварам гэтых ананімных сацыяльных сіл, няўпэўненасць у сваім існаванні, страх перад пагрозай цяжкай прыкрай нечаканасці з іх боку. Больш таго, ён становіцца забаўкай безаблічных аўтарытарных грамадскіх сіл, заклапочаны толькі тым, як выжыць або дамагчыся поспеху.

У «Сне на кургане» выразна гучыць матыў адзіноты, ізаляванасці чалавека ад навакольнага свету.

---

[1] Арочка М. Беларуская паэма. Мн., 1979. С. 36.

## У ГЛЫБІНЮ ГІСТОРЫІ

«Сон на кургане», як ужо гаварылася, сведчыць аб тым, што і сам паэт даволі самотна адчуваў сябе ў навакольным свеце. Цяжкасць і змрочнасць жыцця, бяспраўнасць асобы ў перыяд, які наступіў услед за падаўленнем рэвалюцыі 1905-1907 гг., перажываецца ім, з аднаго боку, як трагізм, уласцівы чалавечаму быццю ўвогуле. З другога боку, паэт бачыць канкрэтных крыўдзіцеляў — тых, каго і ён, і Колас, і Багдановіч, і іншыя пісьменнікі называлі «багатымі» («Я хлеба ў багатых прасіў і маліў» — М. Багдановіч), якія падпарадкавалі сабе бедных. 11 жніўня 1911 г. у «Нашай ніве» змешчана карэспандэнцыя Я. Купалы «З гуты «Залессе», у якой апісваецца цяжкое становішча рабочых, у тым ліку дзяцей, якія працуюць ля шклоплавільных печаў. Падпісана псеўданімам «Ня-Гутнік».

Гэта, так сказаць, сацыяльны бок справы. Але быў яшчэ адзін надзвычай важны і істотны — нацыянальная трагедыя беларускага народа, якая заключалася ў яго адарванасці ад гістарычнага дзеяння, грамадскай нерухомасці і пасіўнасці («Сон на кургане» — вобраз гэтай трагедыі). У ХХ ст. — век сацыяльных і духоўных узрушэнняў і катастроф — ён увайшоў, фактычна не маючы ўласнай бацькаўшчыны. Купала імкнецца да гістарычнага асэнсавання сучаснага жыцця, разумее, што без гісторыі няма нацыі. Забыццё спадчыны продкаў абярнулася для грамадства вялікай шкодай, у прыватнасці стратай маральна-этычных рэгулятараў, распадам нацыі. Каб пазбыцца гэтага зла, трэба было думкамі вярнуцца ў мінулае, павучыцца ў продкаў, якія жылі ў «Залатым веку» нашай гісторыі. Хто мы? Спытайце, раіць паэт, пра гэта нашу гісторыю, адчыніце скарбы фальклору, услухайцеся ў песню лесу, прыгадайце забытае. У 1908 г. быў напісаны верш «Беларушчына» (упершыню надрукаваны толькі ў 1922 г. у зборніку «Спадчына»):

Сотні лет, непрыяцелем-братам прыбітая,
Зарастаючы зеллем чужым, як лазой сенажаць,
Ты ляжала, няпамяці пылам пакрытая,
А народ твой быў змушан маўчаць і табой пагарджаць.

Купала выдатна разумеў, што пры адсутнасці ў беларусаў сваёй дзяржаўнасці і нацыянальнай незалежнасці, развітых форм уласнага палітычнага і эканамічнага жыцця культура, літаратура, паэзія, нарэшце, выступаюць як важнейшы аб'яднальны фактар, які садзейнічае захаванню этнічнай самасвядомасці, духоўнаму абуджэнню і патрыятычнай кансалідацыі.

Сучаснасць, на думку паэта, мела патрэбу ў паэтызацыі і ўзвышэнні мінулага, а таксама ў яго пераасэнсаванні з новым вуглом гледжання, які добра відаць у вершы «Над Нёманам» (1911):

Край, дзе жыццё я сваё пачынаю,
Шмат весялей прыглядаўся на свет,
Песні і казкі інакшыя баяў,
Шчасце цвіло ў ім, як макавы цвет.

Панам быў дома і слаўным за домам
Мой, патаптаны сягоння, народ;
Змог ён не толькі знаць штукі з заломам, —
Роднаму слову ўмеў кніжны даць ход.

У свядомасці паэта трывала захоўвалася пачуццё сувязі і дачынення да лёсу прайшоўшых пакаленняў, да іх гістарычнага вопыту, да той гуманістычнай маральнаэтычнай традыцыі духоўнага разняволення, якая сфарміравалася ў грамадска-прававой практыцы Вялікага княства Літоўскага.

Тэма «мінуўшых дзён» хвалявала паэта неадступна, ён шукаў адказу на набалелыя пытанні: што ўсё ж такі здарылася з цэлым народам?

Перайшло, мінула,
Што калісь жыло,
Ў курганах заснула,
Зеллем зарасло,

Пад магіл навалай
Дрэме Русь, Літва —
За той тая з хвалай
Легла галава.

Не гудзе ў павазе
Голас вечавы,
Не шукаюць князі
Славы і бітвы.

Войска Усяслава
Не ідзе ў паход
На той бой крывавы
За свой край, народ.

Сцены і запоры

Палачан, Мянчан
Леглі ў разоры
Зможаных палян.

Ні святых дуброваў,
Зніч пайшоў з вадой;
Загасціў лад новы,
Ды не той, не свой.

Слых адно праходзе
Калі-нікалі
У жывым народзе
На жывой зямлі.

Баіць, гнучы шыі,
Паднявольны люд:
Мы ў сваім чужыя, —
Край забраны тут!

Так прайшло, мінула,
Што калісь жыло,
Ў курганах заснула,
Зеллем зарасло.

*(«З мінуўшых дзён», 1909)*

У 1910 г. узнік верш «Роднае слова» («Пад навалай крыўдаў многія сталецці...»). Гэта таксама спроба пазнаць карані нацыянальных «крыўд і бед»...

Купала бачыць, што да такога незайздроснага становішча беларускага чалавека апусцілі гістарычныя абставіны і ўмовы жыцця. Вядома, здарылася гэта не раптам, не імгненна, не адразу, а ў нейкім сэнсе пастулова, ад падзеі да падзеі. Беларускі народ шмат гадоў у сваёй гісторыі перажываў надзвычай катастрафічныя перыяды стрэсаў і перанапружанасці ў нацыянальных маштабах, што, безумоўна, разбурала яго дзяржаўны патэнцыял і падточвала яго пасіянарныя сілы. Прыкрае замаруджванне і застой гістарычнага працэсу на Беларусі назіраюцца ўжо ў сярэдзіне XVI ст. Працэс страты дзяржаўнай незалежнасці, скасавання правоў беларускага народа і пазбаўлення яго волі пачаўся ад Люблінскай уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай (1569) і яшчэ ў большай ступені пасля Брэсцкай (1596). Беларуская шляхта ў пераважнай большасці сваёй (за рэдкімі выключэннямі) кіравалася, на вялікі жаль, не столькі патрыятычнымі,

колькі асабістымі інтарэсамі (паводле сеймавай пастановы 1673 г. шляхецкае званне маглі атрымаць толькі патомкі). Купала добра ведаў сваю гісторыю, ведаў, што за памылкі тых, хто здрадзіў радзіме і яе духоўным каштоўнасцям, за іх імкненне да багацця і ўлады расплачваўся народ.

Дзяржаўнай мовай ў Вялікім княстве Літоўскім ад яго ўтварэння і да канца XVII ст. была беларуская мова, але з цягам часу ў сувязі з распаўсюджаннем каталіцызму і збліжэннем з Польшчай яе месца заняла польская мова. Польска-каталіцкія колы на працягу ўсяго часу ўваходжання Беларусі ў склад Рэчы Паспалітай паслядоўна і настойліва размывалі нацыянальны патэнцыял беларускага народа, разбуралі яго этнічную самасвядомасць. Паланізацыя набыла жахлівыя формы пасля заключэння Андрусаўскага міру (1667) з Расіяй, калі ў масавым парадку пачалі зачыняцца цэрквы і ствараліся касцёлы. У 1697 г. быў выдадзены закон, паводле якога ўрадавай мовай у краі аб'яўлялася польская. Тады і уніяты пачалі адпраўляць царкоўную службу па-польску.

Чатырохгадовы сейм (1788-1792) і Канстытуцыя 3 мая 1791 г. скасавалі Вялікае княства Літоўскае. Гэта азначала канчатковае скасаванне беларускай дзяржаўнасці. Затым, пасля трох вядомых раздзелаў Польшчы, Беларусь апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Рускі царызм працягваў палітыку сваіх папярэднікаў, толькі цяпер гэта была ўжо русіфікацыя. Кацярына II шчодра раздавала зямлю рускім памешчыкам, пасады займалі рускія чыноўнікі, уводзіліся агульныя губернскія ўстановы, былі адменены Літоўскі Статут і Магдэбургскае права. Краіна папраўдзе апынулася пад падвойным прыгнётам: да польскага духоўнага ўціску дабавіўся яшчэ і расійскі.

Гэта даўняя крыўда балюча крывавіла сэрца паэта. У вершы «Годзе...» (1912) ён пісаў, узнімаючыся да прамоўніцкага стылю:

Годзе заходняй ці ўсходняй культуры!
Для беларуса цана ім адна,
Усе вы, панове, аднакай натуры:
З сэрца чужога кроў ссалі б да дна.

З сярэдзіны XIV ст. Беларусь мела назву Літва, а беларусы называліся літвінамі. Урадавыя колы імперскай Расіі, асабліва пасля раздзелу Польшчы, імкнуліся пазбыцца самога паняцця «Літва» ў дачыненні да Беларусі. У мэтах асіміляцыі яны былі зацікаўлены, каб гэтыя землі называліся Белай Руссю. Гэтак яно і сталася.

Працэс русіфікацыі беларускіх земляў асабліва ўзмацніўся пасля паражэння паўстання 186 3 г. Каб пасеяць сумненні ў нацыянальных

магчымасцях і перспектывах беларусаў, польскі і рускі бакі пракламавалі погляд на Беларусь як на бедны і ні на што не здатны край.

Пералічаныя тэндэнцыі садзейнічалі таму, што пасіянарна адораныя ўраджэнцы Беларусі ішлі на ўслугоўванне да іншых народаў. Адам Міцкевіч, скажам, павінен быў бы стаць беларускім паэтам, аднак ён стаў польскім. Бацькі Адама Міцкевіча — апалячаная і акаталічаная беларуская шляхта — пачувалі сябе палякамі. Гэта ў многім і прадвызначыла лёс сына.

Пасля анексіі Беларусі ў канцы XVII ст., калі кіраўніцтва краем ажыццяўлялася шавіністычна настроенай расійскай адміністрацыяй, многія беларусы пайшлі шукаць долі на ўсходзе. Дарэчы будзе сказаць, што гэта тэндэнцыя працягвалася да самага апошняга часу, калі многія таленавітыя выхадцы з Беларусі — вучоныя, кваліфікаваныя спецыялісты розных галін — інжынеры, вайскоўцы, нават пісьменнікі — ехалі ў Расію і асядалі там, выракаючыся, па сутнасці, Бацькаўшчыны.

Нацыянальна-адраджэнская тэма заняла вялікае месца ў творчасці Я. Купалы. У алегарычнай форме яна развіваецца ў вершы «Тае снег...» (1911-1912), у якім малюецца надыход вясны:

Узніме чорную скібу саха працавітая,
Ляжа усходнае зерне у пахаць сырую,
Закалосіцца поле, слязой, потам злітае,
Зашуміць сваю думу старую.

Гаспадар той суважна свой шнур па-святочнаму
Абыходзіў будзе, красой любавацца,
Прыслухоўвацца к шэлесту нівы няўрочнаму
І маліцца ж сваёй зямлі-матцы.

Смела гляне на свет і на долю змянлівую,
Як дагэтуль, яму не дадуцца ўжо ў знакі
Тыя сілы з усходу і захаду мсцівыя,
Што даймаюць цяпер, як вужакі.

Паэт усё далей ішоў па шляху ўсведамлення гістарычнага быцця народа, каранёў яго дзяржаўнасці, што хаваліся ў сівой даўніне. Узнікненне дзяржаўнасці на Беларусі звязана з утварэннем і іcнаваннем такіх аб'яднанняў, як Полацкае княства, а затым Смаленскае, Тураўскае і інш. З глыбіні стагоддзяў усё яшчэ ішлі промні былой славы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жмудскага, у абсягах якога старажытнабеларуская дзяржаўнасць дасягнула свайго вышэйшага

росквіту. Быццё народа шмат у чым арыентавалася на гэту гістарычную памяць, што жыла ў паданнях ды легендах.

Пра ўсё гэта сведчыць паэма «На Куццю», упершыню надрукаваная ў «Нашай ніве» ў канцы 1911 г. Пачуццё гісторыі ў ёй узмоцнена рамантызмам з уласцівым яму абагульненым поглядам на гістарычную мінуўшчыну. У намаляваных Купалам вобразах мінулага рэальнае і ідэальнае спалучаны ў адным рамантычным вобразе, скіраваным не столькі на пазнанне і адлюстраванне гістарычнай рэчаіснасці, уласцівага ёй багацця і разнастайнасці жыццёвых праяў, колькі на выхаванне патрыятычных паводзін сучасніка. Паэтыка тут грунтуецца на ўмоўна-міфалагічнай аснове. Аўтар адкрывае заслону часу, ажыўляе мінуўшчыну, героі глядзяць на нас з глыбіні гісторыі. Дзея адбываецца ў калядны вечар на старажытным «адвечным замчышчы», дзе наладжана святочная вячэра-«куцця». «Куцця» — «кут» — «покуць» — этымалагічна блізкія словы. Покуцце — самае ганаровае месца за сталом, дзе звычайна садзілі дзядоў. У купалаўскай паэме на покуці — князь з княгіняй, вакол — княжацкая дружына. Аўтар не даследуе псіхалогію сваіх герояў, а малюе перад чытачом незвычайнае відовішча, засмужаную туманам часу карціну таго, як князь кліча ганцоў і згадвае ім агледзець «усе пагранічныя канцы». Ганцы, каб выканаць загад князя, адольваюць, так сказаць, не толькі адлегласць у прасторы, але і ў часе: князь пасылае іх з свайго часу ў наш.

І што на паверку аказваецца? Аказваецца, народ яшчэ жывы. Выканаўшы заданне, ганцы вяртаюцца, каб расказаць князю аб выніках:

Не ўмруць, не ўмруць ужо яны,
Раз хочуць сонца, славы, песні,
Заб'юць ім зычныя званы
Прабудным звонам напрадвесні...

На дзеле — кожны йшчэ слугой,
У думках — вольныя ўжо людзі;
Над сэрцам іх, над іх душой
Наш дух лунаці вечна будзе.[1]

Прадметна-рэалістычнае напаўненне паэмы зведзена да мінімуму. Абмеркаванне нацыянальнай праблемы адбываецца на такіх вышынях духу, на якія ўваход усяму матэрыяльнаму забаронены. Умоўныя сродкі выразнасці атрымліваюць тут паэтычнае, філасофскае і драматычнае абгрунтаванне.

---

[1] Наша ніва. 1911. 22 снеж.

Устанаўленне духоўнага кантакту са старой літвінскай спадчынай азначала для Купалы вырашэнне праблем нацыянальнай ідэнтыфікацыі, атрыманне адказу на пытанне «Хто мы?».

Роздум над гэтым пытаннем гучыць таксама і ў вершы «Чараўнік», створаным у самым пачатку 1912 г. Як і «На Куццю», ён доўгі час не друкаваўся і знаходзіўся пад забаронай. Беларуская гісторыя адлюстроўваецца ў «Чараўніку» таксама паводле законаў Купалавай міфатворчай сімволікі. Сюжэт яго ў вонкавым сэнсе просты: той, каго паэт называе «чараўнікам-слепаводнікам», бацька трох сыноў, паміраючы, адкрыў перад сынамі тры дарогі:

«А як пойдзе хто першай, — ён кажа ім гэтак, —
Што на ўсход шляхам чорным кладзецца,
Напаткае чужацкі крывавы палетак,
І ў крывавай скупаецца рэчцы.
Той шлях першы і першая рэчка атрутай
Спояць так і за хатай і ў хаце, —
На другіх будзе строіці петлі і путы,
І сам гэтыя путы цягаці.
А як пойдзе другім хто гасцінцам-дарогай,
Што на захад кладзецца вужакай, —
Свой палетак любіць стане горай чужога,
Прыпадзе к чужой рэчцы, як п'яўка.
Той другі шлях і рэчка другая загладай
Атуманяць душу, зальюць вочы;
Будзе сонца шукаці сабе, як прынады, —
Даць, знашоўшы, другім не захоча.
А як пойдзе хто трэцяй сцяжынай-пуцінай,
Што сваёй не мінае граніцы,
Будзе чэзнуць і вянуць націнай, паўцінай,
Смягнуць будзе над роднай крыніцай.
Той шлях трэці і трэцяя рэчка сляпою
Ласкай-крыўдай апутаюць грудзі...
Ён насыпле пяшчаны узгор нада мною,
І таптаці узгор гэты будзе».

«Чараўнік-слепаводнік» увасабляе ў сабе зло; ён хоча, каб зло не пераводзілася і пасля яго смерці. Сыны пакорліва пайшлі вызначанымі ім пуцявінамі — кожны сваёй, але несправядлівая доля, якую яны абралі, не прынесла ўцехі і задавальнення. Пад гнётам аблудна выбранага шляху яны становяцца, як правільна зазначае М. Грын-

чык, «ахвярамі таго антычалавечага ладу, якому яны верна служаць»[1]. Урэшце нешта ў іх душы ўсё ж такі выспявае, і, каб неяк разабрацца ў сваім жыцці, падвесці, так сказаць, папярэднія вынікі, яны звяртаюцца за дапамогай да «судзьбіны», якая ўвасабляе ў паэме як бы ідэал справядлівасці і мудрасці і здольна рассудзіць іх учынкі і погляды на свет. Кіруючыся яе настаўленнямі, яны імкнуцца перайначыць сваё жыццё, аднак лёс усіх трох трагічны. Усе яны гінуць. Шлях да новага, справядлівага жыцця аказваецца не лёгкім і не простым. Перамогу ізноў спраўляе «Чараўнік-слепаводнік».

У паэме «Чараўнік», як і ў «Сне на кургане» і ў некаторых іншых творах, адлюстраваліся балючыя перажыванні і ідэйныя ваганні аўтара ў змрочныя часы панавання рэакцыйных сіл.

---

[1] Янка Купала. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1986. С. 651.

## «ШЛЯХАМ ЖЫЦЦЯ». КУПАЛА І МАДЭРНІЗМ

На лета паэт імкнецца з Пецярбурга ў Беларусь. Так было ў 1911 і 1912 гг., калі Купала наведаў маці і сясцёр, якія перабраліся к таму часу з Бараўцоў у Акопы. Тут добра пісалася. 3 чэрвеня 1912 г. у Акопах ён завяршыў свой першы сцэнічны твор — камедыю «Паўлінка». Асобнай кніжкай яна выйшла ў Пецярбургу ў наступным годзе ўсё ў тым жа выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца», атрымала станоўчыя водгукі. Неўзабаве «Паўлінка» была пастаўлена на сцэне — спачатку ў Вільні, затым у Пецярбургу, а летам 1913 г. і на радзіме — у Радашковічах, што з'явілася вялікай падзеяй у гісторыі нацыянальнага тэатра. На спектаклях прысутнічаў сам аўтар.

Прыкметы новага праяўлялі сябе ў самай рознай форме. У канцы таго ж чэрвеня, калі была скончана праца над «Паўлінкай», Купала наведаў Вільню, дзе разам з мясцовай моладдзю ўдзельнічаў у святкаванні Купалля і напісаў пра гэта ў «Нашу ніву». Яго карэспандэнцыя аб свяце заканчвалася наступнымі словамі: «Пара скінуць многамільённаму беларускаму народу свой векавечны сон, пара распусціць свае сакаліныя крыллі і дружна па-арлінаму сягнуць па свае законныя правы на вольнае і грамадскае самапачуццё. Хай свята Купалле стане паўсямесным святам беларускага нацыянальнага адраджэння»[1].

І яшчэ адна значная падзея 1912 г. — першая сустрэча з Якубам Коласам, які вярнуўся з мінскага астрога пасля трох гадоў зняволення. Спатканне адбылося 26 ліпеня на хутары Смольня, каля Мікалаеўшчыны, у родным гняздзе Коласа. Знаёмства і першыя сустрэчы сталі пачаткам вялікай творчай дружбы на ўсё жыццё.

Вясной 1913 г. у Пецярбургу ў суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца» выйшаў з друку трэці зборнік — «Шляхам жыцця». 6 красавіка ў пісьме ў «Нашу ніву» Купала паведаміў, што выслаў у рэдакцыю газеты экземпляр зборніка для рэцэнзіі.

Гэта — этапная рэч Купалы:

Усяго пакрысе
Знойдзеце вы гэтта, —
Пры сасе, пры касе
Сабрана за лета.

Шчырым сэрцам, душой
Складана няхітра,
Знама — свой, не з якой

[1] Наша ніва. 1912. 28 чэрв.

Там «звёздкай» ці мітрай.

Што-нібудзь, мо не так —
Прашу прабачэння;
Трудна ў рыхт — часу брак,
Мазаліста жменя.

*(«Чым хата багата»)*

І на гэты раз з хаосу навакольнай рэчаіснасці Купала творыць упарадкаваны космас паэзіі, імкнецца да гармоніі духу. «Шляхам жыцця» прымушае ўспомніць выслоўе нямецкага рамантыка Навaліса: «Паэзія ёсць адлюстраванне душы — унутранага свету ў яго цэласнасці». Аднак у зборніку «Шляхам жыцця» знайшоў сваё развіццё не толькі ідэальны, духоўны бок паэтычнай творчасці Купалы, але і бытавы, сацыяльны. Па-ранейшаму ў радку гучыць скарга, нараканне:

Працай жывяцца нашай прыблуднікі,
А мы толькі ўздыхаем і плачам...

*(«Не для нас...»)*

Праблема гарманізацыі зямнога, жыцейскага, побытавага і, з другога боку, нябеснага, аддаленага, духоўнага, што выразна намецілася ў «Жалейцы» і «Гуслярэ», увесь час стаяла перад паэтам:

Як вецер, як птушка, дзе сонца, дзе зоры,
Так рвецца, нясецца ўдаль думка мая,
Абыймецца з небам, пакоціцца ў мора,
Ў вялікае мора людскога жыцця.

*(«Мая думка»)*

Паэзія для Купалы па-ранейшаму фенаменальная магчымасць далучыцца да ўсёй паўнаты чалавечага жыцця. У 1913 г. ён пісаў пра паэзію Ц. Гартнага «Цішка не «майструе вершаў», а пяе, пяе ўсёй сваёй набалелай душой, усім сваім сэрцам гарачым, кіпучым. Нойдзеце тут і галубіныя песні кахання, і сумныя жальбы, і смелыя жаданні, і ва ўсім чуваць песняра праўдзівага, вынасіўшага кожнае слова ў сваіх набалелых грудзях»[1]. Словы гэтыя ў поўнай меры можна было б аднесці і да самога Я. Купалы, у прыватнасці да яго зборніка «Шляхам жыцця», якому ўласціва незвычайная разнастайнасць эмацыянальных станаў, перажыванняў і ўзлётаў. Аўтар разглядае не толькі ценявыя бакі тагачаснай рэчаіснасці. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прачытаць ужо згаданы намі верш «Жняя», у якім намаляваны надзвычай прывабны — зямны і ўзнёсла-адухоўлены — партрэт простай жанчыны-працаўніцы:

---

[1] Купала Я. Зб. тв. У 7 т. Т. 7. С. 202.

Як сама царыца
Ў залатой кароне,
Йдзе яна ў вяночку
Паміж спелых гоняў.

З каласкоў вяночак —
Моладасці сведка —
На ёй зіхаціцца,
Як у садзе кветка.

На грудзях шчаслівых
Каптанок ружовы,
У руцэ сярпочак
Зублены, сталёвы.

Вецер абнімае
Стан яе дзявочы,
Сонца ёй цалуе
Шыю, твар і вочы...

Хараша — ці не праўда?

У зборніку «Шляхам жыцця» знаходзім шматпланавы падыход да жыцця, жаданне зразумець усю паўнату і шматбаковасць яго зместу. Гэта, несумненна, адна з вяршынь беларускай паэзіі пачатку XX ст. Паэт пацвердзіў, што адраджэнская мара яго і нацыянальны ідэал застаюцца ранейшымі — вярнуць свой народ з шляху смерці на шлях жыцця:

З цэлым народам гутарку весці,
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця —
Гэткай шукаю цэлы век чэсці,
Гэта адно мне падпорай жыцця.
*(«З кутка жаданняў»)*

Паэт увесь час імкнецца падвысіць пасіянарны ўзровень свайго народа:

Шлю вам песняй, братнім словам
Здароўканне, людзі:
Не гасіце веры, што вам
Жыцца лепей будзе.
Вы не зломкі, вы не зноскі —
Вы народ магучы:
Ваша панства — вашы вёскі,
Пан ваш — труд жывучы.

*(«Сваякам па гутарцы»)*

Паэзія Янкі Купалы не збочвала з дарогі, на якой вырашаўся народны лёс. Простае слова паэта несла ў сабе важны і актуальны сэнс, несла праўду:

Простым мы словам са святам гаворым,
Песні аб цяжкай творым нягодзе,
З думкамі рвёмся к сонцу і зорам.
Рвёмся к свабодзе.
Проста жывём мы, як доля лучыць,
І крывадушыць не прабавалі...
Просім папросту: кіньце нас мучыць,
Ляхі, маскалі!

*(«Папросту»)*

У зборніку «Шляхам жыцця» назіраецца далейшае ўзрастанне суб'ектыўна-лірычнага пачатку, што выявілася як у пашырэнні ідэйнага зместу многіх вершаў, так і ў пэўных зрухах у сферы формы, якая спалучае ў адным стылі элементы лірыкі, гумару, іроніі, гратэску...

У 1911-1912 гг. напісаны верш «Забраны край», які мае прысвячэнне «Балканскім славянам». Прысвячэнне было выкарыстана не інакш, як дзеля дэзарыентацыі цэнзуры. Праўда, дэзарыентаваць пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі савецкую цэнзуру не ўдалося — верш (сярод многіх іншых) быў забаронены.

У ім таксама адбіўся роздум паэта над гістарычным лёсам «забранага краю» — таго, які доўгі час называўся «паўночна-заходнім»:

Сляпы знемагаецца бацька ў цямніцы;
На стражы пастаўлен сынок;
У поўных калісьці ад шчасця святліцах
Чужак зневажае дачок.
Дзяцей сваіх маткі кідаюць у здзеку,
За «мамак» к наездцам ідуць,
А тыя за іх малако, за апеку
«Забраны край» болей гнятуць.

Выраз «забраны край» Купала ці не ўпершыню сустрэў у этнаграфічным зборніку «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Собранные и приведенные в порядок П. В. Шейном» (СПб., 1902). У артыкуле «За «А ўсё ж такі мы жывём...» ён цытуе гэту кнігу: «Там, у гэтым зборніку Акадэміі навук, т. III, стар. 97, сказана: «Вообще о себе и своей стране они (селяне

Гродненской губ.) выражаются так: «Мы тутэйшыя, наша страна ні руска, ні польска, але «забраны край!»[1].

Змрочнымі, але праўдзівымі фарбамі малюе Купала гаротнае становішча роднага краю:

Мальбішчам чужым б'е пакора паклоны;
Упадку вялічыцца сцяг;
З балотам змяшаны старыя законы,
Наладжан нявольнічы шлях.
Купляюць, збываюць, гандлююць чужынцы
Народным дабром, як сваім...
Заплача ў пагоду канюх па расінцы, —
«Забраны край» жаліцца з ім.

Форма ў гэтых вершах набывае высокую ступень змястоўнасці. Купалаўская паэзія і з боку зместу, і з боку формы стала ўзноўленай памяццю народа, фактам яго духоўнага абуджэння. Красамоўны ўзор яе — верш пад назвай «Чужым» (1912), адрасаваны перш за ўсё, думаецца, панству — як прыхадням, так і, думаецца, сваёй шляхце, якая выраклася ўласных духоўных каранёў. «Чужым» — гэта таксама беларуская гісторыя:

Мы вас прынялі хлебам і соляй,
    Людзі чужыя;
Ўстрэлі вас ласкай нашага поля
    Кветкі жывыя.
Нашы сасонкі шумнага бору
    Далі вам хаты,
Далі загонаў нашых разоры
    Гонар багаты.
Пух і аўчынкі нашага хову
    Грэлі зімою,
Птушкі вам гралі з нашай дубровы
    Гімны вясною.
Ценем тупілі вас ў спякоту
    Нашы чарэсні,
Нашыя жнейкі ў жніўну работу
    Пелі вам песні.
Вашым патомкам нашый маткі
    Казкі складалі:
Ў сэрцах дзіцячых праўдаў пачаткі
    Сеў засявалі.

---

[1] Купала Я. Зб. тв. У 7 Т. Т. 7. С.211.

Верны славянскім спадкам, браточна
Ў госцях вас мелі,
І шанавалі людска, святочна
Ў будні, ў нядзелі.

Верш, умоўна кажучы, складаецца з дзвюх частак. Другая частка — пералік крыўд:

Сотні лет песцім днямі і ночай
Госця на шыі —
Змея, што з пуняў скарбы валоча,
Скарбы чужыя.
Вы ўжо забылі, людзі здарэння,
Дзе ваш прыпынак, —
Вывезлі ў гандаль славу, сумленне —
Праўду на рынак:
Слепа зракліся сораму, увагі,
У хорамы селі, —
Браццям жа ўздзелі лапці, сярмягі,
Торбы надзелі...
Людзі чужыя! Хтось калі зліча
Вашу нам шкоду:
Зліча праступкі... к суду пакліча
Крыўда народу.

Трагічнае відовішча малюецца ў вершы «На рынку», у якім распрацоўваецца тая ж праблематыка, што і ў іншых творах, датаваных 1911-1912 гг.:

— Хадзеце, хадзеце, вясёлыя людзі!
А жыва да нас на таргоўлю:
Пакупка — гасцінчык вам кожнаму будзе
Чырвоненькі, хатняй гадоўлі.
Паціху... не бойцеся — пойдзе ўсё гладка, —
Крый, Божа, якога прымусу.
Маленькая рэч, — як матыль ці стрынатка...
Ўсёй куплі — душа беларуса.
Меў хату, меў поле — прыйшлі і забралі...
Сам вінен: не ўмеў пільнаваць
Ну, ўсякаму ж трэба як-небудзь жыць далей, —
Душу вось і можна прадаці...
Падходзь жа, паночку!.. знімі акуляры —
Лепш будзе агледзець пакупку;
Ты, барынька, так жа падбліжся!.. мы нары
Дамо нават з ёю, галубкай...

Штось срэбнікаў з трыццаць — як піша ў законе —
Узяў за Хрыста калісь Юда...
Аб гэтай цане ані снім мы сягоння:
Станела ўсё — душы і цуды...

Раскрываючы нацыянальную трагедыю беларуса, Купала імкнуўся вызваліць яго ад путаў прыгнёту, узвысіць духоўна. Права свабоды ў яго разуменні з'яўляецца неад'емным і натуральным правам кожнага чалавека, які павінен карыстацца ім у адпаведнасці з мерай свайго маральнага і духоўнага развіцця. Адсюль — рамантычны заклік:

Ўстань ты, старонка, родная маці!
Годзе зімовага рабскага сну,
Годзе табе ужо слёзна ўздыхаць —
Выйдзі на поле, на сенажаці,
Выйдзі спаткаці вясну!
Ясна, святочна ў красы ўбярыся,
Птушкай свабоднай сягні ў вышыню,
З сонцам злучыся, зоркамі йскрыся,
Песняй распейся, славай акрыйся,
Выйдзі спаткаці вясну!

*(«Выйдзі...»)*

Ён не стамляецца прарочыць свайму народу новую долю, натхняць яго, заклікаць, верачы ў неабмежаваныя творчыя магчымасці асобы:

Гэй, наперад, покі сэрца
Б'ецца, рвецца на прастор,
Годзе млеці ў паняверцы;
Гэй, да сонца! гэй, да зор!..

*(«Гэй, наперад!»)*

У зборніку «Шляхам жыцця» была змешчана таксама драматычная паэма «На папасе». Верш «Лявон», які ўвайшоў у гэту паэму як песня Незнаёмага, з'явіўся ў «Нашай ніве» яшчэ ў 1908 г. Задума такога твора выспявала, відаць, даўно і па часе адпавядала прадчуванню новага ўздыму рэвалюцыйнага руху ў грамадстве.

...Ноччу, у цёмным лесе, трое падарожных сялян сустракаюць Незнаёмага. Спачатку яны ставяцца да яго недаверліва, але па часе паміж імі ўстанаўліваецца кантакт. Незнаёмы — як бы прафесійны рэвалюцыянер, агітатар. Гэты вобраз, які ў больш акрэсленых абрысах выступіць у драме «Раскіданае гняздо», Купала адарыў у значнай меры сваёй асабістай філасофіяй жыцця, якая выпрацавалася ў выніку пераадолення разладу паміж кніжнымі ведамі, фантазіяй і, з

другога боку, жахлівай рэальнасцю навакольнага свету. «Цямноты ўсю паняў няздарнасць, / Я сілу знання ўсю паняў».

Незнаёмы спявае песню пра Лявона, у якой выяўляе сябе гэта новая, адраджэнская жыццёвая філасофія:

Зварухнуўся Лявон,
Як вада, як агонь,
Пазнаў сілу ў сабе небывалую;
Ужо бяда — не бяда,
Ўжо нуда — не нуда,
Запеў песні свае разудалыя.

Выбуховая стыхія народнага гневу, на думку Незнаёмага, «як вада, як агонь», нястрыманая ў сваім парыванні, змяце існуючую несправядлівасць зямных спраў і разняволіць чалавека.

Сяляне, паводле патрыярхальных традыцый, пасіўныя. Незнаёмы — носьбіт новых тэндэнцый, будзіцель сацыяльнага і духоўнага пратэсту. Гэта не проста алегарычна-сімвалічны вобраз — ён меў сваіх рэальных прататыпаў, скажам, сярод членаў такой партыі, як Беларуская сацыялістычная грамада. Напачатку недаверлівыя сяляне запомнілі песню пра Лявона, якую спяваў ім Незнаёмы, і яна шмат што гаворыць іх уяўленню:

Жыў на свеце Лявон,
Малад, дужы быў ён,
Толькі з воляй і доляй не бачыўся...

Вада і агонь для Купалы і для такіх людзей, як Незнаёмы, — сімвалы беларускага адраджэння.

Янка Купала, як ужо гаварылася, амаль з самага пачатку выступіў як буйнейшы паэт-рамантык. Купалаўскі рамантызм выявіў нецярплівыя адносіны да жыцця, адмаўленне тагачаснага ў імя будучыні. Рамантызм гэты ў пэўным сэнсе можна назваць крылатым рэалізмам, скіраваным уперад. Ён патрабаваў ёмістасці душы, сілы, здольнай ахапіць усе прадметы свету, усё чалавечае існаванне ў цэлым.

Паэт шукаў шляхоў ні больш, ні менш як да абнаўлення чалавецтва. Гэтыя пошукі, пра што ўжо гаварылася, знайшлі ўвасабленне як у прарочай долі купалаўскай паэзіі ў цэлым, так і ў канкрэтным вобразе рамантычнага прарока, які хацеў бы весці за сабой народ. Размова ідзе пра верш «Прарок» (пра які ўжо згадвалася пры разглядзе паэмы «Сон на кургане») — ён упершыню быў надрукаваны ў «Нашай ніве» (21 снежня 1912 г.), затым увайшоў у зборнік «Шляхам жыцця»:

Пара у рукі браць паходні,
Ўставаць, ісці, ноч рассвятляць!

Бо што не возьмеце сягоння,
Таго і заўтра вам не ўзяць.
Назло крывавым перашкодам
Скідайце ёрмы, клічце сход
І дайце знаць другім народам,
Які вы сільны йшчэ народ!

У «Прароку» ўпершыню ў Купалавай творчасці прагучала ідэя вялікага ўсенароднага сходу, аднак верш, як вядома, заканчваецца на горка-іранічнай ноце: народ з недаверам глядзіць на сваіх прарокаў, сумняваецца ў іх закліках. З неразвітасцю народнай, нацыянальнай свядомасці мы звычайна звязвалі асноўны сэнс купалаўскага «Прарока». У гэтым шмат праўды, аднак не ўся. На нашу думку, верш аб'ектыўна перадае і больш шырокія адчуванні чалавека на пачатку XX ст., калі стваралася новая духоўная сітуацыя, якая азначала не што іншае, як вычарпанасць і крах традыцыйнай гуманістычнай свядомасці грамадства, расчараванасць у жыцці, асуджанасць усялякіх спроб змяніць яго да лепшага. Узмацніліся сумненні ў рацыяналізме, ва ўсеўладдзі «здаровага сэнсу». У паэзію Купалы таксама шырока ўвайшло адчуванне катастрафічнасці перажываемай эпохі, маральнай неўладкаванасці і дэгуманізацыі свету і чалавека. Прадметнарэчыўны свет паэта прасякнуты тэндэнцыяй няўстойлівасці, чаканнем новых павеваў, набліжэннем будучыні. Лірычны герой дзейнічае пад уплывам гэтых, не заўсёды ўсведамляемых токаў жыцця.

Янка Купала сваёй творчасцю дэманструе тое, што савецкі даследчык літаратуры Г. Гачаў назваў «паскораным літаратурным развіццём»[1]. Паскоранае літаратурнае развіццё адбываецца ва ўшчыльненым, сціснутым гістарычным часе, калі гісторыка-літаратурны працэс адбываецца настолькі імкліва, што ў адным пакаленні змяшчае некалькі мастацкіх этапаў. У гэтым выпадку творчая біяграфія аднаго мастака ўтрымлівае ў сабе два і болей этапаў мастацкага развіцця. Інакш кажучы, у адной літаратурнай з'яве ў згорнутым выглядзе, сумяшчаючыся адно з другім, прадстаюць рысы і фазы, што ў «нармальным» гістарычным працэсе знаходзяцца на агромністых часавых адлегласцях. У творчым лёсе Купалы адбываўся грандыёзны пераход з мінулага ў будучыню, у XX і XXI стагоддзі. Творчасць Купалы змясціла ў сабе фальклор і міфалогію, элементы класіцызму і сентыменталізму, рамантызм і пазітывізм. Але не толькі гэта.

[1] Гл.: Гачев Г. Ускоренное развитие литературы (на материале болгарской литературы первой половины XIX в.). М.: Наука, 1964.

Мы часта, гаворачы пра Купалу, параўноўваем яго з Пушкіным, Міцкевічам, Шаўчэнкам. Вядома, падстава для такой тыпалогіі ёсць. Купала захапляўся Пушкіным і Міцкевічам і асабліва Шаўчэнкам, у якім адчуваў шмат роднага і блізкага і якому прысвяціў некалькі вершаў і нават паэму «Тарасова доля». Аднак усе пералічаныя паэты жылі і тварылі ў XIX ст., Купала ж — сын XX ст. Гэта і наследнік Ф. Багушэвіча, і пачынальнік новага гістарычнага этапу. У творчасці Купалы, як і ў той ці іншай ступені ў Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, адначасова спалучыліся дзве эпохі развіцця літаратуры — XIX і XX стагоддзі.

Як гэта адлюстравалася ў яго мастацкай практыцы? Вельмі разнастайна. Многія ідэі, формы і вобразы дасталіся яму у спадчыну ад мінулых вякоў. Мастацкае слова, як вядома, валодае здзіўляючай генетычнай памяццю. Мы ўжо гаварылі пра славуты верш Купалы «Ворагам Беларушчыны», у якім гучаць апантанасць біблейскага прарока і традыцыі палемічнай літаратуры XVI-XVII стст., што дапамагло паэту адстаяць сваю беларускую духоўную пазіцыю ў жорсткай сітуацыі XX ст. Ці другі, не менш яскравы купалаўскі твор, пра які таксама ўжо ішла гаворка, — «Чорны Бог». Апакаліптычная візія евангельскага Іаана Багаслова спалучаецца ў ім са старажытна-фальклорнымі ўяўленнямі, уласцівымі народнаму светапогляду. Аднак справа не толькі ў глыбіні і шматмернасці памяці: і «Ворагам Беларушчыны», і «Чорны Бог» — тварэнні XX ст., як і ўся творчасць Купалы ў цэлым. Эпоха, якая ўзгадавала Купалу — канец XIX — пачатак XX ст. — засведчыла крызіс светапоглядных установак класічнага рацыяналізму. Яго ўжо не задавальняе стары, багушэвічаўскі пазытывісцкі рэалізм. Больш смела ў параўнанні з папярэднікамі заглыбляецца ён у духоўную прыроду чалавека, шукаючы ў ёй апору для сваіх творчых азарэнняў. XX ст. несла шмат новага. Светапогляд людзей XIX ст. абапіраўся на дакладную навуку і пазітыўныя веды. Цяпер жа многія буйныя мастакі і інтэлектуалы заўважылі, што далёка не ўсе дзеянні і ўчынкі асобы вызначаюцца яе свядомасцю і логікай сацыяльна-псіхалагічнага дэтэрмінізму і што сам дэтэрмінізм не дастатковы для вытлумачэння думак і паводзін чалавека. Унутраны свет купалаўскага героя з уласцівымі яму магчымасцямі выбару і самавыяўлення фарміруецца не толькі рацыянальна-лагічнымі ведамі і вопытам, але і ірацыянальным пачаткам (эмацыянальна-вобразным, асацыятыўным, інтуітыўным і г. д.).

Творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага і іншых выявіла іх схільнасць да грамадска-інтэлектуальных і духоўна-маральных праблем. К таму часу, калі пачынаўся іх творчы

шлях, класічны перыяд развіцця буржуазнага свету быў ужо ў асноўным закончаны. Наступіла XX стагоддзе — перыяд рэвалюцыі і войнаў, надзвычай імклівага навукова-тэхнічнага прагрэсу. Мяняўся светапогляд людзей, сцвярджалася новае разуменне і адчуванне часу, прасторы, уяўленне аб руху, хуткасці. Былі вынайдзены радыё, тэлефон. Самалёт даў магчымасць убачыць зямлю зверху, буйным планам. Раскрылася таямніца атама. Па-новаму асэнсоўваецца сувязь чалавека з прыродай і космасам. Насельнік зямлі, яе адвечны жыхар, ён адчуў «звышзямныя прыцягненні» — дыханне сусвету. Інакш стала выглядаць і сама прырода чалавека: З. Фрэйд адшукаў у ім бессвядомыя псіхічныя працэсы, у якіх таілася не толькі стваральная, але і вялікая разбуральная сіла. У пачатку XX ст. усталёўваецца новая карціна свету, абумоўленая крызісам рацыяналістычнага светапогляду, крызісам дэтэрмінізму.

Дэтэрмінізм — філасофскае вучэнне, якое прызнае і абсалютызуе аб'ектыўную заканамернасць і прычыннавыніковую ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць усіх з'яў прыроды і грамадства. Было, аднак, устаноўлена, што дакладны дэтэрмінізм немагчымы. У сувязі з гэтым назіраецца крызіс з такой выявы рацыяналізму, як пазітывізм, які адводзіў чалавеку ролю пясчынкі ў наскрозь дэтэрмінаваным свеце, а складанасць чалавечай душы, псіхалагічны змест асобы зводзіў да прасцейшых «хімічных рэакцый». Аказваецца, ёсць нешта ў чалавечай падсвядомасці, што нельга вытлумачыць прычынна-выніковымі заканамернасцямі, але што можа ў значнай ступені ўплываць на думкі і паводзіны чалавека (гэта і заўважыў той жа Фрэйд).

Магчымасці асветніцкага разумовага вытлумачэння навакольнай рэчаіснасці аказаліся, такім чынам, недастатковымі, каб спасцігнуць усе яе відавочныя і нябачныя глыбіні і супярэчнасці. Гэта адчуванне перададзена ў зборніку «Шляхам жыцця», пра што сведчыць не толькі «Прарок», але і верш «Чалавеку» і многія іншыя:

Ты і ў прышласць рад глянуць зарання,
Змёў бы пыл забыцця з прошлых дней,
Ўсё ж бяссілен твой розум і знание
Перад голасам духу начэй.
Ты дрыжыш перад нечымсь, як глянеш
У гэту цем, падслухаеш яе;
Як дзіцё, як матыль, слабым станеш...
А ноч тайна а дзівах пяе.
Мае свет неадкрытыя сілы,
Што людское ўсёзнанне прайшлі.
Гэтых сіл не пазнаць да магілы

Табе, думнаму цару зямлі.

*(«Чалавеку»)*

Своеасаблівасць Купалы як выдатнага паэта-рамантыка ў тым, што яму давялося жыць і тварыць у пострамантычную эпоху. Самыя верхнія рэгістры яго рамантызму ўступалі ў сугалоссе з тагачаснымі мадэрнісцкімі павевамі. Уласна кажучы, мадэрнізм — гэта і ёсць рамантызм XX ст., або постмадэрнізм (у адрозненне ад рамантызму XIX ст.), абумоўлены новым разуменнем чалавека ў яго суадносінах з жыццём, прыродай, космасам. Мадэрнізм быў выяваю новай эстэтычнай свядомасці, новым мастацкім мысленнем. Рэалізм мінулага стагоддзя знаходзіўся з ім прыкладна ў такіх суадносінах, як класічная механіка з квантавай.

Паэтычны радок набывае новы выгляд. Вядомы беларускі вершазнаўца І. Дз. Ралько яшчэ ў 60-я гады XX ст. адзначаў блізкасць рытмабудовы купалаўскага верша «Устань»:

Устань!
Ўсе, глянь,
Пайшлі...
І вот —
Свабод!
Зямлі!
Эх, бой,
Як стой,
(Зазлуй),
Злаўчы,
Крычы,
Ваюй!

да акцэнтнага верша ранняга Маякоўскага.

В. Шклоўскі, маючы на ўвазе гэты бок даравання Маякоўскага, гаворыць: «Ён сам быў геалагічным зрухам у свеце верша, вынікам рэвалюцыі 1905 года, якая не ўдалася, але ўжо зрушыла пласты свядомасці»[1].

Цікавыя зрухі, перамяшчэнне «акцэнтаў», узбуйненне таго, што раней было незаўважным, маленькім, адбываюцца ў беларускай паэзіі.

Павевы новага сустракаем у творчасці Цёткі. «Можа, ніводзін беларускі паэт так радасна і непасрэдна не захапляўся момантам руху і дзеяння, так прагна не лавіў найменшае іх праяўленне ў жыцці, у

[1] Литературная Россия. 1964. 20 нояб.

прыродзе, як Цётка», — пісаў пра яе Р. Бярозкін[1]. Рух, дынаміка, імпэт — ацэнка тэмпераменту паэтэсы, якой у вышэйшай ступені была ўласціва апантанасць грамадскімі справамі. Адсюль экспрэсіўнасць яе паэтыкі, узмацненне эмацыянальнай выразнасці аўтарскай ацэнкі. Мы не з гіпсу, мы — з камення, Мы — з жалеза, мы — са сталі, Нас кавалі у пламенні, Каб мацнейшымі мы сталі.

У творчасці Купалы і іншых беларускіх пісьменнікаў настойліва сцвярджае сябе той разнастайны мастацкасуб'ектыўны стыль, без якога нельга потым уявіць літаратуру XX ст. Мадэрністы падыходзілі да жыцця, прызнаючы ўласцівую яму ірацыянальнасць і непазнавальнасць. Купала, Гарэцкі, нават Колас у шмат якіх творах звяртаюцца якраз да звышпрыроднага, пазапачуццёвага, «патаемнага», што не дадзена чалавеку ў яго рэальных адчуваннях. Розум, інтэлект падспудна адчуваюць перавагу стыхійных сіл жыцця, бесперспектыўнасць спробы падпарадкаваць іх сабе. Рацыянальна-разважны падыход замяняюць творчыя азарэнні, усплёскі фантазіі, велічныя ідэі і сімвалы. Актыўна развіваецца індывідуальны пачатак, пашыраюцца далягляды асобы з уласцівым ёй пачуццём унутранай годнасці і свабоды. У рускай літаратуры гэта была так званая эпоха Сярэбранага веку.

Як у паэзіі, так і ў прозе сцвярджае сябе эстэтыка падсвядомых і інтуітыўных форм мыслення і творчасці. Беларуская літаратура ўзбагачаецца рысамі рэфлексіі, медытацыі, настраёвасці. Нацыянальныя мастацкія матывы і тэндэнцыі ў ёй становяцца ў сувязь з рухам сусветнай літаратуры. Ад пецярбургскіх сімвалістаў Янку Купалу перадалася вера ў пераўтварэнне рэчаіснасці з дапамогай мастацтва. Гэта добра было відаць ў зборніку «Гусляр». Яго мастацкі свет — не столькі адбітак знешняга свету, колькі тварэнне душы паэта, вынік унутраных, суб'ектыўных намаганнў яго асобы. Аўтар «Гусляра» ў паэзіі, літаратуры і мастацтве бачыў сродак адрадзіць чалавецтва да новага жыцця. Зрэшты, мастацкае слова для Купалы ніколі не было простым і літаральным адлюстраваннем рэчаіснасці. Апазіцыя пазітывісцкаму рэалізму зараджаецца ў яго творчасці, як мы бачылі, ужо ў самым пачатку, калі паэт ішоў да свайго першага зборніка «Жалейка». Далей — болей. Побач з рэалістычна-дакладным узнаўленнем жыцця назіраецца імкненне да абагульняючай сімволікі і рэмінісцэнцыю, да паказу зменлівасці рэчаіснасці і чалавечай свядомасці, новых суадносін паміж імі. Аднак межы сімвалізму, якія, трэба адзначыць, па-першае, не быў арганічны для беларускай культурна-гістарычнай

[1] Бярозкін Р. Постаці: Артыкулы пра паэтаў. Мн., 1971. С. 21.

традыцыі, і, па-другое, к таму часу ўжо вырадзіўся амаль да эпігонства, не маглі задаволіць беларускага паэта і яго «барацьбяны» творчасць. Ён стаяў перад неабходнасцю спасціжэння трагічнасці чалавечага лёсу і звязваў гэта з нацыянальнай трагедыяй беларускага народа — яго бяспраўным існаваннем. Інакш кажучы, Купала не адрываўся ад зямлі, ад рэалізму з яго «здаровым сэнсам», дапаўняючы яго элементамі падсвядомага, інтуітыўнага, шырока ўводзячы ірацыянальныя моманты ў сваю паэзію. Традыцыі «старога» рэалізму не паміраюць у яго творчасці, таму што ў рэшце рэшт рэалізм і мадэрнізм маюць пільную патрэбу адно ў адным. Традыцыйна-рэалістычнаму мастацтву патрабаваліся новыя сродкі выразнасці, асабліва пошукі ў галіне ўмоўна-міфалагічных форм. Разглядаючы сутнасць адносін паміж чалавекам і светам, асобай і грамадствам, Купала шырока звяртаецца да ўмоўных мастацкіх форм. Прыклад таму — верш «У начным царстве» (1912), які малюе карціну тагачаснай рэчаіснасці: «У ёрмах, схаваны, скацінай ідуць нябожчыкі жывыя». Купалаўскі гратэск і гіпербала адлюстроўваюць тут духоўны тупік, у якім апынулася грамадства ў выніку імперыялістычнай палітыкі царскага самадзяржаўя.

На пярэдні план выходзяць уродліва-фантасмагарычныя бакі быцця («Чорны Бог», «Ваўкалак», «Хохлік», «Сон на кургане», «У вечным бары» і іншыя творы). У гэтым сэнсе вельмі адметны другі раздзел зборніка «Шляхам жыцця» (1913) — «Па межах родных...»:

Як змеркне, як ноч дзень зваюе
І зораў паявіцца знак,
Па нівах, па сёлах шнуруе
Туды і сюды ваўкалак.
У поўнач на пні і на сталі
Знімае, ўздзявае свой від;
Не кеміць ні крыўды, ні жалю,
Ні наспаў магільных, ні пліт.

*(«Ваўкалак»)*

Ваўкалак — чалавек-воўк, нешта як бы звышпрыроднае, пазарэальнае, што, аднак, незразумелым чынам уплывае на нашы думкі і ўяўленні, як і хохлік:

Як зайграе ў лесе хохлік, —
Замірае песень воклік;
Як зачэпіць мох і лозы, —
Аджываюць смех і слёзы...

*(«Хохлік»)*

Актыўнае самавыяўленне вядзе да пераўтварэння рэчаіснасці, да стварэння новай эстэтычнай рэальнасці, поўнай таямнічых адчуванняў і няясных намёкаў:

Па межах родных і разорах
Над небам зводна-неспагадным,
Спакоем воджаны век здрадным,
Сную, і нейкі са мной шорах.
Са мной, за мною ўслед сум-вораг
З глухім нашэптам, непрынадным:
Як ты ні хочаш быць праглядным, —
Сягоння ўсё тут — як і ўчора ж!
Усё жыве тым самым богам, —
Таксама шумнае прадвесне
Усёй не зводзе з гоняў плесні...
Араты ўсход нясе адлогам:
Курган чапаючы нарогам,
Не ўспомніць прадзедавай песні.

*(«Па межах родных і разорах...»)*

Гэтыя вершы немагчыма перакласці на мову простай логікі. Тут шмат эмацыянальна-падсвядомага — намёкаў, няўлоўнага сэнсу і адценняў у гучанні слоў. Ствараецца ўражанне, што быццам сціраецца мяжа паміж свядомасцю паэта і навакольным светам, які становіцца функцыяй гэтай свядомасці і адначасова яе адлюстраваннем.

Пачуццёва-інтанацыйны характар гэтах вершаў вызначае іх духоўна-эстэтычную своеасаблівасць, у іх адбіўся імпрэсіяністычны каларыт, які нечым нагадвае бадлераўскі «сплін»:

Ў вечным боры цемнатвары
Скачуць, плачуць, весяліцца;
Жнуць, збіраюць дзіва-жніва
Ў сонным полі, ў горкай долі.
Ночай ходзяць, днём заводзяць,
Твораць, мораць яснагляды;
Веюць, сеюць плесні ў песні
На палаці ў кволай хаце.

Слова цікавіла мадэрністаў не столькі ў сваім прамым значэнні, колькі ў яго патаемным сэнсе, які адпавядаў тым няўлоўным вобразам і пачуццям, што месціліся ў душы мастака. Яно павінна было даносіць незвычайнасць, выключнасць і глыбіню перажыванняў, пазбягаючы праматы і яснасці. Прадметы і ўся жыццёвая рэчаіснасць у гэтым вершы Купалы растаюць у нейкай туманнай дымцы, размытасці і няпэўнасці абрысаў паэтычнай вобразнасці:

Як начніцы-чарналіцы
Скрыпам, шыпам маладзяцца:
Кінем, плюнем чары-мары
На паляны нечапаны;
Над курганам незабраным
Скруты-путы разасцелем,
Сном-травою станем, глянем
На няўлады, на пасады...
З чорным богам прад парогам
Сталі ў хвале, як кароны,
І пануюць — скачуць, плачуць
Цемнатворы ў вечным боры.

*(«Ў вечным боры...»)*

У лірыцы беларускага паэта, падобна як у Поля Верлена, знікае мяжа паміж душэўным станам аўтара і аб'ектыўнай рэальнасцю, неаддзялімай ад уражання, настрою, успаміну. Паэт спалучае зрокавыя і слыхавыя ўражанні, узнікае злавесны вобраз «цемнатвораў», што запанавалі ў навакольнай рэчаіснасці.

Верш перадае не толькі атмасферу нацыянальнага і духоўнага ўціску, але і адчуванне нейкіх ірацыянальных «цямнот» нашага быцця, якія акружаюць чалавека ў яго зямным існаванні, нагадваючы пра сябе нечаканымі катаклізмамі і драмамі.

Мадэрнізм разам з тым прыўносіў у беларускую літаратуру элемент гульні і эстэтычнай раскаванасці. У некаторых выпадках ён даходзіў да абсалютызацыі эксперыменту ў галіне формы, фактычна пазбаўляючы яе змястоўнасці. Дбаючы пра навізну мастацкай формы, Купала, як мастак, не прымаў умоўнасці, прадыктаванай чыста фармальнымі меркаваннямі.

І яшчэ. Купалаўскі мадэрнізм, адлюстраваўшы трагічную вастрыню ўзаемаадносін чалавека і навакольнай рэчаіснасці, ніколі не перарастаў у поўнае расчараванне ў жыцці, у адчуванне асуджанасці ўсялякіх спроб змяніць яго да лепшага. І паэт — гэта адназначна — ніколі не даходзіў да пропаведзі чыстага суб'ектывізму, ігнаравання рэальных форм жыцця. У яго душы не было прыкмет хаосу, ці, інакш кажучы, апошні ніколі не атрымліваў у яго перавагі над гармоніяй.

Побач з грамадзянска-публіцыстычнай лірыкай у новым зборніку атрымалі далейшае развіццё інтымныя, пейзажныя і філасофскія матывы.

У пецярбургскім жыцці паэта значнае месца занялі прыязныя сяброўскія адносіны з П. Мядзёлкай, з якой ён пазнаёміўся яшчэ

будучы ў Вільні. Паўліна Мядзёлка — адна з першых выканаўцаў ролі Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Купалы.

Інтымная лірыка Купалы звязана са светапоглядам і сацыяльна-маральнай канцэпцыяй жыцця, якая выступае ў яго творах. Жыццёвы вопыт даваў яму падставы думаць, што каханне няўтульна адчувае сябе ў рэальным свеце, што ў жыцці рамантычны бок гэтага пачуцця — заведамы абман. Зрэшты жыццёвы вопыт, магчыма, толькі пацвердзіў даўнія думкі — пра што ў пэўнай ступені сведчыць, напрыклад, верш «Даўгажданая», створаны ў 1909 г.:

Ты прыйшла ка мне тады,
Як звінелі халады,
Як стагнаў яловы плот,
Хохлік бегаў ля варот.

У інтымны змест верша ўплятаецца матыў кургана:

І сагрэла ты мяне
У палуцьме, у палусне;
Паня ты была, я пан...
После зноў зацвіў курган.

Каханне ў лірыцы Купалы выяўляецца і як голас прыроды. Часам яно такое бязлітасна-раўнадушнае, як сама прырода. Гэта відаць у вершы «А яна...», у якім, паказваючы чалавека, паэт улічвае складанасць і супярэчлівасць яго прыроды:

Гэткім шчырым каханнем яе атуліў,
З гэткай ласкай глядзеў ў яе сумныя вочы, —
Як і сонца не туліць расквечаных ніў,
Як і зоры людзям не ўглядаюцца ўночы!
Утварыў з яе шчасце з-пад шчасцяў сваё —
Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,
І пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...

А яна?.. А яна была толькі... дзяўчына!..[1]

Дысгармонія паміж ідэальным і сапраўдным, рэальным, якая паўставала перад ім на кожным кроку, усведамлялася ім як асабістая наканаванасць, як паэтычны лёс.

У паэзіі Купалы, у тым ліку і ў інтымнай лірыцы, раскрываліся сутнасныя сілы чалавека.

Так, у вершы «Абнімі...» гучыць водгалас сапраўднай страсці, гарачых парыванняў шчырага сэрца і непадробных пакут:

Абнімі ты мяне, маладая,

---

[1] Купала Я. Вершы. Мн., 1988. С. 157.

Абніманнем гарачым, агністым,
Дый памчымся ад краю да краю
Вольнай думкай па свеце цярністым.

У дзень вясёлы мы сонцам пякучым
Заіскрымся ў нябеснай прасторы,
З ветрам-сокалам душы заручым,
Ў пушчу-лес упляцём загаворы.

Тут, у гэтым пантэістычным гімне каханню, ёсць нават пэўная экзальтацыя, эмацыянальны перабор, але з рамантыкамі так часцей за ўсё і здараецца.

Каханая для лірычнага героя — істота рэальная і ідэальная адначасова. Для Купалы вельмі натуральна рэалістычныя постаці герояў перавесці ў іншасказальна-алегарычны план, сімвалізуючы каханне як вышэйшую каштоўнасць жыцця. Так выглядае яно ў вершы «Заручыны»:

Далёкай, нялёгкай сцяганы хадзьбой,
Прад хвойкай высокай мы селі з табой,
    Як цар і царыца;
    Шурпаты няжаты сох верас ля ног,
    Спаў белы спляснелы пад шышкамі мох
    Над цёмнай крыніцай.

Прырода выступае як натуральнае ўлонне закаханых і адначасова яна сімвалізуе нешта важнае ў чалавечым жыцці (высокая хвойка, цёмная крыніца і інш.). Закаханыя бачаць тое, што не дадзена ўбачыць чалавеку ў звычайным стане. Ракавыя пачуцці, гераічны адчай быцця, якія мелі месца ў яго ранняй інтымнай лірыцы, знікаюць пад прамянямі таго духоўна-прасветленага пачуцця, якое агортвае закаханасць.

У зборніку «Шляхам жыцця» Янка Купала паўстаў перад чытачом як нацыянальны паэт беларускага народа, выразнік яго ідэалаў, вястун лепшай долі, аднак у навакольнай рэчаіснасці ён, як адзначалася, бачыў не толькі арэну барацьбы з сацыяльным злом і несправядлівасцю, а куды больш абсяжнае ўлонне чалавечага існавання, зместам якога была шматстайная таямнічая містэрыя жыцця, яго бясконцы цуд і загадка, багацце праяў чалавечнасці. Менавіта пра гэта расказваў верш «Я люблю...»:

Я люблю ўсходы нашых палеткаў,
І спавітыя ў зелень лугі,
І шум бору пануры, глухі,
І шаптанне крынічнае ўлетку...

Я люблю упрыгожану ў мхі
Нашу вёску — сваёй крыўды сведку,
Свой народ — гэту звяўшую кветку,
Цэлы край — родны мне й дарагі.
Я люблю ясны вочы і грудзі
І стан гібкі дзяўчыны-красы:
Аб ёй брэджу на яве і ў сне.
Я люблю і заву, бы ў нялюддзі, —
Чуюць кліч мой сухія лясы,
Кліч: хто ж любіць, хто любіць мяне?

І менавіта ў такіх сваіх эстэтычных якасцях паэзія Купалы адлюстроўвала набліжэнне значных перамен.

## РАМАНТЫЧНЫЯ ПАЭМЫ «БАНДАРОЎНА», «МАГІЛА ЛЬВА», «ЯНА І Я»

Лета 1913 г., праведзенае ў Акопах, аказалася асабліва плодным у творчых адносінах. Купала ў гэты час надзвычай шмат пісаў — з'яўляліся новыя вершы, паэмы, п'есы, артыкулы, у якіх выявіліся новыя сацыяльныя і духоўныя акцэнты купалаўскага гуманізму, сцвярджаемай ім канцэпцыі свабоды. Ідэя свабоды працягвае заставацца цэнтральнай у яго паэзіі, аднак цяпер ён разглядае яе не толькі ў агульнанацыянальным плане, але і ў плане чалавечай асобы. Усё больш мацнее патрэба і жаданне Янкі Купалы супрацьстаяць неспрыяльнай для чалавека сітуацыі гнёту і несвабодна адстаяць і ўмацаваць асобу ў яе нязломным значэнні як нешта цэласнае і недатыкальнае. У чэрвені была завершана паэма «Бандароўна», напісаная на гістарычны сюжэт. Падзеі, якія згадваюцца ў ёй, адносяцца да XVII ст. Мелася, як мы ўжо бачылі, вялікая патрэба наталіць прагу народа ў яго ўласным гістарычным мінулым, у легендах і міфах, на якія, нягледзячы на іх старажытнасць, абапіралася яго сучаснае жыццё. Паэт шмат браў з паданняў, але яшчэ больш з жыцця чалавечага сэрца, здольнага на гераічны ўчынак. Яго бянтэжыла замаруджанасць працэсу абуджэння народнай масы ад сну, і пагэтаму ён бачыў пільную патрэбу ў героях, якія б адчулі смак свабоды. Свабодны чалавек, на думку Купалы, ужо не згодны будзе трапіць пад уціск іншага. Адна з такіх гераінь — Бандароўна, якая кідае выклік самому пану Патоцкаму. Гегель лічыў, што свабода чалавека праўляецца ў сітуацыі найбольшай для яго небяспекі. У такой сітуацыі і апынулася Бандароўна, калі перад ёй паўстала неабходнасць рабіць прапанаваны панам выбар. Купала імкнецца паказаць не складанасць і вытанчанасць асобы сваёй гераіні, а перш за ўсё яе чалавечую годнасць і духоўную моц:

Перад панам тым з Канева
Смела дзеўка стала,
Смела гледзячы у вочы,
Смела адказала:
— Дужы ты з сваім багаццем,
А я сілы большай, —
За мной праўда і народ мой,
За табой жа — грошы!

Хто яна — Бандароўна — ахвяра ці пераможца? Думаецца, і тое і другое адначасова. Гераіня ахвяруе сваім жыццём у імя свабоды і абароны чалавечых правоў. Выбухае народны бунт і змятае ліхадзеяў.

Купала верыў, што крыўдзіцеляў чакае суровая расплата за зганьбаванне чалавечнасці, высокіх маральных прынцыпаў.

Беларускаму народу неставала такіх людзей, як Бандароўна. Гэта адна з іпастасей купалаўскага тытанізму, які не губляе сувязі з чалавечай супольнасцю, з паўнатой грамадскага быцця.

Услед за «Бандароўнай» тым жа летам з'явілася «Магіла льва». Герой гэтай паэмы — разбойнік Машэка, які, трэба сказаць, нічым не нагадвае Бандароўну. Больш таго, ён — супрацьлегласць Бандароўне, хоць паводле сваіх прыродных задаткаў Машэка здольны быў бы стаць выдатнай асобай.

Легенду пра Машэку запісаў вядомы фальклярыст П. Шэйн. Паэт, аднак, пераасэнсаваў канфліктную аснову фальклорнай першакрыніцы і яе сацыяльна-гуманістычны змест. Пра гэта, думаецца, і ідзе гаворка ў першым раздзеле паэмы, дзе ёсць такія радкі:

Пачнём дакапывацца самі
Разгадкі нашых крыўд і бед,
Што леглі цёмнымі лясамі
На нашай долі з даўных лет.

У «Магіле льва» паэт раскрывае адну з прыкрых старонак «нашых крыўд і бед». У вобразе Машэкі паэт, па сутнасці, развенчвае індывідуалістычны тытанізм з уласцівым для яго эгаізмам, што вядзе да вельмі сумных і таксама гістарычных вынікаў. Ён спрабуе пранікнуць у морак і сутонне чалавечай натуры, у яе цёмныя глыбіні.

Купала адзін з першых у беларускай літаратуры заўважыў, што чалавек, хаця яго і называюць божым тварэннем, істота даволі недасканалая ў маральным плане. У пакутлівым роздуме над пытаннем, як усталяваць на зямлі свабоду, роўнасць і брацтва, беларускі паэт шукаў парады ў шматлікіх мысліцеляў і інтэлектуалаў, а часам як мастак спрачаўся з імі.

Калі вы ўважліва прачытаеце «Магілу льва», дык без асаблівых намаганняў знойдзеце ў гэтай купалаўскай рэчы водгук ніцшэанскіх ідэй. Цікавасць да гэтай філасофіі, асабліва сярод моладзі, была тады літаральна ўсеагульнай. Знаўца і ўдзельнік тагачаснага літаратурнага працэсу Н. Я. Мандэльштам адзначала: «Сімвалісты ўсе да аднаго былі пад уплывам Шапэнгаўэра і Ніцшэ, або адмаўляліся ад хрысціянства, або спрабавалі рэфармаваць яго ўласнымі сіламі, робячы прышчэпкі антычнасці, язычніцтва, нацыянальных перуноў ці дамарошчаных вынаходстваў»[1].

---

[1] Мандельштам Н. Вторая книга. М., 1990. С. 42.

З ідэалогіяй Ніцшэ ў многім былі звязаны погляды Горкага, бальшавікоў. Вобраз Машэкі ў нейкай меры, як здаецца, таксама створаны пад уздзеяннем ніцшэанскай ідэі «звышчалавека». Машэка жыве і дзейнічае ў несвабодным свеце. Калі героі ранніх паэм Купалы — ахвяры сусветнага зла, дык Машэка, здавалася б, — яго вораг. Ён паўстае супраць падману і няпраўды, упэўнены, аднак, што ва ўсім вінаваты самі людзі, што ўвесь свет такі. Ён адкідае чалавечыя перакананні — мараль, веру, законы, этычныя ўстанаўленні. Вышэй за ўсё Машэка ставіць самога сябе, сваю крыўду і ў душы лічыць, што яму ўсё дазволена. Ён не д'ябал, але і не анёл, чорнае і белае перамешана ў ім, аднак не гэта галоўнае. Галоўнае ў тым, што Машэка — індывідуаліст, яму цяжка існаваць з падобнымі сабе.

Купала першы ў беларускай літаратуры ўбачыў галоўную экзістэнцыяльную праблему — пагрозу крайняга індывідуалізму, прынцыповага адзіноцтва, абсурду быцця. Ён быў пабornікам ідэі асабовай свабоды чалавека, аднак рашуча не прымаў індывідуалізму. Ірацыянальны момант у паводзінах Машэкі звязаны з вялікім жаданнем героя сцвердзіць сваю індывідуальную волю і незалежнасць. Ён хоча вызваліцца ад усялякай залежнасці і становіцца, па сутнасці, ахвярай сваіх эгаістычных імкненняў. І ці варта гаварыць пра тое, наколькі адмоўна гэта адбілася на гістарычным лёсе народа, з асяроддзя якога з'яўляліся падобныя «волаты», на фарміраванні яго духоўнай супольнасці. Машэка нагадвае пушкінскага Алека (паэма «Цыганы») з уласцівым яго свядомасці крайнім індывідуалізмам («Ты для себя лишь хочешь воли»), але па шляху злачынства ідзе куды далей за яго. Тут ужо адчуваецца подых навальнічнага XX ст., крушэнне традыцыйных гуманістычных ідэалаў, абсалютызацыя таталітарнай варожасці і падазронасці. Эгацэнтрызм Мацюкі не дазваляе яму бачыць у чалавеку чалавека. Гэтым вобразам Купала фактычна асуджае ідэю «звышчалавека», і ўчынак Натальківў успрымаецца як акт справядлівасці.

Сваімі паэмамі Купала ў значнай ступені вырашаў задачу стварэння нацыянальнага рамантычнага эпасу. Пра гэта сведчыць яшчэ адна яго паэма — «Яна і я», створаная тым жа багатым ліпенем 1913 г. «Яна і я» з'яўляецца, у пэўным сэнсе, працягам паэмы «Магіла льва». Спрадвечны анталагізм чалавечага быцця, уласцівая яму утылітарнасць і будзённая неабходнасць спалучаюцца ў гэтым творы з духоўна-бескарыслівым, замілаваным стаўленнем да жыцця ва ўсіх яго праявах. Прачытаўшы гэты твор, А. Фадзееў пісаў: «Яна і я» —

паэма выключнай своеасаблівасці, зямная, язычніцкая, і ў той жа час па-беларуску ціхая, акварэльная і зноў і зноў мужыцкая»[1].

У ёй Купалу не вабіць прызямленае бытапісанне — ён арыентуецца на лірычна-абагульненую вобразнасць. Праз узнаўленне сялянска-патрыярхальнага малюецца вобраз універсальнага жыцця. У цэнтры твора дзве абагульненыя чалавечыя постаці — Яна і Ён, селянін і яго жонка, жыццё і побыт якіх праходзяць у цесным адзінстве з усімі фазамі земляробчага календара.

Гэты твор называюць паэмай-ідыліяй. Мы б назвалі яго своеасаблівым пастаральным раманам, вытрыманым у духу букалічнай традыцыі, якая ў сусветнай літаратуры ўзыходзіць ажно да антычнасці. Ён і Яна — гэта беларускія Тэлемон і Баўкіда пачатку XX ст. Калі ў «Магіле льва» Купала асудзіў ірацыянальнасць згубных пачуццяў, то ў паэме «Яна і я» ўславіў дабрыню, хараство і маральны абавязак чалавека. Своеасаблівым подступам да паэмы «Яна і я» з'явіўся верш «Пакахай мяне, дзяўчынка...», напісаны ў 1908-1909 гг.:

Плыве рэчачка далінкай,
Рыбак шмат у ёй;
Пакахай мяне, дзяўчынка,
Як рыбкі ручэй!..
Разам будзем жыці ў хатцы,
Разам песні пець;
Будзе раем свет здавацца,
Ўсё праўдай яснець.

«Яна і я» — гэта яшчэ адна з іпастасей Купалавай ідэі Адраджэння, звернутага да багацця і разнастайнасці жыцця. Паэма раскрывае маральна-паэтычны свет зямнога існавання чалавека, радасць гаспадара і працаўніка. Аўтар паэтызуе жыццё і працу чалавека на зямлі, захапляецца вабнасцю зямнога кахання, непасрэднасцю пачуцця прыроды, хараством прыроднага ўлоння. Зямное быццё паўстае тут прыўзнятым на крылах мары. Напачатку рукапіс меў падзагаловак: «Песня зямлі і жыцця», аднак потым патрэба ў такім тлумачэнні адпала: карціны, намаляваныя ў паэме, гавораць самі за сябе:

І выйшаў сеяць я. Яна стаяла
Непадалёк мяне, на ўзмежку;
У высях сонца золатам зіяла,
Ўнізу плыў вецер сваёй сцежкай.
Пасыпаліся дробныя зярняты
Ў раллю, як пацеркі янтарны,

---

[1] Фадеев А. За тридцать лет. М., 1957. С. 813.

На наш загон, сахою узараны,
На мой шнурок — палетак ярны.
Яна, як ніцая бярозка тая,
Стаяла, за сяўбой слядзіла,
І як бы Багародзіца святая —
Здавалася мне — блаславіла.

*(З раздзела «Сяўба»)*

Купала-рамантык, як бачым, выкарыстоўвае рэалістычныя сродкі — дакладныя дэталі, узятыя з паўсядзённага жыцця. Думкі і паводзіны герояў выяўляюць глыбокае ўнутранае высакародства іх натур. У іх вобліку спалучаюцца хараство і маральнасць. Звычайна Купала пазбягаў ідылічных, пастаральных фарбаў у абмалёўцы сялянскага жыцця і побыту. На гэты ж раз, паўтараем, ён свядома робіць стаўку на ідылію. Ідылічнасць у паэме, такім чынам, ёсць, але няма саладжавасці, хадульнасці і рэзанёрства, якія часам спадарожнічаюць рамантызму.

Паэма «Яна і я», думаецца, азначае канчатковае пераадоленне ідэй ніцшэанства ў творчасці Купалы. Тут няма ўласцівага яго ранейшым героям тытанізму і імкнення да абсалюту. Яна і Ён — нармальныя людзі, звычайныя сяляне. Звычайныя, але свабодныя! Свабодны чалавек, паводле пераканання аўтара, ужо не захоча быць ні панам, ні рабом. Інтымны свет герояў прасякнуты душэўнасцю і сілай пачуцця, тут пануюць згода, любоў, дабрыня і няма месца для зла, ілжы, эгаізму. Каханне ў паэме па-вясковаму простае, аднак не пазбаўлена духоўнай узнёсласці. Апісанні ў Купалы падпарадкаваны і выяўленню ўнутранага, суб'ектыўнага свету паэта, яго рамантычнага ідэалу, веры ў магчымасць жыцця шчаслівага і прыгожага. Карціны прыроды і сялянскага земляробчага календара раскрываюць псіхалагічны стан не толькі герояў, але і самога аўтара, яго паэтычнае светаадчуванне. Ідэал Купалы — жыццё, якое б давала чалавеку адчуванне арганічнага адзінства са светам.

Ці можна ў даным выпадку гаварыць пра своеасаблівы русаізм паэта?

Думаецца, што можна. У прыродзе ён бачыць яе цэласнасць, гарманічнасць і прыгожасць. Прырода, на яго думку, здольна абараніць ад жыццёвага зла. Купала здымае адчужанасць чалавека і прыроды, сцвярджае еднасць людзей і таго прыроднага ўлоння, у якім яны жывуць. Беларускія сяляне Яна і Ён перажываюць паўнату спалучэння са светам прыроды, на якую здольны быў хіба што засцянковы шляхціц Завальня з вядомай кнігі пісьменніка XIX ст. Я. Баршчэўскага.

Клопат і трывога Купалы ў тым, каб людзі не здрадзілі зямлі, якая дадзена ім для жыцця. Ён распрацоўвае своеасаблівую экалогію чалавечага існавання на зямлі. Паэт быў перакананы ў тым, што забыццё запаведзей сціпласці і ўстрымання, ненасытная прага ўласнасці не вядуць да дабра. А прыкметы былі відавочнымі — пра іх нагадвала навакольная рэчаіснасць.

## НАШАНІЎСКАЯ ДЫСКУСІЯ 1913 г.

Несупынна пашыраўся кантакт творчасці паэта з шырокім дэмакратычным чытачом. Купала нашмат актывізаваў беларускі літаратурна-мастацкі працэс, здолеў натхніць і паклікаць да літаратурнай творчасці многія маладыя таленты. «Уплыў Янкі Купалы на фарміраванне і рост беларускай паэзіі быў незвычайным, — адзначаў Кузьма Чорны. — І сам факт яго літаратурнай дзейнасці абуджаў да літаратуры новыя сілы і ўзводзіў іх на дарогу». Пад плённым уздзеяннем ягонага слова і прыкладу распачалі сваю працу М. Багдановіч, Ц. Гартны, У. Галубок, С. Палуян, К. Буйло, М. Гарэцкі, Я. Журба, А. Гурло, З. Бядуля. Ядвігін Ш., А. Паўловіч, Г. Леўчык і многія іншыя, якія пераймалі ад Купалы ідэйныя і творчыя прынцыпы барацьбы за высокія маральна-гуманістычныя ідэалы. Яны вучыліся ў яго паважаць праўду жыцця, верыць у стваральныя сілы працоўнага чалавека, у яго будучыню.

Купала ўздзейнічаў на сваіх літаратурных паслядоўнікаў і грамадзянскімі асаблівасцямі сваёй асобы, і праз уплыў на агульны ідэйна-эстэтычны ўзровень грамадства. Яго асоба і творчасць паспрыялі працэсу фарміравання ідэйна-мастацкага адзінства маладых сіл беларускай літаратуры, умацаванню яе сувязей з сацыяльнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбой народа. Менавіта з гэтых пазіцый ён выступіў у вядомай літаратурнай дыскусіі 1913 г. з артыкулам «Чаму плача песня наша?»

Узаемаадносіны паэта з «Нашай нівай» у гэтым годзе складваліся з адзнакай некаторай напружанасці. Газета, здавалася яму, марудзіла з водгукам на зборнік «Шляхам жыцця», у які аўтар уклаў шмат сіл і надзей і які сапраўды быў выдатнай падзеяй у грамадска-літаратурным жыцці Беларусі. Рэцэнзія А. Навіны з'явілася са спазненнем, ацэнка давалася ў ёй у цэлым станоўчая, аднак нейкія недагаворкі, відаць, засталіся, бо праз нейкі час газета надрукавала артыкул «Сплачвайце доўг», падпісаны Ю. Верашчакам (псеўданім В. Ластоўскага). Выступленне Ю. Верашчакі сведчыла, што «Наша ніва» не зусім была задаволена ідэйна-эстэтычным станам тагачаснай беларускай паэзіі. «Маё штодзённае жыццё шэрае, цяжкае, — пісаў Ю. Верашчака, звяртаючыся да тагачасных паэтаў-«парнаснікаў» — і я хачу з вашых твораў навучыцца бачыць каля сябе красу... Мяне цікавіць не толькі тое, што Янка сядзіць на вузкім шнурочку зямлі,

але больш таго, што гэты Янка чуе ў той момант, калі ён поўнымі грудзьмі хапае пах чорнай, прарэзанай плугам на скібы зямлі»[1].

Улетку 1913 г. на старонках «Нашай нівы» ўслед за артыкулам «Сплачвайце доўг» узнікае вядомая дыскусія пра шляхі развіцця беларускай паэзіі. Нельга адмовіць аўтару артыкула «Сплачвайце доўг» у тым, што ён адчуў некаторую аднабаковасць тагачаснай паэзіі, якая нярэдка паступалася сваімі эстэтычнымі магчымасцямі ў імя першачарговых сацыяльных задач. Літаратурная дзейнасць беларускіх пісьменнікаў XIX ст. мела ў пэўным сэнсе не столькі духоўны, колькі духоўна-практычны характар: беларусу перш за ўсё трэба было азвацца, напомніць пра сябе, каб яго пачулі. У XX ст. задачы, якія стаялі перад літаратурай, — і Ю. Верашчака меў тут рацыю — значна ўскладняліся: сцвярджаючы гістарычнае існаванне свайго народа, яна павінна была на новай сацыяльнай і часавай аснове выявіць яго духоўны патэнцыял, своеасаблівасць мастацка-эстэтычнага аблічча, нацыянальны менталітэт. Праўда, крытык як быццам бы не ўлічваў, што менавіта Янка Купала дзеля гэтага зрабіў больш, чым хто. Нядаўна завершаная і пакуль што невядомая шырокаму чытачу паэма «Яна і я», іншыя творы маглі быць важкім адказам на пастаўленыя Ю. Верашчакам пытанні.

Пытанне аб прызначэнні паэта было не новым для Купалы. Ці не ў першы раз ён звярнуўся да яго яшчэ ў вершы «Я не паэта», якім адкрываўся зборнік «Жалейка» і ў якім недвухсэнсоўна паставіў сваю песню ў сувязь з доляй роднага народа. Эстэтычная і грамадзянская праграма паэта выкладзена ў шэрагу твораў, у тым ліку ў вершы «Песняй толькі», які быў напісаны ў час нашаніўскай дыскусіі 1913 г. і, як відаць, ёю выкліканы:

Песняй толькі на свеце жыву я,
Праз яе тапчу толькі расу;
Пасцігаю, як ёй запаную,
Недасціглую быту красу.

Верш перадае дынаміку духоўна-эмацыянальнага жыцця паэта, своеасаблівасць яго эстэтычных адносін да рэчаіснасці.

26 ліпеня 1913 г. у адказ на выступленне Ю. Верашчакі Купала публікуе ў «Нашай ніве» свой артыкул «Чаму плача песня наша?» (за подпісам «Адзін з «парнаснікаў»), у якім рашуча адстойвае дэмакратычны накірунак мастацкай творчасці, значна шырэй, чым яго апанент, вызначае доўг паэта перад народам. Паэт бачыў галечу і ўціск, якія панавалі ў родным краі, і не лічыў магчымым ігнараваць

[1] Наша ніва. 1913. 5 ліп.

гэту акалічнасць у пісьменніцкай творчасці і помніць пра свае грамадзянскія абавязкі. Асабліва цікавай з'яўляецца тая мясціна ў артыкуле, дзе Купала выказвае свае ўяўленні пра асобу, талент паэта і сэнс паэтычнай творчасці «Думка паэта вольная, — пісаў ён, — як вецер, і безгранічная, як даль гэта ўсясветная, сэрца яго напоўнена вечным мілаваннем к бліжняму, як сонца вечным цяплом і святлом, а душа яго глыбокая, як гэта мора-акіян, у глыбінях каторага крыюцца багатыя, недасціпныя чалавечаму воку скарбы. З гэтага святла і агню, што палае ў сэрцы, і з гэтых скарбаў, што крыюцца ў глыбіні душы яго, патрапіць паэта свабоднай думкай дабыць усе хараствы свету і ўсе асалоды жыцця людскога на гэтым свеце і перадаць усё гэта ў бессмяротнай песні свайму народу».

## ДРАМАТУРГІЯ. «ПАЎЛІНКА», «ПРЫМАКІ», «РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО»

З чэрвеня 1912 г. у Акопах Купала завяршыў свой першы сцэнічны твор — камедыю «Паўлінка». Асобнай кніжкай яна выйшла ў Пецярбургу ў наступным годзе ўсё ў тым жа выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» і атрымала станоўчыя водгукі. Неўзабаве «Паўлінка» была пастаўлена на сцэне спачатку ў Вільні, затым у Пецярбургу, а летам 1913 г. і на радзіме — у Радашковічах, што з'явілася вялікай падзеяй у гісторыі нацыянальнага тэатра.

У цэнтры п'есы, як і ўсёй творчасці Купалы, — праблема абуджэння і фарміравання сацыяльна-палітычнай і духоўнай свядомасці народа, узвелічэнне нацыянальных асноў яго жыцця. Тэма камедыі — канфлікт паміж старым і новым у тагачасным беларускім грамадстве, канфлікт пакаленняў. Характэрныя рысы новага пакалення, што ўваходзіла ў жыццё, — узрастанне ўзроўню нацыянальнай свядомасці, любоў да свабоды, развіты асабовы пачатак, увасоблены перш за ўсё ў вобразе Паўлінкі. Гэты новы тып беларускі Купала заўважыў у асяроддзі менавіта моладзі. Падобны да яе і Якім Сарока — вясковы настаўнік. Паўлінка і Якім — гэта маладая Беларусь. Выраз «маладая Беларусь» быў вельмі папулярны ў тыя часы. Адзін з шырокавядомых вершаў паэта той пары так і называўся «Маладая Беларусь» (1911-1912):

Вольны вецер напеў вольных песень табе,
Бор зялёны узняў дружным гоманам,
Сонца полымем вызвала к слаўнай сяўбе,
Зоры веру ўлілі сілам зломаным.

Працэс нацыянальнага адраджэння — як нешта надзвычай натуральнае, што разумелася само сабой, - паэт ставіць у прамую сувязь з усёй навакольнай прыродай, усім светам. Зрэшты, перад ім быў прыклад многіх народаў Еўропы, якія на працягу XIX ст. перажылі перыяд нацыянальнага ўздыму, здолелі кансалідавацца і заняць належнае месца сярод суседзяў. Прыкметы новага абнадзейвалі і на Беларусі, і гэта не магло не радаваць.

Фанабэрыстая шляхта паказана ў «Паўлінцы» як рэакцыйная частка тагачаснага беларускага грамадства, якая адарвалася ад роднай культуры, здрадзіла свайму народу (шляхціц Адольф Быкоўскі), але, як і раней, не перастае прэтэндаваць на ролю носьбітаў вышэйшай культуры. На гэта і скіраваны сатырычныя стрэлы драматурга, які едка высмейвае ганарыстага Адольфа Быкоўскага — «жаніха» Паўлінкі. Гэты персанаж тыпалагічна блізкі Пранцішку Карчэўшчыку — незадачліваму герою камедыі К. Каганца «Модны шляхцюк». У адным

стане з ім знаходзяцца Сцяпан Крыніцкі (бацька Паўлінкі) і яго сябар Пранціcь Пустарэвіч — прадстаўнікі старой, звыраднелай шляхты, што варожа ставіцца да новых павеваў у жыцці, якія былі так блізкія сэрцу Купалы.

«Паўлінка» добра перадае псіхалагічны менталітэт народнага жыцця, у тым ліку і яго ўцешна-забаўны бок (напрыклад, застольныя традыцыі). Згадаем хаця б, напрыклад, тую мясціну ў п'есе, дзе гаворка ідзе пра славутую беларускую «прынуку».

Драматургія Купалы, узрастаючы на глебе нацыянальнага Адраджэння, становіцца к гэтаму часу вельмі разнастайнай у ідэйна-эмацыянальных адносінах. Адчуваючы, напрыклад, патрэбу маладога беларускага тэатра ў лёгкай камедыі, ён піша жарт-вадэвіль «Прымакі» (ліпень 1913 г.). Праўда, гэтаму сцэнічнаму «жарту» хапала і сур'ёзнага зместу: аўтар не ўхваляў сацыяльныя і маральныя заганы, на якія хварэлі героі гэтай камедыі, — п'янства, абмежаванасць і абыякавасць да жыцця. «Прымакі», як і «Паўлінка», узбагацілі рэпертуар беларускага тэатра, асабліва на этапе яго станаўлення ў пачатку XX ст.

У верасні 1913 г. Купала завяршыў яшчэ адзін сцэнічны твор — драму «Раскіданае гняздо». Упершыню яна была пастаўлена на сцэне толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі Першым беларускім таварыствам драмы і камедыі ў Мінску ў ліпені 1917 г., а надрукаваць «Раскіданае гняздо» аўтар змог толькі ў 1919 г. у Вільні.

Своеасаблівая папярэдніца драмы «Раскіданае гняздо» — паэма «За што?», напісаная ў 1908 г. Пра яе ўжо ішла гаворка пры разглядзе ранніх паэм Я. Купалы. Сярод тых зерняў, з якіх узнікла задума вершаванага аповеду «За што?», а затым і драмы «Раскіданае гняздо», была і даўняя родавая крыўда Луцэвічаў на паноў Радзівілаў, якія сагналі сям'ю арандатараў-чыншавікоў з абробленай імі зямлі. Дзед Ануфрый Дамінікавіч доўга судзіўся з панам за роднае гняздо, што адняло ў яго шмат сіл і здароўя і скараціла век, унук жа, Янка Купала, на пачатку XX ст. вынес сямейную крыўду «на свет цэлы». Сваю сямейную трагедыю аўтар асэнсоўвае як трагедыю эпахальную, агульнанародную, за якой стаяла ўсё тое ж пытанне — быць ці не быць беларускай нацыі. Драма «Раскіданае гняздо» адлюстроўвала цярністы шлях беларускага беззямельнага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны і лепшай долі. Час дзеяння ў ёй — пачатак XX ст., новы грамадска-палітычны ўздым, які наступіў пасля паражэння рэвалюцыі 1905-1907 гг.

Асноўны канфлікт «Паўлінкі», як вядома, — канфлікт пакаленняў, сцвярджэнне новага ў жыцці. Гэты канфлікт распрацоўваецца

таксама і ў драме «Раскіданае гняздо», аднак тут ён атрымлівае больш глыбокае развіццё. Драматург шукае шляхі вызвалення чалавека з-пад уціску сіл адчужэння і духоўнай несвабоды. Купала выступае як вястун новай рэвалюцыі, у выніку якой беларусы павінны атрымаць сацыяльнае вызваленне і страчаныя нацыянальныя правы.

«Раскіданае гняздо» мае два планы — сямейны і агульначалавечы. У цэнтры п'есы гаротная сям'я Зяблікаў, якая ў сваім патрыярхальным укладзе жыцця кіруецца традыцыйнымі гуманістычнымі каштоўнасцямі. Вернасць чалавечаму абавязку, працавітасць і пакорлівасць дапамагаюць ёй выжыць у гэтых жудасных умовах, калі ўсё: і права, і суд, і дзяржава — на баку паноў. Само прозвішча — Зяблікі — з тых, што змяшчаюць у сабе яшчэ і дадатковы сэнс: як бы азяблыя, прастуджаныя, пакрыўджаныя. Можа б яны жылі гэтак і далей, калі б не захісталася спрадвечная сістэма каштоўнасцей, назва якой — гуманізм. У «Раскіданым гняздзе» гэта выявілася ў рашэнні пана адняць у Зяблікаў уробленую імі зямлю, на якой яны здаўна жылі. Патрыярхальны ўклад жыцця распадаецца пад націскам нязнанага да гэтага часу жорсткага і своекарыслівага індывідуалізму.

Усё яшчэ працягваецца спрэчка аб жанравай прыродзе «Раскіданага гнязда». Што гэта — сацыяльна-бытавая драма, трагедыя ці «паэма-драма», як лічыў Кузьма Чорны? У кожным з гэтых вызначэнняў ёсць доля ісціны, і ўсё ж такі я схіляюся да той думкі, што перад намі трагедыя, бо хіба можна інакш назваць тое, што здарылася з сялянскай сям'ёй Зяблікаў, якіх пазбавілі галоўнага — зямлі. Трагічнае тут адлюстроўвае глыбокія супярэчнасці жыцця. Самагубствам канчае бацька — Лявон Зяблік. Гэты яго ўчынак нібы сімвалізуе бесперспектыўнасць той філасофіі пакоры, якая панавала над яго пакаленнем і многімі пакаленнямі яго папярэднікаў.

Да гэтага ж ланцугу пакаленняў належыць і яго жонка Марыля — характар, з аднаго боку, гераічны, а з другога — таксама пакорлівы. Яе гераізм — у вернасці маральным прынцыпам, спачуванні ўсім пакрыўджаным, самаахвярнасці, але сама яна ўжо, здаецца, не здольна падаць голас пратэсту. З таго палатна, што звычайна ідзе на кашулі, Марыля шые сабе і дзецям жабрацкія торбы, бо Зяблікам нічога ўжо больш не застаецца, як прасіць міласціну. Яна раіць сыну Сымону: «Паслухай лепей, дзеткі, мяне, я ж цябе гадавала, — пакарыся ты ім, — яшчэ не позна!» (Марыля мае на ўвазе паноў.) На гэта Сымон адказвае: «А ці ведаеш, мамка, што гэта значыць ім пакарыцца?.. Гэта, мамачка, значыць: прадаць, утапіць сябе, цябе, нас усіх у няволю ім на векі вечныя — запрапасціцца ў вечнае

рабства, з якога выхаду ніколі не знойдзем ні мы, ні тыя, што пасля нас гэта рабства ў спадчыну атрымаюць...»

Цэнтральнае месца ў драме займае Сымон Зяблік, у вобразе якога драматург даў узор дзейснага процістаяння грамадскаму злу. Супакойваючы гарачага Сымона, які, каб бараніць зямлю, хапаецца за сякеру, Лявон — бацька яго — кажа: «Трэба праўды шукаць не тапаром, а розумам. Дзед твой не меў розуму, я не маю, але ты яго мей, каб з часам цябе і тваіх дзяцей не ганялі гэтак, як сягоння». Сымон чалавек упарты і рашучы. «Які я ўжо ўдаўся, такі і буду, — гаворыць ён пра сябе, — а свайго ў крыўду не папушчу, хоць бы там свет дагары нагамі перакуліўся». Ён носьбіт мужнасці і абуджанай чалавечай годнасці.

Свая «ідэя» і ў яго сястры Зоські, якая хацела бачыць свет, пабудаваны на ўзаемнай згодзе паміж людзьмі. Варожае супрацьстаянне паміж людзьмі, на яе думку, не можа прывесці да дабра...

Сямейны і агульнанацыянальны план п'есы арганічна звязаны паміж сабой: сям'я Зяблікаў сімвалізуе ўвесь беларускі народ.

Асноўным патрабаваннем драмы з'яўляецца, як вядома, неаслабнае развіццё дзеяння. У трэцім акце, калі на сцэне з'яўляецца Незнаёмы, яно набывае новы паварот. Незнаёмы — рэвалюцыянер, і, як кожны рэвалюцыянер, ён рамантык. Яго пазіцыя блізкая пазіцыі аўтара, а маналогі пранізаны Купалавай метафорыкай. «На крыжах магільных гарацъ свечкі грамнічныя, а па курганах здзірванелых вехі смалістыя палаюць і шляхі асвечваюць для ўсіх тых, што ідуць на гэта зборышча вялікае. Гора таму, хто будзе спаць у гэты час трывожны!»

Драматург паказвае працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці ў асяроддзі беларускага працоўнага люду. Купалаўская тэма «Раскіданага гнязда» адгукнулася ў драме Тодара Лебяды «Загубленае жыццё», прысвечанай перыяду калектывізацыі беларускай вёскі.

Тэма «раскіданага гнязда» ў беларускай літаратуры вядзе далёка — ажно да аповесці В. Быкава «Аблава», напісанай у 1989 г.

## РЭДАКТАР «НАШАЙ НІВЫ». ПАЧАТАК ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У верасні 1913 г. Купала зноў пераязджае на сталае жыхарства ў Вільню, дзе працуе спачатку сакратаром Беларускага выдавецкага таварыства, затым пісьмаведам у газеце «Наша ніва», а крыху пазней — яе рэдактарам-выдаўцом, замяніўшы на гэтай пасадзе Аляксандра Уласава. «Наша ніва» адыграла вялікую ролю ў жыцці і творчасці Янкі Купалы і іншых пісьменнікаў. Сёння без яе цяжка ўявіць шляхі-пуцявіны нацыянальнага адраджэння і асветніцтва на пачатку XX ст., творчыя постаці дзеячаў беларускай культуры таго часу, якія пакінулі ў ёй адметны след. У рэдакцыі працавалі А. Уласаў, браты Іван і Антон Луцкевічы, Ядвігін Ш., В. Ластоўскі, А. Бульба, С. Палуян, У. Самойла, Л. Гмырак... Нашаніўскія адраджэнскія традыцыі аказаліся надзвычай жыццястойкімі ў беларускай літаратуры. Яны ахопліваюць сферу не толькі паэтыкі, але і маралі, духоўнасці ў цэлым, усяго жыццёва-філасофскага комплексу чалавечай свядомасці.

З 7 сакавіка 1914 г. «Наша ніва» выходзіць за подпісам Янкі Купалы як рэдактара (хаця фактычна гэтыя абавязкі ён выконваў значна раней). Новы рэдактар узмацніў дэмакратычны накірунак газеты. На гэтай пасадзе Купала працягвае вострую барацьбу з вялікадзяржаўнымі шавіністамі за раўнапраўнасць беларускай мовы і культуры, з'едліва выкрывае адшчапенцаў, «перакінчыкаў», што здрадзілі роднаму народу і цяпер выступаюць супраць яго. Трэба сказаць, што ў гэты час значна актывізаваліся рознага тыпу ахоўнікі велікарускага шавінізму, якія аб'ядналіся пад лозунгам абароны цара і айчыны.

У вершах, прысвечаных, здавалася б, больш-менш канкрэтнай тэматыцы, прыкладному заданню, гучыць гісторыка-філасофскі роздум, які значна пашырае сэнсавыя рамкі верша:

Я мець ад кагосьці
І штосьці прывык:
Ад рускага чына —
Нагайку і штык,
Ад польскага пана —
Прыгон і бізун,
Ад роднай зямелькі —
Няўрод і каўтун...

Гэта было напісана ў 1914 г. і больш, здаецца, не выдавалася.

«Янка Купала моцна змяніўся з таго часу, як прыехаў у Вільню і стаў рэдактарам «Нашай нівы», — успамінала Паўліна Мядзёлка, —

спахмурнеў, схуднеў, ні разу не бачыла яго цяпер такім гарэзлівым, вясёлым, як у доме прафесара Эпімах-Шыпілы»[1].

Рэдагаванне газеты адбірала шмат часу, аднак ён знаходзіць магчымасць, каб дапамагчы К. Буйло скласці і адрэдагаваць яе зборнік «Курганная кветка». Перад гэтым ён адрэдагаваў «Вянок» М. Багдановіча, які ўбачыў свету 1913 г.

У Вільні ў канцы 1913 г. ён сустракаўся з К. Бальмонтам, а ў жніўні наступнага — з В. Брусавым, які завітаў у Вільню ў якасці ваеннага карэспандэнта на руска-германскім фронце.

У жніўні 1914 г. пачалася першая сусветная вайна, якая стала цяжкім горам для многіх народаў і прадвызначыла далейшыя падзеі XX ст. Купала востра адчуў антынародны, разбойніцкі характар гэтай вайны, якая ўзнікла і вялася ў інтарэсах самадзяржаўя, капіталістаў і памешчыкаў.

У верасні-снежні ён працуе над цыклам вершаў «Песні вайны», які складаецца з шасці раздзелаў. Першы з іх — «Варожбы» — поўны трывожных знакаў і прадчуванняў:

Па зямлі пайшлі пажары —
Неба дымяць дыму хмары, —
Там і тутака агнішча,
Над агнішчам вецер свішча.

Упамінаюцца сонечнае зацьменне над Еўропай у пачатку вайны — 8 жніўня 1914 г. — і іншыя прыкметы.

Тэма вайны як суджанага лёсам наканавання развіваецца ў наступных вершах-раздзелах цыкла: «Перад бурай», «Склік», «Разлука» і інш. Паэт бачыць, што вайна дорага будзе каштаваць людзям. Адзінае выйсце — ён хацеў бы, каб яна з міжнароднай бойні стала вайной за вызваленне Бацькаўшчыны. Тэма Бацькаўшчыны і яе лёсу займае вядучае месца ў цыкле. У гэтым лёсе няма пэўнасці.

У заключным раздзеле «Пабоішча» ізноў, як у даўнім вершы «Чорны Бог», узнікае тэма зла, на гэты раз у абліччах ваўка іругана. «Выбрыў воўк з сваёй бярлогі, / Выць пачаў на ўсе разлогі»:

А разняўшы кіпці-клешчы,
Ў высі ўсплыў груган злавешчы
І закракаў, як бы ведаў:
— Кра-кра, кра-кра! то ж Пабеда!..
Кра-кра-кра! рыхтуй набой,—
Па Пабедзе — зноў у бой!..

[1] Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. Мн., 1969. С. 72.

У гэтых вобразах увасоблена пагрозлівая сіла зла. Купала аказаўся сведкам масавай чалавечай жорсткасці. Будучыня, паводле яго ўяўленняў, не абяцала нічога добрага — паэт бачыць сваю радзіму на грані катастрофы.

У артыкуле «Чвэрць года вайны» ён пісаў: «Чвэрць года крывавых змаганняў паміж мільёнамі! Сто дзён без мала ліецца чалавечая цёплая кроў. Сто дзён кладуцца покатам без часу тысячы нябожчыкаў ды з дымам пажараў ідуць сялібы і ў поце запрацаванае дабро людское... Шал нейкі апанаваў усю Еўропу. Уваружаны мірспакой здрадзіў яе. Людзі захлёбваюцца ў сваёй жа свянцонай крыві і гінуць у вогнішчах, сваімі ж рукамі распаленых»[1].

У адносінах да «Нашай нівы» ўзмацняюцца цэнзурныя праследаванні. У студзені 1915 г. за антываенны артыкул «Думкі» рэдактара прыцягваюць да судовай адказнасці.

У вершах 1915 г. («Таварыш мой», «Сыйду» і інш.) думка Купалы, скіраваная ў глыбіню ўласнага ўнутранага свету паэта, на самапазнанне, набывае востра рэфлексіўны характар.

Ёсць таксама падставы думаць, што лірычна-інтымная пранікнёнасць вершаў першай паловы 1915 г. у многім абумоўлена таксама асабістымі адносінамі з П. Мядзёлкай, у якую паэт быў закаханы. Вершы перадаюць драматызм рамантычнага кахання, якое церпіць паражэнне з-за жыццёвага разладу. Аднак разлад у асабістым для Купалы быў нішто ў параўнанні з тым, што перажывалі «мільёны». Гэта выразна адчуваецца ў санеце «Маё цярпенне»:

Маё цярпенне, мой крывавы боль —
Што значаць перад мукамі мільёнаў,
Дзе безнадзейны стогны родзяць стогны,
А слёзы грызуць вочы ўсім, як соль!

Вершы гэтага часу пазначаны своеасаблівым універсалізмам, які ў лірыцы Я. Купалы праяўляецца як імгненнае азарэнне, якое раскрывае ўсёабдымнасць яго чалавечага «я».

Незвычайнай глыбінёй паэтычнага зместу ўражвае і санет «Сярод магіл», прасякнуты пачуццём надзвычай засяроджанага самааналізу і жальбы:

Сярод магіл, на плечы ўзняўшы крыж свой, стану,
Як пасланец з магіл ад спячых там прарокаў,
І ў даль сягну, дзе толькі можа сягнуць вока,
І скрозь туды, дзе вольнай думкаю дастану.
І кліч пушчу скрозь ад кургану да кургану,

[1] Наша ніва. 1915. 16 студз.

Як віхраў лёт па ўсёй бязмежнасці шырокай,
Кліч — заклінанне векавечнага зароку,
Што ў гуслях толькі дрэмле, ў песню ўчараваны.
Прадсмертнаю кляцьбой канаючага раба,
Малітвай грэшніка, зарэзаўшага матку,
Звярнуся к сонцу, сонцу без канца й пачатку,
Хай спаліць мне душу, як ствол разбіты граба,
Хай вочы высмаліць, як кветку ў лілы слабай,
Але і крыж мой спапяліць хай папарадку!

Ахвярай вайны стала газета «Наша ніва». Янка Купала як яе рэдактар пазбег суда, які яму пагражаў, і ў пачатку верасня 1915 г. у сувязі з эвакуацыяй горада пераязджае з Вільні ў Акопы, да маці.

У канторскай кнізе «Нашай нівы» (апошні, 31-й нумар, выйшаў у свет 7 жніўня 1915 г.) застаўся запіс: «8 жніўня. Купале на дарогу 5 р.»

Сёння некаторыя шкадуюць, «што выдаўцы «Нашай нівы», мабыць, пад уплывам афіцыйнай расійскай прапаганды, што пашырала звесткі аб зверствах кайзераўскай арміі, якая, дарэчы, паводзіла сябе на занятых тэрыторыях даволі ліберальна і талерантна, пастанавілі ліквідаваць «Нашу ніву» ў сувязі з набліжэннем русканямецкага фронту да Вільні, дзе на працягу 9 гадоў выдаваўся гэты знакаміты беларускі штотыднёвік»[1].

Што на гэта можна адказаць? Што адбылося, тое адбылося, — гісторыю не перайначыш.

Маці сустрэла сына з абдымкамі, аднак у Акопах ён доўга не пабыў. Па запрашэнню свайго знаёмага С. К. Жывапісцава, ветурача і грамадскага дзеяча, Купала ў хуткім часе едзе ў Арол. У час знаходжання ў Арле піша верш «Арліныя крыллі», прысвяціўшы яго дзевятнаццацігадовай Таццяне Жывапісцавай — дачцэ свайго прыяцеля:

Арліныя крыллі
Душа твая мае,
К красе яна й сіле
Свой сцяг уздымае.
Зямля ёй зацесна,
Ёй трэба прастору
Тэй высі нябеснай,
Дзе царствуюць зоры.
Лунай жа, сашле,
У гэтых міражах,
Пакуль цябе доля
К зямлі не прывяжа!

---

[1] Баршчэўскі А. Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы. 1958-1998. Мн., 2001. С. 5.

Гэты верш, хаця ён прысвечаны іншаму чалавеку, мае, думаецца, у многім аўтабіяграфічны характар. Таццяна Жывапісцава выступае як бы двайніком паэта, яго неспакойнай рамантычнай натуры, прагнай да новага і неспазнанага.

У канцы верасня 1915 г. ён ужо ў Маскве — вучыцца ў Народным універсітэце імя А. Л. Шаняўскага. Тут, у Маскве, адбываецца вельмі важная падзея ў Купалавым жыцці: ён жэніцца з Уладзіслалавай Станкевіч і пераязджае ў Мінск.

З Уладзіслалавай Станкавічанкай (як называлі тады У. Ф. Станкевіч) ён быў знаёмы даволі даўно — менавіта ёй прысвечаны вершы «Успомні!», «Гэй ты, дзяўчынка, кветка-лілея», «Мусіць трэба было».

У студзені 191 б г. Купала прызываецца ў царскую армію і трапляе ў дарожна-сапёрны атрад Варшаўскай акругі шляхоў зносін. Атрад знаходзіўся ў Мінску, недалёка ад лініі фронту. Заходняя частка Беларусі была акупіравана кайзераўскімі войскамі. Мінск, перапоўнены бежанцамі і рускімі вайсковымі часцямі і ўстановамі, з'яўляўся, па сутнасці, прыфрантавым горадам. Купала з трывогай і болем глядзеў на ўзрастаючае незадавальненне народных мас, што пакутавалі ад зацяжной знясільваючай вайны, паўсюднай галечы, бяздушнасці вайскоўцаў і чыноўнікаў.

Летам 191 б г. атрад, у якім служыў Купала, пераводзяць у Полацк.

Паэт з'яўляецца сведкам таго, як прыкметна ўзрастае, набірае сілу грамадска-палітычны рух, як аднавіла дзейнасць даўнейшая Сацыялістычная грамада, у якую ўваходзілі сацыял-дэмакраты, эсэры, нацыянал-дэмакраты, народнікі. У сакавіку-красавіку 1917 г., нягледзячы на супраціўленне Часовага ўрада, актывізавалася дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску і іншых гарадах. Летам 1917 г. у Вільні ўзнікла беларуская арганізацыя «Саюз незалежнасці і непадзельнасці Беларусі», якая дамагалася ўтварэння незалежнай беларускай дзяржавы і выступала як супраць канфедэрацыі Беларусі з Літвой, так і супраць аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі. Настойліва імкнуліся стварыць сваю нацыянальную арганізацыю беларусы-вайскоўцы.

Ажывае культурна-асветніцкая праца. Нядаўна арганізаванае Першае беларускае таварыства драмы і камедыі паставіла ў Мінску ў ліпені 1917 г. «Раскіданае гняздо» — п'еса яшчэ не была апублікавана. У кастрычніку ў Мінскім гарадскім тэатры ставіцца «Паўлінка».

Неверагодныя звесткі даходзяць з-за лініі фронту. Немцы, аказваецца, стварылі беларусам пэўныя ўмовы для развіцця школьнай справы, культуры, выдавецкай дзейнасці на роднай мове. У Вільні на беларускай мове выходзіць газета «Гоман».

## НОВЫ ЭТАП ВЫЗВАЛЕНЧАЙ БАРАЦЬБЫ. АБВЯШЧЭННЕ БНР

Часовы ўрад не падтрымліваў беларускі рух. Бальшавікі таксама не хацелі супрацоўнічаць з беларускімі палітычнымі партыямі, якія ставілі пытанне аб нацыянальным вызваленні Беларусі.

7 лістапада 1917 г. адбыўся кастрычніцкі пераварот — бальшавікі дачакаліся адпаведнага моманту і захапілі ўладу ў Петраградзе, Маскве і іншых расійскіх гарадах.

7 лістапада бальшавіцкія камісары пры дапамозе дэмаралізаванай расійскай арміі пераняЛі кіраўніцтва і ў Мінску.

За тагачаснымі падзеямі, якія ўражвалі, хвалявалі сваімі гістарычнымі маштабамі, паэт сачыў са Смаленска, куды ён пераехаў пасля Полацка.

Беларусь перажывала перыяд анархіі і неўладкаванасці, аднак былі падзеі, якія абнадзейвалі. 15 снежня 1917 г. у Мінску пачаў работу Усебеларускі з'езд, на якім прысутнічала амаль дзве тысячы дэлегатаў з усёй Беларусі — сяляне, вайскоўцы, інтэлігенцыя. Ганаровым старшынёй з'езда быў абраны вучоны з сусветным імем — акадэмік Яўхім Карскі. Аднак праз некалькі дзён працы з'езд быў разагнаны бальшавікамі. Гэтым самым бальшавіцкае кіраўніцтва ўвяло Беларусь у яшчэ большую анархію і хаос. Бальшавікі, Ленін, якія, як вядома, былі звязаны з немцамі, не хацелі дапусціць незалежнасці Беларусі. Нямецкія войскі захапілі Беларусь у лютым 1918 г. і знаходзіліся на яе тэрыторыі да пачатку 1919 г., але барацьба беларусаў за незалежнасць працягвалася. 25 сакавіка 1918 г. у Мінску была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка (25 сакавіка на Беларусі, па даўняй традыцыі, першы дзень вясны). Урачыста гучалі словы прынятай 25 сакавіка трэцяй Устаноўчай Грамады:

«Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай. Самі народы Беларусі ў васобе Устаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі...»

Тым часам пасля заключэння Брэсцкага міру паміж Германіяй і Расіяй Беларусь аказалася акупіраванай кайзераўскімі войскамі.

На працягу нямецкай акупацыі Купала знаходзіўся ўсё ў тым жа Смаленску, працуючы ў розных установах і часта выязджаючы ў службовыя камандзіроўкі па гарадах і паветах Смаленскай і Курскай губерняў. Успаміны пра смаленскі перыяд жыцця засталіся змрочныя:

«Там, жывучы праз увесь цяжкі і жудкі 1918 г., я папраўдзе быў, як непрытомны»[1].

Рэвалюцыя ўзняла з дна чалавечай душы шмат пачварнага, злога, нізіннага. Людзей ахуталі цёмныя хмары ўзаемнага азлаблення, раўнадушша і жорсткасці[2].

Не давала спакою пытанне аб тым, што чакае Беларусь. Доўгі час, пачынаючы з гнятлівага 1916 г., ён наогул маўчаў, нічога не пісаў. Калі што і друкавалася, дык з напісанага раней.

Так, у петраградскім часопісе «Чырвоны шлях» (№ 7-8) была надрукавана падборка з некалькіх вершаў пад агульнай назвай «Забраны край». Сюды ўвайшлі вершы «Крыўда», «З дня ў дзень...», «З думак жабрака», «Матцы», «Як цені». Створаныя ў дакастрычніцкі час, яны зместам сваім пераклікаліся з падзеямі 1918 г. на Беларусі, дзе гаспадарылі чужынцы:

Не на пацеху дзеці даны
Матулі, што іх сцеражэ, —
Усё адно сусед паганы
У плуг жалезны запражэ.

*(«Як цені»)*

Ва ўнісон з гэтымі радкамі гучаў верш «Крыўда», які заканчваўся пытаннем: «Калі ж ты, Бацькаўшчына-маці, / Устанеш к новаму парадку?!.»

У канцы 1918 г. Янка Купала наведвае Маскву, дзе рыхтуецца да выдання зборнік «Избранные стихотворения». Аднак у цэлым літаратурныя клопаты паэта адсоўваюцца на задні план. На працягу 1916-1917 гг. да восені 1918 г. ён не напісаў ніводнага верша. З восені 1918 г. пачаў пісаць. Станоўчае значэнне ў гэтым сэнсе мела новая хваля падзей: нямецкія акупацыйныя войскі вымушаны былі пакінуць Беларусь. Адбылося гэта ў канцы 1918 — пачатку 1919 г.

Захоплены крутабегам падзей Янка Купала глыбока ўсведамляў сваю ідэйную місію: «Я зноў заснуўшую было жалейку / Бяру і пробую ў ёй галасоў» («Для Бацькаўшчыны»). Беларусь пасля абвяшчэння БНР у вачах суседзяў выглядала ўжо па-іншаму ў параўнанні з ранейшымі часамі. І гэта, вядома, не магло не адбіцца на купалаўскай песні. Таму паэт турбуецца:

А ўсё ж, як тамка сваякі-суседзі
Яе паймуць, хацелася бы знаць, —

---

[1] Купала Я. Зб. тв. У 7 т. Т. 7. С. 452.

[2] Пра тое, што дзеялася ў гэты час на Смаленшчыне, падрабязна расказваецца ва ўспамінах рускага пісьменніка-смаляніна І. С. Сакалова-Мікітова, які жыў там у гэты час і ўсё бачыў на свае вочы // Русская литература. 1992. № 1.

Ці блаславяць, ці ўтопчуць гідка ў гаць?
Адно, снуючы з сумам па праследдзі,
Я голасна йграць буду ў тайным брэдзе,
Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць!

*(«Для Бацькаўшчыны»)*

У кастрычніку-снежні ён стварае вялікі цыкл вершаў, якія з'явіліся не толькі водгукам на падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, але і кардыяграмай духоўнага самаадчування паэта-грамадзяніна і патрыёта: «Для бацькаўшчыны», «Свайму народу», «На сход», «На прызбе», «Пас», «У вырай», «Пчолы», «Сон», «Званы», «Млечны Шлях», «Удосвітак», «Забытая карчма», «Буралом», «Спадчына», «Рунь», «Першы снег», «Паязджане» і інш. У гэтым лірычным цыкле думка паэта выявіла сябе як думка народная на пакручастых дарогах гісторыі. Паэт асуджае братазабойчы характар грамадзянскай вайны, не тоіць расчаравання ў рэвалюцыі, шукае шляхі выжывання для свайго народа. «У гады рэвалюцыі, — адзначае У. Калеснік, — у Купалы з'явіўся новы тып верша, напружанага глабальнымі асацыяцыямі, прарочай сімволікай, якая збірала думку і пачуццё ў адну велічную візію народа на шляхах гісторыі»[1].

[1] Калеснік У. Ветразі Адысея: Рамантычная традыцыя ў беларускай літаратуры. Мн., 1977. С. 45.

## АПАНТАНЫ БЕЛАРУСКІМ ЛЁСАМ

Творчая работа ў гэты перыяд патрабавала асабліва высокага духоўнага напружання і паэтычнага напалу. Як паэт і як чалавек Купала адчуваў у сабе вышэйшую сілу духу і дзеля ісціны і дабра свядома ішоў на подзвіг у імя адраджэння Беларусі. Купалаўскі герой ізноў ахоплены прагай падзей і хваляванняў. Гэта адчуваецца ў вершы «Час!», напісаным у Смаленску 30 кастрычніка 1918 г. Дакастрычніцкая творчасць Купалы была насычана пытаннямі, адказаць на якія павінен быў сам час. І вось цяпер, здавалася б, павінны былі паказацца рэальныя абрысы будучыні:

Доўга людзі ўдзень блудзілі,
Крыўду, слёзы, кроў пладзілі,
Ўсё не ўмелі жыць, —
А сягоння ўжо не тое, —
Ўсходзе сонца залатое
Роўна ўсім свяціць.

У дакастрычніцкай творчасці Купалы няма таго, што мы называем сацыялістычнымі ідэямі. Не з'явіліся яны ў яго і тады, калі рэвалюцыя адбылася. Паэта хвалявала іншае — як дамагчыся незалежнасці для роднага краю. Ізноў у яго творчых азарэннях, як некалі ў вершы «Прарок» іўдраме «Раскіданае гняздо» (1913), паўстае ідэя «вялікага сходу», які павінны вырашыць лёс Беларусі. Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі такі час надышоў:

Час склікаці ўжо грамаду
На вялікую нараду,
На вялікі сход!
Хай рассудзіць, хай разважа,
Слова цвёрдае хай скажа,
Скажа сам народ!

Гэтым і іншымі вершамі Купала падтрымаў абвяшчэнне БНР.

Народ для Купалы заўсёды быў носьбітам высокіх маральных прынцыпаў. Голас народны — голас божы. Паэт хацеў, каб народ заявіў аб сабе рашуча і смела:

На сход, на ўсенародны, грозны, бурны сход
Ідзі, аграблены, закаваны народ! —

заклікае ён у вершы «На сход!» (25.10.1918). Нацыянальны фактар набывае ў яго паэзіі акрэсленае ідэйнапалітычнае гучанне.

Купала не ўтойваў свайго расчаравання ў рэвалюцыі, якая не змагла спыніць беды вайны, штоператварыла родны край у руіны, і вырашыць нацыянальнае пытанне: «Ці доўга будзе нам заломам Вар-

шава панская і царская Масква» («Наша гаспадарка», 1918). Навокал адбывалася шмат дзіўнага і незразумелага. В. Г. Кнорын — сакратар Мінскага Савета рабочых і салдацкіх: дэпутатаў, а пазней кіраўнік Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі і сакратар ЦК КП(б)Б — пісаў у газеце «Звезда» 6 кастрычніка 1918 г.: «Мы считаем, что белорусы не являются нацией и что те этнические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты. Нашей задачей является не создание новых наций, а уничтожение старых националистических рогаток. Белорусское же движение является таким строительством новых националистических рогаток, каких не было да этого, а поэтому коммунисты не могут в каком бы то ни было виде принимать участие в этом движении».

29 кастрычніка 1918 г. напісаны кароткі верш «У дарозе» (потым пра яго яму напомняць маладнякоўцы):

Еду, пхнуся бітым шляхам,
Па балоце конь плюскоча,
А ноч крадзецца паціху,
Сыпле чары ўлева, ўправа.
Пхнуўся ўцвойчы з жуткім жахам,
Злыдні зіркаюць у вочы...
Ах, хаця б не дацца ліху!
Но, мой косю!.. Стой!.. Канава!..

Вобраз шляху ўзнікае ў многіх вершах як пошук выйсця з таго скрутнага становішча, у якое трапіў абяздолены беларускі народ:

Людзі кажуць, што птушкам, зблудзіўшым уночы,
Млечны шлях служыць сцежкай-пуцінай у вырай.
Яшчэ кажуць, што гэта слязінкі сірочы
Замяніліся ў зоркі ды свецяць так шчыра.

*(«Млечны Шлях»)*

У лірыцы Купалы ўзмацняецца баладны пачатак (спрэчка чалавека з лёсам) і з незвычайнай сілай гучыць тэма народных пакут. Адзін з такіх вершаў — «Паязджане», створаны ў канцы 1918 г. Ён палоніць чароўнай плынню музычных сугуччаў:

Распаўзлася па абшары
Сцюжным пухам, сцюжнай марай
Папаўзуха-завіруха —
Злога духа злыбядуха.
Ў полі дымна, ў полі цёмна,
Беспатольна і заломна,
Ні пуціны, ні ўпыння,
Як у вечнай дамавіне.

Як у моры, ў белым снегу,
Без днявання, без начлегу,
Ў бездарожжа, ў беспрыстанне
Едуць, едуць паязджане.

Гукавая тканіна верша, яго інструментоўка ў Купалы заўсёды знітавана з глыбінёю ідэйнага сэнсу. Аднак у даным выпадку музычнасць «Паязджан» нібыта прэтэндуе на сваё самастойнае значэнне, здзіўляючы фанетычным багаццем паэтычнага слова. Сказалася, відаць, школа мадэрнізму, з вопыту якога многае пайшло на карысць паэту.

Верш навеяны падзеямі першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, аднак у ім прысутнічае даўняя тэма пошукаў беларускім народам свайго гістарычнага лёсу. Больш таго, у купалаўскіх «Паязджанах» можна пачуць таксама і прадчуванне будучых блуканняў Беларусі па горкіх шляхах гістарычнага бездарожжа. «Паязджане» перадаюць адчуванне катастрафічнасці эпохі. У сувязі з гэтым хочацца сказаць пра тую плённую тэндэнцыю, якая намецілася ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве (у работах І. Штэйнера) па тыпалагічным збліжэнні лірыкі Купалы 1918-1921 гг. з еўрапейскім мадэрнізмам XX ст., у прыватнасці з Ф. Кафкам (раман «Замак» і інш.). Тэндэнцыя ў цэлым і сапраўды плённая, аднак трэба мець на ўвазе, што калі кафкіянскі герой, трапіўшы ў замак, змірыўся са сваім жыццёвым наканаваннем, то герой купалаўскіх балад не мірыцца з лёсам, працягвае спрэчку з ім да самага канца.

Вельмі красамоўны верш «Пчолы», таксама напісаны ў гэтыя часы:

...як мёд пайду я падглядаць у кадку,
І тут бяда — не ўсё ў парадку і дагляду:
Як рой, і мёд падгледзеў ўжо сваяк-сусед.

Так прыкладна і здарылася: 1 студзеня 1919 г. у Смаленску было абвешчана ўтварэнне БССР. Зроблена гэта было хутчэй за ўсё ў тактычных мэтах. Утвараючы БССР, бальшавікі, мяркуючы па ўсім, цвёрда верылі, што руская рэвалюцыя неўзабаве мае перарасці ў рэвалюцыю сусветную, якая сама сабой зруйнуе межы, і ад створанай БССР нічога не застанецца...

У пачатку студзеня 1919 г. Янку Купалу ў Смаленску наведалі Язэп Дыла і Цішка Гартны. Паэт быў рады гасцям і расказаў ім пра сваё жыццё: «Няма чым хваліцца. Ды і не дзіва — колькі часу фронт непадалёку быў... Я служу ў тутэйшых наркампрасаўскіх арганізацыях і часта бываю ў вёсцы... Бачу, як жыве яна зараз. Заняпад страшэн-

ны...» Шчыра прызнаўся: «Я даўно чакаю таго дня, каб вярнуцца ў Беларусь. Мне хочацца хутчэй уключыцца ў літаратурную работу»[1].

У студзені 1919 г. ён пераязджае на пастаяннае месца жыхарства ў Мінск, дзе на першых парах уладкоўваецца на працу бібліятэкарам пры Беларускім народным доме, вядзе з Народным камісарыятам асветы перамовы аб выданні поўнага збору твораў. Існавала пільная і ўпаўне зразумелая патрэба ў беларускай кнізе ўвогуле і ў купалаўскай у прыватнасці. Многія творы Янкі Купалы, напісаныя ў часы жорсткай цэнзурнай палітыкі, наогул не былі надрукаваны.

Тое-сёе з таго, што рабілася, абнадзейвала. Глыбокае ўражанне на Купалу зрабіў зборнік А. Гаруна «Матчын дар», які ўбачыў свет у 1918 г.

Аднак далёка не ўсё з таго, што адбывалася, радавала.

Застапарылася, напрыклад, справа з выданнем поўнага збору твораў, і галоўнай прычынай было тое, што падтрымка нацыянальнай беларускай культуры, мякка кажучы, не ўваходзіла ў планы новай улады. Падрыхтаваны зборнік вершаў «Спадчына» таксама ляжаў без руху...

Неўзабаве пасля абвяшчэння БССР пад кіраўніцтвам бальшавікоў быў скліканы I з'езд Саветаў Беларусі, які «подтвердил, что потуги белорусской националистической интеллигенции к созданию «своей» национальной культуры напрасны... Пусть примут это к сведению белорусские писатели»[2].

Гэта, вядома, было адрасавана ўсім беларускім пісьменнікам, але, можа, найперш Янку Купалу, які тут жа адказаў на гэты ганебны выпад бальшавікоў супраць беларускай мовы і літаратуры надрукаваннем 7 лютага 1919 г. у газеце «Грамадзянін» верша «Свайму народу», напісанага ў стылі палемічнага купалаўскага прамоўніцтва:

Табе, народ мой, згібнуты ў аковах,
З-пад сэрца песню гэтую пяю,
І, ускрашаючы мінуўшчыну нанова,
Выказваю цяперііічыну тваю.

Якой жа бачыў паэт гэту бальшавіцкую «цяпершчыну» свайго народа? Незайздросны яна мела выгляд (частка ўсходніх беларускіх земляў адышла да Расіі):

Чужак-дзікун, крывёю ўпіўшысь свежай,
Запрог цябе ў няволю, ў батракі
І тваю маці-Бацькаўшчыну рэжа,

[1] Любімы паэт беларускага народа. Мн, 1960. С. 237.
[2] Звезда. 1919. 5 лют.

Жывую рве на часці, на кускі.

І як вывад са становішча, якое склалася, — усклік:

Паўстань, народ! Прачніся, Беларусь!
Зірні на Бацькаўшчыну, на сябе!
Зірні, як вораг хату і зямлю раструсіў,
Як твой навала злыдняў скарб грабе!

Устаноўленыя бальшавікамі парадкі не спрыялі творчаму настрою. З вершаў нічога не пісалася — муза ізноў надоўга пакінула паэта.

Між тым з Захаду насоўвалася новая навала: на Беларусь ішлі легіёны Пілсудскага. Каб зручней змагацца з імі, бальшавікі ў лютым 1919 г. утварылі Літ-Бел з цэнтрам у Вільні (кіравалі са Смаленска), аднак, вядома, гэта папяровая дзяржаўнасць не магла задаволіць Купалу. У красавіку 1919 г. легіёны Пілсудскага занялі Вільню і рыхтаваліся ісці на Мінск У Мінску ствараецца Беларускі паўстанцкі камітэт, які кіруе баявымі дзеяннямі партызан і падрыхтоўкай узброенага паўстання супраць легіянераў.

Цяпер, пасля паражэння кайзераўскіх войскаў, беларуская карта разыгрываецца паміж бальшавікамі і пілсудчыкамі. Янка Купала, як нам здаецца, не адразу гэта зразумеў у поўным аб'ёме. Знаходзячыся на Смаленшчыне і ў Беларусі, ён глыбока пераканаўся ў антынароднай палітыцы бальшавікоў, а што можна было чакаць ад палякаў?

22 красавіка 1919 г. Пілсудскі выдаў адозву да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага, у якой абяцаў ім вырашыць усе нацыянальныя і рэлігійныя пытанні так, як захоча само насельніцтва.

«Стан безупыннай нявол, — гаварылася ў адозве Пілсудскага, — які я, нарадзіўшыся на гэтай нешчаслівай зямельцы, добра ведаю, павінен нарэшце быць зніштожаны і ўжо раз і назаўсёды ў гэтай быццам праз Бога забытай старонцы павінна запанаваць свабода і права вольнай, нічым не звязанай гутаркі аб сваіх патрэбах (...) Хачу вам даць магчымасць развязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы гэтак, як самі захочаце, без ніякага гвалту або націску з боку Польшчы»[1].

У сувязі з гэтай заявай некаторыя беларускія арганізацыі і асобныя дзеячы віталі прыход легіёнаў. Тлела, відаць, нейкая надзея і ў душы Купалы... Новыя, больш жыццесцвярджальныя інтанацыі ўпершыню прагучалі ў вершы «Світае», надрукаваным у газеце «Беларуская думка» 31 мая 1919 г. Аўтар і на гэты раз звяртаецца да сродкаў звыкла сімвалічнай, хаця і вельмі празрыстай па свайму сэнсу, вобразнасці:

---

[1] Ніва (Беласток). 1990. 11 лют.

Ўжо годзе, ўсю ночку праспалі,
Ўжо годзе, у цемры былі;
Глядзіце — ноч скрылась удалі,
Свет сонца царыць на зямлі.

Між тым гэта была ўсяго толькі ілюзія: кіраўнік новай польскай дзяржавы выношваў свае, як кажуць, далёка ідучыя планы, што стала ясна пасля таго, як Мінск аказаўся ў руках Пілсудскага. «Начэльнік паньства» спрабаваў утварыць федэрацыю Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны як фарпост супраць бальшавіцкай Расіі.

8 жніўня 1919 г. польскія інтэрвенты захапілі Мінск. Былі зроблены некаторыя «паслабленні» ў сферы культуры: адкрыўся гарадскі нацыянальны тэатр, пачалі выходзіць перыядычныя выданні на беларускай мове.

25 жніўня 1919 г. выйшаў першы нумар рэдагуемай Я. Купалам газеты «Звон».

Разам з тым меў месца і ўціск. Вядомы, напрыклад, грамадскі дзеяч А. Уласаў (заснавальнік і рэдактар «Нашай нівы») за спробу адкрыць у Радашковічах беларускую гімназію трапіў у канцэнтрацыйны лагер у Стшалкове[1].

Польская цэнзура перашкаджала беларускаму тэатру ў фарміраванні нацыянальнага рэпертуару (пра вастрыню ідэалагічнай барацьбы гэтага часу сведчыць верш «Паэта і цэнзар»).

Паэт часта наведвае маці Бянігну Іванаўну, якая жыла ў фальварку Акопы, сястру Леакадзію ў Калісбергу (недалёка ад Акопаў). Тут былі напісаны вершы «З павяўшай славы...», «На нашым...», «Мая навука», «Паўстань, Прарок», шматстайны змест якіх прасякнуты пафасам патрыятызму і неўміручасці ідэі адраджэння Бацькаўшчыны:

З павяўшай славы быўшых дзён,
З магільных прадзедаўскіх цас.
Пад стогн няволі, путаў звон
Мы зложым песню, зложым сказ,
А так агністы, як пажар,
А гронкі так, як грому ўдар.
І так, каб чуў і брат, і кат
З нізін-далін, з высокіх гор;
Ад меж да меж, ад хат да хат
Зайграем свету ў дружны хор
З жыццём у тон, з вірамі ў тон,
Пра свой папас, пра свой палон.

---

[1] Ніва. 1991. 10 лют.

*(«З павяўшай славы...»)*

Шырокую вядомасць набыў другі верш гэтага перыяду «Мая навука», у якім аўтар асэнсоўвае свае сувязі з родным краем у тагачаснай складанай грамадска-палітычнай сітуацыі на Беларусі:

Каса, і сякера, і цэп малацьбіты
Магутную волатаў сілу далі;
Марозы і спёкі далі гарт нязбытны —
Мне песню, як звон, як пярун, адлілі.

Варта ўдумацца ў гэтыя і наступныя радкі, якія фактычна з'яўляюцца працягам той гаворкі, што была распачата ў даўнім вершы «Я не паэта»:

Так іншай не знаўшы навукі і школы,
Ў пацёмках шукаў і знайшоў Божы дар:
Цяпер маймі скарбамі — думы-саколы,
Цяпер беларускай я песні ўладар.

Аналіз гэтага твора даў У. Калеснік у артыкуле, спецыяльна яму прысвечаным: «У вершы гучыць роздум аўтара над сваім жыццём, пройдзеным шляхам і месцам у беларускай літаратуры. З-за беднасці бацькоў пазбаўлены «мудрасці кніжнай», ён вучыўся беларускім словам і думам ад маці, яго «настаўнікам быў беларускі абшар». У той час многія інтэлігенты груздлі ў нацыяналістычным дактрынёрстве і палітычных авантурах, і адметнасць шляху Купалы была формай самаадмежавання і ўзвышэння над імі»[1].

Паэт выступае супраць інтрыганаў і ўладалюбцаў, якія злоўжываюць імем свабоды для прыкрыцця ўласных вузкаасабістых мэтаў. Паэзія Купалы палітызуецца, у ёй моцна гучыць тэма беларускай дзяржаўнасці, калі беларускі народ, на думку Купалы, абавязаны вылучыць з сваіх шэрагаў лідэра, здольнага сабраць «у адну ўсю Беларусь сям'ю».

На чале дзяржавы павінен стаяць гаспадар, што адпавядала б нацыянальным традыцыям і ўяўленням народа. Гэты заклік на ўсю сілу гучыць у вершы «Паўстань...»:

Паўстань з народу нашага, прарок,
Праяваў бураломных варажбіт,
І мудрым словам скінь з народу ўрок,
Якім быў век праз ворагам спавіт!

Біблейскі вобраз Прарока надае паэтычнай гаворцы асаблівую значнасць і ўзнімае яе на агульнанацыянальны ўзровень:

Паўстань з народу нашага, пясняр,

---

[1] Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік. Мн, 1986. С. 388.

Былых і будучых вякоў баян,
І ў бурны кліч, як буры удар,
З віхрамі загудзі пад звон кайдан!

Паэтыка Купалы ў гэтым вершы, як і ў многіх іншых, свядома арыентуецца на пералічэнне, каб ахапіць з'яву шматбакова, нічога не прапусціць, не забыць:

Паўстань з народу нашага, ваяк,
І волатам на вогненным кані
Народ аграблены — бы з торб жабрак —
За Бацькаўшчыну павядзі ў агні.
На Ўладара жджэ Беларусь даўно,
І жджэ цябе ўладарства Божы дар,
Вялікае, магутнае яно...
Пад беларускі сцяг прыйдзі, Ўладар!

Аднак сапраўднага нацыянальнага лідэра не было.

Роспаччу поўніцца верш «На нашым...»:

У нашай хаце
Тчэ кросны павук,
А вонкі пагнаці
Не знойдзецца рук...

Гэты верш, калі б ён быў надрукаваны адразу ж пасля напісання, стаў бы, напэўна, выклікам акупацыйным уладам, аднак ён з'явіўся ў друку пазней...

«У творах Купалы часоў грамадзянскай вайны, — пісаў у кнізе пра яго жыццё і творчасць М. Р. Ярош, — пастаянна адчуваецца трывога за лёс народа, яго мовы, культуры, самабытнасці. Жыццё бурліла, яно патрабавала роздуму, аналізу, выклікала эмоцыі, асацыяцыі. Уражлівая душа і цвярозы розум мастака нараджалі лірыку драматычнага напалу пачуццяў і неспакойнай засяроджанай думкі. Усё створанае тады Купалам уяўляецца нам адзінай кнігай — непаўторнай, філасофскай, усхваляванай — аб лёсе радзімы, аб лёсе чалавека на крутым павароце гісторыі. У творчасці Купалы гэтага часу пры ўсёй яе на першы погляд стракатасці, ідэйнай і стылявой, выразна выявілася адзінства светаўспрымання і светаадчування паэта»[1].

Паэт прымае самы актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці Беларусі, піша вершы, вывучае славянскую міфалогію, перакладае на беларускую мову (прозай) «Слова аб палку Ігаравым»; але на першы план купалаўскай творчасці выходзіць публіцыстыка. Пачынаючы з восені 1919 г., ён друкуе ў беларускай перыёдыцы, што выдавалася ў

[1] Ярош М. Пясняр роднай зямлі. С. 203

Мінску, шматлікія артыкулы, адозвы, фельетоны, у якіх выступае па найбольш актуальных пытаннях адраджэння нацыянальнай дзяржаўнасці і «абудовы» Беларусі. Пра надзённасць яго выступленняў сведчаць ужо назвы гэтых матэрыялаў: «Абудова Беларусі» (Звон. 1919. 19 кастр.), «Зямельная спекуляцыя» (Беларусь. 1919. 24 кастр.), «Беларускае войска» (Беларусь. 1919. 26 кастр.), «Моладзь ідзе!» (Беларусь. 1919. 15 ліст.), «Торжышча» (Беларусь. 1919. 20 ліст.), «Незалежная дзяржава і яе народы» (Беларусь. 1919. 28 ліст.), «Антанта. Маленькі фельетон» (Беларусь. 1919. 27 ліст.) іінш.

Купалаўскі адраджэнню ідэал шматгранны і гарманічны. Публіцыстыка перыяду грамадзянскай вайны перадае многія яго канкрэтныя рысы.

У артыкуле «Незалежнасць», апублікаваным у газеце «Беларусь» за 28 лістапада 1919 г., Купала піша, што апошнім часам узнікаюць і атрымліваюць прызнанне ўсё новыя дзяржавы — Польшча, Літва, Украіна, Латвія і інш., якія, зразумела, маюць поўнае права на незалежнасць.

«А вось загаварыце вы аб беларускай незалежнасці... — працягвае далей Купала. — Тут вам цэлую кучу нагавораць усялякіх перашкод, недарэчнасцяў, што аж вушы вянуць слухаючы. На ўсякую іншую незалежнасць кожны з вамі згодзіцца, абы толькі не на беларускую.

Чаму гэта так?

Беларускі народ самабытны — гэта прызнаюць ужо нават і нашы праціўнікі з польскага ці расійскага лагеру. Беларуская дзяржаўнасць таксама мае сваю гісторыю — маю тут на ўвазе Вялікае Літоўска-беларускае княства. Геаграфічнае палажэнне Беларусі таксама не горшае, як у людзей, ну, хоць бы як палажэнне Швейцарыі. Мы крыху адсунуты ад мора, але і Швейцарыя не мае мора. Дык чаму ж так страшна наша незалежнасць?

А гэта вось чаму.

Наша незалежнасць соллю ўваччу для незалежнасці нашых суседак — Польшчы і Расіі, бо і адна, і другая хацелі б нашу незалежнасць утапіць у лыжцы вады сваёй незалежнасці.

Для адбудавання вялікай Польшчы «ад мора да мора» трэба пераступіць Беларусь; для адбудавання вялікай Расіі ад Белага да Чорнага мора таксама трэба растаптаць Беларусь.

Вось і выходзе, што трэба Беларусь выкінуць з гісторыі, з геаграфіі, і наогул калі не цалкам прылучыць яе к адной з суседніх дзяржаў, то разрэзаць напалавіну, але так зрабіць, каб яе не было і звання.

А Беларусь, як і кожная іншая дзяржава, мае права і даб'ецца раней ці пазней гэтага права стаць роўнай і вольнай дзяржавай паміж суседзямі»[1].

Паабяцаўшы беларусам федэрацыю, палякі далучылі беларускія землі да Польшчы, аб'яднаўшы іх у адзінай Рэчы Паспалітай, аб адраджэнні якой абвясцілі свет. Беларусь ізноў апынулася ў ярме прыгнёту і несвабоды, і паэт на гэты конт не цешыць сябе ніякімі ілюзіямі.

«Калі немцы пачалі ачышчаць Беларусь, — пісаў Купала ў артыкуле «Справа незалежнасці Беларусі за апошні год», — то бадай адначасова на яе аграбленыя абшары з вялікім разгонам рынуліся з усходу — расійскія бальшавікі, з захаду — польскія нацыяналісты... Сацыяльныя рэвалюцыянеры з усходу і нацыянальныя «рэвалюцыянеры» з захаду ў мінулы год паказалі сваю праўдзівую натуру, І тыя, і гэтыя ў сваім мілітэрна-імперыялістычным паходзе стараюцца сцерці па дарозе ўсё, што ім стаіць на перашкодзе, дзеля дасціжэння сваіх мэт». Купала ясна разумее мэты і бальшавікоў (сусветная рэвалюцыя), і польскія эндэкаў (Польшча ў межах 1772 г.), якія «не дадуць Беларусі жаданага міру і незалежнасці. Яны яе дзялілі і будуць дзяліць паміж сабой...»

Палякі прызывалі ў войска беларусаў, якія павінны былі папаўняць шэрагі чужой арміі, выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах некаторых прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі. Пра гэта ідзе гаворка ў вершы «Беларускія сыны»:

Па беларускім бітым шляху,
Б'ючы ў кайданавы званы,
Брыдзе чужынец, а з ім побач
Хто?
— Беларускія сыны!

Паэт не тоіць пачуцця прыкрасці і расчаравання з прываду гэтага факта. Гэтым самым ён асуджае прыстасаванства і здрадніцтва, нацыянальны нігілізм, праявы якіх сведчылі, што ў беларускіх «сынах» яшчэ не ўмацавалася пачуццё нацыянальнай самасвядомасці.

Ён звяртаецца да іншых нацый і канфесій на Беларусі з заклікам падтрымаць яе рух да дзяржаўнасці (верш «Жыды»), але, як пісаў рускі паэт Восіп Мандэльштам крыху пазней і з іншай нагоды, «ни один мессианствующий и витийствующий народ никогда не был услышан другим».

---

[1] Спадчына. 1990. № 2. С. 14.

Эканамічнае становішча Беларусі за гады нямецкай і польскай акупацыі і грамадзянскай вайны значна пагоршылася. Грамадзянская вайна выклікала ў людзей няўпэўненасць і страх за будучыню.

У 1919 г. у часопісе «Беларускае жыццё» (№ 20) паэт друкуе верш «Мой цень»;

Як прыйдзе дзень майго збаўлення,
З крывавых церняў вызваленне, —
А веру, прыйдзе гэткі дзень, —
З імглы адвечнасці паўстане
І крыжам стане на кургане
Майго жыцця бяссмертны цень.
Без воч, без косці, жыл і сэрца,
Сам крыж, на крыж ён абапрэцца,
І, ўвесь удумаўшыся ўдаль,
Сачыць пачне ўвесь ад пачатку
Мой шлях, якім шоў да астатку.
Які мне толькі кінуў жаль.

Верш напоўнены адчаем і пачуццём безвыходнасці.

Адно сам аб сабе цень скажа
Крыжам, адвечнай сваёй стражы:
Каб не радзіўся я на свет!..

Гэтыя заключныя радкі прымушаюць успомніць «Адвечную песню». Па некаторых звестках, жонка паэта У. Ф. Луцэвіч казала, што верш напісаны быццам бы ў 1915 г. Даводзіцца толькі гадаць, так гэта ці не. Ва ўсякім выпадку верш «Мой цень» вельмі сугучны таму, што перажываў Купала ў 1919 г.

Людзі страшэнна натаміліся, спакутаваліся і прагнулі міру, чакаючы яго ад новага 1920 г. Напярэдадні яго надыходу Купала пісаў:

Ідзеш у край, дзе сотні летаў
Хто толькі хоча гаспадарыць,
Але не сын зямліцы гэтай,
Які тут косці вечна парыць.
Ідзеш у край, які бязбожна
Жыўцом парэзалі на часці,
А брат проць брата стаў варожна
І памагае край раскрасці.

*(«Новы год»)*

Праз прызму ўласных думак і адчуванняў паэт перадае спадзяванні і боль многіх людзей — сваіх суайчыннікаў. І самае галоўнае — страсная просьба да Бога:

Вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа,

Калі Ты цар і неба, і зямлі!

Гэтыя радкі з верша «Цару неба й зямлі», надрукаванага ў газеце «Беларусь» 11 студзеня 1920 г., гучалі як малітва, звернутая да Неба ад імя ўсіх насельнікаў беларускай зямлі.

У студзені-сакавіку 1920 г. Я. Купала цяжка хварэе і знаходзіцца ў бальніцы. «На дабітку ўсяго ў 1920 г., у студзені, — паведамляў ён пазней Б. І. Эпімах-Шыпілу, — я захварэў страшнай хваробай: гнойнае запаленне сляпой кішкі (па-вучонаму перытаніт). Пралежаў у бальніцы, змагаючыся з смерцю, тры месяцы і выйшаў з пакрыўленай губой і з надломленым зусім здароўем. Папраўдзе пабываў на тым свеце. Толькі дзякуючы добрай апецы, асабліва ксяндзу рэктару б. Мінскай духоўнай семінарыі Абрантовічу, я не пайшоў да Абрагама на піва»[1].

Хвароба мінула, і ўжо ў дваццатых лічбах сакавіка Купала працуе, і не толькі над вершаваным перакладам «Слова аб палку Ігаравым», як прынята было да нядаўняга часу лічыць, але і над арыгінальнымі творамі. 24 сакавіка 1920 г., напярэдадні другой гадавіны абвяшчэння БНР, быў напісаны верш «25.III.1918-25.III.1920. Гадаўшчына-памінкі», у якім аўтар як бы падводзіць вынік гэтым двум цяжка пражытым гадам:

Не свята светлае спраўляці
Сягоння будзе наш народ.
А трызну па айчызне-маці
Ён справе ў гэты цяжкі год.
У гэту нашу гадаўшчыну
Звініць ланцуг, як і звінеў,
І там, і тутка без упыну
Шалее катні здзек і гнеў.

У вершы «25.III.1918-25.III.1920. Гадаўшчына-памінкі» ён асуджае і савецкую, і польскую акупацыі, не шкадуючы фарбаў для праўдзівага паказу карціны нацыянальнай трагедыі:

Лунае груганнё ў прыволлі
На ўсход, на захад, там і тут
І сочыць косці ў чыстым полі,
Дзе вые куля, вые кнут.
Не «незалежнасць» праз час гэты
Сваё разводзіла святло,
А падняволле без прасветы,
А рабства Беларусь гняло.

---

[1] Купала Я. Зб. тв. У 7 т. Т. 7. С. 453.

Народ спраўляць памінкі будзе —
Не свята светлае вясны, —
За стол жалобны сядуць людзі
Там, дзе крыжы, дзе курганы!

Гісторыя — на яго вачах — развівалася як барацьба за ўладу з усімі вывадамі, якія з гэтага вынікалі. Няволя, жалоба, курган...

Аднак час ішоў. У маі-ліпені 1920 г. ва ўмовах акупацыі Беларусі войскамі Пілсудскага Янку Купалу даводзіцца рэдагаваць літаратурна-мастацкі часопіс «Рунь». Тут на пачатку мая быў надрукаваны вядомы верш «У вырай!», які сведчыць, што паэт ізноў перажываў высокі душэўны ўздым:

Гэй, вольныя птахі, саколія дзеці!
У вырай! Да сонца вясёлкавым шляхам!
Час сонца схапіці і сонцам ірдзеці
І зведываць светы арліным узмахам.
Гэй, вольныя птахі, патомкі крывічаў!
Да неба! Па зоры і гром перуновы...
Час крылле расправіць — пагудка ўжо кліча,
Ўжо віхры цярэбяць да шчасця шлях новы!

Чым жа ён быў выкліканы, гэты душэўны ўздым аўтара?

Купала адчуваў новыя павевы ў жыцці: легіёны Пілсудскага збіраліся пакідаць Беларусь, і ў сувязі з гэтым ён звяртаецца да беларусаў — «патомкаў крывічаў» — з заклікам стаць «пад сцягі красы і свабоды...». Ясней сказаць было б цяжка — не дазволіла б польская цэнзура.

15-годдзе літаратурнай творчасці Янкі Купалы адзначалася яшчэ пры палякаx — 24 чэрвеня 1920 г. Быў наладжаны банкет, на якім паэт выступіў з прамовай. Гэта прамова доўгі час была невядома беларускім купалазнаўцам, і толькі ў 1988 г. яна была апублікавана (дзякуючы намаганням Б. Сачанкі) у газеце «Літаратура і мастацтва», У ёй юбіляр сказаў (прамова вартая таго, каб прывесці яе поўнасцю, аднак мы даём толькі вытрымку): «Усяго пятнаццаць год вялікая ідэя вызвалення з падняволля Беларусі лунае і пашыраецца сярод многамільённага беларускага грамадзянства.

Трудны і цярністы шлях прыйшлося прайсці нам, беларусам, за гэты час змагання за лепшую долю, за лепшую славу для свае Бацькаўшчыны!

Але мы змагаліся і будзем змагацца і наша змаганне не асталося без следу. Мы самі сведкамі таго, што кінутыя мазолістай рукой здаровыя зярняты зарунеліся на нашых вачах буйнай квяцістай руняй, ад якой можна смела чакаць ураджайнага жніва.

Ні адно на свеце адраджэнне народу, ні адна вялікая ідэя не пашыралася так шпарка, як ідэя нацыянальнага адраджэння беларускага народа.

І сапраўды. Што было пятнаццаць год таму назад і што мы бачым цяпер? Пятнаццаць год таму назад некалькі шалёных галоў захацелі галавамі мур прабіваць — адбудоўваць сваю закованую ў многавяковыя кайданы бацькаўшчыну, а сягоння без малага ўвесь народ усімі сіламі дамагаецца свайго вызвалення. Пятнаццаць год таму назад аб незалежнасці і падумаць было небяспечна — сягоння нашы дужэйшыя суседзі самі аб гэтым па-дзяржаўнаму гавораць з намі, як з народам, каторы заслужыў па людскаму і божаму праву гэту незалежнасць.

Арлінім узмахам агняцветнай думкі аб нашай волі мы скінулі і патапталі даўгавечную брахню, — брахню, што Беларусі не было і няма. Сваім векапомным і магутным шляхам народным, што адважна сягае да сонца, мы паказалі свету, што Беларусь была, ёсць і будзе.

Хай Вас, браты беларусы, не палохае цяперашні бурны крывавы час. Агнём і жалезам куецца моц, гарт, доля і воля народная. Праміне віхор, патухнуць пажары, замрэ свіст меча, і настане светлы радасны дзень змучанага аграбленага нашага народу.

Хай Вас не палохае, што рвуць нашу зямлю на часці, што хаты нашы спалосканы пажарам, што сяўбу нашу жне нехта іншы, — зямля, засеяная касцямі сыноў беларускіх, будзе вечна належаць да ўнукаў беларускіх; спаленую хату беларускі мазоль адбудуе, а сваю сяўбу ён сам будзе жаць. Хай толькі асвеціць Вас адна вялікая думка — аддаць усё для сваёй Бацькаўшчыны, нават жыццё, калі яна Вас да гэтага пакліча.

На беларускай зямлі было і цяпер ёсць шмат фальшывых прарокаў, шмат рэнегацкіх душ, што за лыжку поснай поліўкі з чужой міскі запрадаюць сябе і свой народ у рабства чужынцам, але гэтага няма чаго баяцца. У адным з псалмоў біблейскіх сказана: «стаў Бог у зграмаджэнні Багоў і паміж Багамі суды судзіць». Будзем верыць, што і ў нас, беларусаў, прыйдуць новыя людзі, новыя прарокі і будуць пабожаму над фальшывымі прарокамі і прадажнымі душамі суды судзіць, з пакалення ў пакаленне пракляццямі ўспамінаць.

Дык не зважайма на здраду, а пойдзем далей сваім хоць цярністым, але святарным шляхам, па якім дагэтуль ішлі; з верай і надзеяй к таму вечнаму сонцу праўды і справядлівасці для ўсіх і для кожнага паасобку, і будзе на Беларусі не такое свята, якое мы цяпер святкуем.

Верце, што мы з'яўляемся дзейнымі асобамі — героямі чараўнічай песні, чудатворнай містэрыі, якую тварыць на Беларусі паклікала нас

само жыццё. У гэтых чарах, у гэтым выяўленні бяссмертнага чалавечага духа — наша Пабеда, наша слава і шчасце — цяпер і будучыні.

Перуновым голасам будзем гаварыць з суседзямі сваімі, бліскавічнымі літарамі будзем упісваць сваю гісторыю ў векавечную кнігу гісторыі народаў.

З квяцістымі сонечнымі думкамі, з нязломнай верай у лепшую долю і волю пойдзем усе наперад і наперад пад святым сцягам вольнай Беларусі.

Змагайся і стань вольным, Беларускі Народ!»[1] Не быў бы гэта паэт — у прамове іскрыцца купалаўская вобразнасць, метафарыка, яго незраўнаны стыль паэта-адраджэнца, паэта-прарока!

Польскай акупацыі трываць засталося нядоўга — яна працягвалася да 11 ліпеня 1920 г., пасля чаго ізноў была абвешчана БССР.

Бальшавікоў і іх рэжым Купала ведаў і, мусіць, не надта здзівіўся, што тыя пачалі са стварэння пад Мінскам канцлагеру для «прадстаўнікоў эксплуататарскіх класаў» — так званых «былых» (дробныя ўласнікі, чыноўнікі, святары і інш.).

Сведка тых часоў і падзей мінчук К. Гержыдовіч расказвае: «След у памяці пра рэвалюцыю, пра нямецкую і польскую акупацыі — гэта трывожныя размовы дарослых, забароны выходзіць з двара, бязладная стральба па начах. А пасля аднаўлення савецкай улады летам 1920-га стральба на некалькі месяцаў стала ўпаўне ўпарадкаванай — залпавай... Горад грунтоўна чысцілі ад контррэвалюцыйнага элементу...»[2]

Пачыналіся доўгія гады пострэвалюцыйнага «будаўніцтва», якое смела можна назваць працяглай эпохай таталітарызму.

---

[1] ЛІМ. 1988. 7 кастр.
[2] История минского бухгалтера Кастуся Гержидовича // Народная газета. 1994. 9-11 ліп.

## НА ПАЧАТКУ 20-х ГАДОЎ

Было б, аднак, несправядліва ўспрымаць усё тое, што адбывалася ў гэты час на Беларусі, толькі ў змрочных танах. Не. 17 верасня 1920 г., напрыклад, на сцэне толькі што адкрытага Беларускага дзяржаўнага тэатра адбылася прэм'ера «Паўлінкі», а ў канцы года той жа тэатр паставіў «Раскіданае гняздо» і ўпершыню камедыю «Прымакі». У наступным, 1921 г., святло рампы ўбачыла «Адвечная песня». У 1921 г. Купала працуе намеснікам загадчыка літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы БССР, займаецца ўкладаннем і апрацоўкай беларускай тэрміналогіі, рэдагуе часопіс «Вольны сцяг», збірае фальклор Лагойшчыны. Быў сярод тых, хто актыўна спрычыніўся да стварэння Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт), а ў наступным, 1922 г., быў абраны яго сапраўдным членам. Пасля таго як на базе Інбелкульта ўтварылася Акадэмія навук рэспублікі, Янка Купала быў выбраны акадэмікам (26 лістапада 1928 г.).

На III з'ездзе Саветаў у Мінску ў лютым 1921 г. ужыты захады па пашырэнню абсягаў выкарыстання беларускай мовы, якая становіцца важнейшым фактарам культурнай рэвалюцыі. А ў сакавіку 1921 г. яшчэ большая нечаканасць: X з'езд РКП(б) абвяшчае лозунг: «вялікадзяржаўны расійскі шавінізм — найвялікшая небяспека на дадзеным этапе». Што, якія партыйныя гульні стаялі за гэтымі лозунгамі, паэт, магчыма, не ведаў, але затое напэўна ведаў (хаця, можа, і не ў дакладных лічбах), што ўжо ў 1921 г. у рэспубліцы працавала шэсць тысяч беларускіх школ, у якіх вучыліся 450 тысяч дзяцей і выкладалі 11 тысяч настаўнікаў. Дарэчы, вучні Бабруйскай школы папрасілі ў Янкі Купалы згоды, каб прысвоіць школе яго імя. Паэт такую згоду даў. Ён бачыў, як вяскоўцы ў многіх месцах Беларусі атрымлівалі ад новай улады зямлю ў бясплатнае карыстанне, як умацоўваліся сялянскія гаспадаркі. Нацыяналізацыя зямлі, абвяшчэнне раўнапраўя нацый, замена прадразвёрсткі прадуктовым падаткам (НЭП) сведчылі ў карысць таго, што камуністычная канцэпцыя жыццёвага ладу як быццам бы здольная была на дабратворныя адносіны да чалавека. Паэту, які звязаў свой лёс з ідэяй адраджэння роднай старонкі, вельмі хацелася верыць, што новы лад сапраўды дасць беларускаму народу магчымасць будаваць вольную і шчаслівую Бацькаўшчыну.

У красавіку-маі 1921 г. ён перакладае на беларускую мову «Інтэрнацыянал» (апублікаваны ў газеце «Савецкая Беларусь» 20 ліпеня). У снежні Беларускае дзяржаўнае выдавецтва выдала «Інтэрнацыянал» у перакладзе Я. Купалы як лістоўку для дэлегатаў Усебеларускага з'езда Саветаў.

У жніўні ён піша верш «На смерць Сцяпана Булата», у якім стварае гераічны вобраз змагара за сацыяльнае вызваленне роднага народа.

Да гэтага ж часу адносіцца адзін з шэдэўраў купалаўскай лірыкі — верш «А зязюля кукавала...», у якім ён яшчэ раз вяртаецца да анталагічных першаасноў народнага жыцця, глыбока перажываючы лёс працаўнікааратага і сейбіта. Пры ўсёй прадвызначанасці і ў пэўным сэнсе лагічнай завершанасці гэтага лёсу ён пазначаны відавочнымі рысамі драматызму, які ўзмацняецца вешчаваннем зязюлі. Гаворка ідзе пра абяздоленасць беларускага чалавека: «Янка сеяў — людзі жалі».

Ідэя верша — у запаветным жаданні паэта, каб народ заняў нарэшце належнае месца ў новым жыццеўладкаванні, якое пачало сцвярджаць сябе на Беларусі.

У сакавіку 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор з Польшчай. Перамовы праходзілі без удзелу прадстаўнікоў Беларусі. Кіраўнік савецкай дэлегацыі Іофэ па загаду Масквы не дапусціў беларусаў да ўдзелу ў перагаворах, цынічна папярэдзіўшы пры гэтым, што Савецкая Расія, калі спатрэбіцца, можа аддаць Польшчы ўсю тэрыторыю БССР. Усю тэрыторыю ўсё ж такі не аддалі: Беларусь была падзелена на дзве амаль роўныя палавіны, і пад уладай Польшчы апынулася заходняя частка.

Купала адмоўна паставіўся да Рыжскага дагавора 1921 г. і разам з Якубам Коласам і іншымі пісьменнікамі асудзіў яго. Яны бачылі, што рэвалюцыя была і застаецца далёкай ад нацыянальных інтарэсаў беларусаў, што яна ператварыла народ з мэты гістарычнага развіцця ў сродак маніпуліравання бюракратычных вярхоў — бальшавіцкай алігархіі, якая праследавала свае карысталюбівыя, эгаістычныя планы.

Гэта тэма падзелу Беларусі на Усходнюю і Заходнюю балюча адгукнулася ў творчасці многіх беларускіх пісьменнікаў:

Пасеклі наш край папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.

*(А.Дудар)*

Не быў выключэннем і Янка Купала. Тэма Заходняй Беларусі праходзіць праз усю яго творчасць, нагадваючы аб сабе на кожным кроку. Аціх рух на Даўгінаўскім гасцінцы, па якім паэт ездзіў з Мінска ў Акопы да маці: Даўгінава аказалася па той бок мяжы — у Польшчы:

Ты не спаткаеш стуль суседа,
А мо й матулі з вас які...
Былі сваймі у шчасці, ў бедах, —
Цяпер чужыя чужакі.

Ды ані вестачкі адтуля,
І нібы сам адтуль далей,
Адно пачуеш, як зязюля
Кукуе там, як і даўней.
А воўк завые — адгалоскі
Лятуць сюды, калі дзень ціх,
Як бы і воўк адгэтуль вёскі
Забыць не можа там — у іх.

*(«Па Даўгінаўскім гасцінцы»)*

На тэрыторыі далучанай да Польшчы Заходняй Беларусі ўзнік нацыянальна-вызваленчы партызанскі рух.

Перад гэтым, у 1920 г., выбухнула Слуцкае паўстанне супраць бальшавікоў, жорстка падаўленае. Адна з яго прычын — незадаволенасць Рыжскім дагаворам. Час пагражаў няпэўнасцю і няўстойлівасцю.

У 1922 г., нарэшце, з'явіўся на свет зборнік «Спадчына», які склаўся з твораў, напісаных у гады першай сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. «Спадчына» была падрыхтавана Купалам яшчэ ў 1919 г. і здадзена ў Беларускі пададдзел аднаго з маскоўскіх выдавецтваў, аўтар атрымаў нават у лік ганарару аванс. Аднак у Маскве ён па невядомых прычынах выйсці не змог і з'явіўся ў Мінску праз тры гады, у 1922 г., у кааперацыйна-выдавецкім таварыстве «Адраджэнне». Сутнасць клопатаў, якімі жыў у гэты час паэт, падкрэслена ў самой назве зборніка — «Спадчына». Купала не мог заставацца раўнадушным да лёсу роднага краю — разам з народам ён шукаў адказу на карэнныя пытанні часу, жыў і пакутаваў разам з ім. Зборнік адкрываўся вершам «Спадчына», напісаным 19 верасня 1918 г., у якім на ўсю сілу гучыць патрыятычнае пачуццё паэта, якое складае галоўную лірычную ідэю новай кнігі:

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
Аб ёй мне баюць казкі-сны,
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Няцяжка заўважыць далейшы рост майстэрства, уменне тонка «аркестраваць» страфу, надаць радку нейкую магічную эмацыянальную сілу. Мастацкая форма ў Купалы падпарадкавана сутнаснай аснове яго паэзіі. У гэтым сэнсе верш «Спадчына» шырока і поўна выявіў нацыянальны дух беларускага народа. Аўтар таленавіта выка-

рыстоўвае меладычна-гукавыя магчымасці слова, якія ўзбагачаюць яго мову новымі адценнямі сэнсу. Ёмістасць вобраза «спадчыны» пашыраецца дзякуючы высокай канцэнтрацыі ў ім характэрнага, сутнаснага:

І ў белы дзень, і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з'едзены.
Нашу яго ўжывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.

Купалаўскі верш пакідае ўражанне меладычнага поўнагалосся і завершанасці.

У зборніку «Спадчына» адлюстравалася ўласцівае Янку Купалу гранічна напружанае перажыванне свету. З мэтай перадаць гэта напружанне ён уключыў у зборнік верш 1913 г. «Песняй толькі»:

Млечны Шлях, што нябесны дзядзінец
Засцілае, я б зняў на зямлю
І масціў бы ім новы гасцінец
Цераз новую ніву сваю.

Пра гэты твор ішла гаворка пры разглядзе нашаніўскай дыскусіі 1913 г. Верш выявіў незвычайнае пачуццё зліцця духоўнай істоты паэта з сонцам як жыватворнай першакрыніцай жыцця. У сваім касмічна-пантэістычным, а па сутнасці гуманістычным пафасе Купала гатовы быў да абагаўлення гэтага нябеснага свяціла, якое амаль з самага пачатку стала адным з персанажаў яго лірыкі нароўні з чалавекам. Сонца ў Купалы — стымул развіцця ўсяго жывога на зямлі, абуджальнік стоенай зямной энергіі:

Сонца ўзяўшы агністае ў рукі,
Што гарыць над бязмерам палёў,
Я па Млечным тым Шляху без мукі
Чалавека да шчасця бы вёў.

Аднак, на вялікі жаль, так, як хацеў бы паэт, не атрымалася. Рэальнае жыццё прапаноўвала паэту іншыя вобразы і сімвалы. Купалаўская сімволіка гэтага перыяду выяўляе драматызм сацыяльнага і нацыянальнага становішча беларускага народа і надзеі на лепшую будучыню.

Алегарычным сэнсам, сімволікай і ўмоўна абвостранай вобразнасцю напоўнены верш Купалы «Званы» (1918): «Гудуць званы, з дня ў дзень гудуць мядзяныя званы, / Як стогн, гук-водгулле гучыць маль-

бою жудзі». Паэту, які заўсёды імкнуўся да душэўнай гармоніі чалавечага існавання, глыбока чужым аказаўся той выбух разбуральнага дыянісійскага пачатку, які разбушаваўся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і які ахапіў таксама і літаратуру...

У «Спадчыне» паэт не выпускае з-пад увагі асноватворныя праблемы чалавечага існавання: асоба — народ — гісторыя — дзяржава. Зборнік, складзены на працягу драматычнага часу рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, сведчыць, што развіццё паэта ішло шляхам бясконцага вяртання да старых пытанняў, якія заставаліся незагойнымі ранамі на целе народа: свабода, дзяржаўнасць, незалежнасць.

У лірыцы Янкі Купалы дакастрычніцкага часу адбіўся народна-дэмакратычны светапогляд паэта-адраджэнца. Традыцыі народнасці і дэмакратызму ў многім жывілі і наступныя перыяды яго творчасці. Нацыянальна-адметны вобраз беларуса-сейбіта намаляваны ў вершы «Сявец».

Кніга «Спадчына» з незвычайнай лірычнай усхваляванасцю і паўнатой адлюстравала карціну нацыянальнага быцця беларускага народа ў пераломна-кульмінацыйны момант яго гісторыі. У гэтым сэнсе паказальныя многія вершы, у тым ліку такі, як «Наша гаспадарка» (1918), у якім знаходзім водгук на тагачасныя падзеі і на нацыянальную праблему:

Чужы і свой хлеб становіцца жорсткім комам,
І душыць кліч: ці доўга будзе нам заломам
Варшава панская і царская Масква.

Апошні радок цэнзар скараціў напалавіну: замест «царская Масква» стаялі кропкі.

З падзеямі рэвалюцыі і войнаў, якія вал за валам каціліся па Беларусі, звязаны верш «Забытая карчма» («Пабіты вокны, сарвана страха...»), створаны ў 1918 г. у Смаленску.

У вершы «Буслы» ў алегарычнай форме ідзе гаворка пра чалавека на ростанях (тып паязджаніна, бежанца) паміж старым і новым, пра безнадзейнасць і трагізм яго лёсу...

Падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны як вайны братазабойчай іншасказальна адлюстроўваліся ў вершы «Першы снег». Братазабойства, на думку аўтара, пярэчыць самой чалавечай прыродзе.

У зборніку «Спадчына» меліся быць змешчанымі вершы «Паўстань з народу нашага, прарок...» і «Жыды!», аднак па цэнзурных меркаваннях не ўвайшлі. Да старых цэнзурных абмежаванняў дадаліся новыя: бальшавікі забаранілі Мінскаму тэатру ставіць камедыю Ф. Аляхновіча «Птушка шчасця» толькі на той падставе, што ў п'есе было ва ўжытку слова «жыд» — хаця і без якоганебудзь пагардлівага ад-

цення. Слова «яўрэй» тагачасная беларуская мова не ведала. Мусіць, гэта акалічнасць паўплывала на лёс купалаўскага твора «Жыды!».

Што датычыцца «Паўстань з народу нашага, Прарок...», то сама думка аб нацыянальным лідэру бальшавікам была глыбока варожай...

Напрамак развіцця літаратуры з пачатку 20-х гадоў вызначыла новая грамадская ідэалогія, якая далёка не заўсёды выклікала згоду, а многае проста абурала.

Складаным выглядала пытанне аб нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыне. Савецкая афіцыйная ідэалогія 20-х гадоў глядзела на мінулае як на нейкую імгненную прыкрую недарэчнасць, якая павінна як найхутчэй забыцца, сысці ў бяспамяцтва. Паэт, які спадзяваўся, што рэвалюцыя дапаможа вырашыць і сацыяльнае, і нацыянальнае пытанне, цяпер, калі яна адбылася, быў глыбока здзіўлены рэзкім узрастаннем працэсу уніфікацыі ідэалагічных каштоўнасцей, якія ў новых паслякастрычніцкіх умовах звужаліся да падкрэсленай тэндэнцыйнасці, партыйнасці і класавасці. Рэвалюцыя, па перакананню і ўспрыманню яе ўдзельнікаў і сучаснікаў, не прызнавала пераемнасці, адмаўлялася ад яе, стваралася ўражанне, што жыццё пачынаецца нанова. Былі практычна забаронены паняцці «беларускае адраджанне», «беларускія нацыянальныя інтарэсы», «беларуская свядомасць», «нацыянальная культура». У ход пайшлі новыя словы: «сусветная рэвалюцыя», «інтэрнацыянал», «дыктатура», «сацыялізм», «пралетарыят» і інш.

Гаворка фактычна ішла пра перабудову ўсяго традыцыйнага ўкладу жыцця і чалавечай свядомасці. Ад такога паэта, якім быў Янка Купала, час вымагаў асабліва высокай напружанасці духоўных сіл. Ён пільна ўглядаўся ў новыя, сацыялістычныя формы жыцця. Асоба паэта па-ранейшаму развіваецца, спалучаючы ўласную індывідуальнасць і грамадскую адказнасць. Сведчанне гэтаму напісаны 24 студзеня 1922 г. славуты верш «Перад будучыняй», у якім ва ўмовах савецкай рэчаіснасці знайшла працяг і развіццё даўняя тэма лёсу народнага, распачатая яшчэ ў творы «А хто там ідзе?» На гэты раз паэт бачыць, што гістарычны поступ народа прыпыніўся, што яго чакае невядомасць:

Стаім мы перад будучыняй нашай
І ўсё варожым, сочым ейны ход...
Ці ўскрэснем мы з душой, упаўшай, звяўшай,
Каб выйсці ў свет, як нейкі здольны род...

Былая ўпэўненасць у тым, што за рэвалюцыяй, у якой народныя масы атрымаюць перамогу, павінен наступіць перыяд духоўнага адраджэння, знікла. Купаларамантык, які некалі прагнуў рэвалюцыі,

бачыць, што яна не дасягнула мэт разняволення чалавека, якія, на яго думку, павінны былі б стаць сэнсам рэвалюцыі:

Сягоння мы жывём, і ўдзень мы блудзім
Пад маскай, асляпляючаю нас,
І што сказаць самім сабе і людзям,
Не ведаем, не можам, хоць і час.

У вершы праўдзіва адлюстравалася асабістае самаадчуванне аўтара, яго заклапочанасць тым, што адбывалася навокал. Слова вырастала з непасрэдна ім перажываемага.

Становішча выглядае нават горш, чым у творы «А хто там ідзе?»

Заціснуты, задушаны, як мышы
Пад жорсткім венікам, з усіх бакоў,
Шукаем, як сляпыя, не згубіўшы
Таго свайго, што наша ад вякоў.

Паэт бачыць, што нацыянальны дух народа застаецца па-ранейшаму скаваны, і думкай яго авалодваюць горкае расчараванне і роспач:

Цябе чакаем, будучыні нейкай,
Што прыйдзеш, недзе ўсіх нас павядзеш,
І гінем марна пад чужой апекай,
Адбіўшыся ад родных вехаў, меж
А хтось далёкі ці хтось, можа, блізкі
Засеў за наш бяседны, сытны стол
І кідае, як з ласкі, нам агрызкі,
А мы к зямлі з падзякай гнёмся ўпол.

Вострае адчуванне нацыянальнай абдзеленасці і несправядлівага ўшчамлення ізноў становіцца ў яго галоўнай рухаючай сілай паэтычнага перажывання і лірычнай рэфлексіі:

Нявольніцтва й жабрацтва так нас з'ела
І так нам высмактала з сэрца сок,
Што нат у вочы глянуць, плюнуць смела
Не смеем, стаптаныя на пясок.
Там чутна: Беларусь! Там — Незалежнасць!
А там — «Паўстань пракляццем» ... Ну, а мы?
Мы ў страху... дум крутня... разбежнасць...
Без толку крыллем хлопаем, як цьмы.

Фальклорную паэтыку ў гэтым вершы, як бачым, значна пацясніў стыль газетнай гаворкі і прастамоўя:

О так, як цьма, як спуджаны вароны!..
І слухаем і нюхаем тут, там:
Які павеяў вецер на загоны, —

Заходні, ўсходні, й ці ад нас, ці к нам?
Аграбленыя з гонару й кашулі,
З свайго прыпыну выгнаныя вон,
Мы дзякуем, што торбы апранулі
На нас ды з нашых нітак-валакон.
Няўжо нас не аб'ясніць розум ясны,
І не пакінем біцца з кута ў кут?
Няўжо кліч вечны будзе ў нас напрасны —
Кліч бураломны: вызваленне з пут?!

Вядома, такія творы не маглі спадабацца савецкай уладзе, аднак бальшавікі не трацілі надзеі перавыхаваць аблуднага аўтара. 19 сакавіка 1922 г. у Белдзяржуніверсітэце адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 40-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. З дакладамі выступілі М. Піятуховіч, А. Вазнясенскі і інш. Да фактычнага 40-годдзя (пачатак ліпеня) яшчэ заставаўся час, але падрыхтоўка, так сказаць, пачалася...

У краіне між тым адчуваліся новыя павевы. Будні грамадзянскай вайны змяніліся мірнымі днямі, праўда, не менш суровымі і напружанымі. Пачаўся пераход ад палітыкі ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі, ад якой чакалася, што яна змацуе саюз рабочага класа з сялянствам, дасць магчымасць вырашыць наспелыя дзяржаўныя і народнагаспадарчыя праблемы.

Аб адносінах Купалы да ўсіх гэтых змен можна меркаваць па надзвычай цікавым вершы «Пазвалі вас...», у якім асэнсоўваецца шлях, пройдзены Савецкай Расіяй і бальшавікамі з часу, калі яны ўзялі ўладу ў кастрычніку 1917 г. Твор напісаны з нагоды таго, што правадыр бальшавікоў Ленін быў запрошаны на міжнародную Генуэскую мірную канферэнцыю дзяржаў — удзельніц адгрымеўшай сусветнай вайны. Паэт выкладае свой погляд на бальшавікоў, якія у XX ст. аказаліся ў цэнтры сусветна-гістарычных падзей:

Пазвалі вас на пір піроў,
Пазвалі вас за волю стаць,
І далі ўладу путы рваць,
І далі ўладу біць цароў, —
Зрабілі з вас гаспадароў.
І вы з рабоў пайшлі ў цары... —
О, каб не ў краты толькі з крат?!
Паклон аддаў вам азіят,
За ім Еўропы жыхары
Шлі к вам праз морскія віры...
Але не ваш вітаць шлі сцяг:

З сваёю воляй шлі на вас...

Гаворка ідзе пра падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, барацьбу з царызмам і ваеннай інтэрвенцыяй, якая ішла і сухапутнымі, і марскімі шляхамі:

І не дайшлі — зышлі на час
Праз белы й чорны марскі шлях,
А вам не страх, а вам не страх!..
Чатыры годы крок у крок
Тварыць вы шлі і кроў пілі
Сваю, чужую па зямлі...
Раслі магілы... зваў прарок...
Рос вашай моцы блеск і мрок.
І ўсё вы ўзялі, ўсё як ёсць:
Фабрычны дым, сяўбы загон
І панскі двор, і царскі трон...
Ды стала ўсё вам гэта ў злосць...
У хлебе восць, у горле косць....

Што ж адбылося? Чаму бальшавікі, якім па сілах было справіцца з сваімі праціўнікамі ў ваенным супрацьстаянні, раптам у мірны час апынуліся ў бездапаможным становішчы, што спатрэбіўся НЭП, спатрэбілася дапамога капіталістаў?

Нельга сказаць, што ў вершы даецца вычарпальны адказ на гэтыя пытанні. Паэт хутчэй канстатуе тое, што адбывалася і адбываецца ў яго на вачах:

Сабою самі ўстаць з руін
Вам не хапіла смагі, сіл,
І вось к вам вылез цень з магіл:
Крывавы грош і «гаспадзін»,
А іх закон адзін, адзін.
З-пад ног, з утоптанай нары
Паўзе ўжо збэшчаны павук
І ў сто, у сто кагцістых рук
Хапае вас, рабы-цары, —
Як бы ўжо вы не ўладары

У паэта не было падстаў залішне шанаваць урады заходніх дзяржаў, якія ў свой час невыразна паставіліся да незалежнасці Беларусі і, па сутнасці, не падтрымалі яе, аднак супярэчлівая існасць бальшавікоў («рабы-цары») таксама не магла атрымаць яго прыхільнасці, ухвалы:

Вы ўладары... Яшчэ жар-цвет
Бунтарскіх дум у вас не згас:

Еўропа кліча ў госці вас:
Пад рогат піравых пабед
Саветы кліча на «савет».

Які будзе вынік гэтага «савета» — невядома.

Яшчэ раз давялося Янку Купалу выступіць як драматургу: 31 жніўня 1922 г. у Акопах была завершана трагікамедыя «Тутэйшыя», падзеі якой разгортваюцца ў Мінску ў складаны, драматычны час — 1918-1920 гг., калі, як мы ўжо казалі, вельмі востра для беларусаў стаяла нацыянальнае пытанне, вырашэнне якога затрымлівалася бясконцымі акупацыямі. Першая дзея ў «Тутэйшых» адбываецца ў лютым 1918 г., калі Мінск акупіравалі немцы; другая — у снежні гэтага ж года (адступленне кайзераўскіх войск і прыход Чырвонай Арміі); трэцяя — уліпені 1919 г. (захоп Мінска легіянерамі Пілсудскага); чацвёртая — уліпені 1920 г. (вяртанне савецкай улады).

Драматург выводзіць на тэатральную сцэну гарадскі тыпаж таго часу: былога калежскага рэгістратара Мікіту Зносака, прыйдзісвета Генрыха Мотавіча, Папа, Спраўніка, дзяўчыну невядомых заняткаў Насту Пабягунскую. Гэта героі-маскі, кожная з якіх увасабляе пэўны бок тагачаснага жыцця.

Аўтар выступае як супраць нацыянальнага рэнегацтва, так і супраць польскага і вялікарускага шавінізму. У вобразе Мікіты Зносака ён едка высмейвае людзей, што здрадзілі народу, адарваліся ад нацыянальнай глебы, гатовы прыстасавацца да любога рэжыму ўлады. У залежнасці ад гэтага ён называе сябе то на рускі манер Нікіціем Зносіловым, на польскі — Нікіціўшам Знасілоўскім. Яго жыццёвая філасофія простая да прымітывізму. «А ў мяне... душа рэальная, — гаворыць Мікіта Зносак, — хто мне больш плаціць, таму і служу і чхаць хацеў на ўсякія ідэі». У думках і паводзінах гэтага чалавека адлюстраваліся камічны і трагічны пачаткі, уласцівыя падобнаму сацыяльна-маральнаму тыпу людзей. У камізме і трагічнасці гэтай постаці праглядваецца старое, заснаванае на сацыяльным і духоўным уціску і эгаізме грамадства, якое нясе сваю долю адказнасці і віны за з'яўленне такога чалавечага феномену — хама і нягодніка.

У вобразах Усходняга і Заходняга вучоных аўтар крытыкуе погляды часткі расійскай і польскай інтэлігенцыі, якая, будучы шавіністычна настроенай, не хацела лічыцца з самім фактам існавання беларускай нацыі. Акадэмік І. Замоцін, разглядаючы «Тутэйшых» у артыкуле пра беларускую драматургію, ва Усходнім вучоным убачыў

прадстаўніка «велікарускага чарнасоценнага шавінізму», а Заходняга вучонага расцаніў як увасабленне «польскага імперыялізму»[1].

Захавальнікам нацыянальнай самабытнасці і духоўных асноў асобы выступае ў п'есе Янка Здольнік, ідэалам якога з'яўляецца працоўная, дэмакратычная Беларусь, без цара, паноў і чыноўнікаў.

Афіцыйная крытыка адразу ж абвінавáціла аўтара «Тутэйшых» у значных ідэйных недахопах. В. Кнорын — тагачасны сакратар ЦК КП бальшавікоў Беларусі — у артыкуле, у якім ішла гаворка пра п'есу «Тутэйшыя», характарызуе творчасць Янкі Купалы і яго паслядоўнікаў як «дробнабуржуазнае народніцтва», далёкае ад пралетарскіх мэтаў класавай барацьбы[2].

Крытык вульгарызатар Бэндэ, гаворачы пра творчасць паэта паслякастрычніцкага часу, пісаў: «У першыя гады мірнага будаўніцтва Купала, асляплены буржуазным нацыяналізмам, усё яшчэ актыўна супрацьпастаўляецца ў сваёй творчасці пралетарскай дыктатуры. Найбольш характэрным і буйным творам для гэтага часу з'яўляецца яго п'еса «Тутэйшыя» 1922 г., а таксама вершаваны твор «Перад Будучыняй»[3].

У пачатку 20-х гадоў наогул усё беларускае ўяўляла ўладам небяспеку. Пра гэта сведчыць таксама гісторыя з літаратурнай суполкай «Вір». У 1922 г. у Мінску група літаратараў, у тым ліку і Янка Купала, выступілі з ініцыятывай стварыць пісьменніцкае аб'яднанне пад назвай «Вір». У «Вір» уваходзілі камуністы З. Жылуновіч (Цішка Гартны) і М. Кудзелька (Міхась Чарот), а таксама празаік І. Пятровіч (Я. Нёманскі), паэт А. Александровіч, П. Ільючонак, С. Некрашэвіч, А. Смоліч і інш. Аб'яднанне выпрацавала статут і праграму і ўвайшло ў адпаведныя органы, каб атрымаць дазвол на сваё існаванне. Пачалася праверка, трэба было ўстанавіць палітычную «фізіяномію» членаў «Віра», і за справу ўзялося ДПУ. Амаль усе сябры «Віра» атрымалі адмоўныя характарыстыкі. Янка Купала характарызаваўся як «бел. Писатель-шовинист». Суполку забаранілі, западозрыўшы крамолу. Надыходзілі, па ўсім відаць, новыя часы, калі ўсё павінна было знаходзіцца пад кантролем уладаў, а ўсялякая асабовая, прыватная ініцыятыва (літаратурная творчасць якраз на гэтым і грунтуецца) ставілася пад падазрэнне[4].

---

[1] Узвышша. 1927. № 1. С 78.
[2] Звезда. 1922.17 вер.
[3] Маладняк. 1931. № 5. С 106.
[4] Падрабязна пра гісторыю суполкі «Вір» упершыню расказана ў артыкуле А. Гесь «Вір», які так і не завіраваў» // ЛІМ. 1996. 27 снеж.

Крызіс гуманізму працягваўся праз імкненне да амасаўлення чалавека, да паглынання яго натоўпам, «класам», «партыяй», да ўсялякага сцірання індывідуальных граней.

З іншых падзей канца 1922 г. трэба адзначыць выхад першага нумара новага літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя», які фактычна замяніў сабой часопіс «Адраджэнне», першы нумар якога, ужо набраны і аддрукаваны, цэнзура канфіскавала з-за таго, што ў ім быў змешчаны верш Янкі Купалы «Перад Будучыняй» (які мы ўжо разглядалі).

Новая ўлада зрабіла стаўку на моладзь, якая ў новых умовах пачувала сябе гаспадаром становішча. Маладымі авалодала пачуццё рэвалюцыйнага месіянства. Прадстаўнікі маладзейшых пакаленняў 20-х гадоў, кіруючыся ідэаламі сусветнай рэвалюцыі, жаданнем ўсё перарабіць на новы лад, часам ішлі занадта далёка, адмаўляючыся ад свайго, роднага, ігнаруючы нацыянальную спадчыну, малюючы перад сабой сацыяльныя міражы і спараджаючы шчодрыя ілюзіі блізкага шчасця і ўсеагульнага задавальнення. На пісьменнікаў старэйшых пакаленняў некаторыя з маладых глядзелі як на літаратурнае мінулае. Новых творчых узлётаў ад іх яны ўжо не чакалі. Нашаніўская паэтычная традыцыя, з якой была звязана іх творчасць, стала лічыцца старой і непрыдатнай у новых умовах, а мэты і задачы адраджэння ўжо дасягнутымі і выкананымі. Маладнякоўцы (арганізацыя «Маладняк» была заснавана ў 1923 г.) трымаліся той думкі, што Янка Купала, Якуб Колас і некаторыя іншыя старэйшыя пісьменнікі па-ранейшаму знаходзяцца на варце ідэалаў адраджэння, выкарыстоўваючы яго мастацкія прынцыпы і выяўленчыя сродкі, асуджаныя стаяць перад гістарычнай «канавай» паміж старым і новым, якую не ў стане перайсці і наблізіцца да будучыні. У паэмах «Босыя на вогнішчы», «Сон на балоце» Міхась Чарот лідэр «Маладняка» — палемізуе з Янкам Купалам (у прыватнасці з яго паэмай «На Куццю»), бо не можа ў старасвецкім князю прызнаць духоўнага лідэра сучаснасці.

Вядома, у 20-я гады, калі пачалі актыўна сцвярджаць сябе новыя ідэі і творчыя прынцыпы, свядомасць чытача ўжо не магла задаволіцца нашаніўскім бачаннем жыцця. Дарэчы, Купала адчуваў гэта, можа, нават і лепш, чым хто-небудзь з маладых. Добрае сведчанне таму цудоўны верш «Арлянятам», створаны ў 1923 г. Гэта быў паэтычны зварот да моладзі, наказ свята захоўваць гераічныя традыцыі мінуўшчыны і заклік будаваць новую Бацькаўшчыну:

Вам на памяць Серп і Молат
  Даравала доля,
  Каб з вас кожны быў, як волат,

Не гнуў плеч ніколі.
Каб здабытую свабоду
Зналі, шанавалі
І у цяжкую прыгоду
Ўсталі грознай хваляй.

Серп і молат, што красаваліся на савецкім гербе рэспублікі, Купала ўспрыняў як алегарычнае ўвасабленне традыцыйных нацыянальных каштоўнасцей свайго народа, які заўсёды разумеў жыццё як стваральную дзейнасць. У падтэксце гучала думка аб непрыняцці паэтам разбуральнага характару рэвалюцыі, яе негатыўных адносін да мінулага.

«Арлянятам» прагучала для ўсіх вельмі нечакана. Купала здзівіў маладосцю свайго паэтычнага голасу і тым, што, як аказалася, яго паэзія 20-х гадоў і творчасць маладнякоўцаў мелі шмат супольных тыпалагічна-мастацкіх рысаў. Гэта тычылася шырыні светаўспрымання, рамантызацыі рэчаіснасці, павышанай экспрэсіўнасці радка, выкарыстання фальклорнай сімволікі, падпарадкаванай новаму вобразна-эмацыянальнаму заданню. Верш «Арлянятам» з гэтага часу ўвайшоў ва ўсе школьныя хрэстаматыі па беларускай літаратуры...

Такім чынам, узаемаадносіны Купалы і савецкай улады, якая ўвасабляла ў сабе ідэалы Кастрычніцкай рэвалюцыі, з самага пачатку складваліся не проста. Мелі месца і напружанасць, і падазронасць, і цэнзурныя рэпрэсіі, недавер. Паэт жыў і працаваў з думай аб Бацькаўшчыне.

## ПАЭМА «БЕЗНАЗОЎНАЕ». ЛІРЫКА 1926 г.

У 20-я гады Беларусь, як, вядома, надоўга ператвараецца ў сацыяльна-эксперыментальны палігон па будаўніцтву так званага новага грамадства. У духоўным сэнсе сутнасць гэтага будаўніцтва зводзілася к таму, каб як найхутчэй адрачыся ад усяго нацыянальнага. Купала хутка разгадаў намеры бальшавікоў, у 1924 г. ён пісаў з горкай іроніяй:

...О так! Я — пралетар!..
Яшчэ учора раб пакутны —
Сягоння я зямлі ўладар
І над царамі цар магутны!
Мне Бацькаўшчынай цэлы свет,
Ад родных ніў я адвярнуўся...
Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сняцца сны аб Беларусі!

Нараджэнне і фарміраванне новай пралетарскай культуры на Беларусі павінны былі адбыцца адначасова з разбурэннем культуры нацыянальнай, з адмаўленнем ад спадчыны. На першы план на доўгі час выйшла барацьба з «праклятым мінулым»...

У 1924 г. Купала надрукаваў новы твор — паэму «Безназоўнае». Назва, на першы погляд, як бы і крыху дзіўнаватая. Чаму «безназоўнае», калі тое, пра што ішла размова, мела для свайго вызначэння даўняе і любімае паэтам слова: адраджэнне. Назва, такім чынам, была, але ўжываць паняцце «адраджэнне» ў дачыненні да навейшай беларускай гісторыі было забаронена.

Тым не менш у «Безназоўным» паэт застаецца верны сваёй адраджэнскай прыродзе. Вобраз адраджэння ў паэме прысутнічае:

Не ўзяць рукамі голымі
Таго жывога полымя,
  Што нібы агняцвет,
  Вясёлымі саколамі
  Над горамі, над доламі
  Разносіць іскры ў свет...

Гэта — даўні, яшчэ дакастрычніцкі купалаўскі матыў, матыў адраджэння. Калісьці, успомнім, паэт пісаў: «Плача сонца маладое / Над планетай над старою, / Іскры сыплюцца цурком...» Іскры Адраджэння.

Паэма мае яскрава выяўлены асабісты характар, пачынаючы ад задумы, своеасаблівасці ўспрымання гістарычных падзей, кампазіцыйнай структуры і ажно да самых тонкіх вобразна-эмацыянальных

адценняў, якія перадаюць ідэйны змест і лірычны пафас гэтага твора. Задума нарадзілася з канкрэтна-гістарычнага факта — рашэння Масквы ў 1923 г. аб тэрытарыяльным пашырэнні БССР у яе этнаграфічных межах. РСФСР вярнула беларусам землі Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай губерняў. Аднак тэма дзяржаўнага і духоўнага самасцвярджэння беларускага народа — ад самага пачатку купалаўская. Яна ўзыходзіць да перыяду дарэвалюцыйнай творчасці (верш «Маладая Беларусь», 1912 г. і інш). Гістарычнае жыццё народа, яго шлях з мінулага ў будучыню стаў крыніцай творчага натхнення Купалы ў «Безназоўным». Лірычны пафас яе, інтэнсіўнасць паэтычнага перажывання абумоўлены шырынёй і багаццем агульнанародных і дзяржаўных клопатаў, якія сталі для аўтара глыбока асабістымі. Спраўджвалася, думаў ён, самае дарагое, самае запаветнае. Лірычныя абсягі паэмы надзвычай шырокія. Паэт перадае драматызм падзей перыяду грамадзянскай вайны ў Беларусі, адчуванне разбуранасці роднай зямлі, малюе цяжкасці аднаўленчага перыяду, выказвае спадзяванні на будучыню. Адроджаная Беларусь прадстае ў сімвалічным вобразе святочна апранутай нявесты:

На галоўцы вянок
З сініх васілёчкаў,
А чырвон паясок
Стан абвіў дзявочы.

Паэма ўражвае сваім шматгалоссем, шырынёй сцвярджэння жыцця, скіраванасцю ў будучыню. Аўтар інтэнсіўна шукае і знаходзіць сродкі, разлічаныя на самы шырокі маштаб абагульнення, не адмаўляючыся пры гэтым ад традыцыйнай паэтыкі народна-песеннай вобразнасці, ад алегорый і сімвалаў (як, напрыклад, той «чырвоны паясок» на вясельным убранні нявесты), якія прыдавалі паэме выразнае рамантычнае асвятленне. Як і раней, паэт шмат бярэ з крыніц гаваркога народнага слова, якое гучала на вуліцах і плошчах. Пагэтаму смела можна сцвярджаць, што пафас, паэтычны гіпербалізм у творах Купалы 20-х гадоў з'яўляліся працягам нацыянальных мастацкіх традыцый у новых умовах і адпавядалі асаблівасцям народнага светаўспрымання.

У пачатку 1925 г. выйшаў у свет зборнік «Безназоўнае», у які, акрамя аднайменнай паэмы, увайшлі творы, напісаныя ў асноўным за перыяд 1919-1924 гг. «Гэты зборнік, — пісаў Якуб Колас, жадаючы абараніць сябра ад магчымых нападак, — не трэба разглядаць як мост, па якім Купала пераходзіць ад старой эпохі да новай. Ён чула прыслухоўваецца да павеваў гэтай новай эпохі і сэрцам успрымае вялікі гістарычны сэнс надыходзячага дня».

На новую кнігу Купалы звярнулі ўвагу таксама і маладнякоўцы. А. Бабарэка, разглядаючы зборнік «Безназоўнае», прызнаў, што аўтар «пачынае абмяркоўваць ролю і значэнне сучаснай гістарычнай пары, пачынае шукаць пераходу цераз «канаву», перад якой апынуўся»[1]. «Канаву» А. Бабарэка прыгадаў, успомніўшы купалаўскі верш 1918 г. «У дарозе», дакладней, апошні яго радок: «Но, мой косю!.. Канава!..» У цэлым жа маладнякоўцы к гэтаму часу ў адносінах да Янкі Купалы памянялі думку ў лепшы бок. У сакавіку на рабфаку БДУ адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны Янку Купалу і Міхасю Чароту, — паэты чыталі на ім свае вершы. У тым жа месяцы Купала прымае ўдзел у рабоце першага пленума ўсебеларускага аб'яднання «Маладняк». Між тым пачынаецца падрыхтоўка да дваццацігоддзя яго літаратурнай дзейнасці. Выйшаў з друку юбілейны зборнік «Маладняк» — Янку Купалу». У змешчаным у ім прывітанні Цэнтральнага бюро «Маладняк» ў сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы гаварылася: «Ваша песня, узросшая паміж палыння, прынесла вялікі плён, яе зерне, чыстае, як вока, запала ў сэрца малодшага пакалення і ўзрасціла бунтоўны маладняк. Ваша песня для Беларусі і новых яе песнярскіх пакаленняў застаецца векапомнай»[2].

20-годдзе літаратурнай дзейнасці Купалы адзначалася ў рэспубліцы вельмі шырока. Газеты і часопісы змясцілі вершы, артыкулы, віншаванні. Прыслалі прывітанне пісьменнікі Ленінграда, украінскія літаратурныя аб'яднанні «Плуг» і «Гарт», рэдакцыі харкаўскіх газет і інш. 25 чэрвеня газета «Савецкая Беларусь» апублікавала прывітанне Янку Купалу ад ЦВК і СНК БССР. Яму было прысвоена званне народнага паэта Беларусі. У адказ на прывітанне ў сувязі з гэтым сваім юбілеем і наданнем годнасці беларускага народнага паэта Купала пісаў: «Я скажу адно толькі, што сягонняшняе вялікае і незвычайнае свята для мяне з прычыны ўшанавання майго юбілею і асабліва надання мне годнасці беларускага народнага паэта — гэта ёсць свята не маё, а беларускай нацыянальнай ідэі, гэта ёсць трыумф вызваленай працоўнай Беларусі». Тады ж, з нагоды юбілею, быў створаны вядомы верш «Шляхам гадоў», у якім адлюстраваўся ўласны жыццёвы шлях паэта ў непадзельнасці з народным лёсам — складаным, шматпакутным, драматычным:

Вось так шляхамі год дагэтуль я ішоў
З адною думкаю аб шчасці Беларусі;
То блукаўся паміж абшараў і крыжоў,

---

[1] Маладняк. 1925. № 7. С. 11.
[2] «Маладняк» — Янку Купалу. Мн, 1925. С. 8.

То, як сланечнік, к сонцу яснаму імкнуўся...
Сягоння ўжо працерабіўся гэты шлях:
На гонях родных не пануе нелюдзь,
З душы спадае перад будучынай жах,
Да новага жыцця сцягі віднеюць.

Беларуская паэзія сярэдзіны 20-х гадоў была ў многім прасякнута настроем песімізму, тым больш абнадзейваюча прагучала купалаўскае «Шляхам гадоў». Паэт, здавалася, і сапраўды быў блізкі да таго, каб паверыць, што на Беларусі нарэшце ўсталююцца «права і закон», што народ зажыве нармальным стваральным жыццём.

Былі факты, якія быццам бы абнадзейвалі ў гэтым. Вярнуліся на радзіму члены ўрада былой БНР В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, А. Смоліч, С. Некрашэвіч, Л. Заяц... Яны — у зменавехаўскім духу — палічылі, што БССР вяртаецца да ідэі беларускай нацыянальнай дэмакратыі.

Прыедзе ў СССР з цягам часу нават М. Горкі — асабліва дарагі для Купалы чалавек, перакладчык яго славутага «А хто там ідзе?» Словам, нялёгка было разабрацца ў тым, што адбывалася, ацаніць падзеі, што набягалі адна на адну, як у калейдаскопе...

У лістападзе 1926 г. Купала прымае ўдзел у Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і алфавіта. Канферэнцыя стала вельмі аўтарытэтным навуковым форумам. Прысутнічала шмат замежных гасцей, у тым ліку знакаміты нямецкі славіст Макс Фасмер. На гэтай канферэнцыі Янка Купала сустракаецца з Я. Райнісам, які быў сярод замежных гасцей.

У снежні 1926 г. Беларусі была вернута яшчэ адна частка яе ўсходніх тэрыторый.

Ёсць падставы гаварыць пра новае светаадчуванне ў творчасці паэта, пра ўзнікненне тэмы «вольнай працы ў вольнай краіне» (верш «Сей, вольны сейбіт!», 1926 г.). Старое моцна далося ў знакі, Купала помніў сялянскую долю, долю бацькоў-арандатараў, якія вымушаны былі вандраваць ад маёнтка да маёнтка, спадзеючыся на панскую ласку. Нядобрай памяці старое мінулася:

Дзе стаяў на полі
З бічам прыганяты
І ганяў прынукай
Змучаных аратых, —
Там цяпер без страху
З выглядам малойца
Новы, вольны сейбіт
Братаецца з сонцам.

*(«Дзе стаяў двор панскі...»)*

«Братаецца з сонцам» — тыпова купалаўскі вобраз, які праходзіць праз усю творчасць паэта.

Аднак не ўсё радавала. Купала не мог не заўважыць — тое, што выдавалася за камуністычную ідэю, у сапраўднасці было адчужэннем чалавека ад уласнасці і ўлады, ад права распараджацца прадуктамі сваёй працы, вяло да самавольства і беззаконнасці. Бачыў ён і тое, што да новай улады прымазваюцца неахайныя людзі, якія, р'яна ажыццяўляючы бальшавіцкую праграму, праяўлялі нацыянальны нігілізм, рэлігійную нецярпімасць, чынілі ўціск і нават здзек над чалавекам[1]. Нямала было такіх і сярод беларусаў. Купала называў іх адшчапенцамі. Менавіта ім ён прысвяціў у 1925 г. верш «Адшчапенцам (заходнім)». Давесак у дужках «заходнім» — гэта толькі для зману цэнзуры. Відавочна, што гаворка ідзе пра з'яву «мясцовага» характару, бо нават і такая назва: «Адшчапенцам (заходнім)» — лагічна дапускала, што, акрамя адшчапенцаў (ці «адменцаў», як іх называе паэт) «заходніх», існуюць яшчэ і «ўсходнія»:

Адкуль і хто яны, адменцы?
Няма у кнігах роду іх;
Імя іх толькі — адшчапенцы,
А гэта ведама й без кніг.
Узялі крыўдай уладанне
Над братам бедным і сляпым
І распасцерлі панаванне
Ў чужым дабры, як у сваім.

Летам 1926 г. была створана і надрукавана ў «Полымі» і іншых выданнях надзвычай цікавая нізка вершаў: «І што я ёй зрабіў такое?», «Па Даўгінаўскім гасцінцы», «І прыйдзе», «За ўсё...», «Царскія дары», «У лесе», «Вецер», «Маладая ачуняла», «На пагранічччы», а таксама вершы «Каб», «Акоў паломаных жандар...», «Ёсць жа яшчэ...», якія пазней апынуліся пад строгай забаронай.

У вершах 1926 г. — што даволі нечакана для Купалы дакастрычніцкага і зусім звычна для паслякастрычніцкага — шмат характэрных непрыдуманых дэталей і падрабязнасцей тагачаснага жыцця і побыту. Ёсць тут, безумоўна, цэлы шэраг аўтабіяграфічных матываў. Хаця, як вядома, Янка Купала ў сваіх творах, свядома ці несвядома, ухіляўся прамой аўтабіяграфічнасці, псіхалагічныя перадумовы яго творчасці складваліся, несумненна, пад уплывам жыццёвага лёсу. І не толькі свайго — паэт пільна сачыў за тым, што адбывалася навокал. «У

[1] М. Гарэцкі паказаў гэты тып у вобразе Гаршчыка (аповесць «Дзве душы»).

«сацыяльных» назіраннях знаходзілі адбітак асабістыя радасці і трывогі.

У нізцы ёсць вершы вузкаінтымнага плану («І што я ёй зрабіў такое?», «Аб дзяўчыне»), у якіх паэт працягвае любоўную тэму, добра вядомую нам з папярэдніх яго твораў. Аднак цяпер інтымная лірыка пазначана прыкметамі новага часу:

Купіў ёй хустачку і жычку,
Шнуроўку ў талю падабраў,
А раз паркалю на спаднічку
Ў каперацыі набраў.

*(«І што я ёй зрабіў такое?»)*

Незвычайна лагоднымі і прывабнымі паэтычнымі фарбамі намаляваны партрэт маладой сучасніцы ў вершы «Аб дзяўчыне»:

Вочкі спусціць на грудкі, на дол, —
Так ідзе і набок не зірне,
А прывабны прыпол і падол,
Аж смяюцца з мяне, да мяне!
Яе сонца ад ног да калень,
Ад калень да грудзей і да губ
Атуляе ў пяшчотны прамень,
Бы спраўляе заручыны-шлюб...

Гэты партрэт багаццем лірычнай эмоцыі, паўнатой гуманістычнага светаадчування прымушае ўспомніць даўні, дакастрычніцкі верш Я. Купалы «Жняя», у якім гераіня «смела йдзе ў сонцы, ўся сама — як сонца».

Аднак былі ў нізцы і іншыя вершы, як, напрыклад, «У лесе», у якіх чуліся трывожныя, скрушлівыя ноткі:

Калі бывае мне маркотна, —
А я маркочуся часцей,
Як гэта думае ахвотна
Мой дабрадзей ці ліхадзей, —
Тады іду я ў лес нядбала,
Каб не мазоліць воч людзям,
На мох валюся дзе папала,
І ўжо я з пушчай сам-насам.

Вядомы крытык Р. Бярозкін, прачытаўшы гэтыя радкі, пісаў: «Прызнаемся: нам не зусім зразумелы прычыны паэтавай маркоты, так як яна выявілася ў гэтым вершы. Толькі знаем: аўтар — не «безнадзейны песіміст», калі ён у хвіліну душэўнай слабасці і адзіноты

ідзе ў векавую пушчу, каб з ёю паразмаўляць і нараіцца. Для кволага, друзлага песімізму гэта залішне манументальна...»[1]

Зразумець прычыны паэтавага песімізму дапамагаюць іншыя вершы гэтага часу — «Па Даўгінаўскім гасцінцы», «І прыйдзе», «За ўсё», «Царскія дары», «На пагранічча», «Вецер», «Маладая ачуняла», а таксама такія, як «Каб...», «Акоў паломаных жандар...», «Ёсць жа яшчэ...». Асобныя з іх «Па Даўгінаўскім гасцінцы», «На пагранічча», «За ўсё...» — крытык разглядае, закранаючы таксама «І прыйдзе...».

У вершы «І прыйдзе» ўвасобіўся, на думку Р. Бярозкіна, пакутлівы роздум Купалы над праблемай «мастак і народ, абавязак пісьменніка перад народам і часам»[2]. У пэўнай ступені з гэтым можна згадзіцца:

І прыйдзе новых пакаленняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыццё прайшлі, ці чарада
Зняваг мінулых нас не з'ела
Пакінуўшы свой дом і чад,
І мы па-даўняму нясмела
Жылі не ўлад і неўпапад?

Пра які суд ідзе гаворка? Вядома, гэта глабальнаасацыятыўны вобраз біблейскага паходжання, аднак калі шукаць жыццёвую падаснову верша, штуршок для яго стварэння, то можна меркаваць, што ён быў напісаны пад уплывам суда над Юрыем Лістападам — удзельнікам Слуцкага паўстання 1920 г. Сведкам абвінавачання выступіў на судзе Цішка Гартны (можа, яго і меў на ўвазе Р. Бярозкін, калі вызначаў праблематыку верша?). Вядома, калі Купала і меў тут на ўвазе Цішку Гартнага, дык не яго аднаго: верш атрымаўся значна шырэйшым па маштабах лірычна-спавядальнай думкі і шчырасці паэтычнага пачуцця. Пра гэта сведчаць яго заключныя строфы:

І засумуеце патомак,
Калі дазнаецца аб нас,
Што нейкі з нас хоць быў не зломак,
А плечы гнуў у крук не раз;
Не йшоў з адкрытымі вачыма
У свет і сцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасцю магчымай
Таптаў сляды, сябе таптаў.

---

[1] Бярозкін Р. Свет Купалы. Звенні. Мн., 1981. С. 171.
[2] Там жа. С. 173.

У творчасці паэта ўзмацняецца трагічны разлад паміж нядаўнімі спадзяваннямі і «новай» рэчаіснасцю, якой яна прадстае перад яго вачыма. Не было недахопу ў фактах, якія сведчылі, што новы лад у адносінах да беларусаў праводзіў старую русіфікатарскую палітыку, якую праводзіў некалі царызм. Камуністычная ідэя, такім чынам, на практыцы аказалася ідэяй імперскай, паводле якой рускі народ стаў «старшым братам», усе астатнія — «малодшыя». Нацыянальная годнасць «малодшых братоў», асабліва такога, як беларускі, ігнаравалася і прыніжалася. БССР не мела ніякай палітычнай самастойнасці і поўнасцю залежала ад Масквы, царскае ярмо ўсяго толькі памянялася на бальшавіцкае. Гэта думка вынікала, па сутнасці, з падтэксту напісанага ў тым жа 1926 г. верша «Царскія дары», які меў падзагаловак «з мінулага»:

Цар грозны, маскоўскі — вясёлы,
Шчаслівы з Пабедаў вялікіх —
У госці і з местаў, і з сёлаў
Нявольнікаў верных паклікаў.

Прыйшлі прадстаўнікі Украіны, Польшчы, Латвіі, Грузіі, Крыма, Туркестана і ў тым ліку Беларус. Цар пачаў раздаваць свае «дары»:

Дару, я табе, украінцу,
Украйны капальні і стэпы, —
За гэта вугаль і пшаніцу
Ты звозіш мне ў свірны і склепы.

Купала няблага ведаў эканамічную геаграфію Расійскай імперыі:

Ты цешся, грузіне, краінай,
Тамарай грузінкаю слаўнай, —
Мне выдзеліш толькі часціну,
Дзе пыхкаюць нафтай фантаны.
Свой Крым, а з ім ханаў і мулаў
Бяры сабе, крымскі татарын, —
Мне ж мора пакінеш агулам
І ўсе санаторыі дарам.
Ты, мой туркестанскі сабрату,
Ідзі ў Туркестан разжывацца, —
Ўзамен я каракуль і вату
З тваіх пазбіраю плантацый.
Табе, сібірак, без граніцаў
Сібір аддаю, мо што выспіш, —
Але мне да ўласнай скарбніцы
Сібірскае золата ссыпеш.

Дайшла, нарэшце, чарга і да Беларуса:

А ты, беларусе нямрушчы,
Вазьмі Беларусь на ўспамінак, —
Твае ж прыдадуцца мне пушчы
Мой царскі вялічыць будынак.

Дзяржаўна-імперская машына падпарадкавала сабе ўсё — і геаграфію, і эканоміку, і чалавека. У гэтым сэнсе вельмі красамоўна гучаць заключныя радкі:

І права даю для ўсіх разам
Пладзіцца, як маку зярняты, —
За што мне за першым наказам
Дасце ўсе сыноў у салдаты,

Такія вось «царскія дары»...

На дварэ стаяў год 1926. Цара быццам не было, але старыя звычкі засталіся, і паэт не мог гэтага не бачыць. 5 чэрвеня 1926 г. быў напісаны забаронены пазней верш «Акоў паломаных жандар...», які меў тлумачэнне: «На палеміку ў «Савецкай Беларусі» аб беларускай мове». Справа тут у тым, што перад гэтым «Савецкая Беларусь» надрукавала ананімны ліст з Полацка пад назвай «Вражда из-за языка», у якім у абразлівых выразах гаварылася пра беларускую мову, літаратуру і саміх беларускіх пісьменнікаў. Купала, спрактыкаваны яшчэ на дакастрычніцкім вопыце, распазнае ў ананіме звычайнага шавініста-русіфікатара:

Не па нутру, як смерць, яму,
Што беларускае дзіцё
Бяжыць у сцюжную зіму
У школку пазнаваць жыццё.
Спужаўся, што хлапчук ў лапцёх,
Напаўадзеты вёскі сын,
У роднай мове ўчыцца змог?..
О, стыдна, рускі «гражданін»!

У гэтым жа шэрагу антышавіністычных твораў — верш «Каб...», які ўвайшоў у тую ж знакамітую нізку 1926 г.

Публіцыстычны па зместу, ён уабраў у сябе рэдкасныя па інтанацыі, рытмах, вобразнасці россыпы вуснай народнай творчасці.

Купала тут увесь у дзеянні, у дынаміцы, яго вобразнасць мае яскрава выражаны кантрастны характар:

Каб таму маланкай
Асляпіла вочы
І блукаў абмацкам
Ён удзень і ўночы, —
Хто для нашых дзетак

Хоча асляпленне, —
Бэсціць чужаніцай
Думак прасвятленне.

Верш гаварыў пра жывучасць фальклорных традыцый, пра жывучасць самога беларускага народа (нездарма ў «Царскіх дарах» ён быў названы «Беларусам нямрушчым»):

Каб вады гарачай
На таго нагрэлі
І не ўстаў бы болей
Са сваёй пасцелі, —
Хто над Беларусяй
Хоча распасцерці
Свой бізун чужацкі
І народ усмерціць.

Аднак, на жаль, спраўджваліся горшыя паэтавы апасенні: Беларусь паступова ператваралася ў сацыяльнаэксперыментальны палігон па будаўніцтву новага грамадства. Новай уладзе не падабалася, што ў індывідуальным стылі Купалы выявілася нацыянальная своеасаблівасць беларускага народа, уласцівы яму самабытны тып мастацкага мыслення, жаданне захаваць сваё аблічча. Былі нападкі, але паэт не збіраўся здавацца:

Ёсць жа яшчэ ў мяне сіла
Крыўдзе не дацца, змагацца,
Над спячых продкаў магілай
Вольна маланкай мігацца.
Ёсць жа яшчэ ў мяне сэрца,
Поўнае шчырых жаданняў,
Якое перш разарвецца,
Чымся любіць перастане.

*(«Ёсць жа яшчэ...»)*

Аўтарытэт Я. Купалы быў надзвычай высокі. У вядомым дакладзе Затонскага «Об обследовании практики нацработы в БССР», заслуханым на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б) 27 чэрвеня 1929 г., гаварылася: «В школах, везде рядом с портретом Ленина обязательно имеется портрет Янки Купалы, того самого, что рекомендует доктрину Монро («Америка для американцев») для Белоруссии. И вообще везде — в академии, школе, на советском съезде проводится своеобразный культ Купалы»[1].

Купала па-ранейшаму шмат працуе, выдае збор твораў. У 1927 г. здадзены ў друк чацвёрты том. Паэт часта сустракаецца з сваімі

[1] Нёман. 1992. №9. С. 144.

чытачамі, наведвае Кіеў, Ленінград, Маскву... У 1927 г. ён уваходзіць у арганізацыйную групу новага літаратурнага аб'яднання «Полымя».

У дзяржаўным і грамадскім жыцці ў гэты час усё больш сцвярджаліся метады грубага адміністрыравання. Месца на вяршыні ўлады заняў Сталін. Рэзка памножылася чарада злачынстваў, узмацніўся стан духоўнага рабства. Сталінскі таталітарызм стаў, па сутнасці, вяртаннем да старых царскіх парадкаў у горшым іх варыянце.

Купалава ідэя адраджэння была чымсьці зусім іншым у параўнанні з тым, што прапанавалі бальшавікі... Чым магло скончыцца такое процістаянне?

Купала быў вялікі і шырокавядомы паэт, і з гэтым нельга было не лічыцца, таму з боку ўлад было затрачана шмат намаганняў на яго «перавыхаванне», ужыты ўціск. Нездарма ў 1927 г. на адной з сустрэч са студэнтамі ён выбраў для чытання даўнюю сваю паэму «Курган». Гэта было невыпадкова[1]. У паэме «Курган» на ўсю моц гучыць, як мы помнім, тэма «паэт і ўлада», і гэтым чытаннем паэт намякаў, што перад ім стаў выбар такі ж прыблізна, як некалі перад яго героем — Гусляром з паэмы «Курган» — і што яму гэтак жа нялёгка, як і Гусляру. І трэба сказаць, што ў адрозненне ад свайго рамантычнага героя, Купала другой палавіны 20-х гадоў у некаторых выпадках вымушаны быў здаваць пазіцыі, услаўляць захады новага ладу па будаўніцтву «раю на зямлі».

7 лістапада 1927 г. беларускія газеты друкуюць паэму Я. Купалы «З угодкавых настрояў», прысвечаную дзесяцігоддзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Што можна сказаць пра гэты твор? Фактычнае, рэальнае быццё падмяняецца тут яго ідэалізаваным адлюстраваннем, фантазіяй, і паэт свядома ідзе на гэта. Ён з вымушаным пафасам услаўляе гістарычныя падзеі рэвалюцыі і новую сацыялістычную яву, аднак некаторыя мясціны гучаць дзіўнавата. Так, напрыклад, паэма заканчваецца радкамі, не пазбаўленымі іранічнай двухсэнсоўнасці:

На дзесятыя ўгодкі
Барма варацць мёд салодкі,
А па мёдзе — рукі ў бок
Ды у скокі крок у крок.
Скача горад, скача вёска,
Адно іскры з-пад падноскаў...
Скачы, ўнуча, скачы, дзед,
Ад Пабедаў да пабед!

[1] Такі ён быў: Успаміны пра Я. Купалу. Мн., 1975. С. 188-189.

У апошніх радках — прысмак едкай насмешкі і нейкай нават абсурднасці таго, што адбываецца.

Паэт зразумеў, што яму давядзецца жыць у гэтым штучна-абсурдным раі.

## ПЕРЫЯД ЗМЯРКАННЯ

У 1928 г. Сталін канчаткова спыніў НЭП, рашуча выступіўшы за ўсеагульную роўнасць, якая на практыцы, будучы рэалізаванай, выглядала як усеагульная беднасць. З магазінаў знікалі прадукты харчавання, пусцеў рынак, з'явіўся прывід голаду. Затое набіраў сілы так званы сацыялістычны наступ па ўсяму фронту. Першая пяцігодка абвясціла лозунг: «Тэхніка вырашае ўсё!» Эканоміка краіны па-ранейшаму мела пераважна аграрны характар, і індустрыялізацыя праводзілася перш за ўсё для ўзмацнення ваеннай магутнасці Савецкага Саюза. Бальшавікі фактычна ўсё яшчэ працягвалі курс на сусветную рэвалюцыю, хаця рэвалюцыйная хваля на Захадзе даўно пайшла на спад.

У адпаведнасці з часам у сярэдзіне і другой палавіне 20-х гадоў у беларускую паэзію ўваходзіць тэма індустрыялізацыі, перабудовы вёскі, калектыўнай працы, новай маралі і этыкі, пераасэнсоўваемых пад класавым пунктам гледжання. Купалаўскі рамантызм з яго ўсечалавечай скіраванасцю спакваля страчвае эмацыянальную разнастайнасць і адчуванне рэчаіснасці — стыль паэта губляе свой аб'ём і шматграннасць, у ім пераважае публіцыстычна-дэкларатыўты тон. У паэзіі Купалы ўсё часцей даюць сябе знаць рысы рытарычнасці, ілюстрацыйнасці. Прыклад — вершы «Дыктатура працы» і «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», напісаныя ў 1929 г. Ствараецца нават ураханне, што паэт як бы паверыў у бальшавіцкую рыторыку і дэмагогію:

Закон і права ў долі роўнай
Для ўсіх народаў, для ўсіх нацый
Рукой жалезнай, непакорнай
Напішаш, дыктатура працы.
Жыццё без цемры і цярпення,
А ў ясным сонцы, як у байцы,
Для ўсіх вякоў і пакаленняў
Збудуеш, дыктатура працы.

*(«Дыктатура працы»)*

Паняцце «дыктатура працы» ў дачыненні да той рэчаіснасці, якая мела месца ў СССР, з'яўлялася ўсяго толькі ідэалагічным падманам. На самай справе была сталінская дыктатура, якую правадыр ні з кім і ні з чым дзяліць не жадаў. Ад верша веяла халоднай газетнай рыторыкай, якую не маглі сагрэць традыцыйна-купалаўскі вобраз будучага — «а ў ясным сонцы, як у байцы».

Купала аказаўся падманутым, як пераважная большасць тагачаснай творчай інтэлігенцыі — і савецкай, і той, што вярталася з-

за мяжы, паверыўшы ў гуманны характар сацыялістычнага ладу. Паэт зблытаў міраж з сапраўднасцю. Зрэшты, гэты працэс характэрны для ўсёй беларускай паэзіі — уласна лірычная трактоўка тэмы сучаснасці не дапускалася, літаратура арыентавалася на суцэльнае апяванне і ўслаўленне «новага жыцця».

Пахвала, узвелічэнне новага грамадскага ладу павінны былі прыніжаць мінулае ў імя цяперашняга і будучага.

Час рабіўся жорсткім і крыважэрным. У 1928 г. на ўвесь свет прагрымеў палітычны працэс — Шахцінская справа. З'явілася слова «шкоднік». Маякоўскі адгукнуўся вершам «Шкоднік»: «И он, скорёжен классовой злобою, идет неслышно портить вентилятор, чтобы шахтеры выли, задыхаясь по забоям, как взаперти мычат горящие телята».

З восені 1929 г. у СССР разгарнулася шырокая кампанія па калектывізацыі, «ліквідацыі кулацтва як класа». Сялянства павялі па шляху пралетарызацыі. Маякоўскі ніколі не быў для Купалы настаўнікам, але творы яго беларускі паэт чытаў. У 1929 г. Маякоўскі стварае верш «Ураджайны марш» (ужо пачынаўся знішчальны голад у Расіі і на Украіне): «Кончай с деревней серенькой, вставай, который сер! Вперегонки с Америкой иди, СССР!» Праз год, у пачатку 1930, з'явіўся новы «марш» «лепшага паэта савецкай эпохі» — «Марш 25 тысяч» (славутыя «дваццаціпяцітысячнікі», пасланыя на ўмацаванне калгасаў), у якім аўтар заклікаў: «Враги наступают, покончить пора с их бандой попово-кулачьей...»

Купала не мог ісці па гэтаму шляху. Ідэя калектывізацыі зямлі не была для яго новай. Яна абмяркоўвалася палітыкамі-сацыялістамі з БСГ яшчэ ў перыяд першай рускай рэвалюцыі. Паэт не падзяляў іх думкі пра неабходнасць абагульнення зямлі і правядзення калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, скептычна глядзеў на магчымасць калектыўнага гаспадарання. І трэба сказаць, на Беларусі, дзе сельскай «абшчыны» ніколі не было, арганізацыя калгасаў ішла асабліва цяжка.

Па ўсім адчуваецца, што сваё вядомае «Сыходзіш, вёска, з яснай явы...» (1929) ён напісаў пад нейкім прымусам. Верш, прынамсі, прасякнуты супярэчлівымі пачуццямі. Пра гэта сведчыць нават тое, што рытміка верша зближана з рытмікай тых твораў, у якіх паэт кляйміў некалі перыяд сталыпінскай рэакцыі («У ночным царстве» і інш.).

У канцы 20-х гадоў у беларускай літаратуры пачынаецца перыяд змяркання. Пафас гуманізму, любові да радзімы, лірызм кваліфікуюцца як праяўленне безыдэйнасці. Асабістае, інтымнае аказваецца занядбаным — на пярэдні план выступае грамадскае быццё. Інтымная і пейзажная лірыка самавыяўлення ставяцца пад падазрэнне як буржуазны від мастацтва і лічацца амаль злачынствам перад новым

грамадствам, своеасаблівай ідэалагічнай дыверсіяй. У крытыцы і публіцыстыцы пачаў адчувацца злавесны подых 30-х гадоў.

30-я гады — жорсткі этап у гісторыі Беларусі і ў развіцці беларускай літаратуры. Працэс калектывізацыі з ужываннем усіх сродкаў прымусу дасягнуў свайго апагея. Высяляліся сем'і так званых кулакоў, храмы станавіліся клубамі, складскімі памяшканнямі, а то і проста разбураліся.

30-я гады з'явіліся працягам і ўзмацненнем масавых рэпрэсій і тэрору, не аціхалі арышты. Нельга сказаць, што народ не аказваў супраціўлення палітыцы таталітарызму, што ён добраахватна ішоў у расстаўленыя бальшавікамі сеці. Канспіратыўны гурток моладзі арганізаваўся, напрыклад, у вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна[1].

У лютым-сакавіку 1930 г. Купала ў складзе розных пісьменніцкіх брыгад наведвае цэлы шэраг гарадоў Беларусі (Бабруйск, Віцебск, Хойнікі, Мазыр), сустракаецца з людзьмі. Ці чуў ён што-небудзь пра бабчынскіх канспіратараў? Цяжка сказаць што-небудзь на гэты конт. Калі і чуў, дык вымушаны быў маўчаць... Але пра многае ведаў. Пра тое, скажам, што ўспамінае адзін з сучасных мемуарыстаў — удзельнік тых пісьменніцкіх камандзіровак:

«Быў пачатак 1930 г. З камандзіроўкай літаратурнага згуртавання «Узвышша» я аб'ездзіў немалую прастору Палесся.

Ішла калектывізацыя. Пастрэльвалі, выходзячы з лясоў, банды, сыпаліся з-за мяжы варожыя адозвы. На голас царкоўных званоў збягаліся вёскі не пускаць прызначаныя для высылкі на поўнач заможныя сем'і. З вялікім намаганнем створаныя ўвечары калгасы — пад раніцу рассыпаліся»[2].

Афіцыйныя ўлады імкнуліся адцягнуць погляд паэта ад будзённых бакоў рэчаіснасці, пераключыць яго ўвагу на іншае.

У маі 1930 г. у Мінску і іншых гарадах і вёсках былі праведзены ўрачыстасці з нагоды 25-годдзя літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. Паэт атрымаў шмат віншаванняў, у тым ліку і ад А. В. Луначарскага з Масквы. Адказваючы на віншаванні, Купала гаварыў:

«Я кажу, таварышы, што пакуль хопіць маіх сіл, я не сыду з таго шляху, па якім ішоў да сягонняшніх векапомных бурлівых дзён, — заўсёды наперад і наперад! Бяда і гора маё і ўсяго працоўнага люду беларускага адыходзіць усё далей — у нябыт, а шпаркім крокам тварыцца квяцістае беспрыгоннае бытаванне, абы толькі шчырай пра-

---

[1] Пра драматычныя падзеі, звязаныя з гэтай гісторыяй, расказаў А. Калубовіч у кнізе ўспамінаў «На крыжавой дарозе».

[2] Лужанін М. Дванаццаць вячорных вогнішчаў Мн., 1963. С.11.

цай і безагляднай адданасцю ленінскім запаветам дапамагаць хутчэйшаму набліжэнню гэтай светлай часіны»[1].

Прайшло дзесяць год пасля таго, як паэт выступіў на святкаванні 15-годдзя сваёй літаратурнай дзейнасці, а як усё змянілася! На першым плане аказалася «вернасць ленінскім запаветам».

Адбыліся ўрачыстасці ў чэрвені таго ж года і ў Маскве. На вечары ў Камакадэміі ў сувязі з 25-годдзем літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы з уступным словам выступіў А. В. Луначарскі: «Імя Янкі Купалы, — сказаў ён, — упісана ў гісторыю беларускай літаратуры такімі ж буйнымі літарамі, як імя Тараса Шаўчэнкі ва ўкраінскай літаратуры»[2].

На вечары ў Маскве прысутнічаў і Янка Купала, які прачытаў свае творы, і не паспеў ён вярнуцца ў Мінск, як слых апаліла нечаканая вестка: пад раскулачванне трапілі маці Бянігна Іванаўна і сястра Леакадзія, якія жылі ў Акопах. Пасля адпаведных захадаў цягнік з раскулачанымі, які вёз іх у Котлас, удалося дагнаць у Барысаве, маці і сястра былі вызвалены, але, як аказалася, гэты крайне прыкры, абуральны выпадак не з'яўляўся выпадковым. Хмары навісалі над галавой самога паэта.

У друку з'явіўся артыкул Л. Бэндэ «Шляхам паэта», у якім Купала абвяшчаўся «ідэолагам буржуазнага нацыянал-адраджэнізму»[3]. А што з такім рабіць — разумелася само сабой...

Пачатак 30-х гадоў адзначаны ўзмацненнем палітыкі рэпрэсій, што само па сабе адпавядала сутнасці таталітарнай сістэмы, яе светапогляду, які выяўляўся ў гіпертрафіраванні, перабольшанні ролі супярэчнасцей у жыцці, у імкненні (гэта падмацоўвалася і тэарэтычна) да канфрантацыі з усім тым, што стаіць на шляху да здзяйснення камуністычнага ідэалу. Пошукі ворага ў эканамічнай, палітычнай, духоўнай сферах грамадскага жыцця, канцэнтрацыя сіл для нанясення рашаючага ўдару па той ці іншай сацыяльнай групоўцы, класу, нацыі, ідэйнай плыні і г. д. характарызуюць дзейнасць усяго партыйнага і дзяржаўнага апарату цэлай краіны.

Сама ідэя нацыянальнага Адраджэння зрабілася крымінальнай, тэрмінова шукаўся «нацдэмаўскі кампрамат». Улетку 1930 г. сярод беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў навукі, культуры, асветы пракацілася хваля арыштаў. Многія беларускія літаратары, дзеячы мастацтва і навукі былі абвінавачаны ў «адкрытай контррэвалюцыі», «сувязі з кулакамі», «фашызме», «шпіянажы». П. Мядзёлка, успамінаючы 1930 г., калі яна сядзела ў перапоўненых падвалах Мінскага ДПУ (яе пры-

---

[1] Звязда. 1930. 30 мая.
[2] Полымя. 1930. № 7. С. 237.
[3] Маладняк. 1930. № 6-7.

везлі сюды з Масквы, з Бутыркаў), пісала: «Цікава, ці застаўся хто ў Мінску на волі? Усе беларускія культурныя дзеячы — навукоўцы, пісьменнікі, акторы — усе за кратамі. Што гэта робіцца на белым свеце?»[1]

Дапамагчы арыштаваным Купала, на жаль, нічым не мог. Нават самой П. Мядзёлцы, якую ён некалі, у маладосці, моцна кахаў (і, напэўна, не толькі ў часы маладосці). Пра тое, што П. Мядзёлка займала не абы-якое месца ў яго жыцці і творчасці, сведчыць вядомы верш «Снілася дзяўчыне...», падараваны якраз у гэты час, калі яна знаходзілася ў высылцы:

Снілася дзяўчыне
Квяцістае поле,
А наяве выйшла —
Палыны, гуголле.
Снілася дзяўчыне
Воля і багацтва,
А наяве выйшла —
Няволя, жабрацтва.
Снілася дзяўчыне
Дома жыць да смерці,
А наяве выйшла —
Ў чужакоў памерці.

Жадаючы падтрымаць П. Мядзёлку хаця б маральна, аўтар пераслаў ёй рукапіс верша праз брата Зыгмуся, які ў 1931 г. наведаў сястру ў Казані.

У гэтай атмасферы Купала таксама адчуваў сябе зацкаваным, над ім навісла рэальная небяспека арышту. Праўда, за краты яго пакуль што не бралі, але пачалі рэгулярна мучыць допытамі ў ДПУ аб нібыта існуючай контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», лідэрам якой з'яўляецца не хто іншы, як ён — «ідэолаг буржуазнага нацыянал-адраджанізму». 20 лістапада 1930 г., каб пазбегчы здзекаў і ўніжэнняў, паэт робіць замах на ўласнае жыццё, аднак лёс і на гэты раз быў да яго літасцівы. Першы сакратар ЦК КПБ (б) К. Гей паведамляў у Маскву:

«Считаю необходимым сообщить Вам, што вчера, 20 ноября утром покушался на самоубийство Янка Купала — народный поэт Белоруссии. Покушение было не серьезным. Купала ударил себя перочинным ножом в правый бок, жизнь его вне опасности и если не будет сепсиса или других осложнений, то дней через пять он будет здоров.

[1] Полымя. 1993. № 3. С. 219.

Янка Купала входит в руководящий центр «Союза вызваления Беларуси», как о том свидетельствуют показания Лесика, Некрашевича и других. Янка Купала является идейным центром нацдемовской контрреволюции, что нашло отражение и в его творчестве. Наряду с произведениями вполне советскими у него имеются стихотворения и кулацкого, и прямо контрреволюционного содержания.

Приглашенный для переговоров в ГПУ Янка Купала упорно отрицал свою принадлежность к какой бы то ни было контрреволюционной организации и не обнаружил ни малейшего желания пойти навстречу нам в смысле хотя бы осуждения контрреволюционной деятельности своих друзей — участников и руководителей СВБ...»[1]

Пасля замаху на самагубства Купала некалькі тыдняў пад нядрэмным вокам ДПУ праляжаў у бальніцы. Улады вымусілі яго зрабіць саманагавор — з'явіўся так званы «Адкрыты ліст Я. Купалы», у якім паэт адракаўся ад нашаніўскіх традыцый, ад «адраджэнства» і «незалежніцтва», ад «нацыянал-дэмакратычнага асяродзішча». «Пакаянны» ліст пісаўся, кажуць, пад дыктоўку Л. Бэндэ.

«Прасякнуты нацыянал-дэмакратычнай заразай, — гаварылася ў ім, — прышчэпленай мне нашаніўскім перыядам маёй літаратурнай працы, калі я стаў быў адным з ідэолагаў буржуазна-дэмакратычнага «адраджэнства» і «незалежніцтва», я і пасля Кастрычніцкае рэвалюцыі не адмежаваўся, як гэта належала, ад акружаючага мяне нацыянал-дэмакратычнага асяродзішча, а быў уцягнуты ім і прыняў самы блізкі ўдзел у контррэвалюцыйнай рабоце віднейшых беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія на грунце Канстытуцыі Савецкай Беларусі, скарыстаўшыся давер'ем, якое аказана было ім з боку савецкай улады, прыкрываючыся хлусліва заслонай фальшывых крывадушных дэкларацый і запэўненнем, праводзілі свае шкодніцкія нацыянал-дэмакратычныя ідэі на культурным фронце.

Працуючы ў навукова-тэрміналагічнай камісіі, у Інбелкульце, БАН, гэтых кіруючых штабах беларускага нацыянал-дэмакратызму, бачачы сваімі вачыма іх несумяшчальныя з інтарэсамі беларускіх працоўных мас і запатрабаваннямі партыі і савецкай улады ўстаноўкі, я не толькі ні разу не асудзіў іх, але, наадварот, маральна падтрымліваў і дапамагаў іх рэалізацыі.

Але гэты этап пройдзен. Цяпер я бачу ўсю шкоднасць і гібельнасць таго шляху, на якім памыкаліся беларускія нацыянал-дэмакраты павярнуць ход гісторыі. Гіганцкімі крокамі ідзе культурнае і эканамічнае будаўніцтва Беларусі. Краіна, быўшая ўвасабленнем рабства,

---

[1] Спадчына. 1990. № 1. С. 20.

убоства і беспрасветнай цемры, ператвараецца ў краіну вольнай працы. На месцы некалі гнілых дрыгвяных балот вырастаюць фабрыкі, заводы, электрастанцыі. На месцы ўбогіх сялянскіх палосак красуюцца калгасныя нівы, навейшыя дасягненні агранаміі, тэхнікі і пладатворнай калектыўнай працы. На месцы народнай цемры вырастаюць безупынна ўсё новыя і новыя культурныя, навуковыя і навучальныя ўстановы.

Будуецца сацыялізм...»[1] I г. д., і г. д.

Пасля гэтага Купала быў ужо канчаткова зломлены.

А. Каханоўскі ў артыкуле «Праўда аб смерці Я. Купалы», аналізуючы абставіны яго смерці ў ліпені 1942 г., выказвае думку, што ў пэўным сэнсе датай духоўнай смерці паэта трэба лічыць «восень 1930»[2].

Сучасны даследчык таксама глядзіць на гэта адназначна: «Бальшавізм зламаў рэвалюцыйны, адраджэнскі дух Купалы і Коласа, ператварыўшы іх у служак таталітарызму. Ахвяры таталітарызму, трагічныя фігуры нацыянальнай літаратуры — вось хто такія Янка Купала, Якуб Колас 30-х гг. Ім нічога не заставалася, як між дэмагогаў быць дэмагогамі і чорнае выдаваць за белае, белае за чорнае»[3].

Следам за «Адкрытым лістом Я. Купалы» ў пачатку 1931 г. на паэта абрушыўся град артыкулаў (Л. Бэндэ, І. Гурскі, З. Жылуновіч, Р. Мурашка і інш.), у якіх ён абвінавачваўся ў сувязях з нацдэмаўскімі ідэямі і контррэвалюцыяй.

У адно з перавыданняў Янкі Купалы пачатку 30-х гадоў трапіў даўні яго верш «А зязюля кукавала...», напісаны ў 1921 г. Пра гэты верш будзе з пашанай гаварыць А. Твардоўскі на 2-м з'ездзе пісьменнікаў Беларусі: «Купала сапраўды з поўнай праматой мог сам пра сябе пры жыцці скласці песню, як на свет радзіўся Янка. Гэта праўда вялікага сапраўднага паэта, які сваім уласна існаваннем ужо быў чымсьці аб'ектыўным, чымсьці неад'емным ад духоўнага жыцця народа»[4]. Гэта было сказана ў 1949 г. А ў пачатку 30-х гадоў нейкі тагачасны праз меры пільны функцыянер-чыноўнік так выказаўся пра радок «Янка сеяў — людзі жалі» і яго аўтара: «Па-першае, высмейванне калгаснага будаўніцтва — адчыненае, нахабнае... Вось нейкі Янка сеяў, а прыйшлі людзі й зжалі! Хіба гэта не намёк на беднату й не абарона кулака? Падругое, у той час, як Янка сеяў, зязюлька кукавала. Якая яна, гэтая птушка?! А птушка яна такая, што не клапоціцца аб сваім дабрабыце — ня робіць сабе гнязда, а

[1] Звязда. 1930, 14 снеж.
[2] Беларус. Нью-Йорк. 1952. 13 ліп.
[3] ЛІМ. 1992. 20 сак. С. 6.
[4] Твардовский А. Т. О литературе. М., 1973. С. 259-260.

забіраецца ў чужыя... Хіба тут, у гэтай бяздомнай птушцы, не відавочны намёк на пралетарскую клясу, вясковую беднату й ліквідацыю прыватнай уласнасці на аднэй шостай зямной кулі? Не працуюць, ня дбаюць, а як Янка пасее, сажнуць! Так, Янка Купала — народны паэт, адзначаны ордэнам, пакінем яго ўбаку, хай жыве сабе на здароўе, пакуль што...»[1]

Бальшавікі, можна сказаць, дамагліся свайго. У 1931 г. Купала піша шэраг амаль безжыццёвых рытарычных вершаў, у якіх услаўляе сацыялістычную яву як нешта незвычайнае ў свеце, што чакае прыходу новых, па-асобаму таленавітых летапісцаў. На сябе і сваіх сучаснікаў паэт як бы ўжо і не спадзяваецца.

Прыйдзе новы — а мудры — гісторык,
А ён прыйдзе — ужо ён ідзе —
І сказ дзіўны, праўдзівы ад зорак
І да зорак аб нашых прасторах,
Аб падзеях, людзях павядзе.

*(«Песня будаўніцтву»)*

Новыя летапісцы прыходзілі, але іх тут жа «падмяталі» — накіроўвалі ў ГУЛАГ. Цэлы шэраг пісьменнікаў (Лукаш Калюга, Максім Лужанін, Сяргей Астрэйка, Уладзімір Сядура, Масей Сяднёў і многія іншыя) былі пасаджаны па справе так званага Саюза вызвалення Беларусі (які на самай справе, як з цягам часу стала вядома, увогуле не існаваў). Пра гэта расказвае М. Сяднёў (сам пацярпеўшы) на адной з публіцыстычна-дакументальных старонак свайго аўтабіяграфічнага рамана «Раман Корзюк»: «Беларускае НКВД перастаралася: у пагоні паказацца перад Масквой передавым НКВД у змаганні з нацыяналістамі яно агаліла Беларусь, пасадзіўшы за краты большую палавіну сваіх нацыянальных кадраў, найперш пісьменнікаў, паэтаў, крытыкаў, гісторыкаў, выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, навуковых працаўнікоў, што займаліся беларусазнаўствам, работнікаў наркамасветы, артыстаў, працаўнікоў кіно і г. д. Беларусь была падмецена жорсткай мяцёлкай, ачышчана ад уяўных нацыяналістаў. Не пашкадаваная была і маладая змена — тут беларускае НКВД бачыла ці не самую галоўную небяспеку, і ў выніку пацярпела вялікая часціна студэнцтва. Дастаткова было пачуваць сябе беларусам, як табе прышчаплялася кляймо нацыяналіста»[2].

Зрэшты, той, хто заставаўся на волі, мог разважаць так: а можа яны і сапраўды вінаватыя — мяне вось не ўзялі... Купала гэтак не мог

---

[1] Юрэвіч Л. Палімпсэст, або Уратуе нітка, што ня будзе рвацца // Цэлеш М. Хмары над Бацькаўшчынай. Нью-Йорк, 1995. С. 21.
[2] Сяднёў М. Раман Корзюк. Мн, 1993. С.111.

развaжaць — ён пастаянна адчуваў на сабе апалу і недавер. У 1932 г., напрыклад, калі ў Беларусі адзначалася 50-годдзе з дня яго нараджэння, юбілейныя мерапрыемствы праводзіліся ажно ў верасні замест ліпеня — месяца паэтавага з'яўлення на свет. Відаць, што перад тым, як рашыцца на купалаўскі юбілей, улады, нават пасля пакаяннага ліста Купалы, шмат ваганіся, узгаднялі справу з Масквой (куды ў свой час дакладвалі аб замаху паэта на самазабойства). Зрэшты, ваганні былі дарэмныя. Знікла, звялася тая сіла, пра якую паэт пісаў у 1926 г.: «Ёсць жа яшчэ ў мяне сіла / Крыўдзе не даца, змагацца...» Творы, напісаныя ў 1932 г., сведчылі пра «благанадзейнасць» аўтара. Скажам, у вершы «Настане такая часіна» гаворка ідзе пра немінучасць сусветнай рэвалюцыі:

Я веру — настане
такая часіна,
І руняй савецкай
  уквецяцца гоні,
Дзе Віслы, дзе Сены,
  дзе Тэмзы даліны,
  Дзе праца людская
  сягоння ў прыгоне.

Гэта быў ужо не той Купала, якім яго ведалі раней. Уласцівы яго рамантызму прынцып «двух светаў» звузіўся да стварэння ідэйна і эстэтычна плоскаснай і аднамернай рэчаіснасці.

У 1932 г. выйшла пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Водгук Купалы вытрыманы ў духу партыйных патрабаванняў: «Вялікае давер'е, аказанае партыяй савецкім пісьменнікам, якія стаялі па-за пралетарскімі арганізацыямі, сам сабой абавязвае іх апраўдаць гэта давер'е і тварыць рэчы, годныя нашай вялікай эпохі»[1].

Адзначаная пастанова паклала пачатак падрыхтоўчай работы па ўтварэнню адзінага Саюза пісьменнікаў СССР з нацыянальнымі «філіяламі» ў кожнай рэспубліцы. У Беларусі ў гэты час па ўказцы ЦК КП(б)Б усімі літаратурна-творчымі справамі запраўляла БелАПП, якая далася ў знакі ўсім тым пісьменнікам, якія, як і Янка Купала, не з'яўляліся яе членамі. Яго, разам з Якубам Коласам, нават не ўключылі ў так званы аргкамітэт ССП БССР. Прыйшлося ўмешвацца Маскве, папраўляць занадта службістах чыноўнікаў з БелАПП. Каб паправіць справу, у Мінск прыехаў сакратар аргкамітэта ССП СССР В. Я. Кірпоцін. Пасля разгляду пытання ў ЦК КП(б)Б, гутарак і тлумачэнняў

---

[1] ЛіМ. 1932. 15 мая.

Купала і Колас былі ўключаны ў аргкамітэт, бо без іх аргкамітэт нагадваў «пашыранае праўленне былой БелАПП»[1], і ўжо ў канцы лютага — пачатку сакавіка 1933 г. Купала ўдзельнічае ў рабоце першага пленума аргкамітэта ССП БССР. На вячэрнім пасяджэнні 26 лютага ён нават выступае з прамовай, у якой вядзе гаворку пра дасягненні сацыялістычнага будаўніцтва, адзначае рост савецкай літаратуры і велізарнае значэнне гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый».

Янка Купала, як і іншыя пісьменнікі, якія пакуль што за краты не трапілі, выступаюць на літаратурных вечарах, сустракаюцца з чытачамі. Магло здацца нават, што таталітарызм змяніў сваё аблічча на больш чалавечае. Так, лозунг «тэхніка вырашае ўсё» быў заменены на новы: «кадры вырашаюць усё». Са старонак газет і часопісаў усміхаліся твары герояў працы — шахцёр Стаханаў, ткачыхі сёстры Вінаградавы, машыніст Крыванос. Бурныя тэмпы (асабліва калі меркаваць па газетных справаздачах) набыла ліквідацыя непісьменнасці. Ішоў так званы працэс пераробкі, «перакоўкі» чалавека — ператварэння яго, інакш кажучы, у паслухмянага раба сістэмы, люмпэнэнтузіяста. Перавыхаванне адбывалася праз працу на фабрыках, будоўлях, у лагерах і калоніях для беспрытульных, дзе задарма ствараліся значныя матэрыяльныя каштоўнасці. Нечуваныя маштабы набывала сістэма ГУЛАГу. Будаўніцтва сацыялізму вялося, па сутнасці, на чалавечых касцях. Чалавек аказаўся ператвораным у люмпенпралетарыя, цацку нейкіх безаблічных аўтарытарных сіл. Пачаўся працэс усеагульнай дэіндывідуалізацыі. Так званая «сацыялістычная ідэалогія» рабіла ўсё, каб асоба растварылася ў калектыве і заставалася пасіўна-пакорлівай, не здольнай на асабістую ініцыятыву.

Вядома, тое, што выразна бачыцца і ацэньваецца на адлегласці, з нашага «сёння», заднім розумам, — у той час, тварам у твар, упрытык з падзеямі, цяжка было разгледзець і правільна ацаніць. Пісьменнікам і журналістам кружылі галаву незвычайнымі планамі, вялікімі новабудоўлямі: Днэпрагэсам, Магніткай, СТЗ, Беламорканалам... Яшчэ ў кастрычніку 1932 г. разам з М. Лыньковым, А Александровічам і інш. Купала ездзіў на ўрачыстасці, прысвечаныя ўводу ў строй Днепрагэса, наведаў шэраг прадпрыемстваў на Украіне, гутарыў з людзьмі. Дарэчы, на ўрачыстым пленуме Украінскага аргкамітэта ССП, наладжаным у Харкаве ў гонар беларускіх гасцей, паэт пра-

[1] Кирпотин В. Начало. Автобиографические страницы. М., 1986. С. 144.

чытаў свае вершы. Пленум пастанавіў выдаць зборнік твораў Янкі Купалы на ўкраінскай мове[1].

У жніўні 1933 г. давялося прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцці Беламорска-Балтыйскага канала. Адзін з удзельнікаў гэтай акцыі пісьменнік А. Аўдзеенка ўспамінае: «Па ўказанню Сталіна чэкісты арганізавалі для пісьменнікаў паездку. Далі нам спецыяльны поезд, які складаўся з мяккіх вагонаў, у кожным купэ — скрынка з віном, сухой каўбасой, ікрой, шакаладам. Тры месцы займалі пісьменнікі, чацвёртае — гэта скрынка. Аргкамітэт (тады яшчэ Саюза пісьменнікаў не было) сабраў брыгаду ў складзе 120 чалавек. Галоўным чынам з тых, хто аказаўся пад рукой, — Куліка, Янкі Купалы, Усевалада Іванава, Безыменскага, Кукрыніксаў, Веры Інбер, Бруна Ясенскага, Валянціна Катаева»[2].

Уражанні ад паездкі Купала выказаў у артыкуле «Цуда, створанае бальшавікамі»[3]. Ва ўсіх гэтых дасягненнях сацыялізму пісьменнікі павінны былі бачыць, на думку ўлад, рэалізацыю сацыяльнай праграмы аб вызваленні працоўнага чалавека.

---

[1] Савецкая Беларусь. 1932. 19 кастр.
[2] Литературная газета. 1988. 2 нояб.
[3] ЛіМ. 1933. 18 вер.

## «НАД РАКОЙ АРЭСАЙ » І ІНШЫЯ ТВОРЫ

У літаратурна-мастацкім працэсе ўсё больш вызначаюцца тыя партыйна-ідэалагічныя патрабаванні, якія пазней сталі вядомы як творчыя прынцыпы сацыялістычнага рэалізму. Пісьменнікі абавязаны былі выконваць «сацыяльны заказ партыі» — пісаць пра тое, пра што загадаюць. Адна з самых распаўсюджаных і ўхваленых зверху формаў паэтычнага асваення рэчаіснасці 30-х гадоў — непасрэдны водгук на падзеі, адлюстраванне жывой канкрэтыкі сацыяльна-грамадскіх працэсаў. Звычайна гэта былі творы ілюстрацыйнага плана, адзначаныя публіцыстычнасцю і дакументалізмам. Яны ствараліся ў форме лірычнага дзённіка ці рэпартажу, вытворнага нарыса або замалёўкі працоўных будняў. Сярод такіх твораў была паэма Купалы «Над ракой Арэсай», надрукаваная ў газеце «Звязда» 29-30 чэрвеня 1933 г. «Над ракой Арэсай» — своеасаблівы лірычны рэпартаж У гэтай рэчы Купалы, вядома, таксама сцвярджаюць сябе шмат у чым утапічна-ілюзорныя погляды на навакольную рэчаіснасць, аднак нельга адмовіць таго, што паэма вырасла з рэальных фактаў стварэння сельскагаспадарчай камуны ў адным з глухіх куткоў Беларускага Палесся. У гэтай камуне, якая к таму часу называлася калгасам імя БВА, арганізаваным на асушаным Мар'іным балоце ў Любанскім раёне, Купала правёў май— чэрвень 1933 г. Матэрыялы з жыцця камунараў і рабочых леглі ў аснову паэмы «Над ракой Арэсай», якая ўяўляе сабой амаль дакументальнае апісанне іх працоўных будняў.

Аўтар імкнуўся выканаць «сацыяльны заказ» — паказаць нараджэнне ў чалавеку новых пачуццяў і сувязей паміж людзьмі, што аб'ядналіся ў працоўны калектыў, іх незвычайны энтузіязм. Але крытыцы, якая ажыццяўляла партыйную лінію ў літаратуры, і гэтага было мала. «Асноўным палітычным недахопам паэмы «Над ракой Арэсай», — пісаў А Кучар, — з'яўляецца тое, што рост камуны і саўгаса не паказаны ў ёй у сувязі са змаганнем супраць капіталістычных элементаў вёскі»[1]. Ад заўвагі крытыка вее тым часам, бюракратычным бяздушшам і дэмагогіяй. З сённяшняга пункту погляду купалаўская паэма цікавая тым, што яна дае падставы ўсумніцца ў гуманістычным змесце тых ашаламляльных змен, якія адбываліся на Мар'іным балоце. Хаця Купала і не ставіў па мэце такога глыбіннага паказу абсурднасці сацыялістычнага будаўніцтва, як, скажам, А. Платонаў у аповесці «Катлаван», ён па-свойму адлюстраваў працэс паглынання чалавека дзяржавай, ператварэння народа ў статак пакорлівых і

[1] ЛІМ. 1933.18 вер.

маўклівых рабоў, люмпенаў, пазбаўленых унутранай, духоўнай арыентацыі. Нездарма, калі пачалася Айчынная вайна (якая для беларусаў абярнулася яшчэ і вайной грамадзянскай), героі паэмы — камунары-арэсаўцы апынуліся ў розных станах. Люмпенская свядомасць праявіла сябе з дастатковай відавочнасцю...

У адным радзе з паэмай «Над ракой Арэсай» знаходзіцца паэма «Барысаў» (1934), таксама прысвечаная ўслаўленню так званых працоўных поспехаў рабочых і калгаснікаў — на гэты раз Барысаўшчыны. Барысаўшчане праявілі ініцыятыву паставіць помнік Леніну (няцяжка здагадацца, ад каго такія ініцыятывы зыходзілі). Адкрыццё помніка — кульмінацыя гэтага паэтычнага твора. Скульптурны вобраз Леніна закліканы сімвалізаваць сацыялістычныя дасягненні барысаўчан, адзінства народа і правадыра, народа і партыі. У ідэйна-мастацкіх адносінах паэма «Барысаў», якую Купала напісаў па тагачаснаму сацыяльнаму заказу (ці загаду), падобна на дзесяткі і сотні такіх жа абстрактна-схематычных, пазбаўленых праўды твораў, якія былі выкліканы да жыцця той гістарычнай эпохай.

У чэрвені 1934 г. Янка Купала прымае ўдзел у рабоце Першага ўсебеларускага з'езда пісьменнікаў, а ў жніўні-верасні ўдзельнічае ў рабоце Першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў, абраны — на зайздрасць белаппаўцам — нават у прэзідыум з'езда. Сустракаецца з М. Горкім, А. Фадзеевым, А. Талстым, С. Стальскім і інш. На заключным пасяджэнні з'езда Купала быў абраны членам Праўлення ССП СССР.

Пасля стварэння адзінага Саюза савецкіх пісьменнікаў спектр творчай свабоды мастака яшчэ болей звузіўся. Жорсткія рамкі сацыялістычнага рэалізму строга рэгламентавалі літаратурны працэс і мастацкія пошукі пісьменніка. Купалу практычна ўжо не хапала сіл, каб выбавіцца з уласцівай 30-м гадам сістэмы ідэалагічных каардынатаў. Тым не менш ён заставаўся выдатным нацыянальным паэтам. Сведчанне таму — лепшыя вершы, якім нельга адмовіць у высакароднасці і патрыятызме, прыярытэце агульначалавечага над вузкакласавым. Праўда, такіх твораў не шмат, але яны ёсць. Прыгадваюцца, напрыклад, паэма «Тарасова доля», верш «Генацвале» і некаторыя іншыя. Гэтымі творамі паэт, здавалася б, аддаваў даніну часу — тэма дружбы народаў была ў 30-я гады афіцыйнай, санкцыяніраванай зверху. Аднак Купала здолеў пераадолець яе казённы статус, асэнсаваць вельмі асабіста, узняць на вышыню сэрца.

У сакавіку 1939 г. адзначаўся 125-гадовы юбілей Тараса Шаўчэнкі. У Мінску выйшаў з друку «Кабзар» на беларускай мове пад рэдакцыяй Янкі Купалы і Якуба Коласа. Купала завяршыў паэму «Тарасова

доля», сюжэтную аснову якой склаў жыццёвы шлях украінскага Кабзара. Гэта фактычна роздум над гістарычнымі пуцявінамі двух братніх народаў — беларусаў і ўкраінцаў, спроба адказаць на пытанне —

Чаму ў сэрцы беларускім
    Песня Тарасова
    Адгукнулася, запела
    Зразумелым словам?
Бо йшла доля беларуса
З доляй украінца
Аднолькова — ў поце, ў слёзах,
Церневым гасцінцам.

Так, сапраўды Тарас Шаўчэнка заўсёды быў блізкі беларускаму песняру — любоўю да народа, вольналюбівым пафасам сваёй творчасці, трагічнасцю лёсу, а таксама мастацкімі асаблівасцямі паэтычнай мовы. Напісаная каламыйкавым вершам паэма хвалюе глыбокім пранікненнем аўтара ў духоўна-паэтычны свет братняга народа, услаўляе яго імкненне да лепшай долі-жыцця.

Калі ў «Тарасовай долі» Купала звяртаецца да ўкраінскай тэмы, то ў вершы «Генацвале» дакранаецца да тэмы Грузіі, якую ён у другой палове 30-х гадоў наведаў некалькі разоў — адпачываў, лячыўся, быў удзельнікам руставелеўскага пленума ССП СССР у Тбілісі. «Генацвале» прысвечана Эліко Мікалаеўне Метэхелі — урачу, якая лячыла паэта ў санаторыі Цхалтуба. Гэта незвычайны верш — і па зместу свайму, і па гучанню, аркестроўцы:

Было люба мне ў Цхалтуба,
Ў жыватворнай цёплай цхалі,
Было люба, як галубіў
Цябе ў думках, Генацвале.

«Генацвале» — адзін з лірычных шэдэўраў Купалы, прасякнуты незвычайнай задушэўнасцю, напоены цяплом і сонцам, пачуццём чалавечай высакароднасці. У ім, як і ў «Тарасовай долі», вельмі натуральна, нязмушана, адлюстраваліся ў ідэальна-пераўтвораным выглядзе жыццёвы і мастацкі вопыт паэта, яго душэўны свет, талент і светапогляд. Асабістае — дружба, каханне, прыгажосць, паэзія у сваёй чалавечай значнасці ўзнімаюцца да вышыні грамадскай каштоўнасці.

Што датычыць такіх валявых момантаў народнага жыцця, якіх на той час было шмат, то Купала, па вядомых прычынах, не мог іх закрануць. Паэт з'яўляўся сведкам усяго гэтага, але вымушаны быў маўчаць, не заўважаць, што ён жыве ў краіне абсурду. Апрача таго, улады, трэба адзначыць, у многім здолелі навесіць перад яго вачыма

такую «памроку», якая засціла ад яго рэальную праўду жыцця. Патрабаваўся одапіс, ідэалізацыя. У 30-я гадыі асабліва ў другой палавіне, ідэалізацыя займає месца асноўнага мастацкага прынцыпу ў яго творчасці, паэт усё больш гучна ўслаўляе новы лад.

Узор такой ідэалізацыі як мастацкага прынцыпу — верш «Я — калгасніца...» (1934):

Я — калгасніца
Маладая.
Жыву весела,
Ані дбаю.

У гэтым і некаторых іншых вершах Купала стаў выразнікам той формулы дзяржаўнага мыслення («жыць стала лепей, жыць стала весялей»), якую сцвярджала афіцыйная ідэалогія, усяляк аддаляючы літаратуру ад праўды жыцця. Сувязь з фальклорам у даным выпадку не толькі не паляпшае справы, а нават пагаршае яе. У вершы «Я — калгасніца...» добра відаць як здрабніўся, збяднеў у сваім маральным і духоўным змесце вобраз купалаўскай жняі, вядомай нам па яго дарэвалюцыйнай лірыцы.

## ЛЯЎКОЎСКІЯ ВЕРШЫ

Некаторыя крытыкі (маскоўскія, бо беларускія не рашаліся пісаць пра Купалу ў станоўчым плане), параўноўваючы дакастрычніцкую творчасць паэта з вершамі савецкага перыяду, адзначалі дабратворныя светапоглядныя змены. «Вот поставим рядом, — адзначаў у сярэдзіне 30-х гадоў А. Гурштэйн, — два стихотворения Купалы об осени: одно — дореволюционное, другое, написанное уже в наши дни. Первое называется «Плачет осень...»:

Плачет осень за окном,
Слезы лязгают о стекла...
Обняла тревожным сном
Всё, что сгнило и размокло.

*(Перевод Э. Багрицкого)*

Об осеннем обилии говорит новое стихотворение Купалы «Новая осень»:

На юг собираются гуси,
Журавль подымается в небо...
Плывут по шляхам Беларуси
Обозы колхозного хлеба,
Осенний закат, догорая,
Плывет по дубравам безгласным...
Торжественный пир урожая
Мы чествуем знаменем красным.

*(Перевод О. Колычева)*[1]

Сёння такое параўнанне можа выклікаць толькі ўсмешку — яго немагчыма прызнаць карэктным, бо яно зроблена з відавочным перакосам у наіўны і адначасова грубы сацыялагізм.

Творчасць 30-х гадоў патрабуе ўважлівага, нетэндэнцыйнага прачытання.

Да нядаўняга часу вяршыняй лірыкі Купалы 30-х гадоў лічыўся вядомы «ляскоўскі цыкл», напісаны ў вёсцы Ляўкі Аршанскага раёна, дзе паэт любіў праводзіць свой летні адпачынак. Гэта вершы «Здаецца ж, было гэта ўчора...», «Сонцу», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Лён», «Вечарынка», «Сыны», «Старыя акопы», «Партызаны», «Госці», «Дарогі», «Сосны» і інш., створаныя ў чэрвені — жніўні 1935 г. У беларускай паэзіі 30-х гадоў яны для многіх прагучалі вельмі нечакана. Прыхільнікі артадаксальнага напрамку развіцця савецкай літаратуры (г. зн. сацыялістычнага рэалізму) гатовы былі крытыкаваць Купалу за

[1] Гурштейн А. Избранные статьи. М., 1959С. 11.

адыход ад магістральных тэм будаўніцтва сацыялізму, класавай барацьбы, выкрыцця так званых ворагаў народа ў сферу штодзённага існавання чалавека, яго побыту, нават «інтыму».

Ляўкоўскія вершы звернуты пераважна да ідэальнага боку жыцця. Аўтар, мяркуючы па ўсім, свядома ішоў на гэта, мудра адчуваючы прызванне мастака бараніць жыццё, развіваць стваральны пачатак, уносіць у навакольную рэчаіснасць гармонію і згоду. Савецкая дзяржава разглядала чалавека ўсяго толькі як суб'ект класавай барацьбы, як будаўнічы матэрыял для светлай будучыні, а ў «ляўкоўскім цыкле» ён раптам трапіў у цэнтр паэтычнай канцэпцыі жыцця.

Творы, што ўваходзяць у «ляўкоўскі цыкл», далёка не раўнацэнныя. Скажам, верш «Алеся» хвалюе да гэтага часу. У ім Купала расказвае пра новую долю моладзі. Звычайна, нагадвае ён, лёс беларускай дзяўчыны складваўся так

Будзеш кужаль ты прасці,
Будзеш ткаці кросны,
Выглядаці долі, шчасця
Ў маладыя вёсны.

У «Алесі», таксама як у вершы «А зязюлька кукавала...» (1921), уводзіцца матыў кукавання зязюлі, але на гэты раз старажытная вяшчуння прадказвае гераічны шчаслівы лёс. Новае пакаленне — пакаленне такіх, як Алеся, — у параўнанні з бацькамі — іншыя, на думку паэта, людзі. Яму і сапраўды часам здавалася, што споўнілася, нарэшце, яго даўняя мара (успомнім хаця б зборнік «Гусляр» з уласцівым для яго касмічным адчуваннем чалавечых магчымасцей) пра абнаўленне і разняволенне чалавека:

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.
Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчаслівай краінай,
Над роднай старонкай.

Як паэт Купала валодаў дарам узняць простую з'яву да завоблачных вышынь, і ў вершы «Алеся» гэта ўменне праявіла сябе ў поўнай меры. Купалаўская «Алеся» — гэта ўслаўленне неадольнай сілы жыцця, перамога агульначалавечага ў свядомасці паэта і ў яго творчасці.

Да «Алесі» тэматычна прымыкае верш «Хлопчык і лётчык», герой якога таксама захоплены марай адкрыць для сябе шырокі свет з усімі яго таямніцамі. Гэта жаданне блізкае і зразумелае паэту, якому пада-

баецца цікаўнасць хлопчыка, яго прага ведаў, здольнасць да духоўнага росту.

Купалу — аўтару «ляўкоўскага цыкла» вершаў — нельга адмовіць у высакароднасці і патрыятызме, што выявілася ў славутым вершы «Лён», які ўвасобіў у сабе істотныя рысы беларускага народнага характару — прыгажосць душы, працавітасць, добразычлівасць, адданасць у каханні. Можна, вядома, папракнуць аўтара ў недахопе праўды жыцця, і гэты папрок будзе ў многім справядлівы, аднак варта ўлічваць і традыцыйную своеасаблівасць паэтыкі гэтага мастака, уласцівую яго стылю сказавасць, схільнасць да рамантычна-ідэалізаванага бачання свету.

У гэтым жа плане, думаецца, цікавы верш «Госці»:

І селі мы з павагай дзіўнай нейкай
За стол, дзе быў пірог, і лён, і мёд...
За хатай заліваўся салавейка,
Гудзеў над хатай гулкі самалёт.
Такога гонару не меў ніколі,
Як я на гэтае зямлі жыву,
Каб так віталі мяне хлебам-соляй
І то не ў сне якім, а наяву.

Нехта сказаў, што калгаснікі віталі паэта па ўказанню з Мінска. Так гэта ці не так — гадаць не будзем. Іншая справа, што, як сведчаць «Госці» і некаторыя іншыя творы, у паэзіі Купалы гэтай пары, на жаль, глыбока ўкараніліся прыблізнасць і стэрэатыпнасць у падыходзе да жыццёвай явы, якія не маглі знайсці шчырага водгуку і суперажывання ні ў сучаснікаў, ні ў людзей наступных пакаленняў.

Зразумела, многае ў «ляўкоўскім цыкле» патрабуе крытыкі і перагляду, аднак «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Лён» і нават «Госці» сведчаць, што нацыянальны характар паэзіі Купалы, яго герояў аказаўся шырэй прымітыўна зразуметай сацыяльнай псіхалогіі, адлюстравання якой патрабавалі ідэйныя натхніцелі савецкай літаратуры.

Больш строгай ацэнкі патрабуюць вершы «Сонцу», «Здаецца ж, было гэта ўчора...», «Беларусі ардэнаноснай», «Як я молада была...», «Дзве дзяўчыны» і інш., у якіх аўтар напрамую, так сказаць, услаўляе пабудаваны бальшавікамі новы, сацыялістычны лад жыцця.

## ПАЭТ І ТАТАЛІТАРЫЗМ

Бальшавікі, як вядома, сацыялізму не пабудавалі, аднак тое, што ў выніку атрымалася, прымусілі называць і лічыць сацыялізмам. Між тым гэта была ўсяго толькі сістэма фікцый: «новы чалавек», «вольная праца», «права на працу і адпачынак», «маладым — дарога, старым — гонар» і г. д., якая ні ў якой ступені не адпавядала рэальнаму становішчу рэчаў. Названыя вышэй вершы — мастацкая ілюстрацыя да гэтых фікцый. Купала быццам бы не заўважаў ці не хацеў бачыць, што мэтай грамадскага развіцця стаў не чалавек, а камунізм, жорсткая сістэма, якая не лічылася з чалавечай асобай. І гэта не проста творчая няўдача паэта. Калі будзем разважаць на такім узроўні, дык нічога не зразумеем у яго жыцці і творчасці. Гэта трагедыя нацыянальнага прарока і паэта, які, па сутнасці, страціў усю некалі так уласцівую яму нацыянальную пасіянарнасць. Каб «прыцярпецца» да дзяржавы, паэзія Купалы павінна была адрачыся ад сваёй гуманістычнай прыроды. Ад былога Купалы застаўся адзін цень, і ўсё ж нават такі паэт не задавальняў афіцыйныя ўлады. Не падабалася тое, што ў ім не выветрылася да канца нацыянальная своеасаблівасць, самабытны тып мыслення, уласцівыя беларускаму народу. Таталітарная сістэма рабіла ўсё, каб Купала з паэта нацыянальнага ператварыўся ў паэта савецкага. Шмат што, як бачым, ім удалося. Пра гэта сведчаць зборнікі «Песня будаўніцтву» (1936), «Беларусі ардэнаноснай» (1937), «Ад сэрца» (1940), якія можна разглядаць як праяўленне характэрнай для савецкай літаратуры 30-х гадоў татальнай эстэтызацыі рэчаіснасці:

Не злічыць тваіх здабыткаў  
І не змерыць меркай...  
Чалавек твой на свабодзе  
Стаўся чалавекам.  
Каласіся ж, расцвітайся  
Краскаю чырвонай  
У Саюзе у Савецкім,  
У законе роўным.

*(«Беларусі ардэнаноснай»)*

Можна падумаць, што паэт не заўважаў таго, што многія людзі мелі падставу адчуваць сябе пакрыўджанымі і абяздоленымі. Заўважаў, але нічога не мог зрабіць. Купала, як і ўсе (ці пераважная большасць), трапіў у сталінскі палон і застаўся бездапаможным вязнем вялікага — на ўсю краіну! — ГУЛАГу.

Страшны 1937 г. ён як паэт сустрэў са зламаным хрыбтом, аціхлым і ўпаўне «вернападданым», аднак калі ўзнялася новая хваля арыштаў, навісла пагроза і над Купалам. Кажуць нават, што быў ужо выпісаны ордэр і што ад турмы яго (як і Коласа) нібыта выратаваў сам... Сталін. Большасць савецкіх літаратараў (за выключэннем хіба А. Платонава) услаўлялі «правадыра ўсіх народаў», шчасце жыць пад сталінскім небам. У 1937 г. прысвечаную Сталіну оду напісаў нават Мандэльштам. Верш так і называўся — «Ода»:

Да закалит меня той стали сталевар,
В которой честь, и жизнь, и воздух человечества.

Так пісаў пра Сталіна ў гэтай сваёй «Одзе» (1937) В. Мандэльштам.

Пісаў і Купала. Тым больш, што ён, трэба думаць, ведаў, як Сталін убярог яго ад арышту...

Пад якім прэсам Купала жыў у 20-я і 30-я гады і як пільна была асочана сама ідэя нацыянальнага Адраджэння, гаворыць дакладная запіска наркама ўнутраных спраў БССР Наседкіна ад 23 кастрычніка 1938 г. першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панамарэнка Гэты дакумент сведчыць пра не абы-якія памеры дасье на Купалу, якое кацілася на паэта ў адпаведных органах.

Размова ў дакладной ішла пра яшчэ не арыштаваных к таму часу беларускіх пісьменнікаў (іх не так многа і было). Купала ішоў першым (гэта працяглы кавалак тэксту, але мы, хаця б часткова, працытуем яго):

«Один из «лидеров» нацдемовского движения в Белоруссии. Его нацдемовская деятельность начинается еще с 1908 года, со времени его работы в г. Вильно (Польша), где он являлся редактором белорусской буржуазно-националистической газеты «Наша нива», которая была зародышем впоследствии развивающегося в Белоруссии так наз. нацдемовского движения.

После Октябрьской социалистической революции Янка Купала является одним из организаторов антисоветского нацдемовского движения в Белоруссии и вместе с Червяковым, Игнатовским (покончил самоубийством), Балицким, Жилуновичем, Чаротам (расстрелянный) сколачивает здесь значительные нацдемовские кадры.

В 1919-1920 гг. во время белопольской оккупации Белоруссии был тесно связан с белопольскими оккупантами и находился в близких взаимоотношениях с эмиссаром Пилсудского в Белоруссии, капитаном польразведки Воеводским, который создал здесь ряд антисоветских организаций: «Белорусский национальный комитет», «Войсковую комиссию», в которых Купала принимал деятельное участие.

Во время белопольской оккупации в Белоруссии Купала редактировал белогвардейскую газету «Звон» и во время приезда в 1920 г. Пилсудского в г. Минск в этой газете написал приветственную статью Пилсудскому под названием «Повстань», в которой изобразил Пилсудского как «освободителя» Белоруссии от большевиков и призывал его помочь белорусам в борьбе с Советской властью.

После изгнания белополяков из Белоруссии в 1920 г. Купала совместно с другими руководителями нацдемовского движения — Игнатовским, Балицким, Червяковым, Адамовичем — является организатором нелегальной антисоветской работы нацдемов в БССР.

Купала является одним из инициаторов насаждения кулацких хуторов в Белоруссии и проводит активную работу по отрыву белорусской культуры от русской и ориентации ее на Польшу.

На квартире Купалы на протяжении 1921-1930 гг. систематически происходили нелегальные сборища нацдемовской организации, где обсуждались методы работы нацдемов Белоруссии.

Янка Купала является организатором ряда нацдемовских организаций: «Узвышша», «Полымя», «Молодняк», которыми было охвачено большое число белорусской молодежи, обрабатываемой в этих организациях в антисоветском нацдемовском духе. Большинство участников этих литературных организаций являлись впоследствии участниками нацфашистского подполья и проводили в Белоруссии активную вредительскую и шпионскую работу. Значительное число их было репрессировано в последние годы, часть их осталась на свободе и продолжает вести антисоветскую работу в настоящее время.

Купала на протяжении ряда лет поддерживает организационные связи с нацдемовской белоэмиграцией в Польше, Германии и Чехословакии.

В 1927 г. Купала по заданию организации совершил заграничную поездку в Польшу, Чехословакию и Германию для установления связи с белорусской эмиграцией.

Во время этой поездки Купала имел встречи с руководителями зарубежного центра белорусских эсеров так наз. «Белорусской громады» — Луцкевичем в Польше (Вильно), Езовитовым и Пигулевским в Латвии (г. Рига) и Грибом в Чехословакии (в г. Праге).

Купала поддерживал связь с ними и в последующие годы, примерно до 1932-1933 гг.

Показаниями ряда арестованных в 1937-1938 гг. установлено, что Купала был связан по антисоветской работе с членами Московского антисоветского троцкистско-зиновьевского центра Гесеном Сергеем и

активными троцкистами-зиноновьевцами Рывлиным, Юговым, Дунцом, Бронштейном и др.

В 1930 г. в связи с происходившими в Белоруссии арестами нацдемов вызывался в ГПУ, после чего пытался покончить самоубийством и нанес себе ножевыё ранения в живот.

В процессе разгрома антисоветского подполья в Белоруссии в 1937-1938 гг. было разоблачено большое количество участников антисоветских организаций и основные связи Купалы были репрессированы.

Купала изобличается показаниями 41 разоблаченного нами участника антисоветского подполья в Белоруссии как активный нацфашист и польский шпион.

В результате произведенного разгрома антисоветского подполья в Белоруссии Купала и другие видные белорусские писатели, оставшиеся на свободе, внешне якобы изменили свое лицо и направление своей литературной деятельности приспособили к духу современности, но поступавшие к нам за последнее время агентурные материалы свидетельствуют о том, что они не только не прекратили своей антисоветской деятельности, но еще глубже ушли в подполье и вокруг них группируются все оставшиеся на свободе нацдемовские кадры[1].

Лёс паэта быў зменлівы да незвычайнасці — бізун і пернік. У студзені 1939 г. Купалу ўзнагароджваюць ордэнам Леніна:

Вочы мне з часам самкнуцца,
Жвір мяне ўхутае цвёрды,
Жыць між людзей застануцца
Песня і Леніна ордэн.

*(«Сэрца і думка мне кажа...»)*

У 1941 г. паэт стаў лаўрэатам Сталінскай прэміі за зборнік «Ад сэрца», у які ўвайшла і сталінская нізка.

«Пісалася ўсё гэта, — так лічыць У. Калеснік, і з ім нельга не згадзіцца, — як спазмы віны і спроба адкуплена, як магічныя заклікання ўласнай душы ад тугі і пакуты смяротнай. Купала ніколі ўжо не вырваўся з кіпцюроў дэпрэсіі, можа, часам паддаваўся ілюзіі, што яго місія народнага паэта, ахоўніка і творцы скарбаў беларускай культуры ўсё ж патрэбная. Магло яму здавацца, што няма ў народзе сілы, якая здольна спыніць эксперыменты па інтэрнацыяналізацыі і дэнацыяналізацыі, што тварыліся зверху. Ён мог хоць часткова стрымліваць

[1] НАРБ, ф. 4, с. 1394, л. 102-106.

закусы інжынераў уніфікацыі свету самім фактам прысутнасці ў літаратурна-творчым жыцці Беларусі»[1].

Ад Купалы патрабавалі ўсё новых і новых сведчанняў аб «благанадзейнасці», самакрытыкі, паэт павінен быў пастаянна каяцца ў неіснуючых грахах мінулага. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся юбілеі, да якіх, трэба сказаць, у 30-я гады быў асаблівы смак. І напрыклад, у юбілей першага свайго зборніка «Жалейка» Купала пісаў: «Ад першай маёй кніжкі, ад першай «Жалейкі» да сённяшніх дзён прайшло нямала — 30 год. Доўгай гэтай дарогай ішоў я па-рознаму. Бывала, і спатыкаўся, і дарогу губляў, і ў цянёты трапляў балотныя... Але правадыром прыходзіў народ, які не забываў, не пакідаў мяне і выводзіў на правільную сцежку»[2].

17 верасня 1939 г. пасля папярэдняй сакрэтнай дамоўленасці Сталіна і Гітлера аб падзеле тэрыторыі Польшчы паміж Германіяй і СССР пачаўся паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

Купала падтрымліваў нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Ён асуджаў шавінізм грамадскапалітычнага ладу, які ўстанаўліваўся ў тагачаснай Польшчы і які змагаўся з беларускім нацыянальным адраджэннем:

Нядоўга, паны, ужо вам панаваці
Над краем, праз вас катаваным, —

пісаў паэт у вершы «Суд ідзе» (1932), які, дарэчы, вельмі падабаўся В. Таўлаю. Упаўне можна дапусціць, што ў сваіх палітычных ацэнках Купала не заўсёды меў рацыю, недзе быў недакладны, нешта перабольшваў. Пра жыццё ў Заходняй Беларусі ён ведаў апасродкавана — праз савецкі друк, чуткі, сродкі масавай прапаганды.

Вестку аб уз'яднанні Заходняй Беларусі ў адзінай БССР сустрэў вельмі прыхільна, у складзе пісьменніцкай брыгады наведаў Брэстчыну, Гродзеншчыну, Беласточчыну, Віленшчыну... У тым жа 1939 г. апублікаваў цыкл вершаў «На заходнебеларускія матывы»:

Ты з Заходняй, я з Усходняй
Нашай Беларусі,
Больш з табою ўжо ніколі
Я не разлучуся[3].

Гэтыя радкі паэт чытаў на пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі, які быў праведзены 26 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. І сапраўды, заходнія братыбеларусы трапілі ў моцныя абдымкі ўсходняй сістэмы. З тэрыторыі Заходняй Беларусі з кастрычніка 1939 да

[1] ЛІМ. 1993. 12 лют.
[2] ЛІМ. 1939. 9 лют.
[3] Янка Купала. Выбраныя творы. Мн, 1952. С. 610.

чэрвеня 1941 г. было вывезена на поўнач і ўсход СССР у лагеры, турмы і на пасяленне дзесяць працэнтаў насельніцтва. Частка загінула ў Курапатах. Трагедыя працягвалася...

Ці ведаў пра гэта Купала? Хутчэй за ўсё, што не. А зрэшты, што б ён, бездапаможны перад сістэмай, мог зрабіць?

## АЙЧЫННАЯ ВАЙНА. СМЕРЦЬ ПАЭТА

Вайна заспела Купалу ў Каўнасе, дзе ён знаходзіўся па запрашэнню літоўскіх пісьменнікаў. Адтуль ён спешным парадкам вяртаецца ў Мінск[1], але нямецкія бомбы сыпаліся ўжо і на сталіцу Беларусі, і Купала падаўся ў Ляўкі, а адтуль, калі фронт пачаў набліжацца, выехаў у Маскву. На старонках «Правды», «Известий», «Красной звезды» і іншых газет паэт выступае з вершамі і ўсхваляванымі артыкуламі. Хто не памятае магутнай духаўздымнай публіцыстычнай сілы вершаў «Беларускім партызанам», «Зноў будзе шчасце мецъ і волю» і інш. Заклапочаная нацыянальным лёсам палымяная публіцыстыка, як некалі ў гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ізноў выходзіць на першы план купалаўскай творчасці:

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
    Каб не ўскрэслі век яны.
Клічу вас я на Пабеду,
    Хай вам шчасцем свецяць дні,
    Выразайце людаедаў,
    Каб не стала іх і следу
    На святой нашай зямлі.

*(«Беларускім партызанам»)*

Гэты верш распаўсюджваўся па захопленай ворагам тэрыторыі Беларусі, размнажаўся ў падпольных партызанскіх друкарнях. Паводле сваёй паэтыкі ён нагадваў лепшыя ўзоры паэзіі Купалы дакастрычніцкай пары — высакародныя, гуманістычна-наступальныя вершы «Зашумеў лес разгуканы», «Пойдзем...», «Родныя песні», «Ворагам Беларушчыны» і іншыя з уласцівым для іх лірыкапубліцыстычным пафасам. У вершах Купалы 1941-1942 гг. нібы абудзілася яго маладая сіла, здольнасць увабраць у сваім «я» агульную, усенародную волю і выказаць гэта так, каб пачулі ўсе.

Восенню 1941 г. пачалася эвакуацыя і ў Маскве. Купала пераязджае ў гарадскі пасёлак Печышчы Татарскай АССР, які знаходзіўся за 14 кіламетраў ад Казані. Нягледзячы на дрэнны стан здароўя, ён не спыняе актыўнай грамадскай, літаратурнай і навуковай дзейнасці. 18 студзеня 1942 г. паэт удзельнічае ва Усебеларускім антыфашысцкім

[1] Пра тое, як Я. Купала дабіраўся з Каўнаса ў Мінск, гл. успаміны Н. У. Качарскай «Янка Купала выходил на разведку» // Народная газета. 1994. 21 вер.

радыёмітынгу ў Казані, дзе выступае з прамовай, у якой выказвае цвёрдую, непахісную веру ў хуткае і немінучае вызваленне Беларусі ад нямецкафашысцкай няволі.

У Печышчах Янка Купала напісаў вершы «Хлопчык і лётчык на вайне», «Грабежнік», «Дзесяць асінавых келляў», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Паўстаў народ...» У гэтах вершах-закліках, адрасаваных беларускаму народу, ён з гневам і нянавісцю выкрывае крывавых захопнікаў.

Янка Купала горача верыў у перамогу свайго народа і змагаўся за яе.

Памёр паэт 28 чэрвеня 1942 г.

Апошні акт жыццёвай драмы вялікага беларускага нацыянальнага паэта да гэтага часу пакрыты таямніцай. Ёсць небяздоказныя меркаванні, што Купала памёр не сваёй смерцю, што яго ўсё ж такі наздагнала няўмольная сталінская «ласка» і сістэма жорстка расправілася з варожым ёй «элементам».

Пахавалі Янку Купалу 1 ліпеня 1942 г. на Ваганькаўскіх могілках у Маскве. Праз дваццаць год прах паэта быў перавезены ў Мінск і перазахаваны тут, на Вайсковых могілках, побач з Якубам Коласам.

## ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Творчасць Янкі Купалы — набытак беларускай нацыянальнай культуры. Як аўтарытэтна сказаў Якуб Колас, «нельга ўявіць беларускі народ без такой велічнай постаці, як Янка Купала». Творчасць Купалы, як і творчасць Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, Гаруна, Цёткі, — вынік пэўнага этапу духоўнага развіцця беларускага народа. Яго паэзія дае яскравае ўяўленне аб самых істотных рысах беларускага характару — чалавечай годнасці, духоўнасці, талерантнасці.

Пранікнёна сказаў пра Купалу рускі паэт А. Т. Твардоўскі: «Лірык па складу свайго цудоўнага таленту, пясняр Беларусі, які выявіў сэрца яе з незвычайнай сілай, ён усёй сваёй паэтычнай існасцю як бы сімвалізаваў творчую моц народа»[1].

З шэрагу іншых паэтаў-сучаснікаў і папярэднікаў Купалу вылучае магутнасць пяснярскага тэмпераменту, незвычайная сіла лірызму, напор унутранай энергіі, шырыня ахопу з'яў жыцця, чалавечнасць. Купала адкрыў самыя разнастайныя бакі і праявы чалавечага існавання, асоба паэта ўвабрала ў сябе прасторы Сусвету. Маштаб чалавечай асобы ў яго вызначаецца ў барацьбе з сіламі зла і прыгнёту. Ён рана зразумеў, што ўсякі ўціск над асобай — злачынства, і ўсё жыццё змагаўся з крыўдай, несправядлівасцю і адступленнямі ад глыбінных законаў жыцця.

Ужо першыя творы Купалы сведчылі, што яго паэзія грунтавалася на значных ідэалагічных каштоўнасцях. З самага пачатку ён настолькі пранікся беларускай нацыянальнай ідэяй, настолькі загарэўся ёю і блізка ўспрыняў яе, што, валодаючы вялікім паэтычным дарам, стаў прарокам нацыянальнага адраджэння, абвясціў выхад свайго народа на арэну гісторыі.

Спалучэнне сацыяльнай праблематыкі і нацыянальнай, агульнанароднай і асобаснай, духоўнай зрабіла Купалу буйнейшым прадстаўніком беларускага рамантызму і мадэрнізму пачатку XX ст. Новая мастацкая праблематыка, якая на пачатку XX ст. уваходзіла ў беларускую літаратуру, ужо не магла для свайго вырашэння задаволіцца тымі магчымасцямі, якія даваў ёй пазітывісцкі рэалізм другой палавіны XIX ст. Купалаўскае паэтычнае мысленне ўключала ў сябе не толькі патрабаванні «здаровага сэнсу», але і працу падсвядомасці, інтуітыўныя азарэнні, ірацыянальныя моманты.

Лірыка і эпас Купалы перадаюць адчуванне неўладкаванасці свету, сацыяльнай і маральнай яго няўстойлівасці і супярэчлівасці. Яго

[1] Твардовский А. Т. Собр. соч. В 6 т. М., 1978. Т. 4. С. 291.

рамантызм (мы называем яго пострамантызмам) прасякнуты глыбокай эмацыянальнасцю, якая афарбоўвае ўсе элементы яго паэтыкі.

Галоўная рыса светаўспрымання паэта — перавага суб'ектыўнага над аб'ектыўным, імкненне да неабмежаванай свабоды, здольнасць бачыць свет далёка і ўсеахопна. Тут сцвярджае сябе ўласцівы рамантыкам прынцып двайнога бачання, у якім спалучаюцца рэальнае і ідэальнае, зямное і нябеснае, блізкае і далёкае.

Вялікае і пакуль што малаасветленае пытанне Купалавай паэтыкі — формы і спосабы абагульнення ўяго паэзіі.

Р. Бярозкін знаходзіў, што «творчасць Купалы — самае непасрэднае, прамое і амаль не апасродкаванае аднаразава-прыватнымі сітуацыямі паэтычнае выяўленне працоўнага народа як сацыяльнай і нацыянальнай цэласнасці»[1]. Думка крытыка ў прынцыпе правільная, але, на наш погляд, без дастатковых падстаў пашырана на ўсю творчасць паэта. Між тым у Янкі Купалы шмат вершаў, прасякнутых глыбокім лірызмам і пабудаваных выключна на асабовым самавыяўленні («Чым хата багата», «Песняй толькі...», «Маё цярпенне», «Бацькаўшчына», «Мая вера», «Можам часта мы плакаць...», «Для Бацькаўшчыны», «Мая навука» і інш.).

Паэзія Купалы дакастрычніцкага перыяду нашмат больш змястоўная, чым савецкага, але нельга ігнараваць і савецкі перыяд творчасці. У 20-30-я гады выходзяць зборнікі вершаў «Спадчына» (1922), «Безназоўнае» (1925), «Беларусі ардэнаноснай» (1935), «Ад сэрца» (1941), паэма «Над ракой Арэсай» (1934) і іншыя творы, у якіх знайшлі адбітак тагачасная рэчаіснасць і своеасаблівасць самой паэзіі. Савецкая паэзія пачынаючы з сярэдзіны 20-х гадоў была падключана да агульнай ідэалагічнай задачы па перабудове свету і перапрацоўцы чалавека, які павінен быў стаць «вінцікам» сістэмы, сціплым «саўком». Ідэя гуманізму, паводле якой чалавек з'яўляўся вышэйшай каштоўнасцю, носьбітам усіх асноў грамадскага жыцця, творцам культуры, была па сутнасці скасавана, а недзе з канца 20-х гадоў усё трапіла пад уціск «сталіншчыны».

Паэта па сутнасці адолеў канфармізм — ён мусіў саступіць ціску сістэмы і заняў пазіцыю згоды з агульнапрынятымі тады нормамі, эталонамі і каштоўнасцямі. І ўсё ж такі паэтычныя, мастацкія традыцыі працягвалі жыць, працягвалі існаваць. Паэзія, нягледзячы ні на што, імкнулася выконваць сваю ролю па духоўнаму, эстэтычнаму забяспячэнню чалавека. На гэты конт адзін з сучасных даследчыкаў рускай савецкай літаратуры А. Жалкоўскі філасофскі зазначаў: «Пры

[1] Березкин Г. Звенья. Творческая индивидуальность и взаимодействие литератур. М., 1984. С. 12-13.

любым ладзе мастацтва стварае сваю асаблівую, другую рэальнасць, узбагачаючы такім чынам жыццё, дапамагаючы яго асэнсаванню і прымірэнню з ім. Пісьменнікі, якім выпала жыць у небывалых савецкіх умовах, адарылі нас цікавейшымі гібрыдамі і гэтым унеслі сваю лепту ў ва ўсіх адносінах цяжкую і рызыкоўную справу — трэніроўку маральных, інтэлектуальных і эстэтычных мускулаў нашай непуцёвай нацыі[1]».

У гэтым выказванні шмат праўды: паэтычная рэальнасць Купалавых твораў 30-х гадоў таксама па-свойму падтрымлівала сучасніка, дапамагала яму выжыць.

**Сучасная беларуская літаратура і купалаўскія традыцыі**. Сучасная беларуская літаратура, імкнучыся ўсвядоміць сучаснасць у кантэксце быцця, адчувае сябе як ніколі сталай у ідэйных і мастацкаэстэтычных адносінах. Купалаўскія традыцыі дапамагаюць ёй у імкненні і ўменні пранікнуць у сутнасць з'яў, у глыбіні чалавечага духу. Сёння беларускія пісьменнікі, як і некалі Купала, напружана шукаюць адказы на нялёгкія пытанні жыццядзейнасці чалавека, яго ўзаемадзеяння са светам прыроды. У паэзіі Купалы адчуваецца прысутнасць прыродных сіл і павага да іх з боку чалавекапрацаўніка, які для паэта ніколі не зводзіўся да нейкага абстрактнага ўвасаблення сацыяльнай практыкі. Купалаўскі герой адчуваў адзінства свайго лёсу і прыроды, гэта своеасаблівы пантэіст: «Мой дом — прыволле звёзднай далі». Адсюль вынікае купалаўскі «касмізм», пачуццё «сына міру». Пошукі сучасных паэтаў у галіне праблемы «чалавек і прырода» суадносяцца з традыцыямі Купалы. Касмічны вобраз сасны і бярозы (з аднайменнага верша А. Куляшова «Сасна і бяроза», 1968), якія трымаюць «жывымі рукамі карэнняў сваіх» зямлю, можна паставіць у сувязь з філасофскай лірыкай вялікага песняра.

У творчасці сучасных паэтаў жыве неадольнае жаданне духоўна далучыцца да прыроды, суаднесці з ёю чалавека і яго справы, адчуць яе хараство, мэтазгоднасць і разам з тым адчуць сваю адказнасць за яе лёс. Такіх твораў шмат у кнігах паэтаў розных пакаленняў. Яны схільныя адухаўляць прыроду, шукаць у ёй маральны сэнс. З гэтага пункту погляду вельмі па-свойму наследаваў Янку Купалу Максім Танк:

Лячу Млечным Шляхам
І чую: нехта плача.
Прыслухоўваюся.
А гэта — скардзіцца Зямля

---

[1] А. Жолковский. Блуждающие сны. М., 1992. С. 64.

На свайго сына — чалавека.
Прачнуўся і падумаў:
Трэба перапрасіць яе,
А то і я за сваё жыццё
Нямала прычыніў
Ёй гора.

Жывы, дзейсны касмізм паэта ўзбуйняе яго гуманістычныя ўяўленні, абвастрае клопат пра існаванне чалавека, пра яго зямны лёс і саму зямлю. «Максім Танк, — піша І. Навуменка, — падобен да Купалы шырынёй паэтычнага «дыхання», адчуваннем бязмежнасці даляў, глыбінь жыцця, замілаванасцю да скарбаў народнай паэзіі, павагай да маральна-этычных каштоўнасцей, створаных народам на працягу ўсёй яго гістарычнай жыццядзейнасці. Танк, як і Купала, бадай, у роўнай ступені рамантык і рэаліст, яднае абодвух паэтаў імкненне да экспрэсіўнасці вобраза, да ёмістай, шматзначнай метафары як асноўнага сродку асацыятыўнага мыслення».

Хочацца адзначыць таксама імкненне сучаснай паэзіі да «сацыяльнага пейзажа», выдатным майстрам якога быў Янка Купала. У гэтым, як ніхто, блізкі яму Пімен Панчанка, паэзія якога, спалучаючы «сацыяльны пейзаж» з «пейзажам душы» ў адно цэлае, ніколі не ўтойвала супярэчнасцей быцця, скажам, супярэчнасці паміж высокім прызначэннем чалавека і стракатай эмпірычнай рэальнасцю. Панчанка таксама шмат думаў над тым, што ж можна проціпаставіць эгаізму, індывідуалізму, раз'яднанню, адчужэнню паміж людзьмі і іншым негатыўным з'явам, якія спадарожнічаюць чалавечаму існаванню. На думку паэта, чалавеку трэба глыбей спазнаць сябе, спасцігнуць прывабнасць навакольнага свету, адчуць сваю Радзіму, свой народ. У вершы, прысвечаным П. Броўку, гаворыцца: «На твой і мой бальшак гляджу і думаю: Радзіма».

П. Панчанка хацеў, услед за Купалам, паказаць працэс абжывання чалавекам гісторыі, асваення сваёй прыналежнасці да мінулага і будучыні, ён напісаў нямала пранікнёных вершаў пра родную мову...

У чым заключаюцца асаблівасці сучаснага літаратурна-мастацкага працэсу? Нельга не заўважыць, што сучасная паэтычная думка больш і глыбей даследуе ўнутраны свет чалавека, яго сутнасць, маральныя магчымасці, сувязі з людзьмі, прыродай, вытворчасцю, усім светам. Мастацтва хоча спазнаць, вытлумачыць чалавечы феномен, раскрыць ягоную прыроду, асвятліць глыбіню яго экзістэнцыі, сувязь са сваім часам.

Даводзіцца назіраць з гэтай нагоды ўзрастанне светапогляднага пачатку ў літаратуры, яе філасафічнасці і канцэптуальнасці, свядомага гістарызму.

Чым вышэй ідэйна-эстэтычны ўзровень нашай літаратуры, тым мацней яе сувязі з традыцыямі класікі, са спадчынай Янкі Купалы, які актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні самасвядомасці сучаснай літаратуры і мастацтва.

Сёння купалаўская кнігі шырока раскрыты перад вачыма нашага часу. «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына» — гэтыя словы з вядомага верша Купалы паўтарае Р. Барадулін.

Ад сівых гадоў,
ад дзядоў
Для мяне
ашчаджона спадчына...—

хіба не адчуваюцца тут купалаўская лексіка, і інтанацыя, і думка? Таксама зрэшты, як і ў гэтым вось яго вершы, які так і называецца — «Спадчына»:

Колькі год Беларусі?
Колькі дочкам, сынам,
Колькі радасці, скрусе,
Колькі снам, курганам;
Колькі зорцы дасвецця,
Што ўзышла для вякоў,
Колькі шумнаму веццю
Баравых бальшакоў;
Колькі крэўнаму слову,
Што вяшчуе святло,
Небу, што крутаброва
Маладзік узняло.

Вось яна — глыбіня памяці, якая не можа не адгукацца ў вершах паэтаў — нашых сучаснікаў. На своеасаблівай рамантычнай ноце яна чуецца ў У. Караткевіча:

Дзе мой край!
Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за поліўку носяць
ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы, ударыш, і зломіцца меч.

Янка Купала нямала папахадзіў старасвецкімі шляхамі Беларусі. «Ляжыць, уецца ў бел-свет, як вужака, стары, утоптаны вякамі шлях» («Па шляху», 1914). Вобразы дарогі, шляху-пуцявіны, бальшака любі-

мыя і ў сучаснай паэзіі. Працяг купалаўскага роздуму над шляхамі роднага народа адчуваецца ў вершы Н. Гілевіча «Бальшак» (1964):

Праз пушчу, дзе сосны
Струменяць жывіцу-пяршак,
Праз ліўні густыя,
Што раптам засланяць паўсвета, —
Спяшаецца ўдалеч
Стары беларускі бальшак,
Спяшаюцца людзі,
Спяшаецца век-непаседа.

Зноў і зноў узнікае ў паэзіі матыў кургаНоў, якія праз вякі падаюць свой голас:

На Палессі — спрадвеку, як быццам званы,
Несціхана сівыя звіняць курганы.
То трывожна набатны, то як ранішні сон,
Над зямлёю плыве іх малінавы звон.

*(А. Грачанікаў)*

«Курганне» — так назваў сваю паэму М. Арочка (1979). Другая мае не менш красамоўную назву — «Крэва» (1981).

Словам, ёсць падставы сцвярджаць, што і сёння паэзія на новым узроўні звяртаецца да вопыту Купалы, яго жыватворных вытокаў, пераймае ад яго гэтае «пачуццё каранёў», вучыцца ў яго маштабнасці і гістарычнай глыбіні светаадчування.

Наследуючы Купалу, развіваючы яго ідэі і пафас, сучасныя паэты не забываюць, аднак, пра натуральнасць індывідуальнага светаўспрымання, якая знаходзіць выяўленне — у кожнага — у сваім уласным стылі. Сёння, развіваючы купалаўскі традыцыі, паэты часам калі не палемізуюць з ім, то некалькі інакш падыходзяць да асэнсавання, скажам, праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Мы маем на ўвазе, напрыклад, паэму А. Разанава «Было балота», у якой нібыта адчуваецца скрытая палеміка з паэмай «Над ракой Арэсай». Што ж, сучасная мастацкая думка жыве «пытаннем сутнасці» (Р. Барадулін), ва ўсім яна хоча дабрацца да каранёў, разгадаць тайну быцця. І ў гэтым ёй дапамагае Купала, яго прыклад. Яго паэзія працягвае сваё жыццё ў творчасці пісьменнікаў розных пакаленняў і жанраў. Адчуванне яго духоўнай спадчыны прысутнічае ў іх творчых канцэпцыях.

Я жыву па вуліцы Купалы,
І яго таполя мне відна.

*(П. Панчанка)*

Спадчына песняра жывіць сучасную літаратуру, застаючыся надзвычай каштоўнай крыніцай яе ідэйнаэстэтычнага ўзбагачэння. Гэта не толькі наша мінулае, але і наша будучае, пра што добра сказаў Максім Танк:

Ты вечна будзеш сярод нас,
І непаўторнае тваё імя
Легендай стане ў вяках,
Паходняй, што сваім праменнем
Паможа ў будучыню шлях
Прабіць наступным пакаленням.

Янка Купала — паэт трагічнага лёсу, але ён знаходзіў у сабе сілы для веры ў будучыню, у народ, у чалавека. Купала — гарант нацыі, яе апякун і абаронца. Ён адкрыў Беларусь.

Творчасць Купалы, абапіраючыся на багатыя традыцыі мінулага, шырока і разнастайна адлюстравала ўздым адраджэння нацыянальнай культуры і свядомасці ў беларускім народзе. Паэтычны характар Купалы выявіўся надзвычай шматгранна — у лірычных вершах, паэмах, драматургічных творах, публіцыстыцы. Яго паэзія прывівала беларусу любоў да жыцця, падтрымлівала веру ў яго каштоўнасці, лячыла ад пасіўнасці, абуджала творчую актыўнасць. Не губляючы з поля свайго бачання сацыяльна-ролевага становішча чалавека, паэт праяўляў глыбокую цікавасць да яго самога, яго ўнутранага свету і духоўных магчымасцей.

Купалаўскі герой адлюстраваў у сабе шматаблічны і шматгалосны свет беларускай прыроды, яе непарыўную сувязь з чалавекам. У разрыве з прыродай, хцівых, гвалтоўных адносінах да яе, у імкненні эгаістычна прысвоіць сабе яе багацці і прыгажосць караніцца, на думку паэта, злачынства, за якое чалавеку давядзецца адказаць. Шукаючы новую, праўдзівую канцэпцыю свету і месца чалавека ў ім, творчасць Купалы асвойвала сучасныя універсальна-ўсёахопныя ідэі, ідучы ў сваім развіцці шляхамі сусветнай культуры.

Кіруючыся да сонца, думка паэта не адрывалася ад зямлі. Паэт-прарок, ён ведаў, прадчуваў, што наперадзе ўсіх чакаюць новыя вялікія выпрабаванні і рыхтаваў да гэтага беларускі народ, імкнуўся даць яму ўсебаковую гістарычную арыентацыю, узброіць ідэалагічна і духоўна.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

## ТЛУМАЧЭННЕ НЕКАТОРЫХ ІМЁНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

**Абсалютызацыя** — узвядзенне чаго-небудзь (ідэі, факта альбо з'явы) у абсалют, г. зн. у ступень безадноснага, пагамованага, неабмежаванага.

**Абсурд** — бяссэнсіца. У інтэрпрэтацыі экзістэнцыялізму (адзін з вядучых напрамкаў філасофіі XX ст.) абсурд — асноватворная катэгорыя для ацэнкі і характарыстыкі чалавечага жыцця і рэчаіснасці.

**Адэкватны** — роўны, тоесны, адпавядаючы.

**Антрапамарфізм** — надзяленне чалавечымі псіхічнымі ўласцівасцямі прадметаў і з'яў нежывой прыроды, нябесных цел, жывёл, міфічных істот; форма светапогляду старажытнага чалавека, які быў схільны прыпісваць нежывому свету здольнасць дзейнічаць, жыць і паміраць, адчуваць і г. д. (зямля дрэмле, неба хмурыцца, сонца смяецца..?). Водгукі антрапамарфізму шырока прадстаўлены ў паэзіі — у прыватнасці ў Янкі Купалы.

**Апакаліптычная візія** — містычнае ўяўленне аб канцы свету.

**Архетып** — першавобраз, універсальная ўстойлівая псіхічная мадэль жыццёвых працэсаў і сітуацый, якая ўтрымліваецца і захоўваецца ў чалавеку (калектыве) у сферы падсвядомага і праяўляе сябе (г. зн. пераходзіць у сферу свядомага) у чалавечай жыццядзейнасці, уключаючы і мастацкую творчасць. Паняцце архетыпу ўведзена швейцарскім псіхааналітыкам К. Юнгам, які бачыў у ім «канцэнтраванае выяўленне ўсёй псіхічнай сітуацыі». У Янкі Купалы курган — як магіла дзядоў, дзе дрэхмле былая слава, якую трэба адрадзіць; сонца — як крыніца жыцця, ажыўлення зямлі пасля зімовага сну і г. д.

**Асацыятыўнасць** — асаблівасць мастацкага мыслення, якая праяўляецца ў збліжэнні разнастайных, часам даволі аддаленых паміж сабой ідэй, вобразаў, адчуванняў, уяўленняў і г. д.

**Бадлер Шарль** (1821-1867) — французскі паэт, адзін з пачынальнікаў мадэрнізму ў заходнееўрапейскай літаратуры XIX ст. Паняцце «бадлераўскі сплін» вядома з яго паэтычнага зборніка «Кветкі зла» (1857), раздзел «Сплін і ідэал».

**Барока** (вытв.: барочны) — мастацкі стыль XVI — сярэдзіны XVIII стст. Адрозніваўся ад стыля Адраджэння і ад класіцызму складанымі вобразна-метафарычнымі формамі, дынамізмам і экспрэсіяй.

**Букалічная паэзія** — адзін з жанраў старажытнагрэчаскай паэзіі, які атрымаў далейшае развіццё ў рымскай літаратуры і ў еўрапейскіх літаратурах новага часу. Карані «буколікі» — у фальклоры, у песнях пастухоў.

**Бутафорыя** — падробка, мішура.

**Гіпертрафія** — празмернае перабольшанне памераў або значэння нейкага прадмета або з'явы.

**Дактрынёрства** — сляпое, некрытычнае аддаванне якой-небудзь дактрыне; разважанні, якія грунтуюцца на бяздоказных палажэннях.

**Дэгуманізацыя** — працэс збяднення маральнаэтычнага ідэалу грамадства, адыходу ад гуманістычных прынцыпаў, зніжэння ўяўлення аб духоўным багацці і каштоўнасці чалавечай асобы.

**Дэмагогія** — ілжывыя абяцанні, перакручванне фактаў у мэтах набыцця папулярнасці, прыцягнення на свой бок мас.

**Дэпрэсія** — стомлены, прыгнечаны псіхічны стан.

**Дэтэрмінізм** — філасофскае вучэнне, якое прызнае аб'ектыўную заканамернасць і прычынна-выніковую ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць усіх з'яў прыроды і грамадства.

**Ігнараванне** — непрыманне да ўвагі або наўмыснае нежаданне ведаць.

**Ідэнтыфікацыя** — атаясамліванне, устанаўленне супадзення чаго-небудзь з чым-небудзь.

**Іерархія** — размяшчэнне частак ці элементаў цэлага ў парадку ад вышэйшага да ніжэйшага.

**Ілюзія** — скажонае ўспрыняцце рэчаіснасці; нязбытная надзея, мара.

**Іманентны** — унутрана ўласцівы якому-небудзь прадмету, з'яве, што вынікае з яго прыроды.

**Імпрэсіянізм** — напрамак у еўрапейскім (пераважна французскім) мастацтве апошняй трэці XIX — пачатку XX стст. Імкнучыся да больш непасрэднага і непрадузятага адлюстравання шматфарбнасці, рухомасці і зменлівасці рэальнага свету, імпрэсіяністы-жывапісцы распрацоўвалі надзвычай тонкія і дакладныя спосабы перадачы ўражання як асновы ўсякага, у тым ліку самага мімалётнага ўяўлення, перажывання, думкі.

**Індывідуалізм** — супрацьпастаўленне інтарэсаў асобнага ідывідуума інтарэсам грамадства, перавага асабістага перад грамадскім.

**Інтэнсіўны** — узмоцнены, напружаны, паскораны, насычаны яркімі колерамі і фарбамі (скажам, працэс паэтычнага адлюстравання рэчаіснасці).

**Ірацыяналізм** — філасофска-эстэтычны напрамак які адмаўляе магчымасць разумнага лагічнага пазнання рэчаіснасці і асноўным відам пазнання прызнае інтуіцыю, інстынкт, веру. На гэтай падставе сцвярджаецца пазаразумовы, ірацыянальны характар рэчаіснасці.

**Касмізм** — своеасаблівы эмацыянальны настрой, плынь думкі, скіраванай на пераадоленне супярэчнасцей эпохі Асветніцтва ў імя

дасягнення адзінства і цэласнасці погляду на свет. Пафас касмізму — вяртанне чалавека ва ўлонне прыроды, пазнанне сістэмы яе законаў, развіццё думкі, якую касмісты лічаць такім жа натуральным для прыроды працэсам, як і рух нябесных свяціл; думка — важнейшая састаўная сусветнага эвалюцыйнага працэсу. І нараджэннем сваім, і розумам чалавек, на думку касмістаў, абавязаны прыродзе, космасу.

**Катаклізм** — нечаканы разбуральны пераварот, катастрофа (патоп, паводка, землятрус і г. д.).

**Кодуэл Крыстафер** (1908-1937) — вядомы англійскі пісьменнік і крытык марксісцкага накірунку.

**Люмпены** — дэкласаваныя людзі, сацыяльнае дно грамадства: крымінальныя элементы, жабракі, бадзягі, бомжы і інш.

**Мадэрнізм** — адзін з галоўных напрамкаў развіцця сусветнага мастацтва пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. і да нашага часу. Яго сацыяльна-псіхалагічныя і філасофскія карані — у крызісе рацыяналістычнага светапогляду, які ў другой палавіне XIX ст. у многім ужо не задавальняў патрэб грамадства на новым этапе яго гістарычнага развіцця. Узнікненне і станаўленне мадэрнізму як ідэйна-эстэтычнай плыні абумоўлена патрэбамі больш глыбокага адлюстравання чалавечай суб'ектыўнасці, імкненнем да творчай свабоды і самарэалізацыі. Гэту плынь можна разглядаць як працяг і крайняе выражэнне рамантызму ва ўмовах XX ст. Мадэрністы востра адчулі крызісны стан свету, супярэчнасці паміж маральным узроўнем чалавека і навукова-тэхнічнымі дасягненнямі XX ст., духоўным светам асобы і тэндэнцыямі сацыяльна-грамадскага жыцця. Расчараваныя ў ідэі дэтэрмінізму, яны імкнуцца да адлюстравання не толькі свядомых, але і падсвядомых псіхічных працэсаў. Уласцівыя мадэрнізму пошукі новых выяўленчых сродкаў звязаны з адмаўленнем ад традыцыйнага, ломкай старых мастацкіх форм, устаноўкай на эксперымент.

**Максімаліст** — прыхільнік крайніх, празмерных патрабаванняў і поглядаў.

**Медытацыя** — паглыбленыя, засяроджаны роздум, мройніцтва.

**Менталітэт** — своеасаблівасць душэўнага ладу народа, яго нацыянальнага характару, псіхікі і мыслення.

**Месія** — выратавальнік, які, паводле біблейскіх уяўленняў, павінен прыйсці на зямлю дзеля ўстанаўлення боскай справядлівасці.

**Місія** — адказнае заданне, роль, даручэнне. Місіянер — той, каму даручана місія.

**Містэрыя** — від сярэдневяковага рэлігійнага прадстаўлення, якое разыгрывалася на плошчах пры шматлікім сцячэнні народа, у час свят.

**Мойры** — у грэчаскай міфалогіі багіні лёсу.

**Наваліс** (1772-1801) — нямецкі паэт і філосаф, прадстаўнік іенскай школы рамантызму. Творчасць Наваліса карысталася шырокай папулярнасцю ў Расіі ў пачатку XX ст.

**Нігілізм** — поўнае адмаўленне агульнапрызнанага, адмоўныя адносіны да традыцый, скептыцызм.

**Пазітывізм** — адзін з напрамкаў у філасофіі, які зыходзіць з таго, што крыніцай сапраўдных (пазітыўных) ведаў могуць быць толькі спецыяльныя дакладныя навукі, здольныя апісваць і сістэматызаваць факты. Пазітывізм ігнаруе філасофска-метафізічную праблематыку, т. зв. «вечныя пытанні».

**Пантэізм** — філасофскае вучэнне, якое атаясамлівае бога і прыроду.

**Пасіянарнасць** — адданасць пастаўленай мэце і адоранасць духоўнай і фізічнай энергіяй для яе дасягнення.

**Патэтыка** — паэтычнае выяўленне ідэйна-эмацыянальнага ўздыму, натхнення, страсці.

**Песімізм** — светаадчуванне, прасякнутае безнадзейнасцю, бязвер'ем у лепшую будучыню.

**Поліфанізм** — шматгалоссе, заснаванае на гарманічным спалучэнні і развіцці самастойных меладычных ліній. У пераносе на літаратурны твор — структура і ўзаемаадносіны яго персанажаў, тэм, ідэйных пазіцый і імкненняў.

**Пратаганіст** — станоўчы герой твораў пісьменніка, у якім ён увасабляе свой асабісты (ці блізкі сабе) погляд на свет і адносіны да навакольнага асяроддзя. Супрацьлеглае — антаганіст.

**Радыкалізм** — выкарыстанне рашучых, нават крайніх метадаў пры вырашэнні якіх-небудзь пытанняў, рашучы спосаб дзеянняў.

**Рамантызм** — напрамак у еўрапейскім мастацтве першай паловіны XIX ст. Прыхільнікі рамантызму на першы план вылучалі індывідуальнасць, надзяляючы яе ідэальнымі памкненнямі. Мастацтву рамантызму ўласцівы незадаволенасць навакольным, скіраванасць да ідэалу, выключнасць герояў, страсцей і канкрэтных сітуацый, напружанасць сюжэта, шматфарбнасць апісанняў і характарыстык, раскаванасць мастацкай формы.

**Рацыяналізм** — напрамак у тэорыі пазнання, які прызнае розум рашаючай або нават адзінай крыніцай ісцінных ведаў. У сапраўднасці крыніцай пазнання з'яўляецца пачуццёвы вопыт — чалавечае мысленне перапрацоўвае яго даныя; разважлівыя адносіны да жыцця.

**Русаізм** — ідэйны комплекс, звязаны з творчай спадчынай вядомага французскага пісьменніка і філосафа Ж. Ж. Русо (1712-1778). Русаізму ўласцівы культ прыроды, адмаўленне заслуг цывілізацыі ў чалавечым выхаванні, апалогія простых маральных норм, не абцяжараных абстрактным маралізаваннем.

**Рэзанёр** — чалавек, схільны да бясконцых разважанняў павучальнага, маралізатарскага характару.

**Рэмінісцэнцыя** — водгук іншага твора або матыву ў паэзіі, фалькторы, музыцы і інш.

**Рэнегат** — чалавек, які здрадзіў сваім перакананням і перайшоў у лагер праціўнікаў; здраднік, перакінчык.

**Рэфлексія** — роздум, які ўключае ваганні, сумненні, супярэчнасці, аналіз уласнага псіхічнага стану.

**Сепаратызм** — імкненне да аддзялення, адасаблення.

**Сінкрэтызм** — злітнасць, спалучанасць, якая характарызуе першапачатковы, неразвіты стан першабытнага мастацтва, калі танец, спевы і музыка знаходзіліся ў непадзельным адзінстве.

**Стаіцызм** — стойкасць і мужнасць у жыццёвых выпрабаваннях.

**Статус** — прававое становішча.

**Талерантнасць** — верацярпімасць.

**Тытанізм** — характар дзейнасці, незвычайнай па сіле, размаху, напружанасці і мэтанакіраванасці.

**Тэндэнцыйнасць** — пэўная накіраванасць твора, выказвання, часта прадузятая, якая да таго ж праводзіцца залішне назойліва.

**Тэстамент** — запавет (у Бібліі: стары і новы тэстамент).

**Універсалізм** — шматграннасць, усебаковасць. У паэзіі Янкі Купалы універсалізм праяўляецца як імгненнае азарэнне, якое раскрывае ўсёабдымнасць чалавечага «я».

**Уніфікацыя** — прывядзенне чаго-небудзь да аднастайнасці.

**Утылітарызм** — адзін з накірункаў у этыцы, які крытэрыем маральнасці прызнае толькі карысць альбо выгаду; вузкі практыцызм, імкненне з усяго мець непасрэдную карысць, матэрыяльную выгаду.

**Фантасмагорыя** — прывідныя, фантастычныя карціны; хваравітае трызненне.

**Феномен** — рэдкая, незвычайная з'ява ці чалавек, выключны ў якіхсьці адносінах.

**Шавінізм** — крайні нацыяналізм, пропаведзь нацыянальнай выключнасці, распальванне варожасці і падазронасці паміж народамі.

**Экспрэсія** — выразнасць, сіла праяўлення эмоцый і перажыванняў.

**Эгацэнтрызм** — крайняя ступень індывідуалізму і эгаізму.

**Экзальтацыя** — узбуджаны стан, павышаная эмацыянальнасць, хваравітая ажыўленасць.

**Экзістэнцыялізм** — філасофія чалавечага існавання, шырока распаўсюджаная ў сучасным свеце. Экзістэнцыялізм лічыць, што прадметам філасофіі з'яўляецца чалавек, экзістэнцыя (існаванне) якога вызначаецца праз усведамленне трагічнасці яго светаадчування.

**Энтрапія** — у пераносным сэнсе працэс забыцця гістарычнага вопыту, знікнення памяці аб перажытым, якая губляецца ў мораку мінулага.

**Эпігонства** — нятворчае, пераймальніцкае наследаванне якому-небудзь напрамку, паўтарэнне аджыўшых ідэй і дасягненняў.

**Эсхаталогія** — рэлігійна-філасофскае вучэнне аб канечным лёсе свету і чалавека; эсхаталагічны — які мае адносіны да гэтага вучэння.

## ЗМЕСТ

Уступ
Рысы біяграфіі
Вершы пра долю беларуса
Раннія паэмы
«Жалейка»
Мэты, ідэалы, шляхі
Вільня. «Адвечная песня»
Пецярбург. «Гусляр»
«Курган». «Сон на кургане». Своеасаблівасць купалаўскага рамантызму
У глыбіню гісторыі
«Шляхам жыцця». Купала і мадэрнізм
Рамантычныя паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я»
Нашаніўская дыскусія 1913 г
Драматургія. «Паўлінка», «Прымакі», «Раскіданае гняздо»
Рэдактар «Нашай нівы». Пачатак першай сусветнай вайны
Новы этап вызваленчай барацьбы. Абвяшчэнне БНР
Апантаны беларускім лёсам
На пачатку 20-х гадоў
Паэма «Безназоўнае». Лірыка 1926 г
Перыяд змяркання
«Над ракой Арэсай» і іншыя творы
Ляўкоўскія вершы
Паэт і таталітарызм
Айчынная вайна. Смерць паэта
Замест заключэння
Тлумачэнне некаторых імёнаў і паняццяў

**Гніламёдаў У. В.**

Янка Купала: Жыццё і творчасць / У. В. Гніламёдаў. — Мн.: Бел. навука. 2002. — 238 с.

ISBN 985-08-0521-8

У кнізе па-новаму асвятляецца творчая спадчына Янкі Купалы — ад першых вершаў і паэм да апошніх выступленняў. Пераасэнсоўваюцца такія буйныя яго творы, як «Адвечная песня», «Сон на кургане», «Магіла льва», «Над ракой Арэсай», «Безназоўнае», «Тутэйшыя» і інш.

Аўтар імкнецца пераадолець ідэалагічныя штампы, скажэнні, недагаворанасць, якія да гэтага часу перашкаджаюць зразумець сапраўднага Купалу.

Разлічана на шырокае кола чытачоў.

УДК 821.161.3.09+929 Купала